ЗЯНОН
ПАЗЬНЯК

НОВАЕ СТАГОДДЗЕ

Вільня
Таварыства Беларускай культуры ў Летуве
Варшава
„Беларускія Ведамасьці”
2002 г.

УДК 323 (476)
(091) П 12

ISBN 9955-9337-4-7

© Зянон Пазьняк, 2002

НОВАЕ СТАГОДДЗЕ

„Новае стагоддзе” — гэта спэцыяльная сэрыя артыкулаў, напісаная ў асноўным (з рэдкім выключэньнем) у 2001 годзе, у першы год новага XXI-га стагоддзя.

Пры напісаньні ставілася акрэсьленая мэта: пазнаёміць чытача з пэўнымі ведамі, фактамі, праблемамі і ідэямі, якія ўзьніклі ў кантэксьце нашага беларускага нацыянальнага жыцьця на працягу апошняга стагоддзя і перакрочылі (разам з намі) у новы храналягічны час. Мяжа стагоддзяў — гэта, вядома, фармальнасьць. Але яна дае нагоду задумацца над існаваньнем.

У XX-м стагоддзі Беларусь вытрымала неверагодны разбуральны ўдар з Усходу і з Захаду. Удар бязбожніцтва і чалавеканянавісьці. Нашыя народныя страты — велізарныя, мераюцца касьмічным маштабам.

І ўсё ж такі мы жывём і змагаемся пад нашым найсьвяцейшым *Бел-Чырвона-Белым Сьцягам* за будучыню.

У XXI-м стагоддзі нас чакаюць новыя выпрабаваньні, новая навала з Усходу і з Захаду. Навала хцівасьці, бездухоўнасьці і граху.

Мы мусім абараніць беларускую цывілізацыю.

Адпор і сіла — у нас самых, у абароне каштоўнасьцяў, якія мы стварылі і на якіх стаім у нашым яднаньні і ў нашай веры.

Гэтыя артыкулы спэцыяльна разьлічаныя на шырокага чытача, на людзей, якія любяць Бацькаўшчыну, і пададзеныя як разважаньні на падставе існуючых здабыткаў і фактаў, прапушчаных праз досьвед і перажываньні ўласнага вопыту.

Пісалася, галоўным чынам, для тых беларусаў, якія (у выніку агульных абставінаў) ня мелі магчымасьці атрымаць беларускую адукацыю і карысталіся чужой сістэмай ведаў.

То няхай жа гэтая кніжка прыдасца беларусам дзеля ўгрунтаваньня іхных ведаў пра Беларусь.

Зянон Пазьняк

МІНУЛА XX-е СТАГОДДЗЕ

Мінула XX-е стагоддзе, скончылася 2-е тысячагоддзе і пачалося трэцяе. І мінула яно, і пачалося неяк незаўважна, без належнай увагі людзей, без падсумоўкі і раздумленьняў, без пакаяньняў і без надзей. Як быццам усе занятыя сваімі клопатамі, больш важнымі, чым задуменьне над вечнасьцю і сэнсам гісторыі.

У навагодні пераход стагоддзяў, гледзячы эўрапейскі тэлевізійны эфір, назіраючы калейдаскоп больш паўсотні нацыянальных праграмаў, нельга збавіцца ад ўражаньня, што бачыш адну вялікую забаўляльную праграму шумнай духоўнай пустэчы, робленай весялосьці і агрэсіўнай бессаромнасьці. Моляцца ў Ватыкане, а вакол — мітусіцца Вальпургіева ноч Эўропы.

Гэта ў эфіры. І гэта адбітак часу, адлюстраваньне ўзроўню тых людзей, тых пластоў, што ўсплылі на паверхню культуры.

Чаму гэтак адбываецца — варта задумацца разам. Чалавек жывы ня можа ня думаць пра сэнс існаваньня. Але цяпер, на пераломе стагоддзяў, трэба азірнуцца ў глыбіню, каб убачыць, што было.

XX-е стагоддзе было стагоддзем тэхнічнага разьвіцьця. Кардынальна зьмянілася хуткасьць і ўзровень камунікацыяў між людзьмі і адпаведна — ўяўленьне пра прастору. Чалавек, сьведама ці нясьведама, стаў адчуваць сябе істотай не ў бясконцым нязьведаным сьвеце, як раней, а жыхаром на круглай Зямлі ў замкнутай прасторы. Разьвіцьцё хуткасьці камунікацыяў пашырыла гарызонты, але абмежавала сьвет. Хуткасьць не дала эканоміі ў часе, але паскорыла рытм. Людзі сталі больш ведаць пра сьвет, але ці сталі яны лепшымі?

У сфэры грамадзкіх дачыненьняў XX-е стагоддзе запомнілася ў гісторыі як час крывавых сусьветных войнаў, масавага зьнішчэньня людзей, таталітарных ідэалёгіяў і асэнсаванай, знарочыстай, фантастычнай хлусьні.

Для нас, беларусаў, гэтыя сто гадоў былі драматычным выпрабаваньнем, поўным сьмерцяў і пакутаў. Тым ня менш, мінулае стагоддзе сталася для нас больш выніковым, чым XIX-е, калі ўсе нашыя паўстаньні і войны з Расеяй не далі выніку.

У XX-м стагоддзі была сьцьверджана Беларуская Нацыянальная Ідэя, адроджана Беларуская Дзяржава і аб'яўлена яе Незалежнасьць.

Сэнс гістарычнага існаваньня кожнага народу — у стварэньні нацыянальнай дзяржавы і разьвіцьці нацыянальнай культуры. Вось чаму для беларусаў найважнейшымі былі падзеі пачатку і канца XX-га стагоддзя. А менавіта: 1918 год, калі была створаная і аб'яўленая незалежнай Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), і 1991 год, калі была зьліквідаваная маскоўская ўлада КПСС і адноўленая незалежнасьць Беларусі.

Гэтыя падзеі ёсьць для нас найважнейшым вынікам XX-га стагоддзя, які ўдалося дасягнуць велізарнымі высілкамі, ахвярнасьцю, працай і ахвярамі прадстаўнікоў Беларускага нацыянальнага Адраджэньня.

Азіраючыся ўсьлед стагоддзю, зададзімся пытаньнем: чаго нам, беларусам, не хапіла, каб давесьці ўсё да канца? Шмат чаго неставала, але найперш — не хапіла нам ***нацыянальнай салідарнасьці***.

Курапацкі крыж. Беларускі помнік XX-га стагоддзя.

Беларусы, асабліва перад аблічам чужых нашаму народу сілаў, павінны падтрымліваць адзін аднаго. Беларус беларусу мусіць спрыяць і шанаваць усё беларускае. Гэта абавязковая ўмова беларускай свабоды. Інакш нават геніяльныя справы вялікіх беларусаў будуць змарнаваныя, стануць ня чыньнікам перамогі, а толькі чарговай ахвярай на алтар нацыянальнага вызваленьня.

Вядома, што нельга здабыць свабоду без ахвяраў. Але свабода не дасягаецца толькі ахвярамі.

Дзень у дзень крочыць ужо па нашай зямлі XXI-е стагоддзе. Мы перайшлі ў яго з усімі нашымі турботамі, трывогамі і хваляваньнямі за наш лёс. Нашым людзям існуецца цяпер так цяжка, гэтак бедна і непрытульна, што беларусы ня могуць не задумвацца: а што чакае іх у будучыні. Шмат хто па звычцы спадзяецца, што нешта здарыцца, што нехта дапаможа, што неяк жа ж будзе. Але гэта памылковыя ўяўленьні. Бо ўсё залежыць не ад некага, а толькі ад нас, беларусаў, і толькі мы можам самы сабе дапамагчы, і толькі так будзе, як мы зробім.

Самае вялікае выпрабаваньне, якое ўжо нясе нам XXI-е стагоддзе, — і ня толькі нам, але і ўсёй Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе, — гэта разбурэньне маралі і маральны рэгрэс. Д'ябальская атака брыдоты і паскудства ідзе на Беларусь з двух бакоў: з кагэбоўскай Расеі і зь лібэральнай Эўропы.

Гэта комплексная атака, але калі вылучыць галоўнае, то самай страшнай заганай, што ідзе з Усходу, гэта ёсьць алькагалізм, п'янства, інсьпіраванае ў нацыянальным маштабе.

На Беларусі п'янства рэзка пашырылася за апошнія 5-6 гадоў. У канцы XX-га стагоддзя на Беларусі, амаль у паўтары разы перавышаны дапушчальны парог спажываньня алькаголю на кожнага жыхара краіны, пасьля чаго пачынаецца незваротны працэс выраджэньня этнасу.

Для параўнаньня: у Беларусі спажываецца больш за 11 літраў алькаголю ў год на аднаго жыхара. У Расеі — 14 літраў, на Ўкраіне — 4,5 літра. Навуковая і міжнародна прынятая норма алькагольнага парогу, пасьля якога пачынаецца дэградацыя этнічнай супольнасьці, складае 8 літраў.

Абсалютным чэмпіёнам па алькагольным спойваньні і выраджэньні заўсёды была Расея. Цяпер Беларусь набліжаецца да Расеі. Тое, што здарылася зь Беларусьсю ў канцы XX-га стагоддзя і набірае моцы далей — гэта ёсьць этнічная і народная алькагольная катастрофа. Патрэбныя ввельмі хуткія, радыкальныя і эфэктыўныя захады, разьлічаныя на доўгі час (адно-два пакаленьні), каб гэты працэс затармазіць.

Самай небясьпечнай заганай, што шчэміцца да нас з брусэльскай Эўропы, — гэта ўзаконьваньне чалавечай брыдоты на падставе фальшыва ўспрынятай лібэральнай канцэпцыі правоў чалавека. Ня можа быць свабоды граху. Чалавек ня мае права на разбэшчанасьць, на самазьнішчэньне (хоць і здольны гэта рабіць). Грамадзтва не павінна такое цярпець.

Дзе ж компас, дзе ж той справядлівы шлях, дзе зорка, якая павінна сьвяціць беларусам у XXI-м стагоддзі над дарогай, што вядзе ў Беларускі Храм?

Я мяркую, што ***Беларусь павінна вярнуцца да Хрысьціянства***. Беларусь у XXI-м стагоддзі мусіць адрадзіцца як Хрысьціянская краіна. Беларуская ідэя, абапертая на традыцыі беларускага Хрысьціянства — гэта шлях для нас найбольш унівэрсальны і правільны, бо толькі такая сьветлая і магутная ідэя магла б дапамагчы беларусам вылезьці з глыбокай ямы, у якую ўпіхнулі наш народ ворагі беларушчыны.

У нашай гісторыі ёсьць шмат дзівоснага і містычнага. Дзівосным было нашае ўстаньне з попелу ў канцы 80-х гадоў. Дзівосным было вяртаньне незалежнасьці ў 1991-м годзе вельмі малымі адраджэнцкімі сіламі ў Вярхоўным Савеце. Дзіўнымі здаюцца цяпер рабскія пакуты народа, структура інтэлектуальных магчымасьцяў якога ў чатыры разы перавышае сярэднеэўрапэйскі ўзровень. Дзіўным здаецца паніжэньне нашчадкаў тых, якія ніколі не прыгняталі іншыя народы і нават палонным іншаверцам давалі волю, зямлю і шляхецтва. Дзіўным ёсьць зьнеаважэньне народа, які трымае ў руках незвычайны сымвал — ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг Ісуса Хрыста***. Гэты сьцяг у рэальнасьці

(Фота В. Фядосенкі)

Сьцягі над Сьвіслаччу

(і ў тым, што ён сымвалізуе) зьяўляецца галоўнай мэтай варожага перасьледу беларусаў і галоўным сэнсам беларускага змаганьня.

Магчыма, што Беларусь і яе народ чакае незвычайная будучыня і сьветлая доля. Магчыма, беларускім прарокам у XXI-м стагоддзі адкрыецца яе сэнс. Сёньня ж ужо відавочна і ўсім зразумела: ніколі беларускія рыцары Сьцяга ня выпусьцяць з рук наш сьвяты *Бел-Чырвона-Белы*, наш адвечны беларускі сымвал — *Сьцяг Беларускай Нацыі.*

4 студзеня 2001 г., Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №1(31); „Пагоня", — 2001, 11 студзеня; „Народная Воля", — 2001, 12 студзеня).

БЕЛАРУСКІ СЬЦЯГ

Давайце пагаворым пра нацыянальны сьцяг. Гэта значыць, пра рэчы відавочныя і таемныя, рэальныя і містычныя.

Нацыянальны сьцяг — гэта каляровае палатно, як правіла, прастакутнага памеру, якое зьяўляецца сымвалам нацыі. Бываюць людзі, якіх сьцяг нічым ня ўзрушвае: палатно як палатно. Іншыя — дзеля сьцяга ахвяруюцца жыцьцём, адносяцца да яго з піэтэтам і з найвялікшай павагай.

Адносіны да сьцяга паказваюць на ўзровень нацыянальнай кансалідацыі і нацыянальнай сьведамасьці народа. І што важна: тут існуе ўзаемаабарачальная сувязь. Народ падтрымлівае сьцяг, а сузіраньне сьцяга — кансалідуе народ.

Успомнім нядаўняе мінулае, як адносіліся да беларускага нацыянальнага сьцяга на Беларусі функцыянэры КПСС. Калі ўжо перад канцом Савецкага Саюзу камуністы ня мелі моцы, яны стараліся ўсімі сіламі прынізіць, зьменшыць значэньне сьцяга. „Ім бы толькі флажкі", — крычалі яны ў Вярхоўным Савеце на Народны Фронт. Маўляў, ёсьць больш важныя рэчы, чым сьцяг.

Але як толькі расейскаму КГБ удалося прывесьці на прэзыдэнцкі пасад Лукашэнку, першае, з чаго яны пачалі — гэта зь ліквідацыі беларускага дзяржаўнага сьцяга. Пры гэтым, не лічыліся ні зь якімі выдаткамі.

У барацьбе за беларускі сьцяг цяперашняя рэчаіснасьць нарадзіла сапраўдных герояў. Паглядзім на подзьвігі няўлоўнага МІРОНА, які ўжо некалькі гадоў вывешвае Бел-Чырвона-Белы Сьцяг на самых высокіх і недаступных месцах, і заўсёды пакідае пры гэтым запіскі патрыятычнага зьместу.

Апошні подзьвіг Мірона, які ён ажыцьцявіў на другі Дзень Нараджэньня Хрыстовага 26 сьнежня мінулага году ў Віцебску, уражвае сваёй сьмеласьцю. Мірон сярод белага дня вывешаў беларускі сьцяг над горадам на 110-мэтровай вышыні (на коміне гарадзкой цеплацэнтралі). Убраны ў барвовы плашч, гэты рыцар беларускага сьцяга працаваў на вышыні, на марозным ветры амаль пяць гадзінаў, дзёрзка, навідавоку ўсяго горада. Унізе яго ўжо чакала міліцэйская пастка, але Мірон, дзякуючы беларускай кемлівасьці, спусьціўся з гары і здолеў не патрапіць у рукі ахоўнікаў. Ён зноў няўлоўна зьнік, не адкрыўшы свой твар.

Я мяркую, што неўзабаве, пасьля таго, як будзе скінуты ў Беларусі прамаскоўскі рэжым, — урачыстае ўздыманьне беларускага сьцягу над парлямантам і Домам ураду пад велічныя гукі беларускага духоўнага гімну будзе даручана герою беларускага сьцяга — Мірону, які ў гэты момант адкрые сваё аблічча.

Прыгледзімся да нашага сьцяга.

Ён заўсёды відаць здалёку як самая яркая зьява ў прасторы, якія б фарбы і аб'ёмы вакол ні былі. Гэта настолькі відавочна, што ўражвае.

Калі глядзець на наш сьцяг зблізку і асабліва, калі сьцягоў шмат і разьвіваюцца пад сонцам, — відовішча вельмі велічнае. Зьяўляецца ілюзія, што над сьцягамі і ў гушчы сьцягоў узьнікае канцэнтрацыя сьвятла. Гэтае месца ня проста самае сьветлае ў прасторы; ражаньне, што яно вылучае сьвятло. Прытым ілюзія вельмі моцная. Ніякія іншыя сьцягі зь іншымі прапорцыямі і спалучэньнямі колераў не набліжаюцца ў гэтым да эфэкту беларускага сьцяга.

Вельмі яркае таксама псіхалягічнае адчуваньне ад сузіраньня беларускіх сьцягоў. Гэта адчуваньне прыўзьнятай радасьці і надзвычайнай чыстасьці. Прытым ізноў жа — гэтае адчуваньне вельмі моцнае і аб'ектыўнае. Яго сьведама і падсьведама перажываюць усе людзі (прынамсі, пераважная большасьць).

Адразу скажу, што тут няма ніякай містыкі. Тут спрацоўваюць аб'ектыўныя законы ўспрыняцьця колераў, іхных прапорцыяў і камбінацыяў. У беларускім сьцягу ідэальна збалянсаваныя белы і чырвоны колеры. Знойдзена мера раўнавагі. Беларускі сьцяг візуальна гарманічны, бо чырвонае і белае ўраўнаважаны. Для раўнавагі гэтых колераў патрэбная якраз прапорцыя: адзін да двух.

Як прапорцыя колераў уплывае на гармонію цэласьці можна пераканацца, калі сузіраць сьцягі Інданэзіі і Польшчы, якія аднолькавыя — бела-чырвоныя (толькі іншы колерны парадак верху і нізу палатна). Тут уражаньне несімэтрычнай распалавіненасьці плошчы, ілюзія дысанансу, бо чырвонага шмат, і гэты колер выглядае цяжкім. У прапорцыі ж 1 : 2, як у беларускім сьцягу, чырвоны колер лёгкі, ён плыве, уецца, палымнее на белым, не цягне на дол, а нібы лунае ў белай прасторы. Тыя ж колеры, але ў розных прапорцыях, выклікаюць розны візуальны і псіхалягічны эфэкт.

Немалаважны і сутнасны выбар колеру. Самы яркі колер ёсьць белы, але ў рэальнасьці самым яркім колерам на Зямлі лічыцца жоўты (тут псіхалягічны эфэкт жоўтага сонца). Тым часам ніякі жоўты сьцяг і ніякая камбінацыя жоўтага зь белым, ці жоўтага з чырвоным ня будзе ярчэйшай і сьвятлейшай за беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг (я ўжо не кажу пра псіхалёгію ўспрыняцьця). Ня дасьць лепшага эфекту таксама толькі белы, ці тым больш — толькі чырвоны сьцяг.

Мастацтвазнаўцы і мастакі-калярысты ведаюць, што ёсьць колеры, якія сумяшчаюцца і гарманізуюцца, і колеры, якія не сумяшчаюцца і не гарманізуюцца. Напрыклад, зялёны і чырвоны колеры — несумяшчальныя, згарманізаваць іх разам практычна немагчыма. Тым часам зь белым можна сумясьціць і згарманізаваць любы колер.

На беларускім сьцягу згарманізаваны самы „гарачы" колер чырвонага, ці, як яшчэ кажуць, „цёплага" краю спэктара. Кожны колер, які бачны ў прыродзе, нясе аб'ектыўную псіхалягічную нагрузку і фактычна аднолькава псіхалягічна ўспрымаецца большасьцю людзей. Гэтая ж аб'ектыўная аснова псіхалягічнага ўспрыняцьця выяўляецца і ў камбінацыі колераў, якія мастак сумяшчае па законах эстэтыкі.

Гарманізацыя белага з чырвоным у прапорцыі 1 : 2 аблягчае цяжкую псіхалягічную актыўнасьць чырвані і на балянсе кантрасту актывізуе (высьвятляе) белы фон, ад чаго ўзьнікае ілюзія сьвятла і палымненьня ўсёй бел-чырвона-белай карціны.

Калі прааналізаваць гэтак усё да канца, то прыходзім да высновы, што ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг ёсьць ідэальным візуальным выяўленьнем гармоніі самых актыўных колераў — чырвонага і белага — і найвыразьнейшым выяўленьнем псіхалягічнага вобразу чыстасьці і радаснага ўздыму. Гэта оптымум ідэі радасьці і сьвятла і оптымум візуальнай яркасьці***.

Далей я буду гаварыць пра рэчы, набліжаныя да містыкі, над якімі нельга не задумацца.

Беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг вядомы яшчэ з сярэднявечча. У XV і XVI стагоддзях ён ужо лунае на піках беларускіх рыцараў.

Канцэпцыя гармоніі белага з чырвоным вядома на Беларусі з

(Фота З. Пазьняка)

Беларускія сьцягі ў Нью-Ёрку каля гмаху ААН.

глыбокай старажытнасьці, яшчэ з дапісьмовых часоў, і матэрыялізавалася ў адзеньні. Сутнасьць яе ў тым, што дзейнікамі выступалі толькі чырвоны і белы колеры, і спалучэньне іх не перакрочвала прапорцыі 1 : 2. Чырвоны колер быў акцэнтам, але не дамінаваў удзельна (гэта значыць, па плошчы запаўненьня). Нашыя старажытныя продкі адчувалі законы гармоніі.

У хрысьціянскай старажытнасьці склалася традыцыя сымвалізацыі прыходу Месіі. Гэта чырвоны крыж ці чырвоная паласа на белым фоне. Тут сымвалізацыя дарогі Боскага Духу, духоўнага шляху на чыстасьці стварэньня. Тут чырвоны, гарачы шлях Хрыстовай Веры і Любові праз вечнасьць сьветабудовы да вечнага Бога.

У сярэднявеччы шмат дзе на карцінах мастакоў можна было бачыць выяву Ісуса Хрыста зь Бел-Чырвона-Белай харугвай крыжа ці зь Бел-Чырвона-Белым Сьцягам у руцэ. Бел-Чырвона-Белы Сьцяг з чырвоным крыжам ці чырвонай паласой на карцінах сярэднявечча выступае як атрыбут Езуса, як яго Боскі знак і Боскі Сьцяг (П'ера дэла Францэска, Тржэбоньскі Майстар, ангельскія мініятуры 12-13 стагоддзяў і інш.)

З першага погляду відаць, што беларускі сьцяг вельмі просты. Шмат якія дзяржаўныя сьцягі на сьвеце у агульным супадаюць, паўтараюцца ў вобразе ці мадыфікуюць адзін аднаго. Нідзе і блізка не паўтараецца толькі беларускі сьцяг. Няма нават мадыфікацыяў. Некаторых беларусаў гэта здумляе. А можа, невыпадкова, што нацыя, якая стагоддзямі ўваскрасае ў пакутах і муках, мае сьцяг Ісуса Хрыста?

Але, пэўна ж, містыка тут ні пры чым: ці мала ёсьць пакутнікаў на сьвеце. І ўсё ж такі, і ўсё ж... Нічога не бывае бяз сэнсу.

Які сэнс вынікае з гісторыі нашага сьцяга?

Я задаваў гэтае пытаньне беларусам. Кожны нешта тлумачыў, і ніхто не адмаўляў эзатэрычнага зьместу. Адзін беларускі сьвятар у Амэрыцы сказаў мне: *„Беларускі народ ёсьць выбраным народам на Другое Прышэсьце. Толькі пра гэта ніхто ня будзе ведаць”.*

Такі вось апокрыф. Але калі так, то пра гэта ня мусіў бы ведаць таксама і сьвятар.

Відаць, нічога не парадзім мы з містыкай сьцяга. Але неабходна радзіць з рэчаіснасьцю. А рэчаіснасьць такая: ***пакуль ёсьць, лунае й жыве наш беларускі сьцяг — жыве і Беларусь. Шануйма ж яго і ўздымайма высока. Ён, найпрыгажэйшы на сьвеце, ёсьць увасабленьне нашай краіны, нашай народнай моцы і нашай веры. Ён сымвал нашай беларускай народнай вечнасьці***.

8 лютага 2001 г., Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №3(33); „Новы горад”, — 2001, сакавік, №1; „Народная Воля”,— 2001, 5 красавіка).

СТАРЫЯ ДАРОЖКІ

Людзі любяць размаўляць пра палітыку, крытыкаваць дзеяньні ўлады, стараюцца зразумець становішча і прычыны падзей. Тым часам шмат якія падзеі і зьявы маюць пастаянную тэндэнцыю і пастаянны характар пераменаў, паўтараюцца з году ў год і нават — зь веку ў век, існуюць стагоддзямі. Асабліва ў зьнешняй палітыцы, якая моцна ўплывае на ўнутранае наша жыцьцё.

Значыць, існуюць пастаянныя прычыны такіх тэндэнцыяў. Гэтыя прычыны абумоўленыя, перш за ўсё, балянсам сілаў і парадкам у сьвеце.

Тэндэнцыі сьветабудовы ў Эўропе не зьмяняюцца ўжо тысячы гадоў і ўзьніклі яшчэ за часы Рымскай імпэрыі. Яны выяўляліся ў сутыкненьні цывілізацыі і варвараў, пазьней — Захаду і Ўсходу, у супроцьстаяньні ўзаемных экспансіяў.

Тым часам парадак дачыненьняў зьмяняўся некалькі разоў за гісторыю, у залежнасьці ад разьмеркаваньня сілаў у гэтых тэндэнцыях.

У позьнім сярэднявеччы (а менавіта ў XIV-XVII стагоддзях, якія мы, беларусы, называем для сябе „Залатым векам") балянс тэндэнцыяў на Ўсходзе Эўропы у значнай ступені вызначаўся існаваньнем *Вялікага Княства Літоўскага* і пазьней — *Рэчы Паспалітай*.

Моцная славянская краіна распрасьціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора і трымала пад кантролем ўвесь Усход Эўропы. Вялікае Княства выконвала тут стабілізуючую ролю. Дзяржава ўзьнікла на старажытным міжморскім шляху і амартызавала дзьве ўзаемавыключаючыя экспансіі: цывілізацыйную з Захаду і варварскую — з Усходу.

Пасьля распаду Рымскай імпэрыі цывілізацыйную функцыю зьяднаньня Эўропы і пашырэньня яе на Ўсход узялі на сябе немцы. На Ўсходзе, пасьля распаду Залатой Арды, разбуральную варварскую экспансію на Захад пераняла Масковія.

На працягу стагоддзяў старажытная беларуская цывілізацыя трымала ўдары з Усходу і з Захаду, пільнуючы пэўны парадак у гэтай частцы Эўропы. Стабілізуючая роля нашай краіны, аднак, паступова малела, разам з заняпадам магутнасьці Вялікага Княства. Заключэньне Люблінскай Уніі з Польшчай і ўтварэньне Рэчы Паспалітай не ўратавала становішча, бо прывяло да аб'яднаньня нямецка-расейскіх інтарэсаў. Антаганісты з Захаду і з Усходу не хацелі існаваньня Рэчы Паспалітай, кожны імкнуўся ўступіць на тэрыторыю, што ляжала паміж інтарэсамі.

Менавіта немцы, ажыцьцяўляючы свае пляны, прычыніліся ў XVIII стагоддзі да арганізацыі і росту магутнасьці Расейскай імпэрыі. Лёс Рэчы Паспалітай быў вырашаны. У канцы XVIII стагоддзя яна перастала існаваць.

Адбылася кардынальная перамена становішча і парадку ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Становішча стала нестабільным, бо дзьве экспансійныя лініі адвечнага цывілізацыйнага канфлікту сустрэліся „твар у твар" і выйшлі на агульныя межы.

Глябальнае ваеннае сутыкненьне паміж імі стала непазьбежным, але адбылося яно толькі праз сто гадоў (у 1914-м), таму што спатрэбілася яшчэ сто гадоў, каб палітычна пераварыць Беларусь, Польшчу, Летуву і Ўкраіну, ды задушыць чатыры паўстаньні.

Пасьля сканчэньня 1-й Сусьветнай вайны міру фактычна не наступіла. Гэта была толькі перадышка, бо нестабільнае становішча ў Цэнтры і на Ўсходзе Эўропы, створанае пасьля разбораў Рэчы Паспалітай, яшчэ больш абвастрылася. Беларусь падзялілі, а з існаваньнем незалежнай Польшчы ніхто сур'ёзна не лічыўся. Немцы і рускія (то бо Гітлер і Сталін) праводзілі ўзгодненую палітыку.

У 1939 годзе яны зноў сумесна выйшлі „твар у твар" на лінію Керзона — часовы геапалітычны падзел. Вайна запалала ізноў.

Ялцінскі эўрапейскі парадак, які ўзьнік пасьля 2-й Сусьветнай вайны, гэта ёсьць той самы парадак, што стварылі пасьля разбораў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя, толькі папраўлены цяпер Злучанымі Штатамі Амэрыкі, якія ўзялі на сябе ролю стрымліваючага фактару.

У 1991 годзе, калі часткова распаўся Савецкі Саюз і аднавіліся незалежныя краіны Ўсходняй Эўропы, тады зьмянілася і пасьляялцінская сітуацыя, і ўпершыню за 200 гадоў гісторыі ўзьнікла магчымасьць аднавіць Усходнюю Эўропу паміж Балтыкай і Чорным морам як цывілізацыйны фактар, адрадзіць на новым, незалежным узроўні той, больш надзейны парадак, які існаваў два стагоддзі таму.

Але аказалася, што ня так гэта проста. Аказваецца, шмат каго ўзнэрвавала пэрспэктыва Балта-Чарнаморскага адзінства ў Эўропе. Аказалася, што зноў сталі супрацоўнічаць старыя сябры-ворагі немцы-рускія, зноў гандлююцца за Беларусь з Расеяй. А нядаўна нямецкі дыплямат у Беларусі Ганс-Георг Вік (былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны) так і заявіў у Беластоку, што нямецкая палітыка ў АБСЭ спрыяе ўключэньню Беларусі ў склад Расеі. Выяўляецца, што яны ўжо зноў таемна падзялілі Ўсходнюю Эўропу пад прыкрыцьцём размоваў аб „правах чалавека".

Яны зноў інтэгруюцца. На Ўсходзе — хочуць вялікадзяржаўнай Расеі; на Захадзе — аб'яднанай Эўропы. Хто хоча дамінаваць на Ўсходзе — зразумела. Хто ў Заходняй Эўропе — таксама зразумела. (Калі ня немцы, то Дойчэ Банк.)

Гэтак фармальныя абставіны і пэўныя расстаноўкі сілаў на старым кантыненце ўплываюць на „старыя дарожкі" старых дачыненьняў.

Мушу сказаць, што гэтая змора, гэты кашмар нямецка-рускай палітыкі ўжо стагоддзямі вісіць над Беларусяй і Польшчай. Сітуацыя, якая зноў адраджаецца цяпер, ужо (як мы бачылі) была ня раз і вядзе яна зноў да старога цывілізацыйнага канфлікту, разьвіцьцё якога можа рэальна пачацца, калі давядуць да інкарпарацыі Беларусі ў Расею.

Ведаючы правілы гісторыі і назіраючы цяперашнія працэсы ў нашай частцы сьвету, мы бяз цяжкасьці зразумеем, што Заходняя Эўропа — вельмі ненадзейны памочнік Беларусі ў яе беларускай нацыянальнай драме. Дамінацыя нямецкай палітыкі тут штораз павялічваецца, узаемадзеяньне Нямеччыны з Расеяй ёсьць гістарычна і сітуацыйна угрунтаванае, палягае на ўзаемных антаганізмах і агульных інтарэсах. Яны ўжо вызначаюць лёс Усходняй Эўропы: Беларусь — пад Расею, Польшчу — у Эўразьвяз.

Дзьве высновы напрошваюцца з таго, што ёсьць. Першая — гэта тое, што наша галоўнае спадзяваньне павінна быць спадзяваньнем на самых сябе. Наша сіла — у нас самых.

Другая выснова ў тым, што пэрспэктыва Беларусі зьлепшала б, калі б у новай расстаноўцы зьявілася трэцяя сіла. Сто гадоў таму не было такой сілы. Цяпер гэта можа быць Амэрыка.

Сёлета распачынаецца чарговая палітычная бітва за Беларусь*. У яе, магчыма, уключыцца і Амэрыка. Але ізноў жа, не забывайма: вырашае ні Амэрыка, ні Масква і ні Брусэль. ***Вырашае Беларусь і Беларускі Народ***.

Студзень, 2001 г., Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №2(32); „Народная Воля", — 2001, 15 лютага).

* Маюцца на ўвазе выбары прэзыдэнта ў Беларусі *(аўт.)*

ЭЛІТА

Задумваючыся над нашым беларускім цяперашнім існаваньнем, мы часта гаворым пра грамадзкія ды людзкія дачыненьні, пра плюсы і мінусы нашага нацыянальнага характару і заўважаем, што ёсьць у ім шмат тыпалягічнага, як у праявах высакароднага, так і адмоўнага кшталту. Тут вельмі істотна дайсьці да прычыны.

Мяне заўсёды ўзрушвала высакароднасьць беларускага характару ў спалучэньні са сьціпласьцю. Потым — велікадушнасьць. Гэтае рыцарства душы ёсьць спагада да чалавека, разуменьне яго патрэбаў, перажываньне несвайго болю. Рыцарствам напоўненая ўся наша гісторыя. Успомнім кап'ё Альгерда пад маскоўскай сьцяной. На пакаяньне — была літасьць, палонных вызвалялі, людзей не прадавалі. У беларусаў няма ксэнафобіі. Беларус унутрана паважае чужое жыцьцё і права чалавека быць іншым, непадобным на яго.

Адначасна мяне не перастаюць бянтэжыць якасьці іншага кшталту, якія, здавалася б, нельга вытлумачыць разумным абгрунтаваньнем. Гэта найперш — нейкае ірацыянальнае, але сьведамае адмаўленьне ад барацьбы. Калі беларус хоча нейкага агульнага дабра, у яго нестае рашучасьці змагацца з перашкодамі. Ён кажа, што трэба, каб было так і гэтак. Але калі яму прапанаваць: „давай зробім", ён адказвае: „Дык жа ж не дадуць", альбо: „Дык жа ж ня выбяруць", „Дык жа ж заб'юць", ці: „Нічога не атрымаецца", „Нічога ня будзе" і г.д.

Гэтае нявер'е ў свае сілы, нявер'е ў грамадзтва, гэтае ўцяканьне ад барацьбы, гэтае антырыцарства (бо рыцар мусіць змагацца са злом) характэрнае цяпер паўсюдна і, як ні дзіўна, найбольш у інтэлігентных, адукаваных вярхах грамадзтва. У ніжэйшых сацыяльных пластах гэтая пазыцыя даведзена да лягічнага завяршэньня і да абсурду і гучыць так: „Абы вайны не было". Альтэрнатыва паўстае сама сабой — цярпець. Цярпець зьдзекі, паскудства, прыгнёт, жаліцца — і зноў цярпець, пакуль не памром. Ужо ходзяць анэкдоты пра беларускае цярпеньне.

У чым жа прычына, што рыцарства суіснуе з пакорай злу, а псіхалёгія свабоды — з ідэалёгіяй нявольніцтва?

Справа ў тым, што, ў выніку акупацыяў і гістарычных прычын, быў зьнішчаны беларускі набілітэт і разбураная нацыянальная эліта грамадзтва. Паўнавартаснае нацыянальнае грамадзтва існуе ў суладдзі і дачыненьні сацыяльных структураў, якія твораць адзінае цэлае. ***У грамадзкай сістэме нацыі найважнейшымі ёсьць дачыненьні паміж масай і элітай, паміж народным стэрэатыпам і культурным аўтарытэтам. Эліта і аўтарытэт ёсьць важнейшымі дзейнікамі нацыянальнай культуры.*** Калі мы кажам, што для нармальнага разьвіцьця нацыі неабходная нацыянальная літаратура, тэатр ды школьніцтва, то не забывайма, што гэтыя найважнейшыя катэгорыі ёсьць вытворныя ад існаваньня і дзейнасьці нацыянальнай эліты. Эліта першасная. Спачатку мусяць быць людзі, якія народзяць ідэю і стануць яе ажыцьцяўляць.

Невыпадкова, што ўсе антыцывілізацыйныя і антычалавечыя агрэсіўныя сілы напрацягу ўсёй чалавечай гісторыі першым чынам стараліся вынішчыць эліту чужога ім народу. Пры гэтым людзей неабавязкова зьнішчалі фізічна, як гэта рабілі манголы ці расейцы-бальшавікі. Нацыянальных кіраўнікоў, асобаў заможных, разумных, таленавітых, здольных ды ўмелых, і нават проста

(Фота Г. Радзецкага)

Сьцяг Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне".

працавітых, стараліся запалохаць, падкупіць, навязаць фальшывыя ўяўленьні, завесьці ў тупік, на збочную дарогу дзейнасьці, ці проста забараніць тварыць і працаваць.

Народ рэалізуецца ў лепшых сваіх прадстаўніках. Таму страціўшы эліту — грамадзтва сьлепне і нямее.

Самым разбуральным вынікам рускай акупацыі (побач з паленьнем беларускіх кніг, бурэньнем беларускай архітэктуры, забаронай беларускай мовы і рэлігіі) сталася фізічнае і сацыяльнае зьнішчэньне беларускіх паноў і верхніх пластоў грамадзтва. ***На Беларусі была гвалтоўна перапынена элітарная традыцыя беларускай культуры.*** Спынілася яе сацыяльная рэпрадукцыя. Адбылася культурная катастрофа. Вялікі беларускі народ апусьцілі да ўзроўню этнічнага існаваньня, ператварылі ў мужыцкую нацыю.

(Фота З. Пазьняка)

Магіла Алеся Гаруна на Ракавецкіх могілках у Кракаве.

Новая беларуская эліта магла адрадзіцца толькі з сялянаў. Гэта разумелі ўсе нешматлікія шляхецкія рыцары духу, ад Дуніна-Марцінкевіча ды Багушэвіча да Янкі Купалы. Яны зьярталіся да мужыка, узвышалі яго, падбадзёрвалі, маліліся на яго, спадзяваліся і марылі, што паўстане нацыянальны геній з сялянскага народу.

Што з гэтага атрымалася — вядома. Новая беларуская эліта сапраўды адрадзілася з сялянаў і тут жа была выразаная, выстраляная ў 30-х, згноеная ў сталінскіх лягерах разам з сялянамі.

Пасьляваенныя інтэлектуальныя і сацыяльныя беларускія вярхі ўтвараліся ўжо пераважна з калгасьнікаў. І толькі нязначная іх частка (дакладней — доля працэнта) сфармавала новую нацыянальную эліту Беларусі.

Пасьляваенная беларуская эліта ўзьнікала ў вакууме разбураных традыцыяў. Яе цяперашнія прадстаўнікі валодаюць ведамі, навуковымі ступенямі ды пасадамі, яны любяць Беларусь, але нават будучы неардынарнымі спэцыялістамі, нясуць у сабе вясковую мэнтальнасьць шэрага чалавека, яго неактыўнасьць, яго задаволенасьць мінімумам, яго інфантыльныя спадзяваньні на некага. Адсюль — гэтае нярыцарскае: „Дык жа не дазволяць" і „Нічога ня будзе", — адмаўленьне ад барацьбы.

Гістарычная практыка балгараў, краінаў Балтыі ды іншых народаў, якія фармавалі новыя эліты нават на пустым месцы, даказала, што становішча паляпшаецца пры нармальных варунках ва ўмовах незалежнай нацыянальнай дзяржавы напрацягу аднаго-двух пакаленьняў. Лёс Беларусі горшы. Таму нашае змаганьне доўжыцца ўжо 200 гадоў, і цяпер яно найцяжэйшае, бо ў адзіночку імкнемся пазбавіцца з магільных абдымкаў паміраючай імпэрыі.

Заканчваючы развагі пра беларускае грамадзтва, хачу спаслацца на каштоўны вопыт гісторыі і думкі вялікіх беларусаў.

Максім Багдановіч, абагульняючы ўяўленьні народнікаў, пісаў, што інтэлігенцыя гэта ёсьць тыя людзі, якія валодаюць ведамі і выкарыстоўваюць іх дзеля дабра народу на карысьць грамадзтва. Інтэлектуальная эліта народу павінна спрыяць народнаму дабру і служыць яго памнажэньню.

Раней прадстаўнікі эліты адасаблялі сябе ад народа і называлі народам толькі ніжнія, працоўныя пласты грамадзтва, масы простых людзей. Гэтае архаічнае разуменьне можна напаткаць яшчэ і цяпер, калі новая эліта, што выйшла з калгаснай вёскі, у роспачы шукае вінаватых, абзывае беларускіх людзей дурнымі, дэбільнымі, здраднікамі ды халуямі за тое, што яны быццам бы не разумеюць яе сьветлых апазыцыйных памкненьняў.

Гэта вялікая памылка. ***Народ нельга абзываць.*** Ад гэтага ён не палепшае. І за абзывальшчыкамі — ня пойдзе. ***Народ — гэта ўсе мы, усе беларусы.***

Стагоддзямі простыя людзі назіралі нацыянальную здраду ў вярхах. Ня ўнізе выракаліся беларускае мовы, а наверсе. І калі зьнізу беларус прабіваўся ў гару, то найчасьцей там, уверсе, ён выракаўся ўсяго свайго, а часам нават краю і родных бацькоў.

Ці ж мог просты народ, сьведама і падсьведама, тым давяраць, што ўгары?

Так пад стагоддзямі няволі і прыгнёту ўтварылася заломнае кола здрады, якое можна разарваць толькі любоўю, дабром, працай на карысьць усіх беларусаў, і толькі ў свабодзе, толькі ў вольнай незалежнай краіне. Бо не разьвіваюцца людзі ў няволі.

18 студзеня 2001 г., Варшава.

(„Народная Воля",— 2001, 24 студзеня).

СВАБОДА

Воля, свабода... Словы амаль магічныя. Яны неяк па-асабліваму ўспрымаюцца. У мяне слова „свабода" выклікае ўяўленьне шырокага сьветлага прастору, дзе вее цёплы лагодны вецер. Несвабода асацыюецца зь нечым замкнутым, прыгнечаным і абмежаваным, без даляглядаў і пераменаў.

Праявы несвабоды я назіраў з самага раньняга дзяцінства, тады, калі пачалася савецкая калектывізацыя. Пад акупацыяй воля не існуе. Беларус быў бяспраўны. Расейцы зьдзекаваліся з нашых сялянаў, як хацелі. Гэтыя карціны зьдзеку бальшавікоў над людзьмі мне і цяпер стаяць у вачах. Сам жа я непасрэдна сутыкнуўся з несвабодай ужо тады, калі асэнсоўваў свабоду як сваё і наша агульнае беларускае права (а не як нейкае маё хаценьне).

Памятаю, калі я яшчэ вучыўся ў 9-м клясе ў школе, прыйшоў да нас у керзавых ботах дырэктар-расеец і сказаў, што з наступнага дня ён будзе выкладаць у нас гісторыю па-руску, дык каб мы яму і адказвалі па-руску.



(Фота З. Пазьняка)

Тады мы цэлым клясам пастанавілі, што па-руску яму адказваць ня будзем. Кірзач ставіў нам усім за гэта „калы" і „двойкі". Праз нейкі час я ад імя кляса запатрабаваў, каб ён спыніў свой экспэрымэнт і стаў нам чытаць лекцыі на нармальнай мове. Дырэктар спасылаўся на Леніна, маўляў, Ленін гаварыў па-руску. „Але вы ня Ленін, — сказалі мы дырэктару, — вось калі да нас прыйдзе Ленін, тады мы зь ім і пагаворым."

Праз нейкі час у нас зьявіўся новы настаўнік гісторыі і, як ні ў чым ні бывала, пачаў весьці заняткі па-беларуску.

Гэта была наша школьная перамога, бяз крыку і шпурляньня чарнілак у непрыяцеля. Мяне гэта ўмацавала тады ў думцы, што толькі *той несвабодны, хто не змагаецца за свабоду*. Свабода сама не зьяўляецца. За яе трэба змагацца, а потым — абараняць.

* * *

Дэфініцыя свабоды ўмяшчаецца ў тры словы. Свабода гэта ёсьць ***магчымасьць тварыць дабро***.

Пра свабоду мы гаворым толькі тады, калі ***існуе*** такая магчымасьць. Калі такой магчымасьці няма — мы кажам, што ***няма*** свабоды.

Калі ж свабода выкарыстоўваецца на зло — яна ператвараецца ў несвабоду. Тады чалавек альбо робіцца нявольнікам сваіх страсьцяў, злых думак і паводзінаў, альбо, ў выпадку антысацыяльных дзеяньняў, трапляе ў турму і траціць свабоду ў літаральным, фізічным сэнсе. Прытым нікому не прыходзіць у галаву змагацца за свабоду крымінальнікаў, гвалтаўнікоў ды забойцаў. Наадварот, патрабуюць абмежаваць іхнюю свабоду.

Істотна зазначыць, што свабода ёсьць ***маральная катэгорыя***. Яе адлюстраваньне ў канкрэтных каштоўнасьцях залежыць ад маралі і ўзроўню культуры грамадзтва. Тым часам гэта ёсьць катэгорыя ***аб'ектыўная***. Рэлятывісцкі падыход тут памылковы і прыводзіць да зьнішчэньня свабоды. Дадам яшчэ, што ў філясофскім сэнсе, свабода — гэта ***магчымасьць вечнага разьвіцьця да ідэалу***.

Свабода зьвязана з сьветапогляднай і маральнай арыентацыяй чалавека. Таму дэкляраваньне барацьбы за свабоду і сама барацьба за свабоду яшчэ мала што тлумачаць і вымагаюць канкрэтызацыі — у чым справа. Часта выяўляецца, што некаторыя людзі, якія змагаюцца за свабоду, на справе маюць на ўвазе толькі свае інтарэсы, прытым даволі эгаістычныя, суб'ектыўныя і заганныя. Цяпер, у час усеагульнага крызісу дэмакратыі, мы бачым, як нарастае агрэсіўнасьць сацыяльнай цемры ў грамадзтве. ***Зло змагаецца за свабоду***. Масы цёмных суб'ектаў у розных краінах патрабуюць легалізацыі наркотыкаў, свабоды прастытуцыі, распусных палавых дачыненьняў, ліквідацыі інстытуту сям'і, свабоды абортаў і г.д.

Шматаблічная катэгорыя свабоды патрабуе, перш за ўсё, дакладнай кадэфікацыі ў праве і выразнай вызначальнасьці ў сістэме маральных каштоўнасьцяў грамадзтва. Агульнасьць і расплывістасьць праўных фармулёвак свабоды можа стаць прычынай апраўданьня абсурду і несвабоды чалавека.

Рэкардсмэнам такога абсурду зьяўляецца якраз „свабодная" Амэрыка. Тыповы прыклад. У Нью-Ёрку ўдарыў мароз. Гэта вялікая пагроза для бяздомных, апушчаных людзей і наркаманаў, якія начуюць на вуліцах. Паліцэйскі разбудзіў бяздомную жанчыну-наркаманку, што ляжала пад сьцяной, і, ня гледзячы на яе супраціў, завёў у цёплую станцыю мэтро, каб яна там пераначавала і не замерзла. Праз нейкі час паліцэйскага пацягнулі ў суд і паліцэйскае ўпраўленьне было аштрафаванае на 500 тысячаў даляраў за парушэньне правоў наркаманкі ляжаць на вуліцы і дзе яна хоча. Паліцэйскі, згодна азначэньня суда, парушыў фундамэнтальнае права асобы — яе свабоду.

Некаторыя амэрыканцы нават з гонарам расказвалі мне пра гэта — во якая ў нас свабода. На самай справе тут звычайны (а ў нашым разуменьні — шарлатанскі) амэрыканскі бізнэс. Знайшоўся нікому не вядомы адвакат, які падгаварыў бадзяжку зьвярнуцца ў суд і, карыстаючыся агульнасьцю вызначэньня заканадаўства і

фармалізацыяй мысьленьня суддзяў (такое магчыма толькі ў Амэрыцы), выйграў працэс „абароны свабоды”.

Адвакат такім чынам зрабіў сабе бясплатную рэкляму (бо абсурдальнасьць падзеі прыцягнула ўвагу друку) і ў дадатак яшчэ зарабіў грошы (звычайна, ад 25 да 50 адсоткаў ад сумы „судовага выйгрышу”, гэта значыць, штрафу).

Гэта вельмі тыповы для Амэрыкі прыклад, дзе бог — даляр, а свабода — сродак бізнэсу. Ні адваката, ні суддзяў, ні журналістаў, ні разьзявакаў, што цікавіліся зьявай, не абходзіла жыцьцё бадзяжкі. Яны не асэнсоўвалі нават фальшывасьці сваёй пазыцыі. Адзіным чалавекам у гэтай гісторыі, які меў жаласьць у сэрцы і цаніў жыцьцё іншага чалавека як найвялікшую каштоўнасьць, быў амэрыканскі паліцэйскі, якога пакаралі.

* * *

Свабода — гэта ўнівэрсальны прынцып Сусьвету як Боскага стварэньня, часткай якога ёсьць свабодная воля чалавека.

У сацыяльным грамадзтве абсалютны, унівэрсальны сусьветны прынцып свабоды ўзаемазьвязаны з маральнымі калізіямі духоўнага разьвіцьця чалавецтва. Гэтым абумоўлена тое, што свабода ў цывілізаваным сацыяльным грамадзтве ёсьць катэгорыяй выбару і не зьяўляецца найвышэйшай і абсалютнай каштоўнасьцю. Найвялікшымі каштоўнасьцямі ёсьць Бог, жыцьцё чалавека і жыцьцё народа. Там, дзе свабода ўступае ў канфлікт з гэтымі каштоўнасьцямі — там робіцца выбар. Ён можа быць розным. Гледзячы якія сілы, якія ўзроўні задзейнічаныя ў супроцьстаяньні.

Глыбінная сутнасьць канфлікту змаганьня за свабоду выяўляецца ў пытаньні: ці можа існаваць ***свабода ўсяго?*** (А гэта значыць — і свабода зла.) У метафізічным сэнсе, які апэрыруе *вечнаснымі катэгорыямі*, такое становішча прызнаецца. (Бог даў свабоду Сатане. Але на пэўны час. Пакуль колькасьць упалых анёлаў не заменіцца адпаведнай колькасьцю справядлівых людзей. У гэтым — сэнс духоўнай гісторыі чалавецтва і зьмест барацьбы дабра са злом на Зямлі.)

Але сацыяльная практыка *дачаснага сьвету* (і дачаснага жыцьця) паказвае, што ў соцыюме не павінна быць свабоды злу, бо спыняецца духоўнае разьвіцьцё. „Не”, — гавораць злу свабодныя людзі. „Так”,— кажуць тыя, што хочуць іншай свабоды. „Так”, — кажуць лібэральныя заканадаўцы, якія лічаць, што прынцып свабоды павінен быць роўным для ўсіх: і для мільярдэра, які лётае зь Нью-Ёрка на Канкордзе паабедаць у парыжскі рэстаран (тры гадзіны лёту, 18 тысячаў даляраў туды й назад), і для бадзяжкі, што мае права замерзнуць на вуліцы, і для верных хрысьціянаў, што жывуць па запаведзях, і для дэградаванага збачэнца, што ўступае ў палавыя акты з жывёлай ці з сабе падобным (і, дарэчы, знаходзіцца ў Амэрыцы пад асобай аховай закону; гэта тут называецца „сэксменшасьць”).

Лібэралы глядзяць на свабоду, як той рускі Іван на агурковае поле, які садзіў агуркі, але ніколі іх не палоў. У выніку — замест агуркоў выраслі чартапалох ды пустазельле. Затое — свабода: расьце, што хоча. Хоць вядома, што культура пачынаецца з абмежаваньня прыроднай свабоды (стыхіі), з абмежаваньня несвабоды (г.зн. разбуральнай сілы).

Праклямацыя ў дэмакратычным грамадзтве свабоды без берагоў, „свабоды ўсяго” заўсёды ёсьць маніфэстацыяй заганнай цемры, патрабаваньнем свабоды злу, імкненьнем да легалізацыі чалавечай нізасьці.

Часта прыходзіцца чытаць, як у Нью-Ёрку злавілі тую ці іншую банду маладзёнаў у час нападу на краму. Калі паліцыя іх хапае, яны, звычайна, абураюцца, што парушаюць іхныя чалавечыя правы і што гэта дыскрымінацыя, таму што яны чорныя. Такая рэакцыя сярод злачынцаў вельмі распаўсюджаная. Яны шчыра думаюць, што іх заціскаюць, бо ў Гарлеме яны вырасьлі „абсалютна свабоднымі”.

* * *

У цэлым, аднак, свабода ў Амэрыцы добра рэглямантаваная і ўлічвае інтарэсы чалавека, бадай, як нідзе. Выдаткі, кур’ёзы, наступ зла ды абсурд, якія пашыраецца, зьвязаны, перш за ўсё, з актывізацыяй левых ва ўсім сьвеце і лібэралаў на Захадзе, пасьля распаду сістэмы савецкага таталітарызму.

У заходнім грамадзтве зьнік страх перад камуністычным варварствам, і людзі расслабіліся, страцілі пільнасьць, сталі больш спакойна глядзець на сваіх левых сацыяльных і маральных экстрэмістаў, якія тут жа перайшлі ў наступ і ўжо шмат чаго дамагліся, і нават шмат дзе захапілі ўладу.

Выглядае парадаксальным, што маральны крызіс заходняй дэмакратыі і крызіс свабоды супаў па часе з крахам савецкага камунізму і таталітарнай сістэмы сацыялізму ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе. Захад, магчыма, з цягам часу пераадолее гэты крызіс. Але для нас, для беларусаў, якія змагаюцца яшчэ зь мінулым днём — з рускім каляніялізмам у кагэбоўскай упакоўцы, — для нас важна зразумець, што каштоўнасьці дэмакратыі і свабоды, якія вязуць да нас з Захаду, гэта ў значнай ступені ***— лібэральны сурагат у дэмакратычнай абгортцы***. Ім, дэмакратычным лібэралам, важней узгадаваць тут, у нас, на Беларусі, сваіх гамасэксуалістаў ды фэміністак, ды экспартаваць на Беларусь адкіды сваёй культуры, чым сапраўды дапамагчы нам, беларусам, збавіцца ад расейскай каляніяльнай агрэсіі, абараніць беларускую мову ад зьдзеку і вынішчэньня, вярнуць беларускія школы і беларускую асьвету, умацаваць беларускую незалежнасьць і г.д. Іх не цікавяць праблемы нашага нацыянальнага выжываньня. Ім абходзяць, перш за ўсё, свае лібэральныя інтарэсы.

Пад гэтыя свае абмежаваныя паняцьці яны даюць невялікія грошы ды гранты бедным беларусам і плодзяць апазыцыйны пустацьвет, балбатуноў за дэмакратыю без суверэнітэту.

Менавіта гэтакая заходняя лібэральная „публіка” прычынілася да спробы зьнішчыць *Беларускі Народны Фронт* і расфармаваць яго ў „дэмакратычную апазыцыю” (у „балота”). З гэтага, аднак, нічога не атрымалася, бо мы ўжо ведаем іхныя норавы і іхныя справы.

* * *

Для нас, беларусаў, свабода сёньня абазначае сьцісла канкрэтную і практычную задачу. Мы павінны, перш за ўсё, *збавіцца ад каляніяльнага прамаскоўскага рэжыму ўлады, спыніць агрэсію расейскай каляніяльнай палітыкі і гарантаваць бясьпеку і незьнішчальнасьць дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі*.

Дзеля гэтага мы павінны стварыць нацыянальнае кіраўніцтва краінай. Беларусяй павінны кіраваць: Беларускі нацыянальны ўрад, Беларускі нацыянальны парлямант і Беларускі нацыянальны прэзыдэнт. Беларусяй павінны кіраваць беларусы, а не расейцы, не расейскія генэралы і не расейская каляніяльная адміністрацыя.

Пра свабоду можна казаць толькі тады, калі мы будзем гаспадарамі ў сваім доме. Толькі тады — калі мы, беларусы, самы, як мы таго захочам, — будзем кіраваць і гаспадарыць у нашай Беларускай дзяржаве. І ўжо маючы такую свабоду, мы ніколі не скарыстаем яе на зло. ***Наша свабода стане для нашага народа Боскім стварэньнем шчасьця нашых людзей.*** І тут ужо нам трэба будзе пастарацца, каб не рабіць так, як заходнія лібэралы, і ня ўкінуць Сьвятую Свабоду ў гразь.

5 траўня 2001 г., Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №6(36); „Народная Воля”, — 2001, 1 чэрвеня).

ТЭЛЕВІЗАР

Наш сьвет кардынальна перамяніўся за апошнія 40 гадоў. Нельга сказаць, каб зьявіліся іншыя грамадзкія і духоўныя каштоўнасьці, але ўзьнікла шмат чаго новага. Зьмяніліся магчымасьці чалавека і вельмі рэзка. Кардынальныя перамены зьвязаныя, перш за ўсё, з інфармацыяй і камунікацыяй. Перамены настолькі радыкальныя, што яны паўплывалі на ўсё грамадзтва, на традыцыі дачыненьняў паміж людзьмі, паставілі пад сумненьне адстояныя паняцьці.

У 50-х гадах шырока зьявілася тэлебачаньне. Праз кароткі час яно пранікла ў кожны дом. Суседзі абмежавалі непасрэдныя кантакты, перасталі хадзіць адзін да аднаго на размовы, бо кожны меў ілюзію субяседніка (тэлевізар) у сваім памяшканьні.

Ніколі яшчэ людзі не валодалі такім масавым і эфэктыўным ***сродкам ўзьдзеяньня*** на сьвядомасьць, розум і пачуцьці чалавека. Інфармацыя ў сістэме ТБ, сьведама ці нясьведама, была падпарадкаваная якраз прынцыпу ***ўзьдзеяньня***, незалежна ад таго, у чыіх руках знаходзілася надайная функцыя.

Уплыў на падсьведамасьць ёсьць галоўная адметнасьць тэлебачаньня, чаго ня мае ў такой ступені ні радыё, ні друк, ні нават кіно, пра якое У.Ленін (які, па яго ўласным прызнаньні, нічога не разумеў у мастацтве) казаў, што для іх (для бальшавікоў) „з усіх мастацтваў галоўным зьяўляецца кіно”.

У Савецкім Саюзе ўзьдзеяньне тэлебачаньня абмяжоўвалася ў асноўным ідэалягічнай сфэрай і прасеянай інфармацыяй. Гэта было даволі нуднае тэлебачаньне, і савецкі чалавек глядзеў у ім у асноўным „апошнія паведамленьні”, кінафільмы, спартыўныя ды забаўляльныя перадачы. Тым часам, дзякуючы якраз пасьлядоўнаму дзяржаўна-партыйнаму кантролю, на экраны не пранікала брыдота, паказ гвалту, збачэнстваў, крывавых жорсткасьцяў, распусты і паскудства творчасьці разбэшчаных людзей. (Зрэшты, у СССР не існавала індустрыі такога „мастацтва”). Савецкае тэлебачаньне мела значна меншы разбуральны ўплыў на маральнасьць асобы, чым цяперашняе тэлебачаньне ў Расеі, і асабліва на Захадзе — у Эўропе і ЗША.

Узрастаньне разбуральнага ўзьдзеяньня тэлебачаньня ў сьвеце спалучана з агульным маральным крызісам дэмакратыі, які пачаўся, на маю думку, з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя і зьвязаны з паўсюдным прыходам да ўлады левых сілаў у заходніх краінах (дэмакратаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў, камуністаў, зялёных і т.п.). Палітычна рэглямантаваны дэмакратычны прынцып свабоды асобы быў пераведзены імі ў „права чалавека” на ўсё, што не пярэчыць закону. А паколькі законам вельмі цяжка (і фактычна, немагчыма) рэглямантаваць мараль (бо маральныя дачыненьні вышэй за закон), то „права на ўсё” стала правам на грэх.

Спробы амэрыканскіх дэмакратаў рэглямантаваць гэтую падмену (свабоды правам на грэх) у галіне заканадаўства прывялі да кур’ёзаў, да пачварных вынікаў, што супярэчаць лёгіцы і здароваму сэнсу, прыніжаюць годнасьць чалавека, разбураюць сям’ю, разьядноўваюць людзей.

На працягу вельмі кароткага часу на паверхню грамадзтва выплыла такая чалавечая гразь, пра існаваньне якой раней не магло нават прысьніцца ў кашмарным сьне. Распаўсюджаньне яе адбываецца агрэсіўна і хутка, запаланяецца адна грамадзкая галіна за другой. Асноўная барацьба йдзе за ўладу, заканадаўства і сродкі масавай інфармацыі. У значнай ступені ў антымаральным балоце патоплена мастацтва і найбольш — так званая „мас-культура”.

* * *

Нешта падобнае назіралася ў XV-XVI стагоддзях у Эўропе ў пару так званага „рэнесансу” (гэта значыць, адраджэньня паганскіх традыцыяў, свабоды людзей ад рэлігійных дачыненьняў — своеасаблівых „правоў чалавека” ў дахрысьціянскім разуменьні). Тады вельмі нізка апусьцілася мараль. Дзеці ня ведалі сваіх бацькоў, а манастыры ператварыліся ў пристанішчы блуду і садомскай распусты. У гэты ж час ішла адкрытая разгерметызацыя ведзізму і таемных ведаў (Дж. Бруна). Прапаведвалася шалёная нянавісьць да Бога і чалавека (Т. Кампанэла). Эўропа літаральна захлыналася нашэсьцем цёмных сілаў, чараўнікоў, „калдуноў”, магаў, хірамантаў, астролягаў, прадказальнікаў, гадальнікаў, чарнакніжнікаў і т.п. „экстрасэнсаў” (у цяперашняй тэрміналёгіі). Усё гэта раптам павылазіла з усіх шчылінаў на паверхню жыцьця.

Але тады, вобразна кажучы, другога ўпадку Рыму не адбылося. Хрысьціянская грамадзтва знайшло ў сабе сілы знутры, стварыўшы і сьвятую інквізіцыю (Дамініканцы), і моцную апалягетыку, і узяўшы ў свае рукі выхаваньне эліты (Езуіты). Стабілізацыі дасягнулі праз сто гадоў.

За ўсю 2000-гадовую гісторыю эўрапейскай цывілізацыі гэта было самае небясьпечнае і самае крытычнае яе выпрабаваньне. Тут справа ішла не за ўладу, і нават не за рэлігійную дактрыну, як магло здавацца на першы погляд. ***Вырашаўся лёс чалавечай індывідуальнасьці.*** Як трактаваць чалавека, як да яго адносіцца, якая яго роля на Зямлі і ў Сусьвеце. Гэта была барацьба з антычным (паганскім) рэгрэсам у межах Хрысьціянства.

Новая індывідуальнасьць ***(індывідуальнасьць душы, якую заклаў Хрыстос)*** зь яе крытэрыямі ўнутранага сьвету асобы і вечнага існаваньня ўступіла ў канфлікт з старой індывідуальнасьцю — індывідуальнасьцю цела і прыроднага права на задавальненьне яго вымог.

Менавіта тады вырашалася будучыня эўрапейскай цывілізацыі, бо *сэнс Хрысьціянства мог рэалізавацца толькі ў новым чалавеку*. Без стварэньня гэтага новага чалавека Хрысьціянства засталося б рэлігійнай дактрынай, ня больш.

* * *

Антыхрысьціянскія сілы зноў ідэалягічна і палітычна арганізаваліся ў Эўропе толькі праз 200 гадоў (масоны; пазьней — сацыялістычныя партыі). Але змаганьне за асобу было імі прайграна яшчэ ў XVI стагоддзі. Цяпер барацьба вялася ў сфэры ідэалёгіі і палітыкі за ўладу і сьвецкую дзяржаву, сацыяльную свабоду і права на бязбожжа.

Не праз асобу, а цераз новую дзяржаву і ўладу ў ёй, меркаваўся зварот да „свабоднага”, „натуральнага” чалавека, які павінен быў сьцінуць з сябе рэлігійныя і духоўныя абмежаваньні ды сацыяльныя путы і будаваць свой „новы сьвет”, на асновах прадэкляраванай масонамі „свабоды, роўнасьці і братэрства”.

Барацьба, як звычайна ў такіх сітуацыях, выштурхнула на паверхню крайнія сілы, якія зыходзілі з агрэсіўнага бязбожжа і дыктавалі ўмовы паводзінаў ня толькі Эўропе, але ўсяму сьвету на працягу амаль што ўсяго XX-га стагоддзя.

Татальны ўціск і зьдзек над людзьмі вядзе да абмежаванасьці і духоўнага зьбядненьня асобы, да дэградацыі магчымасьцяў чалавека, але маральная дэградацыя і разбэшчаньне грамадзтва ў такіх выпадках, як правіла, затармажаныя самым таталітарным рэжымам (які забараняе ўсё). Асоба ў варунках несвабоды і рэпрэсіяў „сьціскаецца”, прыстасоўваецца і мізэрнее. Гэта яе сродак абароны, устаноўка на выжываньне. Такая асоба, аднак, у глыбіні душы захоўвае, як правіла, сваю маральную аснову.

Развагі па ходу размовы. Галеча і беднасьць ламаюць людзей.

Але звычайны чалавек часта не вытрымлівае выпрабаваньня багацьцем. Яно часам робіцца горам для яго душы. Такой жа бядой можа стаць для яго і сацыяльная свабода, калі ён не гатовы да яе. ***Свабода патрабуе высокай якасьці духу.*** У хрысьціянскім разуменьні свабода — гэта ***магчымасьць тварыць дабро***. Гэта адначасна — маральная катэгорыя, якая характарызуе ўзровень асобы (яе свабоду ад заганаў, ад страсьцяў, ад нізкіх і прымітыўных вымог). Ня кожны нявольнік, атрымаўшы сацыяльную свабоду, робіцца вольнай асобай. Але карыстацца сацыяльнай свабодай можа кожны. У гэтай супярэчнасьці закладзены вірус маральнага крызісу дэмакратыі.

* * *

Ліквідацыя камуністычнага таталітарызму ў Эўропе паспрыяла рэальнаму яе палявеньню. (Бо зьнікла таталітарная пагроза ад СССР.) Левыя з энтузіязмам узяліся за ажыцьцяўленьне ідэі аб'яднанай Эўропы. У канцы гэтай ідэі ўжо праглядваецца новая карпаратыўная імпэрыя „таталітарнай дэмакратыі", дзе „правы чалавека" (і мы ўжо бачым гэтага „чалавека") будуць першасныя, па параўнаньні з суверэнітэтам краіны. (Гэта нешта накшталт сурагату новай рэлігіі.)

Аднак не палітычныя дактрыны, і нават не эканамічныя праблемы, вызначаюць цяпер сутнасьць напружаньня ў дэмакратычным сьвеце. На паверхню выходзіць той самы суб'ект, што і ў XVI стагоддзі — чалавек разбэшчаны. Гэтак жа, як і 500 гадоў таму, ён усьведамляе сваю разбэшчанасьць як свабоду. Свабоду ўсяго: ад Бога, ад рэлігіі, ад маралі, ад сям'і, ад абавязкаў, ад грамадзтва, і нават ад сваіх справаў (за якія ён ня хоча адказваць). Ён лічыць, што безадказнасьць — гэта ягонае „права чалавека", і змагаецца за гэтае права ў плыні ўсіх левых сілаў.

Разбэшчаны чалавек у XXI стагоддзі, гэтак жа, як і ў XVI стагоддзі, змагаецца не за сваю нішу, а за сваё разуменьне сьвету. Канфлікт, які нарастае (ад якога, аднак, некаторыя людзі адмахваюцца і робяць выгляд, быццам яго няма), мае якраз ***цывілізацыйны характар*** і ў пэрспэктыве (у выпадку, калі б перамог разбэшчаны чалавек), азначае крах, канец эўрапейскай цывілізацыі. (Хаця першай можа ўпасьці якраз Амэрыка. І эканоміка тут не дапаможа.)

Менавіта такую цывілізацыйную калізію ўпадку маралі і страты ўсялякіх маральных крытэрыяў перажылі, між іншым, старажытныя Грэцыя і Рым, што і прывяло да ўсеагульнага крызісу і зьнікненьня антычнага сьвету.

Альтэрнатыва Хрысьціянству як ***свабода ўсяго*** — ужо перажытая людзьмі далёка ў мінулым. Зварот да яе — гэта рэгрэс, шлях уніз, да таго, над чым некалі ўзвысіўся чалавек.

* * *

Цяпер вернемся ў пачатак, адкуль пачаліся нашыя развагі. Хтосьці зь цяперашніх дасьледчыкаў сказаў, што калі б у Гітлера было сучаснае тэлебачаньне, то невядома, як бы ўсё сталася. Тут ёсьць разуменьне асаблівага ўзьдзеяньня тэлебачаньня на чалавека.

Фактам зьяўляецца тое, што да пачатку XXI стагоддзя чалавек разбэшчаны ўжо грунтоўна ўсталяваўся і часткова загаспадарыў тэлебачаньне ў Эўропе і Амэрыцы. Пад выглядам свабоды і розных існуючых і неіснуючых правоў адбываецца агрэсіўны наступ нізасьці і бессаромнасьці, і адначасна здача пазыцыяў прыстойнасьці асобай маральнай і чалавекам разумным. Калі працэсы стануць разьвівацца гэтак і далей, то ў бліжэйшыя 10-15 гадоў хрысьціянскі сьвет будзе мець тэлебачаньне-клааку чалавечай мярзоты, збочанасьці і нізкіх паняцьцяў.

Дрэнь выстаўляецца напаказ. Дрэнь і загана, гвалт і блуд сталі цяпер бізнэсам. Дрэнь прадаецца і купляецца, прыносіць прыбыткі і грошы. Таму змагацца з маральнай дэградацыяй няпроста і малавынікова толькі ў адной краіне. Праблема даўно перакрочыла нацыянальныя межы і патрабуе міжнародных захадаў. Для гэтага ў грамадзтве павінны быць іншыя каштоўнасьці, акрамя грошай.

Што сталася і што можа стацца з тэлебачаньнем у бліжэйшы час, добра ілюструе прыклад Галівуда. Сорак гадоў таму Галівуд быў зусім іншым. Хто памятае старыя галівудзкія фільмы, можа ў гэтым пераканацца. На экране тады існаваў чалавек прыстойны. У 80-х, і асабліва ў 90-х гадах, „фабрыка сноў" ператварылася ў канвэер зла. На экране фактычна няма болей вобразаў жыцьця (ня кажучы ўжо пра адлюстраваньне жыцьця нармальнага). Тут цяпер зусім іншыя людзі. Гэта штучныя вобразы, што прышлі з кіна-коміксаў і з рэклямных кліпаў. Забойствы, кроў, блуд, бойкі, пошласьць і распуста — усё гэта запоўніла экран Галівуда, пранікла на тэлебачаньне, ва ўсе куткі сьвету.

Экспансія паказу распусты, забойстваў і брыдоты зьяўляецца складовай часткай працэсу глябалізацыі, якая йдзе па двух накірунках: фінансава-эканамічным і культурным. Цэнтрам фінансава-эканамічнага інтарэсу зьяўляецца „Ўол-Стрыт" (Фінансавы Цэнтар амэрыканскага бізнэсу). Цэнтрам культурнай (ці, дакладней, антыкультурнай) агрэсіі ад нядаўняга часу стаў Галівуд.

Захад моцны сваёй фінансавай сістэмай. За Ўол-Стрытам стаіць рэальная сіла і рэальныя каштоўнасьці. Тым часам сучасная мастацкая культура Захаду мізэрная па сваім узроўні. Яна перажывае працэс упадку і дэградацыі. Тут даўно ўжо няма ні вялікіх духоўных ідэяў, ні станоўчых эстэтычных ідэалаў. Яе месца заступіла мас-культура, ці дакладней, — бізнэс-культура.

Фінансы і высокі тэхнічны ўзровень, дамінуючае валоданьне глябальнымі сродкамі перадачы інфармацыі (тэлебачаньне, інтэрнэт, касьмічныя спадарожнікі) забясьпечвае экспансію бізнэс-культуры і адпаведна — разбурэньне духоўнай мастацкай культуры чалавецтва.

Існуе сусьветная праблема і пагроза зьнішчэньня духоўных традыцыяў нацыянальнай гісторыі. Ісламскі сьвет рэагуе на гэты мас-культурны імпэрыялізм дзікімі, варварскімі мэтадамі барацьбы. Заходні сьвет трымаецца за свабоду слова і робіць выгляд, што праблемы няма.

Але яна ёсьць і перакрочыла ўжо межы магчымага. Лічбавае тэлебачаньне, якое разьвіваецца ў накірунку злучэньня з інтэрнэтам, адкрые яшчэ большыя магчымасьці для індустрыі брыдоты, запабягаць якой будзе надзвычай цяжка, ды й па ўсім відаць, ніхто не гатовы гэта рабіць.

* * *

Станоўчы ўплыў цяперашняга тэлебачаньня на разьвіцьцё асобы (прынамсі на Захадзе, і асабліва ў ЗША) здаецца мне надзвычай малым. Тым часам разбуральныя вынікі яго ўзьдзеяньня — навідавоку.

Асабліва відаць гэта на дзецях і моладзі. Тое, што адбываецца ў апошнія 3-4 гады ў школах Амэрыкі, — гэта поўны абсурд, які нагадвае пра пэрспэктыву канчатковага краху сацыяльнага грамадзтва ў гэтай краіне.

У кожнай амэрыканскай школе пастаянна знаходзіцца паліцыя. У клясы на лекцыі і зь лекцыяў усіх дзяцей прапускаюць праз кантрольныя дэтэктары (як у аэрапорце), выварочваюць кішэні і ранцы, адбіраюць нажы, пісталеты, балёнчыкі з газам, і нават гранаты. І тым ня менш, у школах Амэрыкі амаль кожны дзень грымяць стрэлы. Шасьцігадовыя дзеці і 16-гадовыя падлеткі страляюць па вучнях і па настаўніках за дрэнныя адзнакі, ці за заўвагі аб непаслушэнстве, ці проста так, з цікавасьці, наглядзеўшыся галівудзкай эрзац-прадукцыі ў тэлевізары.

Ужо дзясяткі забітых дзяцей (не кажам пра раненых). Дзіця не

адрозьнівае таго, што бачыць па тэлебачаньні, ад рэальнага жыцьця. Яно яшчэ ня здольнае ацаніць і прадбачыць вынікі сваіх дзеяньняў, а ў рукі яму ўжо ўклалі пісталет. Гэта зрабіў тэлевізар. Дзецям усё гэта здаецца забаўкай, як на экране.

Цяпер амэрыканскія школьнікі страляюць у школах, але праз нейкі час выстралы загучаць у сям'і. І, дарэчы, ужо гучаць.

Прычыны розныя. І тое, што ў Амэрыцы манія асабістай зброі, і што яна ўсім даступная. І тое, што ў ЗША цяпер інтэнсіўна разбураецца сям'я, і тое, што многія амэрыканцы ўжо перасталі разумець дзіцячую псіхалёгію, бо большасьць жыве для сябе, для свайго задавальненьня і сваіх інтарэсаў, а не для сваіх дзяцей (як прынята ў нас). Прычынаў шмат. Але галоўная і агульная прычына — тэлевізар, тое, што дзеці ў ім бачаць. Дзіцячая псіхіка ўжо ня вытрымала.

Калі ж зьяўляюцца энтузіясты, каб абмежаваць паказ забойстваў і паскудства, то ў іх нічога не атрымліваецца. Галоўны аргумант супраць іх — свабода слова. Маўляў, чалавек свабодны і павінен мець права і магчымасьць выбару.

Але дзеці і падлеткі ня ўмеюць рабіць асэнсаваны выбар. Больш таго, клясычная норма права гаворыць аб тым, што ***ніхто не павінен нікога змушаць рабіць выбар***. Бандыт, які кажа чалавеку рабіць выбар кшталту „кашалёк або жыцьцё" ёсьць проста бандыт, а не прыхільнік свабоды выбару.

Для шмат якіх людзей цяжка выбраць цяпер нават паміж тэлепраграмамі (асабліва ў вечаровы час). Тэндэнцыя так званай „свабоды выбару" рухаецца да таго, што нармальнаму чалавеку застанецца толькі адзін „выбар": альбо ўключаць, альбо не ўключаць. Так рэалізуецца права на свабоду выбару інфармацыі па прынцыпу: „альбо кашалёк, альбо жыцьцё".

* * *

У пазнаваўчым сэнсе сітуацыя са свабодай слова ня ёсьць тупіковая. Яна патрабуе пэўнага аналізу і прыняцьця пэўных рашэньняў, зыходзячы з той нормы (амаль аксіёмы), што ***свабода без берагоў ёсьць несвабода***. Бо ня могуць асобныя людзі быць свабоднымі ад грамадзтва і адзін ад аднаго. Крыміналітэт як паразітычная агрэсіўная форма свабоды ад грамадзтва прыводзіць да яшчэ большай несвободы чалавека ў крымінальнай супольнасьці.

Імкненьне да неабмежаванай свабоды ёсьць у аснове сваёй крымінальнае, эгаістычнае і прымітыўнае жаданьне несвабоднага чалавека, які хацеў бы збавіцца ад абавязкаў перад людзьмі, культурай і прыродай.

Грамадзтва валодае сістэмай абмежавальных мэханізмаў, каб свабода не ператварылася ў несвабоду, але яно не заўсёды здольнае іх ужываць, бо стрымліваньне зла залежыць ад шматлікіх фактараў, дзе найбольшай супрацьдзеючай сілай зьяўляецца інтэрас бізнэсу і прага нажывы.

Практыка паказвае, што права грошай тут нават ня ставіцца пад сумніў. Ніякая страляніна ў школах, ніякія забойствы і ніякая маральная шкода людзям ня спыняць нажыву, нават калі кананада загучыць па ўсім сьвеце, бо сам ***бізнэс на чалавечых заганах, нізкіх інстынктах і комплексах ёсьць узаконеным дзеяньнем зла***.

Можна ўявіць, як далей будзе разьвівацца легалізацыя разбэшчанага чалавека і якую ролю адыграе ў гэтым тэлебачаньне. Верагодны варыянт: усё будзе ісьці, як і цяпер, — зьяжджаць па нахіленай плоскасьці да цывілізацыйнага распаду эўрапэйскай культуры.

Магчыма, аднак, што ў грамадзтве адбудуцца перамены, да ўлады прыйдуць адказныя людзі ды разумныя сілы, і праблема пачне вырашацца на міжнародным узроўні. Будуць уведзеныя пасьлядоўныя заканадаўчыя абмежаваньні на зло, наладжаны кантроль грамадзтва і *перагледжана лібэральная формула свабоды* (у тым ліку і свабоды слова), якая ня можа быць абсалютнай, ня можа быць адасобленай ад маралі, ад павагі да чалавечай асобы, ад шанаваньня сьвятога і чалавечага. Свабода ня можа быць зброяй рэгрэсу і разбурэньня, хто б ёй ні карыстаўся.

Свабода — гэта вялікая Боская каштоўнасьць. Але ёсьць бязбожнае разуменьне свабоды (якім пераважна імкнецца жыць цяперашні сьвет), калі чалавек хоча быць свабодным ад Бога і ад усяго. Бальшавікі таксама змагаліся за свабоду. У іх было сваё разуменьне свабоды. Што атрымалася з бальшавіцкай „свабоды", мы ведаем.

Мяркую, што ў вольнай справядлівай Беларусі будзе нацыянальнае тэлебачаньне высокага ўзроўню. Яно, напэўна, таксама сутыкнецца з агрэсіяй распусты і з тэлевізійнай бізнэс-культурай. Але мы, беларусы, мусім быць падрыхтаванымі да гэтага, каб не дапусьціць ўкараненьня чужароднага.

Беларуская ўлада, якая будзе гэта разумець, павінна памятаць адно: заканадаўчыя і арганізацыйныя захады супраць распаўсюджаньня тэле-бізнэсу на разбэшчанасьці ***мусяць прымацца адразу***, без прамаруджаньня, цьвёрда і пасьлядоўна.

Калі ў гэтай справе час будзе страчаны і на Беларусі ўмацуецца індустрыя дрэні, тады гэта станецца, як з мафіяй — вечная барацьба, якая змарнуе грамадзкія сілы.

Аднак веданьне праблемы — гэта ўжо палова справы. Ёсьць надзея, што беларусы ня стопчуць свой гонар і захаваюць высокі ўзровень людзей.

(Фота З. Пазьняка)

14 красавіка 2001 г., Нью-Ёрк.
(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №9(39).

УРБАНІЗАЦЫЯ

Узровень культуры грамадзтва залежыць ад пэўных цывілізацыйных фактараў, якія выяўляюцца ў канкрэтных азначэньнях таго, чым займаецца грамадзтва, што і як вытварае, які існуе падзел і якая сувязь (камунікацыя) паміж людзьмі, якія іхныя ўяўленьні пра сьвет і пра сэнс існаваньня.

Чыньнікі грамадзкага падзелу і камунікацыі ёсьць галоўнымі дзейнікамі паскарэньня і разьвіцьця культуры. Грамадзтва роўных людзей амаль не разьвіваецца (напрыклад, прымітыўныя супольнасьці на нізкай ступені існаваньня).

* * *

Мы, беларусы, гістарычна малады народ. Прыблізна тысячу гадоў таму ў нас адбыўся культурны выбух. Супала некалькі цывілізацыйных падзеяў. Практычна ў адзін і той жа час узьніклі гарады, пісьмовасьць, дзяржава і распаўсюдзілася Хрысьціянства. За вельмі кароткі час нашыя продкі выйшлі з гістарычнага нябыту і стварылі вялікую цывілізаваную магутную дзяржаву, якая сталася ня толькі геапалітычнай, але і культурнай зьявай Эўропы.

Дынамічным чыньнікам, маторам эўрапейскай культуры былі гарады. Беларускія гарады карысталіся Магдэбурскім правам, мелі самакіраваньне і вольнае саслоўе, канцэнтравалі гандаль і рамесьніцкую вытворчасьць, былі цэнтрамі адміністрацыі і рэлігіі, станавіліся часта (што датычыць сталіцаў) духоўнымі і культурнымі цэнтрамі ўсяго народу.

(Фота: „Бацькаўшчына")

Касьцёл у Будславе. Здымак 1930-х гг.

Тым часам жорсткі сацыяльны падзел бяз зьявы грамадзкай камунікацыі прыводзіць да застою і марнаваньня магчымасьцяў культуры, да дэградацыі.

Для нармальнага разьвіцьця камунікацыйны дзейнік культуры павінен выступаць чыньнікам грамадзкай лучнасьці, стаць спосабам гарманізацыі сувязяў і дачыненьняў людзей. Якраз тады праяўляецца паскарэньне як шлях да стабільнасьці грамадзтва. Стабільнасьць жа грамадзтва — гэта ёсьць стабільнае разьвіцьцё культуры.

Камунікацыйнымі чыньнікамі разьвіцьця (паскарэньня) культуры трэба лічыць рэлігію, дзяржаву, пісьмовасьць, урбанізацыю, тэхніку і ў апошні час — інфарматыку.

Пацікавімся адной з гэтых істотных зьяваў дынамікі і стабільнасьці сацыяльна-культурнага разьвіцьця — урбанізацыяй.

Аднак, каб урухоміць цывілізацыйную ролю гарадоў на ўсё грамадзтва, патрэбна, каб існавала прадуманая ўрбаністычная сістэма сувязі паміж горадам і вёскай, спалучаная з камунікацыйнымі магчымасьцямі людзей.

У сярэднявяковай Беларусі, гэта значыць у Вялікім Княстве Літоўскім, якраз была створана і добра дзейнічала такая сістэма.

Прынцып яе заключаўся ў тым, што паміж сталіцай, вялікімі гарадамі і вёскай існавала мноства маленькіх гарадкоў — паселішчаў з сацыяльна-культурным статусам гарадзкога цэнтру. Гэта славутыя беларускія мястэчкі.

Мястэчка, як правіла, было цэнтрам мясцовай адміністрацыі і парафіі. Тут былі царква і касьцёл. У мястэчку, акрамя сялянаў, жылі гандляры, мяшчане і рамесьнікі, былі крамы, школа, аптэка, часам шпіталь ці пры боку кляштар і замак, будынкі адміністрацыі. У мястэчках існавала галоўная гандлёвая плошча і рынак. Шмат якія мястэчкі мелі самакіраваньне, магдэбургскія гэрбы і свабоднае саслоўе.

Беларускія мястэчкі, як правіла, разьмяшчаліся на адлегласьці ад 12 да 16 кілёмэтраў адно ад другога. Мы можам нядрэнна прасачыць гэтую сістэму на тэрыторыі былой Віленшчыны, дзе яна найлепш захавалася.

Пачнем адвольна, скажам, зь Дзявенішак. Праз 14 кілёмэтраў на поўдзень ад Дзявенішак — мястэчка Суботнікі; на захад ад Суботнікаў за 12 кілёмэтраў — мястэчка Геранёны з замкам і касьцёлам; за 16 кілёмэтраў на паўднёвы захад — мястэчка Ліпнішкі; за 12 кілёмэтраў на паўночны ўсход — мястэчка Трабы з царквой і касьцёлам; за 12 *км* на ўсход — мястэчка Юрацішкі; ад Юрацішак за 14 *км* на паўднёвы захад — мястэчка Іўе, а за 12 *км* на поўдзень — Лаздуны; 12 кілёмэтраў за Лаздунамі — Бакшты; за 14 *км* на захад ад Іўя — Ліпнішкі; за 12 *км* на захад ад Ліпнішак — мястэчка Тракелі, потым Воранава, Беняконі і г.д. — ва ўсе канцы праз 12-14-16 кілёмэтраў ёсьць мястэчкі.

Калі пайсьці на паўночны ўсход ад Суботнікаў праз Трабы, то далей, праз 14 *км* ад Трабаў — славутае мястэчка Гальшаны з замкам і касьцёлам. Збоку — Меднікі з замкам, з другога боку — Багданава, потым — Вішнева з касьцёлам і царквой. Ідучы гэтак на паўночны ўсход праз Жупраны, Ашмяны, мы дойдзем, мінаючы шэраг мястэчак, да Астраўца, Гервятаў, Сьвенцянаў, потым да Відзаў, Дрысьвятаў, Опсы, горада Браслава, потым, праз 12 кілёмэтраў — да мястэчка Слабодка, праз 14 — да мястэчка Плюсы, далей — да Друйска, Друі, Прыдруйска і так аж да Невеля — паўночнай мяжы былога Вялікага Княства.

Гэтак жа, ці то ад Дзявенішак праз Яшуны, Салечнікі, ці то ад Гальшанаў мы праз кожныя 12-16 кілёмэтраў, мінаючы мястэчкі, дойдзем да Вільні, Лентварова ды Трокаў і потым — на Майшаголу і Няманчын.

Такая ж сістэма сягае аж да Беластоку і Берасьця. Выразна праглядваецца яна вакол Менска, Магілёва і Віцебска ды Полацка. Рэшткі яе існуюць і ў паўднёвай Беларусі вакол Пінска ды Мазыра.

Рацыянальнасьць урбаністычнай сістэмы Вялікага Княства відавочная. Кожнае мястэчка, як бачым, мела радыюс ахопу тэрыторыі 6-8 кілёмэтраў. Гэта псіхалягічна максімальная адлегласьць для пешахода, калі чалавек мог кіравацца ў дарогу пехатой, не спадзеючыся на каня. Тым часам гэта адна гадзіна язды на запрэжаным кані.

Жыхар любой вёскі ў разе патрэбы мог у любы час на працягу адной-дзьвюх гадзінаў трапіць у мястэчка. У мястэчку якраз і адбываўся культурны абмен паміж горадам і вёскай. ***Мястэчка было рэальным перадатачным зьвяном культуры.***

Паміж мястэчкам і горадам існавала рэгулярная чаўночная міграцыя і сувязь (гандлёвага, адміністрацыйнага, канфэсійнага і іншага парадку). У мястэчку і ў горадзе быў у прынцыпе аднолькавы характар культуры, толькі ў мястэчку ў меншым маштабе. (Дарэчы, і архіўныя, і археалягічныя матэрыялы добра гэта пацьвярджаюць.)

Тым часам селянін часта і рэгулярна наведваў ня горад, а якраз мястэчка, і адтуль чэрпаў свае ўяўленьні пра больш шырокі сьвет і гарадзкія дачыненьні.

Урбаністычная сістэма Вялікага Княства дала вельмі шмат для беларускай культуры. Яна забясьпечыла ёй агульнаграмадзкі эўрапейскі ўзровень і засьцерагла ад правінцыялізму. Гэта значыць ад культурнага разыходжаньня, ад бездані паміж горадам і вёскай.

Там, дзе не існавала сістэмы культуратворнай (эўрапейскай) урбанізацыі, там заўсёды прысутнічаў грамадзкі правінцыялізм. (Велічная Бухара ды Самарканд — у атачэньні жывёлагадоўчых плямёнаў з прымітыўнымі заняткамі ды ўяўленьнямі; купецкая Масква, чыноўны Пецярбург і побач, як казалі самы расейцы, — „мерзость российской действительности”.)

У Расеі не было ні вольных гарадоў, ні самакіраваньня, ні Магдэбургскага права, ні мястэчак, ні прадуманай сістэмы ўрбанізацыі. Такі стан вынікаў увогуле з неэўрапейскага характару рускага грамадзтва. У пачатку XX-га стагоддзя ў Расеі існавала велізарная культурная розьніца паміж горадам і вёскай. Бальшавікі паставілі задачу ліквідаваць гэтую бездань. І ліквідавалі па-свойму: разбурылі вёску і зьнішчылі сялянства. (Набудавалі таксама непатрэбных савецкіх гарадоў, у якіх немагчыма жыць.)

На Беларусі яны першым чынам ліквідавалі саму назву „мястэчка”. Перайменавалі мястэчкі то ў „дзярэвні”, то ў „гэпэ” („гарадзкія пасёлкі”). Расейцы моцна дэфармавалі функцыі беларускага мястэчка, шмат якія мястэчкі давялі да поўнай дэградацыі, але зьнішчыць дазваньня ўсё ж не пасьпелі.

Урбаністычная палітыка расейскіх камуністаў на Беларусі заключалася ва ўкараненьні такой мадэлі, якая б стымулявала працэсы русіфікацыі беларусаў і міграцыі расейцаў у Беларусь. Зыходзячы з гэтай задачы, у пачатку 60-х гадоў, на закрытым паседжаньні ЦК КПСС у Маскве было прынятае рашэньне аб разбудове Менска ў вялікі мегаполіс з шматмільённым насельніцтвам.

Потым, у 1964 годзе, узьнік плян ліквідацыі на Беларусі вясковых паселішчаў. Дзеля гэтага быў прыдуманы тэрмін „непэрспэктыўная вёска”. 73 адсоткі беларускіх вёсак намерваліся ліквідаваць, сьцерці з твару зямлі.

Гэты плян ужо ня меў дачыненьня да ўрбанізацыі. Адкрыта рыхтавалі культурную катастрофу і вынарадаваньне беларускай нацыі.

Мы, беларусы, павінны быць удзячныя Богу, што своечасова распаўся Савецкі Саюз.

Дбаючы пра нашу будучыню і нашу культуру, мы мусім будзем шмат што адбудаваць, адрадзіць, аднавіць; у тым ліку вярнуцца да культуратворчай сістэмы ўрбанізацыі, абумоўленай інтарэсамі нашага грамадзтва, дабром нашых людзей, эканомікай, экалёгіяй і культурнай пэрспэктывай. ***Мы павінны будзем адрадзіць нашыя мястэчкі.***

Беларуская гісторыя нам штодзённа сцьвярджае і сьведчыць, што наша нацыянальная будучыня знаходзіцца ў нас самых. Мы, і толькі мы, беларусы, мусім яе ажывіць і ўсталяваць на нашай зямлі.

15 лютага 2001 г., Нью-Ёрк.
(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №9(39); „Народная Воля”,— 2001, 16 траўня).

(Фота Я. Шатохіна)
Ваколіца пад Пінскам.

ЭГАЛІТАРЫЗМ

У 80-х гадах мінулага стагоддзя немінучы распад СССР адчуваўся ў паветры. У Эстоніі, Латвіі, Летуве толькі і размоваў было пра вяртаньне суверэнітэту ды незалежнасьці.

У Беларусі ўзьнікла крыху іншая карціна. Пачынаючы ад гарбачоўскай перабудовы, як толькі зьбяруцца якія-небудзь палітыкі, то абавязкова будуць гаварыць пра эканоміку ды пра рэформы. Як правіла, нехта скажа (і ўсе пагодзяцца), што эканоміка — гэта галоўнае, што бяз добрай эканомікі нічога ня будзе, што найважнейшае — гэта эканамічныя рэформы і г.д.

Пэўна, што так. Ад эканамічнага ўладкаваньня грамадства шмат што залежыць. ***Толькі ў аснове добрай эканомікі павінны быць добрыя людзі.*** Інакш нічога прыстойнага не атрымаецца. Галоўным у эканоміцы ёсьць маральны чыньнік чалавека — пісаў вялікі эканаміст Адам Сміт. І сапраўды, якія эканамічныя рэформы можна рабіць, напрыклад, у грамадстве, дзе шмат людзей прывыклі ашукваць і красьці, дзе існуе павальнае п'янства, дзе людзі ня любяць працаваць, бо праца абясцэненая, дзе ў грамадстве няма духоўных ідэалаў і агульнанацыянальных каштоўнасьцяў, а дачыненьні паміж людзьмі ўзьнікаюць на падставе нянавісьці. Калі ў такім грамадстве пачынаюць эканамічныя рэформы, то багатымі людзьмі ў выніку становяцца найбольш злодзеі і нягоднікі, якія, зрабіўшыся заможнымі, да таго ж, захопліваюць уладу. Прыкладаў шмат, ад Паўднёвай Амэрыкі ды Афрыкі да прастораў Расеі.

У аснове абсалютызаваных разважаньняў пра эканоміку як самадастатковую вартасьць знаходзяцца ўяўленьні, выхаваныя на бязбожніцтве і матэрыялізме, калі асобу чалавека ня толькі не паважаюць, але ўвогуле не прымаюць у разьлік. Ад эканамічнага рэфарматарства ў такім грамадстве часта простая дарожка да таталітарнай дыктатуры.

Справа часьцей за ўсё зусім ня ў дрэнных эканамічных праграмах. Справа ў людзях. Грамадства можа мець інтэлектуальныя рэсурсы (зрэшты, можа іх купіць у іншым грамадстве), каб скласьці добрыя эканамічныя праграмы рэформаў. Але пойдуць яны кепска, наперакос, прывядуць да пабочных вынікаў, бо не хапіла патрэбных ***маральных людзкіх рэсурсаў***.

Можна глядзець на Захад і на Ўсход — усюды гэтыя прыклады ўбачым, толькі на розным узроўні і ў розным выяўленьні.

Палітыкаў, якія асновай добрага існаваньня грамадства і ўсяго чалавечага жыцьця лічаць толькі эканоміку, ня трэба й слухаць. Гэта, як правіла, папулісты і абмежаваныя людзі. Ім лепш прафэсійна займацца эканомікай і не набліжацца да палітычнай улады. ***Бо ўлада і палітыка — гэта перш за ўсё адказнасьць за людзей і за ўсю нацыю.*** Тут трэба ўлічваць ня толькі эканоміку.

У Беларусі, прынамсі на працягу апошніх 200 гадоў існаваньня пад акупацыяй, большыня ўнутраных сацыяльна-псіхічных і маральных зьменаў у грамадстве выкліканыя зьнешнепалітычным чыньнікам. Менавіта бесперашкоднасьцю палітычна-праўнага, інфармацыйнага і сацыяльнага пранікненьня расейскіх стэрэатыпаў у беларускую сацыяльна-культурную супольнасьць.

Далучанасьць Беларусі да адзінага савецкага грамадства абазначала і далучанасьць яе да хваробаў гэтага грамадства, да інфэкцыі чужародных заганаў.

Часта ў грамадстве (мы разглядаем тыя чалавечыя грамадствы, якія існуюць на ўзроўні дзяржаўных утварэньняў) нейкая загана фармуецца як традыцыйная грамадзкая зьява (напрыклад, кроўная помста ці п'янства ў некаторых краінах). Тады яна ўхваляецца часткай народа і дзейнічае як тормаз любога нацыянальнага прагрэсу.

Зьяву можна разглядаць як агульную хваробу грамадства, змагацца зь якой ня так проста, бо яна заўсёды мае ня толькі маральныя, але і сацыяльныя, і эканамічныя, культурныя, палітычныя і іншыя карэньні.

У пляне эканамічнага разьвіцьця найбольш небясьпечнай грамадзкай заганай зьяўляецца, на маю думку, эгалітарызм — грамадзкае выяўленьне зайздрасьці, якое рэалізуецца як раўненьне па ніжнім узроўні. Эгалітарная супольнасьць страчвае імкненьне да лепшага, да пераймаваньня добрых прыкладаў, да ўдасканальваньня. Яна перастае разьвівацца. Глыбокі застой зьмяняецца рэгрэсам і адсталасьцю.

Эгалітарызм распаўсюджаны ў асноўным сярод бедных пластоў насельніцтва, характэрны таксама для люмпена і люмпенскай псіхалёгіі. Гэтая зьява найчасьцей спатыкаецца на ўсходзе Эўропы, найбольш у Расеі і далей на ўсход.

Беларусы, якім прыходзілася выязджаць зь Беларусі і доўгі час жыць у Расеі, асабліва ў рускай сельскай мясцовасьці, добра ведаюць, што такое нянавісьць да лепшага.

Беларус ня можа бяз працы. Таму, пасяліўшыся з сям'ёй у рускай вёсцы, ён заводзіў гаспадарку, трымаў карову, сьвіней, курэй, індыкоў ды качак, садзіў сад, упраўляў гарод, шаляваў хату, ставіў гаспадарчыя пабудовы, капаў склеп ды студню, абгароджваў усё добрым плотам, працаваў і ўсё неабходнае меў.

Рускія сельскія жыхары, большасьць зь якіх (асабліва вакол вялікіх гарадоў) здавён не трымаюць жывёлы, ня маюць ні садоў, ні платоў і кожны дзень п'яныя, ацэньвалі такое жыцьцё беларуса заўсёды варожа. „Вось куркуль, вось прагны, яму больш за ўсіх трэба, дурны беларус," — казалі яны пра яго. Кожны стараўся зрабіць яму цішком непрыемнасьць: то штанкет адарваць, то гусь колам пераехаць, то цяля атруціць, то сад спляндраваць. Часам даходзіла да адкрытых пагрозаў: „Ты, — казалі рускія, — тут не старайся, усяроўна спалім".

Тым часам яны заўсёды нечага прасілі ў беларуса. Ведаю гісторыі, што калі прыходзіла пара калоць парсюка, то ў чаргу да беларуса па мяса ды сала выстройвалася цэлая руская вёска. І ўсім давалася. Але гэта ніяк не зьмяняла адносіны да беларуса: „Вишь, куркуль, всё имеет," — казалі пасьля сала.

Ведаю выпадкі, калі такога беларуса ў рускай вёсцы спальвалі, ведаю, калі беларус кідаў усё і зьязджаў, але ніводнага ня ведаю прыкладу, каб нехта з такіх рускіх людзей нечаму добраму ў беларуса навучыўся, нешта добрае ў яго пераняў, ці хоць бы паважаў яго за працу і заможнасьць.

Тут не ксэнафобія. Тут якраз выяўляецца псіхалёгія эгалітарызму. Менавіта на эгалітарызм абапіраліся бальшавікі, калі стваралі розныя „камбеды", знішчалі заможных сялян („кулакоў") і разбуралі вёску. Нянавісьць да багацейшых, да вольнай працы, што стварае багацьце, да ўсяго лепшага, чыстага, адукаванага, інтэлегентнага стала афіцыйнай псіхалёгіяй у рускай камуністычнай імпэрыі. Гэтая псіхалёгія падтрымлівалася і ўхвалялася, і называлася „клясавай нянавісьцю".

У Расеі эгалітарызм быў глыбока ўкаранены ў сьвядомасьць яшчэ за прыгонным правам. Нідзе прыгоннае права не было такім жорсткім і нідзе не пратрывала так доўга, як у Расеі. (Да 1861 года за царом і з 1930 па 1991 — за камуністамі).

У Беларусі праявы эгалітарызму сталі відаць найбольш у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі самыя актыўныя людзі ў вёсцы на кароткі час здолелі выбіцца на самастойныя таварныя гаспадаркі (так званыя „фермеры").

Шмат дзе калгасны люд адносіўся варожа да тых гаспадароў,

справы якіх пайшлі ўгару. Зафіксаваныя нават выпадкі атручваньня быдла і рабленьне нематываванай шкоды. Маўляў, не высоўвайся, ня лепшай, не багацей, жыві дрэнна, як мы, гэта, маўляў, нармальна.

Тое, што праявы эгалітарызму ў агрэсіўнай форме ёсьць у Беларусі — гэта найбольш вынік камунізму ды калгаснага ладу. Тут выяўленьне псіхалёгіі несвабоднай асобы, а таксама наступствы усёй сістэмы камуністычнага выхаваньня і адносінаў да працы як да працэсу, адасобленага ад канкрэтнага чалавека.

Вольныя і маральна выхаваныя людзі ў вольным грамадзтве паводзяць сябе інакш. Калі немец ці амэрыканец бачыць, як побач зь ім багацее сусед і нешта разумнае робіць, што дае яму выгаду, то ацэнка суседзкага посьпеху выяўляецца не ў эгалітарнай зайздрасьці, не ў жаданьні нашкодзіць бліжняму, каб той ня лепшаў ды не багацеў, а ў імкненьні павучыцца ў яго і зрабіць гэтак сама, а то й лепш, каб дасягнуць свайго посьпеху.

У свабодных грамадзтвах, дзе цэніцца вольная праца (а не нявольніцкая ды прымусовая), дзе існуюць нацыянальныя традыцыі культуры, дзе ёсьць павага да Бога і да чалавека, там заможных, пасьпяховых людзей паважаюць. Там кіруюцца на вышэйшае, на лепшпе.

У супольнасьці, дзе пануе эгалітарызм, багатых людзей ня любяць, ім зайздросьцяць і ненавідзяць. У іх могуць прасіць, але не вучыцца.

У эгалітарнай супольнасьці нішчыцца і зьнікае вольная праца. Тут узаемасувязь і замкнутае кола. І ня так проста зь яго выйсьці пры дапамозе адных толькі эканамічных рэформаў. Бо ўзьнікае цэлы ланцуг нездаровых паводзінаў.

Канкурэнцыя ў свабодным грамадзтве, напрыклад, вырашаецца разумна. Калі нейкі вытворца вытварае такі ж самы тавар, як іншы вытворца, але па танейшай цане, то іншы вытворца пачынае думаць, як скараціць выдаткі на вытворчасьць, увесьці новыя тэхналёгіі, павялічыць гандлёвы абарот і г.д., каб выраўняць цану.

У супольнасьці, дзе пануе эгалітарная псіхалёгія, праблемы канкурэнцыі вырашаюцца, як у Расеі. Вытворца пачынае думаць, дзе б гэта наняць кілера, каб застрэліць канкурэнта. (Ці ў лепшым выпадку спаліць альбо нашкодзіць.) Эгалітарная псіхалёгія спараджае крымінальную сьведамасьць.

Успамінаю выпадкі ў сваёй дэпутацкай практыцы. Падыходзіць да мяне ў Менску адзін пэнсіянер-ветэран і кажа, што ўсе гандлёвыя кіёскі-шапікі ў горадзе трэба спаліць і забараніць, бо крывапіўцы-гандляры жывуць на целе народа.

— А хто вам пэнсію выплочвае? — пытаю.

— Дзяржава.

— А вы ведаеце, што латошнікі і прыватны сэктар у Менску плацяць 56 адсоткаў усіх падаткаў па горадзе. Калі іх ня будзе — адкуль грошы ў дзяржаве, адкуль вам пэнсія? — кажу я.

— Всё равно нада сжэч. Жыруют на нашы пенсіі, — быў адказ.

11-га сакавіка гэтага году на рускім тэлеканале *НТВ* паказалі такі дакумэнтальны сюжэт, зьняты ў Тульскай вобласьці Расеі.

У вёску прыехала прыстойная адукаваная жанчына сярэдніх гадоў і пачала апекавацца бяздомнымі сабакамі. Яна ўладкавала ў сваім доме і двары 52 сабакі, карміла і даглядала іх. Гэта выклікала лютую нянавісьць аднавяскоўцаў. „Людям кушать нечево, а она собак кормит,” — такая была ацэнка.

Неўзабаве яе дом падпалілі. Калі дом гарэў, аднавяскоўцы глядзелі, як ён гарыць, а жанчына аднаго за другім выносіла сабак з агню. Калі яна ўскочыла ў палаючы дом, каб вынесьці чарговага сабаку, дах абваліўся і жанчына згарэла разам зь няшчаснымі жывёламі.

Потым аднавяскоўцы прышлі на пажарышча разам зь міліцыянерам і пазабівалі ўсіх 27 сабак, якіх пасьпела вынесьці з агню загінуўшая жанчына. Трупы сабак так і засталіся ляжаць на зямлі, ніхто іх нават не закапаў.

Неўзабаве ў вёску прыехалі з гораду дачка і зяць згарэўшай кабеты і кажуць пажарніку, што хацелі б пахаваць маці па-хрысьціянску і шукаюць яе рэшткі.

— Вот, забірайте — всё, что осталось, — паказаў пажарнік на бруднае вядро з абгарэлымі касьцьмі і падкінуў яго нагой.

Камэнтаваць гэтае дзікунства я ня буду. Тым больш, што ў цывілізаваных людзей такое ня ўкладваецца ў галаве. Адзначу толькі, што гэты выпадак тыповы для псіхалёгіі эгалітарнай супольнасьці. Тут нянавісьць да непадобнага, да іншага нязвыклага разуменьня, да ўзвышаных паняцьцяў, да стылю паводзінаў, які ўспрымаецца падсьведама ў эгалітарнай супольнасьці, як дакор нікчэмнаму і прывычнаму існаваньню. Тут спрацоўвае рэакцыя статкавага інстынкту.

Зазначу, аднак, што ў маскоўцаў (гэта адзначае і гістарычная этнаграфія) сабака лічыўся нячыстай жывёлай. Маскоўцы сабак білі і ня мелі да іх ніякай ласкі і сантымэнтаў. Дачыненьні да сабакі адлюстраваныя і ў рускіх прымаўках ды выслоўях (накшталт, „бить, как собаку”) і нават у паэзіі. (Напрыклад, рускі паэт Ясенін мастацкім узорам сваёй дабрыні лічыў той факт, што ён сабак ня біў па галаве. Такая вобразная аргумэнтацыя магла нарадзіцца толькі ў сьведамасьці рускага паэта.)

Аднак выпадак у Тульскай вобласьці вынікае не з этнічных, а менавіта з эгалітарных уяўленьняў. Этнічная падсьведамасьць магла, магчыма, толькі падтрымліваць эгалітарную матывацыю.

Памятаю, у канцы 60-х гадоў, пасьля савецкай інвазіі ў Чэхаславаччыну, задаю пытаньне рускаму інтэлігенту (па адукацыі інжэнер, любіць опэрную музыку, зьбірае кружэлкі з запісамі рускіх хораў, носіць гальштук).

— Чаму вы ўвялі войскі ў Чэхаславаччыну?

— Потому что надо этих чехов проучить.

— За што — гэта ж краіна сацыялізму?

— Неважно! Зажрались, трамваи у них бесплатныи, — такі быў адказ.

Падобных ацэнак, як гэтая, мне прыходзілася чуць ад расейцаў сотні разоў. Прытым ні адукацыйны, ні сацыяльны цэнз не адыгрываў тут практычна аніякай ролі.

Ня думаю, аднак, што калі прыйдзе час на свабоду ды на эканамічныя рэформы ў Беларусі, то мы будзем мець праблемы з агрэсіўнай псіхалёгіяй грамадзкай зайздрасьці ў такім маштабе, як у Расеі. Але паколькі такая псіхалёгія ў нас таксама існуе ў розных пластах грамадзтва, то можна не сумнявацца, што яна праявіцца нэгатыўна ў эканамічных дачыненьнях.

Эканоміка не бывае касмапалітычнай. Эканоміка — гэта заўсёды нацыянальная людзкая справа, якая датычыць усіх і кожнага паасобку. Толькі асьвета, культура і адукацыя на аснове нацыянальных і хрысьціянскіх каштоўнасьцяў, калі яны будуць улічвацца разам з рэформамі ў эканоміцы, змогуць амартызаваць разбураныя праявы эгалітарызму ў грамадзкім жыцьці і паскорыць працэс выхаду з савецкай сістэмы ў цывілізацыйнае грамадзтва нацыянальнай культуры, эканамічнага парадку і забясьпечаных добрых людзей.

12 сакавіка 2001 г., Нью-Ёрк.

(„Беларускія Ведамасьці”,

— 2001, №4(34).

ВЯЛІКІЯ ЛЮДЗІ

„Вялікі чалавек здабывае справядлівасьць, малы — выгаду.”

Канфуцый

Паважаныя людзі — гэта тыя, якія валодаюць аўтарытэтам (у калектыве, у супольнасьці, у грамадзтве, у народзе). Аксіёма, пацьверджаная гісторыяй: *без аўтарытэту не разьвіваецца культура.*

Аўтарытэт асобы не ўтвараецца сам сабой. Павінна адбывацца ўзаемадзеяньне суб'екта і грамадзтва. Пазыцыя і паводзіны чалавека мусяць выклікаць прызнаньне і павагу. Узровень асобы і справы яе могуць пераганяць узровень грамадзтва, якое не ўспрымае, альбо не прызнае тое, што кажа ці стварае такая асоба. Але калі яе ўспрымуць і прызнаюць пазьней іншыя пакаленьні, то для іх яна стане аўтарытэтам.

Вопыт пацьвярджае, што гэтак жа, як шмат якія асобныя людзі, імкнуцца забясьпечыць сабе аўтарытэт у іншых, гэтаксама і грамадзтва для замацаваньня і абароны сваіх дасягненьняў імкнецца мець свае аўтарытэты, падтрымліваць іх, прапагандаваць і нават ствараць.

Дзейнасьць чалавечай супольнасьці, пачынаючы ад самых простых формаў яе існаваньня, ня можа быць абязьлічанай, бо вылучэньне чалавека з прыроды — гэта перш за ўсё, зьяўленьне яго асабовай індывідуальнасьці. Чым вышэйшы ўзровень культуры, тым большая роля і ацэнка асобы.

Хрысьціянства адкрыла чалавецтву каштоўнасьці душы, калі якасьць і ацэнка чалавека перамясьціліся ва ўнутраны сьвет асобы. (Высокія якасьці душы ставіліся вышэй за ўладу і матэрыяльнае багацьце, бо людзі ўспрымалі душу як вечную частку чалавека. Асобу сталі ацэньваць па ўнутраных якасьцях.) У гісторыі духоўнага разьвіцьця чалавека гэта быў найвялікшы прарыў, скачок на верхні ўзровень. Новая індывідуальнасьць, якой ня ведаў антычны сьвет, стварыла новае грамадзтва і новую культуру Эўропы, дзе асобны чалавек стаў нароўні з грамадзтвам, зрабіўся першаснай каштоўнасьцю гэтага грамадзтва і ўсіх ягоных інстытутаў, ад рэлігіі да дзяржавы.

Калі мы прасочым канцовую мэту духоўнага разьвіцьця чалавека так, як яна тлумачыцца ва ўсіх вышэйшых сусьветных рэлігіях, і асабліва ў Хрысьціянстве, то на духоўным этапе (які дасягаецца праз духоўнае ўдасканаленьне і фізічную сьмерць) супольнасьць увогуле перастае адыгрываць вызначальную ролю. Яе як бы і не існуе. Самаіснымі каштоўнасьцямі застаюцца справядлівая індывідуальная душа і яе мэта — злучэньне з Богам.

Але спусьцімся на Зямлю. Відавочны факт, што Хрысьціянства прынесла на Зямлю іншыя дачыненьні да аўтарытарнасьці. Галоўным прынцыпам узаемаадносінаў стаў ўнутраны вольны выбар. Велізарнае значэньне пачалі адыгрываць маральныя аўтарытэты, людзі вялікай адукацыі, ведаў, здольнасьцяў і культуры. Сацыяльная аўтарытарнасьць, якая раней не аспрэчвалася, таксама пачынае ацэньвацца з гледзішча маральных якасьцяў і культурнага ўзроўню. Першасным грамадзкім аўтарытэтам робіцца не герой зь яго разбуральнымі подзьвігамі, як у старым сьвеце, а чалавек-стваральнік, які сваімі думкамі, дзеяньнямі і дасягненьнямі спрыяе грамадзкаму дабру, які ня толькі зьнішчае перашкоды, але, перш за ўсё, стварае і сцьвярджае станоўчую рэальнасьць дзеля лепшага існаваньня і ўдасканальваньня ўсіх.

Менавіта такую асобу найперш стала ўхваляць грамадзтва. Паважаная актыўная асоба стала эфектыўным чыньнікам разьвіцьця культуры. Стваральны ўплыў такой вялікай асобы не абмяжоўваецца пэрыядам яе жыцьця, бо новая нацыянальная супольнасьць, арганізаваная ў нацыянальную дзяржаву, выступае як калектыўная адметная індывідуальнасьць, якая мае свае калектыўныя (нацыянальныя) інтарэсы, галоўныя зь якіх — грамадзка-культурнае разьвіцьцё і падтрыманьне вечнасьці народнага існаваньня.

Вялікая асоба якраз і выяўляла гэтыя інтарэсы. Аўтарытэт асобы ў нацыянальным грамадзтве ёсьць мера і чыньнік грамадзкай культуры, фактар нацыянальнага разьвіцьця. Яго ўплыў, незалежна ад часу, робіцца пастаянным, становіцца гістарычным здабыткам культуры. Ён (гэты ўплыў) можа большаць ці меншаць, але ўжо не мінае, бо пераходзіць у сфэру нацыянальнага духу.

З разьвіцьцём нацыі індывідуальная дзейнасьць у сфэры літаратуры, тэатра і грамадзкіх ідэй мела рашаючае значэньне для сфармаваньня нацыянальнай супольнасьці і стварэньня потым нацыянальных дзяржаваў. Калі не існуе нацыянальнай літаратуры, калі няма вялікіх нацыянальных пісьменьнікаў і паэтаў, то няма і нацыі. Нацыя не ўтвараецца без нацыянальнай літаратуры і тэатру. Нацыянальны тэатр — гэта ўвогуле мастацкая мадэль нацыі ў мініятуры. Але ўся творчасьць нацыянальнага пэрыяду ўжо ня ёсьць безыменнай, калектыўнай, цэхавай, ці вуснай народнай. Гэта ёсьць прафэсійная ўсьвядомленая творчасьць індывідуальнасьцяў, якія імкнуліся ўвасобіць і адлюстраваць агульнае ў канкрэтным, народны лёс у чалавечым вобразе.

Творцы і дзеячы нацыянальнага мастацтва, літаратуры, тэатра, навукі, палітыкі, культуры ёсьць генератарамі ідэй, стваральнікамі нацыянальнай супольнасьці; кожны мае сваё імя і аўтарытэт у пантэоне нацыянальнай культуры. ***Нацыя моцная сваімі вялікімі прадстаўнікамі.*** Уплыў іх абсалютны, каштоўнасьць безумоўная.

Кожнае нацыянальнае грамадзтва адносіцца з асаблівай увагай да сваіх грамадзкіх аўтарытэтаў. Характар дачыненьняў шмат пра што кажа. Тут выяўляецца і ўзровень культуры, і якасьць духу, і ступень салідарнасьці, і пасіянарнасьць, і скрытыя комплексы, і незалежнасьць (ці, наадварот, залежнасьць) думаньня, і нацыянальная сьпеласьць грамадзтва.

* * *

Стабільныя культуры Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі даволі арганічна акамулююць нацыянальныя аўтарытэты ў сфэры свайго грамадзтва. Адносіны да іх разьвіваюцца ў рэчышчы агульнай павагі да чалавека. Павышаны інтэрас можа выклікаць элементы перабольшаньня альбо недаацэнкі, але ў цэлым, носіць аб'ектыўны і здаровы характар. Дачыненьні адэкватныя.

Больш складаныя дачыненьні ў ацэнцы аўтарытэту асобы ў грамадзтвах Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Тут аўтарытэту часта надаецца павышаная хваравітая ўвага і вызначэньне; успрыняцце можа быць заведама тэндэнцыйным і рэфлексійным, эмацыйныя крытэрыі могуць пераважаць.

Супраць аўтарытэтаў адных асобаў і за аўтарытэты іншых тут нярэдка йдзе змаганьне, часта вельмі аднабокае і далёкае ад рэальнасьці, аб'ектыўнасьць не шануецца, плодзяцца ілюзіі і міфы, на іх, як замкі на пяску, будуюцца цэлыя квазінавуковыя канцэпцыі. На грунце рознасьці ўяўленьняў узьнікаюць дыскусіі і непаразуменьні.

Адной з прычынаў такіх ускладненых дачыненьняў ёсьць тое, што народы Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы ў пэрыяд позьняга сярэднявечча страцілі сваю незалежнасьць, былі падзеленыя паміж чатырма імпэрыямі і толькі ў пачатку XX стагоддзя дамагліся

незалежнасьці, а некаторыя неўзабаве зноў апынуліся ў савецкай імпэрыі.

У той складанай сітуацыі шмат якія вядомыя людзі дзейнічалі і тварылі на сумежжы культураў, альбо адначасна ў некалькіх культурах, часам зьмянялі сваю арыентацыю і супрацоўнічалі з акупацыйным рэжымам. Тое ж самае адносіцца да дзеючых сучасьнікаў, калі палітычныя крытэрыі ў грамадзтве пераважваюць над культурнымі і навуковымі.

У цэлым трэба прызнаць, што гэта ёсьць невысокі ўзровень дачыненьняў у ацэнцы вялікіх людзей і выкліканы ён, перш за ўсё, палітычнай няўпэўненасьцю, страхам (часам, неўсьвядомленым) зноў страціць свабоду і незалежнасьць. Адсюль імкненьне самасьцьвердзіцца як найбольш.

У скансалідаваных грамадзтвах Цэнтральна-Усходняй Эўропы адбываецца (часам амаль нябачнае) змаганьне за нацыянальныя аўтарытэты на ўзроўні палітычнай аднабокасьці. Але, трэба сказаць, практычна ніхто ў гэтых грамадзтвах не сумняваецца ў вялікім значэньні аўтарытэту асобы для нацыянальнай сучаснасьці, гісторыі і культуры. Нігілізм, адмаўленьне аўтарытарнасьці культуры тут не прыжываюцца.

Адметны падыход да аўтарытэту як да стваральнага чыньніка разьвіцьця выяўляюць габрэі, для якіх на працягу тысячаў гадоў гісторыі ўтрыманьне аўтарытарнасьці габрэйскай культуры было асноўнай задачай, сродкам духоўнага выжываньня і кансалідацыі, сцьвярджэньня сябе ў не сваім сьвеце.

У дачыненьні да аўтарытэтаў габрэі вольныя ад паталёгіяў Цэнтральна-Усходняй Эўропы. Яны ніколі не бяруць чужога і не выдаюць яго за сваё. Яны ніколі не затоптываюць сваё, зыходзячы з рознасьці палітычных дачыненьняў, бо агульнае (габрэйскае) — вышэй. Тут іншы падыход да аўтарытарнасьці і нацыянальнага самазахаваньня. Лепшую, вядомую, паважаную, здольную, пэрспэктыўную асобу часьцей за ўсё ўзмоцнена прапагандуюць, ёй ствараюць аўтарытэт, ставяць нібы на катурны, яе ўзвышаюць, пра яе часта і шмат гавораць, даюць выдатныя ацэнкі, аўтарытэт і значэньне яе распаўсюджваецца, разьдзімаецца і ўсімі падтрымліваецца. Вядомасьць часам ствараецца ямаль што на пустым месцы, але настолькі энэргічна і пасьлядоўна прапагандуецца, што ніхто ўжо не адважваецца сказаць нешта насуперак. А калі і скажа, то яму ж і горай. Бо хто ж можа сумнявацца ў быццам бы звышгеніяльнасьці ўсімі прызнанай асобы — толькі той, хто ні ў чым не разьбіраецца. (Хаця сумніўца якраз можа разьбірацца найлепш.)

Вельмі дрэннымі здаюцца мне дачыненьні да вялікіх людзей у беларускім грамадзтве. З першага погляду можна падумаць, што наша супольнасьць пакутуе на нейкі сацыяльна-псіхалягічны мазахізм і самаедзтва. Топчацца і не паважаецца менавіта сваё.

Беларускі нацыянальны аўтарытэт — гэта фактычна заўсёды трагічная асоба, якую зьневажаюць, абплёўваюць і здраджваюць нібыта свае беларусы.

Практычна, аднак, нэгатыўныя дачыненьні вызначалі і вызначаюць якраз не беларусы, а калянізатары, акупанты, ворагі беларушчыны. Яны заўсёды былі агрэсіўныя і канцэптуальныя, а беларускае грамадзтва — пасіўнае і, як правіла, канфармісцкае.

Галоўная прычына такога ненармальнага стану ў тым (пра гэта я ўжо пісаў раней), што ў XIX-м стагоддзі была зьнішчана беларуская сацыяльна-культурная эліта, набілітэт, засталіся толькі нізы (у асноўным сяляне і часткова мяшчане). Руская каляніяльная імпэрыя ўвяла тут сваю сацыяльна-дзяржаўную эліту замест зьнішчанай беларускай, і беларускія нізы змушаныя былі яе прызнаць як неабходную ўладу, бо іншай альтэрнатывы не існавала.

З гэтага часу пачалася нацыянальная сьлепата, якая ня скончылася па сёньняшні дзень.

(Выкадроўка з фота Ул. Кармілкіна)

Васіль Быкаў. 1996 г.

Наша грамадзтва з прычыны даўгіх акупацыяў, падзелаў і страты элітаў, слаба скансалідаванае. У ім не хапае разуменьня асноўнага адзінства паміж прыватным, агульнанацыянальным і асабовым. Чалавек сучаснай эўрапейскай цывілізацыі айчынаў успрымае агульнанацыянальныя задачы і прэстыж вялікіх асобаў нацыі гэтак жа, як свой прыватны інтэрас. У пластах беларускага грамадзтва такога неабходнага разуменьня адзінства няма. Яно падзеленае. Задачы нацыі, палітыка, ідэі культуры, дзяржава, улада і прыватныя інтарэсы асобных людзей існуюць у сьвядомасьці шмат якіх беларусаў незьвязана, нібы самы па сабе, а дзейнасьць вялікіх аўтарытэтных асобаў народа ацэньваецца як іхняя прыватная справа.

Лёс вялікай нацыянальнай асобы ў гэтакім дэфармаваным нескансалідаваным грамадзтве, як правіла, поўны драматызму.

Ворагам беларушчыны лёгка расправіцца з такімі людзьмі, а прапаганда можа вытварыць, што хоча, пры агульнай пасіўнасьці і маўчаньні нацыі. Праца і творчасьць беларускіх адраджэнцаў з гэтае прычыны патрабавалі выключнай самаадданасьці.

Жыцьці вялікіх беларусаў ужо больш-менш апісаныя, больш-менш вядомыя. Менш адчыненымі засталіся грамадзкія абставіны трагедыі, якія якраз высьвятляюць яе зьмест. Гэта, перш за ўсё, абыякавасьць у грамадзтве да лёсу сваіх прадстаўнікоў.

Калізія паміж ахвярнасьцю змагарнай асобы і здрадай ёй (як непрыняцьцем асобы) адлюстраваная ў найвялікшай паэтычнай драме ***Янкі Купалы*** ***„Сон на Кургане”***. Нагадаю схему сюжэта. Змагара Сама, які змагаўся за шчасьце і волю беларускага народа, беларусы (у дадзеным выпадку, сяляне) услужліва аддаюць у рукі царскіх сатрапаў. Схема для Беларусі тыповая і знаёмая, пачынаючы ад здачы інсургентаў ***Кастуся Каліноўскага*** царскім уладам да даносчыкаў НКВД і прыхільнікаў Лукашэнкі.

Гэтай жа трагічнай калізіі прысьвяціў сваю выдатную паэтычную драму ***„Пакрыўджаныя” Леапольд Родзевіч***. Маналёг змагара за свабоду ад прыгону — старога скульптара Піліпа, адрынутага ў канцы драмы роднай дачкой, — ёсьць, бадай, адзін з самых прачулых і трагічных у беларускай паэтычнай драматургіі.

Беларуская рэчаіснасьць адэкватная такой літаратуры і ня менш выразная.

Міхась Зарэцкі, як і сотні беларускіх інтэлігентаў, пісьменьнікаў і паэтаў, быў зьнішчаны ў 1930-х гадах рускім НКВД. Сьледчыя-чэкісты шукалі рукапіс яго рамана ***„Крывічы”***, спачатку — каб прад'явіць уліку, а потым, пасьля прысуду, каб зьнішчыць раман. Не знайшлі. А рукапіс быў у вёсцы, і сяляне-дзядзькі, аматары махоркі, скарысталі гэты рукапіс — на ... самакруткі. Раман скурылі. Рэшта зьнікла ў НКВД.

Тут справа ня толькі ў адсталасьці і неадукаванасьці. Нешанаваньне свайго, выхаванае ў сялянскай сьведамасьці чужынцамі, прыводзіць да заганнай ацэначнай формулы: „Няма прарока ў сваёй айчыне”. Які ўжо там аўтарытэт, якая павага!

Васіля Быкава ведае ўвесь сьвет. На Беларусі яго называюць сумленьнем нацыі. Гэта вялікі пісьменьнік, вялікі чалавек. Сіла ягонага маральнага аўтарытэту такая вялікая, што той чалавек, той чыноўнік, той дзяржаўны дзеяч, які пачаў бы яго зьневажаць ды паліваць брудам ягонае імя, павінен выклікаць усеагульнае абурэньне і шырокае асуджэньне брыдкіх паводзінаў, бо Быкаў — гэта ўжо ня проста вялікі пісьменьнік — ён вялікі гонар і каштоўнасьць Беларускай нацыі.

Аж не. У Беларусі, аказваецца, можна зьневажаць і Быкава. І гэта абыходзіцца, сходзіць з рук. І ворагі беларушчыны пра тое ведаюць.

Калі прааналізаваць жыцьцё беларускіх адраджэнцаў — вялікіх людзей XX-га стагоддзя, уражвае пастаянства іхных ілюзіяў у дачыненьні да беларускага грамадзтва і да Расеі. Хоць, здавалася б, хто лепш за іх павінен бы быў усё ведаць.

У канцы 60-х у размове з Паўлінай Мядзёлкай я даведаўся, што калі ў сярэдзіне 20-х на Беларусь вярнуліся з эміграцыі шмат якія беларускія нацыянальныя дзеячы і атрымалі навуковыя ды дзяржаўныя пасады ў БССР, яны неяк сабраліся разам і тады, здаецца, Язэп Лёсік сказаў: „Ну, цяпер ужо беларускай справе ніхто і нішто не перашкодзіць”.

Праз нейкі час усе яны былі зьнішчаныя НКВД.

У 1922 годзе Аляксандар Цьвікевіч, выступаючы на пахаваньні Алеся Бурбіса і расказаўшы пра ягонае цяжкае жыцьцё, пакуты, турмы і перасьледы, зазначыў, што ён быў беларусам-адраджэнцам, а жыцьцё адраджэнца — гэта ахвярнасьць і служэньне Беларусі. Яно немагчымае без пакутаў.

* * *

Падагульняючы думкі пра сітуацыю, якая склалася на Беларусі ў дачыненьні да аўтарытэтных людзей нацыі і разумеючы, чаму так ёсьць, можна зрабіць дзьве галоўныя высновы, якімі, па маіх назіраньнях, кіраваліся вялікія адраджэнцы, такога ўзроўню, як ***Ларыса Геніюш*** і *ксёндз* ***Адам Станкевіч***.

Па-першае. Каб запабегчы расчараваньням, трэба ня мецьць ілюзіяў. Беларускі адраджэнец павінен адносіцца да сваёй дзейнасьці (у якой бы галіне яна ні адбывалася) як да місіі, як да прызначэньня, памятаючы, што народ, людзі ёсьць такія, якія яны ёсьць, што іншых людзей няма і трэба дапамагаць ім вярнуць свой нацыянальны гонар і стаць вольнымі беларусамі, не чакаючы ад іх ні ўдзячнасьці, ні ўзнагароды. Адраджэнец мусіць узвышацца над абставінамі і не кідацца ў пэсымізм.

З іншага боку, кожны беларус, грамадзянін Беларусі, мусіў бы сабе ўсьвядоміць, што ***найпершае багацьце нацыі — гэта яе разумныя, таленавітыя, здольныя, адукаваныя вялікія асобы***. Ім павінна быць найпершая павага, шанаваньне і абарона.

Другая выснова. У абставінах грамадзкага асьляпленьня ***нельга абвінавачваць усю нацыю***, крыўдзіцца на народ і, тым больш, зьневажаць яго (як часам цяпер бывае). Гэта было б цалкам няправільна і абсалютна беспэрспэктыўна.

Калі я азіраюся на XX-е стагоддзе, мяне ўражвае маральная веліч беларускіх адраджэнцаў. Гэта людзі высокай пробы. Іхняя дарога, справы, дзейнасьць — ёсьць шлях дасканалых.

Кожны адраджэнец адчувае сябе народам. Кожны мог бы сказаць: ***народ — гэта я***. І гэта праўда. Гэта правільнае, нармальнае адчуваньне. Гэтак павінен бы думаць кожны чалавек у дасканалым грамадзтве.

22 сакавіка 2001г., Нью-Ёрк.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №4 (34); „Народная Воля”, — 2002, 26 красавіка).

КАМУНІЗМ
ЯК ФОРМА РУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ

Прамаўляючы слова „камунізм”, я маю на ўвазе тую сістэму ўлады, тую сістэму палітыкі і тую ідэалёгію, якая існавала ў былой расейскай імпэрыі — Савецкі Саюз — з 1917 па 1991 гады.

Гістарычна гэтая імпэрыя (яе палітыка і ідэалёгія) была заснаваная манголамі і выяўлялася ў пастулаце: „ісьці да апошняга мора”. На працягу стагоддзяў зьмяняліся сталіцы і групы, што кіравалі імпэрыяй Чынгіз-хана, зьмяняўся яе назоў, але нязьменным заставаўся яе аб'ём, яе эўра-азіяцкі зьмест, яе палітычная сутнасьць — вайна — і яе ідэялёгія: „ісьці да апошняга мора” („да перамогі рускай зброі”, „да перамогі камунізму”).

Імпэрыя ніколі не распадалася. Яна зьмянялася, пераменьвала форму. У часе пераменаў траціла ненадоўга на ўскраінах свае тэрыторыі, каб потым, набраўшы рускага, візантыйскага ці прускага вопыту, ці кшталту вучэньня сусьветнага камунізму, усё вярнуць і пакаціцца наперад, нічога не ствараючы: душыць, рабаваць, спажываць, разбураць і хлусіць.

Хлусьня ёсьць самым істотным вызначэньнем стылю палітыкі, стылю існаваньня і дачыненьняў расейскай імпэрыі. Хлусьня, узьведзеная на п'едэстал веры, ёсьць сутнасьць дачыненьняў у камунізме.

У гісторыі пераменаў і ўмацаваньня расейскай імпэрыі пэрыяд камунізму ёсьць радыкальна новая форма ўлады і кіраваньня старой каляніяльнай дзяржавай. Была зламаная дынастычная цягласьць рускага царызму і зьмененая форма імпэрскай ідэалёгіі. Замест дынастыі — палітычная група (партыя); замест цара — аўтарытарны дыктатар; замест праваслаўя — марксізм-ленінізм. Нязьменным засталіся імпэрыялізм, русізм, рабскі прыгнёт асобы, прыгоннае права, агрэсія і вайна.

„Расея ёсьць ваенная дзяржава”, — казаў рускі цар Мікалай І. У XVIII стагоддзі яна падрыхтавала разбор Рэчы Паспалітай, захапіла Беларусь і Прыбалтыку, парушыла балянс у Эўропе, стала прычынай бясконцых войнаў за перадзел сьвету, выклікала Першую і Другую Сусьветныя войны і — ня выключана — справакуе трэцюю, каб ацаліць сваё існаваньне.

Перамена формы ўлады і ідэалёгіі, усталяваньне новага аўтарытарнага кіраваньня, вяртаньне прыгоннага права ў вёску і эканоміку вымагала татальнага задушэньня ўсіх апазыцыйных і патэнцыяльна нязгодных сілаў. Для абсалютызацыі новай улады, для абнаўленьня імпэрыі і для падрыхтоўкі вайны масавыя рэпрэсіі, расстрэлы і лягерная сістэма ГУЛАГ былі непазьбежнымі. Яны шакавалі Захад, але не бянтэжылі Расею, бо вынікалі з кантэксту яе гісторыі, зь нявольніцкай эўра-азіяцкай (гэта значыць, ні эўрапэйскай, ні азіяцкай) мэнтальнасьці, з эгалітарнай псыхалёгіі насельніцтва.

Камунізм ня быў субстанцыянальнай зьявай у Расеі, а толькі таталітарнай формай імпэрскай улады. Ніякіх ахвяраў, ніякіх разбурэньняў і ніякіх пабудоваў не было зроблена так званымі „будаўнікамі камунізму” дзеля самога камунізму. Усё працавала на выключнасьць, абарону і ўмацаваньне новай татальнай улады і новай расейскай звышдзяржавы, якая ператварылася пры камунізме ў рэальную пагрозу для ўсяго сьвету.

Руская мова ў СССР стала ідэалягічным атрыбутам камуністычнай „тэорыі” зьліцьця моваў (гэта значыць, русіфікацыі). Расейшчына была аб'яўлена „агульначалавечай” мовай будучага камуністычнага грамадзтва, мовай так званага „савецкага народу” як новай імпэрскай агульнасьці людзей, стварэньнем якой займаліся рускія камуністы. Русіфікацыя ў СССР пасьлядоўна праводзілася і кантралявалася КПСС.

Нацыянальныя культуры маглі часткова выжываць толькі ў форме калябарацыі з рэжымам улады і ў вузкіх межах дазволенага. У падсавецкай Беларусі ў 70-х гадах нават беларускія казкі (выдадзеныя ў Вільні да 1939 года) і школьныя падручнікі на беларускай мове па трыганамэтрыі ляжалі арыштаваныя ў так званых „спэцфондах” бібліятэк. На беларускай мове выдаваліся творы Леніна ды савецкая літаратура, што хваліла рускіх ды камунізм. Да 70-х гадоў былі зачыненыя ўсе беларускія школы ў беларускіх гарадах і перарobленыя на расейскія. Беларуская гісторыя была груба сфальсіфікаваная, а гісторыя Расеі стала гісторыяй СССР. На гэтай атруце ды на так званай „агульначалавечай мове” вучылі і абалваньвалі беларускую моладзь. Будаўнік камунізму ня мог гаварыць па-беларуску. Гэта не ўхвалялася і перасьледвалася камуністамі.

За часы СССР Беларусь, як і раней, была асаблівым аб'ектам рускай палітыкі і зонай русіфікатарскіх экспэрыментаў. У 60-х гадах Мікіта Хрушчоў, наведаўшы Менск, з задавальненьнем адзначыў, што беларусы першыя (вядома, першыя пасьля рускіх) прыйдуць да камунізму, бо дабраахвотна адмовіліся ад беларускай мовы і ўсталявалі рускі „язык”. Гэта была пахвала сьмерці.

Сьмерць і гвалт, русіфікацыя і этнацыд, зьнішчэньне культуры і цэлых народаў, злачынствы супраць чалавецтва — вось галоўныя адзнакі і вынікі рускага імпэрыялістычнага камунізму.

Пасьля 2-й Сусьветнай вайны дзесяцімільённая Беларусь не далічылася каля трох мільёнаў сваіх жыхароў, але каля двух мільёнаў былі забітыя яшчэ да вайны органамі камуністычнага НКВД. У Беларусі фізічна зьнішчылі 70 адсоткаў усіх беларускіх пісьменьнікаў, пазабівалі вучоных і мастакоў. (Трупа Трэцяга Беларускага Дзяржаўнага тэатра Ўладзіслава Галубка была арыштаваная ў поўным складзе і расстраляная амаль цалкам.)

Забівалі па нацыянальнай прыкмеце. Дзеля гэтага быў прыдуманы ярлык „нацдэм” (гэта значыць, нацыянальны дэмакрат, хаця партыі такой не існавала). Гэты ярлык прыклейвалі да ўсіх беларусаў, якіх сталіністы плянавалі зьнішчыць. У нетрах НКВД была прыдуманая неіснуючая антыкамуністычная арганізацыя — СВБ („саюз вызваленьня Беларусі”). Пад створаны фантом энкавэдзісты праводзілі арышты, вялі ўяўнае сьледзтва, дапытвалі, судзілі, потым ссылалі ў Расею і расстрэльвалі невінаватых людзей.

Пасьля Рыскай змовы ў 1921 годзе, Беларусь падзялілі паміж Польшчай і Расеяй. Мяжу падзелу правялі непадалёк ад Менска. Існаваў таемны загад НКВД вынішчыць усё беларускае насельніцтва ўздоўж мяжы. Расейскія акупанты хацелі зрабіць тут бязьлюдную зону. Вынішчэньне ажыцьцяўлялі памежныя войскі. Давераным выдавалі карабін і рыдлёўку. Калі такі салдат-памежнік сустракаў у бязьлюдным месцы (на дарозе, у полі, у лесе) адзінокага беларуса, ці беларуску, ці дзіця, ён застрэльваў чалавека, тут жа рыдлёўкай выкопваў яму і засыпаў труп. Такая была інструкцыя. Людзі ў вёсках ня так баяліся „чалавека з ружжом”, як маскаля з рыдлёўкай. (Гэтыя факты надрукаваныя ў беларускім друку ў пачатку 90-х гадоў.)

У 30-х гадах на 95-99 адсоткаў (практычна поўнасьцю) была зьнішчана (сасланая і расстраляная) беларуская камуністычна-партыйная і цывільная адміністрацыя. Вынішчалі нават дырэктарат і гаспадарчых кіраўнікоў.

На месца забітых адміністратараў і камуністычных начальнікаў-

беларусаў прысылалі расейцаў з Расеі. Рускія (так званыя „выдвіжэнцы") прыяжджалі ў Беларусь, займалі вызваленыя пасады, атрымлівалі ільготы, маёмасьць, кватэры, і першае, што рабілі — зачынялі беларускія школы, пераводзілі іх на расейскую мову, каб іхныя дзеці маглі вучыцца, не абцяжарваючы сябе вывучэньням, як яны казалі, „нікому непатрэбнай" беларускай мовы. Гэтак акупанты стваралі на Беларусі „рускаязычнае населеніе". Этнацыд, лінгвацыд, мнемацыд і генацыд праводзіліся бальшавікамі адначасова.

Вынішчэньне беларусаў расейскім НКВД працягвалася і ў часы нямецкай акупацыі. У чэрвені 1941 года, у першыя дні вайны камуністы расстралялі ў турмах і на этапах тысячы вязьняў. Толькі рабілі іншую правакацыю, каб выклікаць карную апэрацыю гітлераўцаў, якія звычайна спальвалі ўсю вёску (часта разам зь людзьмі). Гэткім чынам, дарэчы, у выніку спэцыяльнай правакацыі савецкіх партызанаў была спаленая і вядомая Хатынь, якую камуністы потым, у 70-х гадах разрэклямавалі на ўвесь сьвет як тыповую ахвяру фашысцкага зьверства.

У выніку такой камуна-фашыстоўскай сумеснай „працы" на Беларусі спалілі больш за дзевяць тысячаў вёсак.

Ужо ў 1943-м годзе ў беларускіх лясах дзейнічала агулам ад трохсот да чатырохсот тысячаў партызанаў. Масква не давярала беларусам. Таму пад канец вайны, ў выніку спэцыяльнай апэрацыі НКВД, многія беларускія камандзіры былі пасланыя на сьмерць,

(Фота Я. Шатохіна)

Помнік вяскоўцам — ахвярам бальшавізму ў вёсцы Чарнагубава (Копыльскі раён).

ў Берасьцейскай крэпасьці, дзе была страшная турма НКВД, усіх арыштаваных ліквідаваць не пасьпелі, частка разьбеглася. Тым часам вялікая група наглядчыкаў і функцыянэраў НКВД была заблякаваная ў крэпасьці немцамі. Яны сядзелі там каля месяца, пакуль ня вымерлі. Гадоў праз 20 пасьля вайны камуністы прыдумалі легенду пра „геаічную абарону" Берасьцейскай крэпасьці.

Зьвяртае на сябе ўвагу той факт, што шырокі савецкі партызанскі рух быў арганізаваны толькі на Беларусі і часткова — на этнічных беларускіх землях, што былі пад Расеяй (Смаленшчына, Браншчына). У акупаванай Расеі „партызанкі" не было. Чаму? Ды таму, што прадаўжаў дзейнічаць плян зьнішчэньня беларускай нацыі. Масква праз органы НКВД уцягнула масы цывільных беларусаў у вайну супраць немцаў, і гэтым падставіла іх пад удар. Неабходная справа вынікала з подлай задумы і рабілася ня менш подлымі мэтадамі. (Сталін хацеў мець двайную выгаду.) Энкавэдзісты спэцыяльна каля беларускіх вёсак забівалі немца ці адхіленыя ад камандваньня, забітыя і рэпрэсаваныя. Іхняе месца займалі расейцы і верныя энкавэдзісты.

Летам 1944 года, калі „чырвоная армія" заняла Беларусь, расейцы правялі мабілізацыю ў войска на беларускай тэрыторыі. Дзясяткі тысячаў маладых беларускіх хлопцаў, амаль без падрыхтоўкі, кінулі на перадавую лінію фронта. Рускія камандзіры падымалі іх у непатрэбныя атакі пад агонь нямецкіх кулямётаў, ня даўшы нават зброі ў рукі, альбо з карабінамі, ды без патронаў. Яны гінулі тысячамі, як трава пад касой, а тыя, што ўцякалі назад, траплялі пад кулі энкавэдзіскіх „заградатрадаў". Зрэшты, заградатрады стралялі і ў сьпіну.

Так працягвалася вынішчэньне беларусаў на вайне, рукамі немцаў і расейцаў адначасна. Як казалі камуністы, „в барбе за савецкую родзіну".

У 40-х гадах рускія вывезьлі ў Сібір і там замардавалі ўсіх лясьнікоў і так званых „кулакоў" з Заходняй Беларусі. Вывозілі вагонамі, па разнарадках. У 1949-1950 гг. правялі так званую

калектывізацыю. У сялянаў адабралі зямлю, асноўную маёмасьць і сродкі вытворчасьці.

Палітыка нацыянальна-культурнага вынарадаваньня беларусаў працягвалася пры Хрушчове. У пачатку 60-х гадоў на закрытым пленуме ЦК КПСС быў прыняты плян ператварэньня 600-тысячнага тады Менска ў шматмільённы прамысловы мегаполіс. Масква вырашыла пабудаваць у Беларусі гіганты вялікай хіміі, разьлічаныя на імпэрыю. Што азначала для 10-мільённай краіны (дзе праводзілася палітыка русіфікацыі) разбудова шматмільённай прамысловай сталіцы без беларускіх школаў і беларускіх ўнівэрсітэтаў — зразумела. Плянавалася гэтая разбудова (і дзякуючы пастаяннаму насельніцтву. Інтэнсіўная, радыкальная і раптоўная ўнутраная міграцыя разбурае традыцыйную культуру. (Чарнобыльская зона — гэта экалягічная і сацыяльна-культурная катастрофа.)

Плян ліквідацыі 73-х адсоткаў вёсак у Беларусі пачаў ажыцьцяўляцца з канца 60-х гадоў. (Дадам, што адначасна разбуралі гістарычныя цэнтры беларускіх гарадоў.) Плян быў абстаўлены псэўданавуковай дэмагогіяй, быў стратным з эканамічнага боку і дыктаваўся палітычнай задумай этнацыду беларусаў, пра што ўслых не гаварылася.

Спробу зьнішчэньня беларускіх вёсак камуністы пасьпелі ажыцьцявіць толькі часткова. Па-першае, на хуткі „прарыў" не

(Фота Г. Ліхаровіча)

Стаўленьне Курапацкага Крыжа Пакуты 29 кастрычніка 1989 г.

часткова была ажыцьцёўлена) не з эканамічных, а з палітычных русіфікатарскіх меркаваньняў.

У гэты ж час, у 1964-м годзе, камуністы зацьвердзілі грандыёзны плян зьнішчэньня беларускіх вёсак. Іх падзялілі на „пэрспэктыўныя" і „непэрспэктыўныя". З „непэрспэктыўных" вёсак паступова высялялі людзей, адцінал і сьвятло, радыё, энэргію, ліквідавалі крамы, здымалі транспартныя маршруты, спынялі фінансаваньне, высялялі калгасныя ўстановы і г.д. Людзі павінны былі самі выяжджаць ва ўказанае месца. Потым вёску зьнішчалі.

З трыццаці чатырох тысячаў беларускіх вёсак заплянавана было пакінуць дзевяць тысячаў, а дваццаць пяць тысячаў — ліквідаваць (як „непэрспэктыўныя"). (Прыпомнім, што ў вайну немцы, разам з рускімі, зьнішчылі дзевяць тысячаў беларускіх вёсак.)

Гэта быў плян нацыянальна-культурнай катастрофы Беларусі. Нагадаю, што культура і культурныя традыцыі зьвязаныя з месцам гістарычнага існаваньня людзей, трымаюцца і разьвіваюцца толькі хапіла рэсурсаў і сілаў. Па-другое, — скончыўся камунізм. Але ўдар па беларусах быў зроблены моцны.

Наступны ўдар быў нанесены ў час Чарнобыльскай катастрофы. Як вядома, 70 адсоткаў радыяцыйных выкідаў было сьскінута на Беларусь. Па загаду Масквы рускія „таварышчы" з выкарыстаньнем авіяцыі асадзілі над Магілёўскай вобласьцю радыёактыўныя хмары на галовы беларусаў. Яны „спасалі Расію" над нашай тэрыторыяй, скарыстаўшы той факт, што Беларусь была імі акупаваная і ня мела суверэнітэту.

Я бачыў мёртвыя радыяцыйныя вёскі на Магілёўшчыне, з пустымі дамамі і трохмэтровай крапівой на бязьлюдных вуліцах, бачыў, як іх хавалі, як закопвалі дамы — набытак пакаленьняў. А тысячы памерлых, а тысячы хворых дзяцей, а тысячы людзей бяз роднай зямлі, бяз спадчыны, уцекачы ў сваёй краіне...

Аб Курапатах. Курапаты ёсьць неабвержнае сьведчаньне і рэчавы доказ камуністычнага генацыду на Беларусі. Упершыню эксгумацыйныя раскопкі праводзіліся тут археолягамі і

археалягічнымі мэтадамі. Гэта дало магчымасьць дасьледваць пахаваньні на аснове навуковых мэтодык, выявіць і пацьвердзіць факт папярэдніх раскопак магілаў у канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў і выемку большай часткі касьцей расстраляных. Аналіз дадзеных паказвае, што ў Курапатах з 1937-га па 23 чэрвеня 1941-га года было расстраляна больш за 200 тысячаў чалавек. Гэта быў энкавэдзісцкі канвеер сьмерці.

Акрамя Курапатаў, мне ўдалося вызначыць яшчэ пяць такіх месцаў вакол Менска і пра адно (Лошыца) сабраць зьвесткі. На Беларусі вядома каля дзясятка мясьцін камуністычных расстрэлаў і пахаваньняў расстраляных людзей. Шмат — вакол Магілёва, дзе

Праз чатыры гады КГБ поўнасьцю захапіў уладу ў Расеі. Там цяпер няма камунізму, але ёсьць канцэнтрацыйныя (фільтрацыйныя) лягеры, праводзіцца генацыд і зьнішчэньне Чачэніі з ужываньнем войска і сучаснай разбуральнай зброі, душыцца друк і ўведзена вайсковая цэнзура. Вусная інструкцыя для рускіх вайскоўцаў абавязвае забіваць усіх чачэнцаў ад 10 да 60-ці гадоў. Людзей замыкаюць у фільтрацыйныя лягеры, дзе іх катуюць, прыніжаюць і мардуюць. Пляны расейскага камандваньня заключаюцца ў тым, каб забіць дзьве траціны чачэнскай нацыі, разбурыць і абязьлюдзіць горную частку краіны.

Курапаты. XXI-е стагоддзе. Сакавік.

быў другі па маштабах (пасьля Менску) рэпрэсіўны цэнтар НКВД.

Разбурэньне Савецкага Саюза і КПСС пачалося з 1988 года, калі былі створаныя народныя франты Эстоніі, Латвіі, Летувы, Беларусі, Украіны і сфармуляваныя ідэі палітычнага змаганьня за незалежнасьць і дэмакратыю.

У 1991 годзе КПСС перастала існаваць, СССР распаўся, руская намэнклятурная дэмакратыя пераняла ўладу ў Расеі. Ёй спатрэбілася толькі тры гады, каб асвоіцца і вярнуцца да сваёй праверанай імпэрскай палітыкі ўмяшальніцтва, захопу, агрэсіі і зьнішчэньня. Напад на Чачэнію і першая каляніяльная вайна з чачэнцамі (1994-1996) падвяла рысу пад посткамуністычнай пераменай улады ў Расейскай імпэрыі. Перамены скончыліся. Пачаліся працэсы вяртаньня страчанага.

Наступным аб’ектам умяшаньня стала Беларусь. У 1996 годзе Расея непасрэдна падтрымала свайго стаўленіка Лукашэнку і на высокім дзяржаўным узроўні прыняла дыпляматычны ўдзел у дзяржаўным перавароце ў Беларусі. Да ўлады ў Беларусі прыйшоў савецкі КГБ. Усталявалася прамаскоўская дыктатура.

Гэта робіцца цяпер перад аблічам усяго сьвету. То які сэнс гаварыць цяпер пра злачынствы камунізму, што ў 40-х гадах зьнішчаў і вывозіў у Сібір тых жа чачэнцаў, інгушоў ды татараў? І калі ёсьць сэнс, то дзе яго болей: тады, калі існаваў расейскі дзяржаўны камунізм і расейскі дзяржаўны бандытызм, ці цяпер, калі расейскага камунізму няма, а расейскі бандытызм ёсьць?

Камунізм у Савецкім Саюзе быў перш за ўсё формай рускага каляніялізму, ідэалягічнай канцэпцыяй расейскай імпэрыялістычнай палітыкі.

Пасьля таго, як да сярэдзіны 80-х гадоў гэтая форма скампрамэтавала і вычарпала сябе, камуністычных артадоксаў адхілілі ад улады. Адначасна зьніклі, растварыліся ў нетрах улады так званыя рускія дэмакраты (тыя ж імпэрыялісты). Рэальнай і адзінай палітычнай сілай у Расеі паступова робіцца КГБ.

У 1993-95-х гадах адбываецца хуткае засвойваньне імпэрскага шавінізму як дзяржаўнай ідэалёгіі. (Ролю юродзівага ў гэтым працэсе, згодна з расейскай мэнтальнасьцю і традыцыяй, прафэсійна выканаў блізкі да спэцслужбаў У. Жырыноўскі.

Дзяржаўных мужоў, што ў прыстойным тоне паўтаралі тыя ж пазыцыі усьлед за Жырыноўскім, ужо ўспрымалі сур'ёзна. Шышкі падалі на „сына юрыста".)

Гэта ёсьць кагэбісцкая тэхналёгія захопу ўлады, таксама, як ўзрывы дамоў (разам зь людзьмі) у Маскве і Валгадонску. Сутнасьцю ж зьяўляецца тое, што КГБ-ФСБ (былое НКВД) валодае цяпер поўнай і абсалютнай (а неўзабаве — татальнай) уладай у Расеі.

Сутнасьцю ёсьць тое, што гэтая ўлада вядзе несправядлівую, брудную вайну, вынішчае людзей, робіць ваенныя злачынствы, топча правы асобы, а ўсе рускія палітыкі і ўсё рускае грамадзтва ўхваляюць ды падтрымліваюць такія дзеяньні, бяруць, такім чынам, на сябе калектыўную адказнасьць за забойствы і генацыд.

Сутнасьцю зьяўляецца тое, што расейская ўлада рыхтуе аншлюс Беларусі, падтрымлівае антыдэмакратычны нелегальны рэжым Лукашэнкі, а ўсё расейскае грамадзтва ўхваляе гэтую захопніцкую палітыку.

Сутнасьцю зьяўляецца тое, што расейскае грамадзтва падтрымлівае ўладу Пуціна-КГБ-НКВД гэтак жа, як апантана падтрымлівала дзеяньні Мураўёва-вешальніка, цара, Сталіна ды Леніна. Гэта грамадзтва, якое згаджаецца і ўхваляе любое варварства ў інтарэсах рускай імпэрыі. Гэта ёсьць грамадзтва без інтэлігенцыі, без ідэалоў свабоды.

Для рускіх імпэрыялістаў, незалежна ад таго, за каго яны сябе ўважаюць (за дэмакратаў ці недэмакратаў), камунізм стаў выгаднай шырмай, за якую можна схавацца. Ён стаў для іх ахвярным казлом, на якога можна ківаць і сьпісаць усе свае мінулыя антылюдзкія расейскія грахі і апраўдаць цяперашнія, выкарыстоўваючы камунізм як страшылку для дызарыентаванага грамадзтва і лёгкавернай міжнароднай супольнасьці.



Прысуд малапісьменнага расейскага энкавэдзіста, вык. абавязкі пракурора па спэцсправах юрыста 2-га рангу С. Шусціна: „З прычыны сацыяльнай небясьпекі — расстраляць." 26.VI. 41 г.

Камунізм нельга разглядаць толькі як абстрактную катэгорыю, што сама па сабе чыніць зло. Гэта правільна толькі з ацэначных, вызначальных (дэфінітыўных) патрабаваньняў. Але калі мы падыходзім да пытаньня адказнасьці за тое, што ўчыніў рускі камунізм, то знаходзім ня толькі ідэалёгію, але і канкрэтных асобаў, спраўцаў злачынства, і палітычную арганізацыю, і дзяржаўную сістэму, і адпаведным чынам арганізаваны народ, і адпаведным чынам арганізаванае грамадзтва. Кожны мае сваю долю віны. Кожны нясе сваю долю адказнасьці. Але ў Расеі ніхто ня думае пра пакаяньне.

Адказнасьць за масавыя злачынствы супраць чалавецтва датычыць ня толькі канкрэтных асобаў, яна ёсьць ня толькі індывідуальная, але і калектыўная, што прадугледжвае розную ступень пакараньня.

Перад абліччам міжнароднага суду камунізм мусіць разглядацца ў канкрэтным зьмесьце. Я маю на ўвазе рускі камунізм. Іншага ў Эўропе не было.

Нюрнбергскі трыбунал судзіў не абстрактны, а нямецкі фашызм і канкрэтных злачынцаў. Было прынятае рашэньне аб ліквідацыі магчымасьцяў аднаўленьня нямецкага мілітарызму. Нямецкая нацыя (не фашысты, а народ, нацыя, што скарыстала фашызм) заплаціла кантрыбуцыі за зьнішчаныя культурныя каштоўнасьці іншых народаў, плаціла за галакост і газавыя камэры, за выкарыстаньне дармовай рабочай сілы (і плоціць па сёньняшні дзень).

Хто заплоціць беларусам за мільёны землякоў, замардаваных рускім камунізмам?! Хто заплоціць за скарыстаньне беларускай дармовай рабочай сілы на рускіх лесапавалах, за працу ў вечнай мерзлаце? Хто заплоціць за зрабаваныя культурныя каштоўнасьці Беларусі, што аселі ў рускіх музэях і розных „палатах" Масквы? Хто нам заплоціць за Чарнобыль?!

Захад бяз зброі перамог камуністычную сістэму, выйграў халодную вайну. І тут жа пачаў адраджаць расейскага монстра, наіўна мяркуючы, што дапамагае дэмакратыі і што зло не жыве. У такіх умовах змаганьне з рускім камунізмам пачынае выглядаць барацьбой з папяровымі тыграмі. Яно толькі ўмацоўвае імпэрыялізм, які перамяніў аблічча.

Сем гадоў таму мне і маім калегам зь Беларускага Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце ня раз прыходзілася казаць, пісаць і перасьцерагаць аб магчымасьці дыктатуры ў Беларусі, аб будучай агрэсіі Расеі, аб пагрозе страты незалежнасьці. Цяпер, гледзячы на тое, што робіцца, сумна ўспамінаць тое лёгкадумства, зь якім беларускія эліты адносіліся да відавочнай рэальнасьці.

Цяпер для Масквы і яе памагатых з Захаду засталося толькі легітымізаваць рэжым Лукашэнкі праз любыя выбары (хай сабе і недэмакратычныя), і тады 300-тысячная расейская вайсковая групоўка гатовая ўступіць у Беларусь. Гаворачы пра „інтэграцыю", рыхтуюць акупацыю. Потым можа ўзьнікнуць чарговы „калідор" да Калінінградзкай вобласьці і акупацыя Летувы. Мы ўжо бачым гэтую генэральскую палітыку „атторжэныя вазвраціх". Гісторыя, на жаль, мае тую асаблівасьць, што на практыцы яна людзьмі не засвойваецца. Прынамсі, ва Ўсходняй Эўропе.

Калі зло не судзіць, яно робіцца нормай. Таму суд над рускім камунізмам неабходны. Гэта мусіць быць суд над „імпэрыяй зла".

Працэс павінен пачацца. Ня могуць мільёны ахвяраў нявінных людзей застацца без патолі і справядлівасьці. Ня можа кроў забітых адплысьці вадой.

Рускі камунізм — злачынная імпэрыя агрэсіі і вайны — павінен стаць перад людзкім судом вольных краінаў Эўропы.

12 чэрвеня 2000 г.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2000, №5(28); Факты абвінавачваюць (зборнік), — Вільня, 2000 г.; „Народная Воля", — 2000г., 15 верасьня).

ВЕРА І ПАЛІТЫКА

Мы, беларусы, — хрысьціянскі народ. Гісторыя нашай веры драматычная. Мы пераняλі ўсходняе Хрысьціянства ад Грэцыі цераз Балгарыю і Сербію. Аднак Беларусь не была Ўсходам і на працягу ўсёй гісторыі, ад часоў заснаваньня моцнай дзяржавы, — Вялікага Княства Літоўскага — змагалася з усходняй дэспотыяй (спачатку Залатой Ардой, затым Маскоўшчынай, потым — Расеяй). У барацьбе з Усходам і ў змаганьні з Расеяй — увесь зьмест нашай тысячагадовай гісторыі.

Тут канфлікт цывілізацыяў, і Беларусь — на падзельнай мяжы. Гэта не магло не ўплываць на нашу веру. Усходняя імпэрыя, што ваявала супраць нас, таксама пераняла Хрысьціянства з Усходу і, узмацніўшыся, пачала выкарыстоўваць рэлігійную ідэнтычнасьць у сваіх палітычных інтарэсах.

Гэта спрыяла таму, што найбольш актыўныя беларускія вярхі, змагаючыся з Масквой, зьмянялі ўсходні абрад на заходні, адсякаючы маніпуляцыі ўсходняга непрыяцеля. Але гэта не палепшыла становішча.

У XVI стагоддзі, у часы распаўсюджаньня пратэстанцызму ў Эўропе, частка беларускай арыстакратыі прыняла пратэстанцтва і паспрабавала кансалідаваць народ на падставе моднага тады кальвінізму. З гэтага нічога не атрымалася. Беларускае грамадзтва рабілася ўсё больш шматканфэсійным і індэферэнтным.

Аднак у самым канцы XVI стагоддзя ўдалося ажыцьцявіць вялікую кансалідацыйную ідэю: заключыць Царкоўную Вунію паміж Усходнім і Заходнім Хрысьціянствам на Беларусі.

Цяпер, гледзячы здалёку, трэба прызнаць, што гэта была найвялікшая падзея ў беларускай гісторыі. Праз няпоўныя 200 гадоў Вунія, культурна і духоўна, скансалідавала беларускае грамадзтва і заклала падваліны пад будучыню беларускай нацыі, найглыбейшым чынам паўплывала на беларускае сакральнае мастацтва, вобразную творчасьць і сьведамасьць беларусаў. Вунія дала ў рукі беларусам пастаянны і натуральны абаронны шчыт перад разбуральнай і рэлігійнай па форме агрэсіяй усходняй імпэрыі.

У канцы XVIII стагоддзя, перад разборамі *Рэчы Паспалітай*, беларускае хрысьціянскае насельніцтва складалася з 80 адсоткаў вуніятаў, 5-ці адсоткаў праваслаўных і 15-ці адсоткаў каталікоў.

У першай палове XIX стагоддзя расейцы, захапіўшы Беларусь, расправіліся з *Вуніяй*. Было забіта і замардавана тысячы беларусаў, вуніяцкіх сьвятароў і вернікаў, спаленыя тысячы беларускіх кніг, абразоў, твораў мастацтва, пазачыняныя і разбураныя вуніяцкія школы, кляштары і сьвятыні, зачынены Віленскі ўнівэрсітэт. Генацыд беларусаў ажыцьцяўлялі спэцыяльныя расейскія карныя атрады з казакаў. Падзеі зьдзеку над беларускім насельніцтвам, людабойства і вымардаваньне веры апісаныя часткова ў *„Актах пакутніцкай Вуніі”,* выдадзеных яшчэ ў XIX стагоддзі на польскай мове. Аднак самы беларусы гісторыі гэтага страшнага вынішчэньня яшчэ не напісалі.

* * *

У сярэднявеччы, за часы існаваньня феадальных дзяржаваў, веравызнаньне мела вялікае значэньне для кансалідацыі грамадзтва. Новы час прынёс новыя, ужо не рэлігійныя, а нацыянальныя ідэі кансалідацыі і запатрабаваў новую форму дзяржаўнасьці, заснаванай не на феадальным праве і ўласнасьці, а на волі нацыі.

Аб’яднаўчым, сьведамым ідэйным чыньнікам нацыянальнага грамадзтва зьяўляецца ўжо не рэлігія, як раней, а нацыянальная культура і, перш за ўсё, — нацыянальная мова, нацыянальная літаратура і нацыянальны тэатр.

Пытаньне канфэсійнасьці на Беларусі перастала быць прыярытэтным. Да стварэньня сваёй новай нацыянальнай дзяржавы ў пачатку 1918 года беларускае грамадзтва прыйшло шматканфэсійным. Шматканфэсійнасьць паглыбілася ў XIX-XX стагоддзях, перш за ўсё, з прычыны палітычных дзеяньняў непрыяцеляў Беларусі. Аднак гэта ўжо не зьмяніла і не аслабіла культурнага адзінства беларускага народу (як таго спадзяваліся з Усходу і Захаду).

На сёньняшні дзень беларускае грамадзтва складаецца з чатырох, прыкладна роўных групаў людзей, якія так ці інакш згуртаваныя альбо зьвязаныя з каталіцкім ды вуніяцкім касьцёлам, праваслаўнай (артадаксальнай) царквой*, пратэстанцкімі абшчынамі і сьвецкім атэізмам (бязбожніцтвам). Апошняя група не зьяўляецца канфэсіяй. Але яна ў рэальнасьці, бадай, ці не найбольшая, хоць адкрыта сябе не выяўляе і прыстасоўваецца да абставінаў. (Камунізм не мінае бясследна.)

* * *

У другой палове 80-х гадоў мінулага стагоддзя, калі на Беларусі аднавіўся рух беларускага Адраджэньня, тады былі адроджаныя і прынцыпы нацыянальнай кансалідацыі грамадзтва, разбураныя рускімі камуністычнымі каланізатарамі.

Галоўнымі фактарамі адраджэнскай кансалідацыі грамадзтва ў барацьбе за свабоду былі беларуская мова і культура, сацыяльная справядлівасьць, эканамічная ўласнасьць і незалежная Беларуская дзяржава.

Адначасна *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* сфармуляваў палітычныя дачыненьні да рэлігіі і канфэсійных групаў насельніцтва. *Фронт* прызнае свабоду сумленьня і паважае рэлігійныя традыцыі беларускага народу. За агульны кансалідацыйны чыньнік нацыі бярэцца беларуская культура, беларуская мова і беларускія інтарэсы, рэалізаваныя ў Беларускай нацыянальнай дзяржаве. З гэтага гледзішча, беларускія адраджэнцы раўназначна станоўча адносяцца да ўсіх беларускіх хрысьціянскіх канфэсіяў і да нехрысьціянскіх канфэсійных групаў, прызнаюць свабоду сумленьня, у тым ліку, і права на невызнаньне ніякай рэлігіі (але гэта не ўхваляецца). Беларуская дзяржава, якой будуць кіраваць беларусы-адраджэнцы, ня стане перасьледваць атэістаў, але дзяржаўная палітыка мусіць быць скіраваная на стварэньне ўмоваў, для разьвіцьця каштоўнасьцяў Хрысьціянства, высокага ўзроўню грамадзкай маралі і маральнай асобы чалавека.

Акупацыйныя ўлады на Беларусі, якога б ідэалягічнага кшталту яны ні былі, заўсёды аддавалі прыярытэт той канфэсіі, якая зьяўлялася пераважнай у іхняй краіне. Яны стараліся, перш за ўсё, падпарадкаваць беларускія канфэсіі пад іерархію акупацыйнай дзяржавы. Нават рускія бальшавікі-бязбожнікі, зьнішчаючы ўсё рэлігійнае, тым ня менш апасродкавым чынам аддавалі перавагу праваслаўнай царкве. (Асабліва ў апошнія часы існаваньня СССР.)

Немалаважнае значэньне ў растлумачэньні такога дзіўнага, на першы погляд, прыярытэту бальшавікоў, мела „кагэбізацыя” рускай праваслаўнай царквы. У 1929 годзе, пры Патрыярху Сергію, бальшавікі зламалі супраціўленьне праваслаўнага кіраўніцтва, і рускае кіруючае праваслаўе (нясучы адначасна страты ў людзях і ў веры) пайшло на супрацоўніцтва з камуністамі і НКВД. Чэкісты напрасткі засылалі свае кадры ў духоўныя сэмінарыі і акадэміі, у структуры праваслаўя і, пры спрыяньні

*На Беларусі з XIX стагоддзя, у выніку расейскай акупацыйнай палітыкі, усталявана кіраўніцтва (юрысдыкцыя) Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ). Беларуская Праваслаўная Царква дзейнічае ў эміграцыі.

патрыярхаў, хутка кагэбізавалі іерархію рускай праваслаўнай царквы, ператварыўшы яе ў своеасаблівы аддзел КГБ.

Тут зазначу, што руская праваслаўная царква была падпарадкаваная дзяржаве і страціла самастойнасьць яшчэ ў пачатку XVIII стагоддзя, пры цары Пятры-шалёным (як называлі яго беларусы).

У XIX стагоддзі расейская праваслаўная царква ўжо ў значнай ступені зьвязаная з паліцыяй і ператварылася ў выробленую зброю рускага самадзяржаўя, каляніяльнага ўціску і імпэрскай экспансіі.

Пасьля распаду СССР і савецкай сістэмы сацыялізму, палітычная ўлада вышэйшага праваслаўнага клеру павялічылася. Кагэбізаванае праваслаўе стала імітаваць дзяржаўную ідэалёгію кагэбізаванай

* * *

Пасьля заняцьця Беларусі савецкім войскам ў 1944 годзе, ізноў была адноўленая ўлада маскоўскага патрыярхату над праваслаўнымі беларусамі.

Але беларусы бачылі, што такое маскоўская царква. Як і ў ранейшыя часы, адбываўся адплыў да пратэстантызму, хоць пратэстанцкія абшчыны за саветамі надзвычай жорстка перасьледвалі. (Вернікаў не ўладкоўвалі на працу, выдумвалі штучныя абвінавачваньні, судзілі ды ссылалі, зьдзекваліся над дзецьмі, вялі шалёную прапаганду, прыдумвалі дзікія небыліцы, распальвалі нянавісьць да пратэстантаў і г.д.)

(Фота: „Ніва")

Ідуць беларусы (Беласточчына).

Расеі. На праваслаўныя сьвяты кіраўнікі Крамлю (былыя бязбожнікі і энкавэдзісты) выстройваюцца ля алтара са сьвечкамі ў правай руцэ. Патрыярх Маскоўскі **Алексій II** (ён жа генэрал КГБ **Рыдзігер**, агентурная клічка **„Дроздов"**) неаднаразова „благословляет" генацыд у Чачэніі і вынішчэньне чачэнцаў, ухваляе вайну, узнагароджвае бязбожніка Лукашэнку праваслаўным ордэнам, выступае ініцыятарам і праводзіць кананізацыю (прылучэньне да аблічча сьвятых) *аднаго з найбольшых злачынцаў ХХ-га стагоддзя — рускага цара Мікалая II („крывавага").* *****

Прычыны такіх асабліва жорсткіх адносінаў бальшавікоў да пратэстантаў былі палітычныя. Гэтыя вернікі выпадалі з-пад кантролю КГБ. Каталіцкі касьцёл бальшавікі прыгаварылі на фізічнае выміраньне, перакрыўшы ўзнаўленьне кадраў сьвятароў. (Стары ксёндз паміраў і касьцёл зачыняўся. Парафія зьнікала.) Праваслаўе кагэбісты кантралявалі поўнасьцю праз свае кадры і сэмінарыі, а вось з пратэстанцтвам нічога не атрымлівалася.

Інфільтраваць яго агентурай было значна цяжэй. Пратэстанцкія абшчыны складаліся, у асноўным, з простых беларусаў, на якіх бальшавік, акрамя страху, практычна ня меў ніякага ўплыву.

Такая ж сітуацыя засталася і цяпер, у час аднаўленьня на Беларусі расейскага нэакаляніялізму. Рэжым Лукашэнкі зразумеў, што паставіць сабе на службу беларускіх пратэстантаў (ці хоць бы часткова нэўтралізаваць, як каталіцкі касьцёл) яму ня ўдасца. Таму рэакцыя супраць пратэстантаў грубая і тыпова кагэбоўская: дыскрэдытацыя, пагрозы, паклёп і т.п. Імкнуцца запалохаць вернікаў.

Аднак за ўсім гэтым стаіць „стратэгічная" задача расейскага

* Нагадаю, што рускі цар-алькаголік Мікалай II асабіста аддаў загад расстраляць 9-га студзеня 1905 года мірнае шэсьце людзей, якіх з іконамі і царкоўнымі харугвамі прывёў да царскай рэзыдэнцыі ў Пецярбургу праваслаўны поп-правакатар Гапон. Было забіта 1118 чалавек. У гісторыі гэтая трагічная падзея вядомая пад назвай „крывавая нядзеля". Цара Мікалая II, пасьля гэтага расстрэлу, назвалі „крывавым".

Ніколі не было ні скрухі, ні пакаяньня ў гэтага чарговага страшнага і апошняга рускага цара. І тое, што бальшавікі па-бандыцку без суда расстралялі яго разам з сям'ёй, выглядае як Боская кара забойцу сотняў людзей. Тут усё сымвалічна, нават, што суда не было. Бо такіх чакае Боскі Суд. (Я ўжо не ўспамінаю тут пра жонку цара ды Распуціна, ды пра ўвесь гэты вядомы ў гісторыі бруд.) Праз 80 гадоў нашчадкі камісараў у сутанах аб'яўляюць „сьвятым" забойцу нявінных людзей.

гэбізму: выклікаць у Беларусі нянавісьць па канфэсійнай прыкмеце, справакаваць канфлікты на рэлігійнай глебе і потым „камандаваць парадам" — лавіць рыбу ў мутнай вадзе.

200 гадоў працуюць рускія спэцслужбы над гэтай мэтай у Беларусі. Што толькі ні прыдумвалі: і „чорныя сотні", і каталажкі, але так нічога і не атрымалася. І не атрымаецца. Я гэта кажу ўпэўнена, бо ведаю беларусаў.

* * *

Калі мы гаворым пра беларускае хрысьціянства, беларускае праваслаўе, беларускае каталіцтва ці беларускае вуніяцтва, то мы, вядома ж, разумеем, што Хрысьціянства ёсьць адзіным, і мы ня маем на ўвазе нейкую яго выключнасьць у Беларусі ці выпаданьне з агульнай сусьветнай дарогі Веры. „Беларускае" абазначае тое, што ня мусяць беларускімі вернікамі і грамадзянамі Беларусі кіраваць з замежных цэнтраў патрыярхі-гэбісты чужой дзяржавы і лейтэнанты ў сутанах. Гэта супярэчыць нашым нацыянальным інтарэсам.

Павінна быць так, як у вольных людзей, як у іншых вольных краінах Эўропы і як некалі ў нас было. Беларускай царквой павінны кіраваць беларускія першаерархі, кардыналы і біскупы. Хопіць акупацыі.

Аддзяленьне царквы ад дзяржавы абазначае, што царква не зьяўляецца дзяржаўным інстытутам улады і не выконвае функцыяў дзяржаўнай улады. Юрыдычна яна знаходзіцца на правах грамадзкай арганізацыі і падлягае ўсім дзяржаўным законам.

Царква ня мае такога юрыдычнага статусу, каб займацца кантрабандай, гандляваць цыгарэтамі ды гарэлкай, вывешваць сьцягі чужых дзяржаваў у алтарах і кіравацца антыбеларускай справай. Могуць быць прынятыя спэцыяльныя законы па канфэсіях, але яны павінны адпавядаць Канстытуцыі краіны.

У 1993 годзе дэпутатам Народнага Фронту ўдалося правесьці ў Вярхоўным Савеце (праўда, са стратамі) прыстойны закон аб рэлігійных арганізацыях, які паспрыяў усім. Рэжым Лукашэнкі ўвесь час намерваецца адмяніць гэты закон і заступіць яго іншым, каб забясьпечыць прыярытэт рускай праваслаўнай царкве (РПЦ) на Беларусі і дыскрымінаваць іншыя (беларускія) канфэсіі (у тым ліку, і беларускае праваслаўе). Знаёмыя справы, пазнавальныя пляны.

* * *

Калі зазірнуць далей у будучыню вольнай Беларусі, у той час, калі мы адновім наш Беларускі дом і наш Беларускі Храм, калі будзем мець Беларускі нацыянальны ўрад, Беларускае кіраўніцтва і Беларускі друк, калі мы вернем дзяржаўнасьць Беларускай мовы і станем, нарэшце, сапраўднымі гаспадарамі ў сваёй краіне, то будучыня Беларускага Хрысьціянства ўяўляецца мне вельмі добрай. Зарукай таму зьяўляецца памяркоўнасьць і разумнасьць нашых людзей. Беларус ня любіць варагаваць з суседам і з усімі імкнецца жыць мірна.

Распаўсюджаная зьява на Беларусі, калі ў адным мястэчку, дзе людзі ведаюць адзін аднаго, стаіць касьцёл, царква і частка жыхароў — пратэстанты. Аднак няма канфліктаў. Усё функцыянуе нармальна, людзі супрацоўнічаюць, працуюць, жэняцца і выходзяць замуж у межах насельніцтва, а не канфэсіяў.

Такія дачыненьні выпрацаваныя стагоддзямі і зьяўляюцца асаблівасцю беларусаў. Палітыканы чужых дзяржаваў увесь час хацелі ўшчыміцца ў гэтыя асаблівыя людзкія дачыненьні беларускага грамадзтва і навесьці свае парадкі. Безумоўна, што яны нарабілі шкоды, але, у прынцыпе, нічога не дамагліся. І не дамогуцца. Жыцьцёвая сіла людзкага адзінства беларусаў мацнейшая за наносную нянавісьць палітычных маніпулятараў.

Я лічу, што мы, беларусы, павінны вельмі шанаваць і мацаваць нашую людзкую памяркоўнасьць у канфэсійных дачыненьнях паміж сабой. Бо гэтая добрая рыса ёсьць псіхалягічнай асновай нашага культурна-нацыянальнага адзінства. А ўвогуле, калі падумаць глыбей, гэта ёсьць рыса духоўнай велічы беларусаў, падстава да сапраўднай дэмакратыі, моцы і вышыні будучай вольнай беларускай дзяржавы. Гэтая веліч Беларусі сапраўды будзе, бо яна ўжо сапраўды была і пакінула нам праз вякі найвялікшае багацьце — здольны, працавіты, памяркоўны і мірны народ.

Беларусы на дэманстрацыі ў Нью-Ёрку.

21 траўня 2001 г.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №8(38).

ТРАДЫЦЫЯ

Людзі часта гавораць пра традыцыі, не задумваючыся, што азначае традыцыя і чаму яна існуе. Ім здаецца, што традыцыі, як дождж і вецер, ці як прывычка, існуюць самы па сабе. Бо цяжка ўявіць культурнае грамадзтва без традыцыяў культуры.

Сапраўды, працэс утварэньня традыцыяў ва ўсіх галінах дзейнасьці людзей разьвіваецца самаісна. Традыцыя ёсьць найважнейшы чыньнік захаваньня і жыцьцяздольнасьці культуры. Культура зь неразьвітымі традыцыямі — слабая культура. Яна можа рассыпацца, зьнікнуць пры ўскладненьні жыцьцёвых абставінаў. А гэта суправаджаецца пакутамі людзей і агульным зьбядненьнем чалавечага грамадзтва.

Калі гвалтоўна развальваюцца традыцыі ці дэградуюць ад зьмяшаньня з чужародным, тады людзі ***перастаюць разумець адзін аднаго***, грамадзтва перажывае рэгрэс, культура спараджае хімеры. Развал адстояных уяўленьняў і дэградацыя соцыюма прыводзіць да прымітывізацыі і змаленьня асобы.

Захаваньне традыцыяў заўсёды было клопатам вышэйшых людзей у грамадзтве. Можна дакладна вызначыць: па тым як адносяцца людзі да захаваньня традыцыяў, мераецца іхны ўзровень культуры.

Традыцыя ёсьць вынік калектыўнай дзейнасьці людзей. Гэта плён агульнай творчасьці і супольных уяўленьняў. Традыцыя — асаблівая зьява, якая існуе толькі ў жывым грамадзтве і рэалізуецца тады, калі ствараецца тып, альбо канон, ёсьць варыянтнасьць і пастаяннае насельніцтва.

* * *

Вельмі наглядна традыцыі відаць у мастацкай творчасьці, бо творы мастацтва валодаюць выразнай аўтаноміяй і самастойнасьцю (адасобленасьцю) ад носьбітаў. У калектыўным (гэта значыць народным) мастацтве гэтая самастойнасьць толькі частковая. У індывідуальным (гэта значыць прафэсійным) — практычна цалкавітая.

Гносэалягічна мастацтва зьвязанае з рэлігійнымі ўяўленьнямі і вырастае з аднаго кораня. Мэта рэлігіі — пазнаньне Бога і дасягненьне вечнага існаваньня душы ў ідэальным стане. Мэта мастацтва — узвышэньне душы праз адлюстраваньне (стварэньне) эстэтычнага ідэалу.

У філясофскім пляне мастацтва і рэлігію можна разглядаць як адзіны працэс пазнаньня абсалютнай ісьціны. Рэлігія — шлях непасрэдны, ***шлях дасягненьня*** праз веру. Мастацтва — гэта шлях апасродкаваны, ***шлях набліжэньня*** праз вобраз ідэальнага хараства.

Трэба ведаць, што хараство ёсьць функцыя ісьціны. ***Ісьціна заўсёды вечная, простая і прыгожая.***

Таму апасродкаваныя шляхі набліжэньня да ісьціны (Бога) ішлі праз ***мудрасьць*** (філясофія, навука і т.п. „рацыё”) і праз ***мастацтва*** (вобразы хараства). Непасрэдны шлях, як я ўжо адзначаў, ляжыць пасярэдзіне — ***шлях веры***. (Гэта значыць успрыняцце ісьціны агулам, усёй істотай, адразу такой, якой яна ёсьць.)

Ні адзін з трох шляхоў не гарантуе ад памылак, і толькі адзін шлях сапраўдны (шлях веры). Але сумяшчэньне гэтых накірункаў ёсьць агульнай дарогай духоўнага разьвіцьця чалавецтва. І гэта якраз пацьвярджае гісторыя.

У калектыўны пэрыяд мастацкай творчасьці людзей кожны народ па-свойму адлюстроўваў ідэал хараства, ствараў сваю сістэму вобразаў і мастацкіх традыцыяў. Тут дзівосны сінтэз. Бо, адлюстроўваючы аб’ектыўную эстэтычную ісьціну праз сваю вобразную сістэму і традыцыі творчасьці, народ выяўляў адначасна сябе, сваю душу, паняцьці і ўяўленьні.

У працэсе калектыўнай творчасьці ***вобразнае выяўленьне*** сістэматызавалася ў аптымальную форму, набывала закончаныя і дасканалыя абрысы. Так узьнікла ***традыцыя як найлепшае выяўленьне сутнасьці, якое характарызавалася аптымальнасьцю, закончанасьцю і дасканаласьцю***.

Такім чынам традыцыя станавілася ***ўнівэрсальным перадатачным мэханізмам захаваньня культуры, цягласьці яе з пакаленьня ў пакаленьне***. Гэта сапраўдны ўсенародны скарб, набытак, які стагоддзямі жывіў творчасьць і эстэтычнае разьвіцьцё людзей у адпаведным і найлепшым для іх рэжыме паняцьцяў і адчуваньняў.

* * *

Гвалтоўнае зьнішчэньне традыцыяў — гэта заўсёды культурная катастрофа. Тут трэба адрозьніваць натуральны працэс, выкліканы грунтоўнымі і вельмі хуткімі пераменамі ў грамадзтве, і працэс намераны, накіраваны спэцыяльна на зьнішчэньне традыцыяў культуры.

Беларусы, апынуўшыся ў расейскай імпэрыі, сутыкнуліся з выпрацаванай палітыкай разбурэньня традыцыяў беларускай культуры. У XIX стагоддзі найбольш пацярпела беларуская архітэктура і гарады. Над Беларусяй нібы пранёсься зьнішчальны ўраган. Але вынішчэньні XIX-га стагоддзя нельга параўнаць з тым, што зрабілі потым у XX-м стагоддзі рускія бальшавікі.

У даўняй Беларусі для абазначэньня традыцыйнага, выпрабаванага ўкладу жыцьця і культуры ўжываўся ўнівэрсальны тэрмін ***„старына”***. „І каб старыны ня рухалі..,”— пісалі звычайна магілёўскія, смаленскія ці быхаўскія мяшчане, стаўляючы ўмовы.

Бальшавікі, ставячы задачу зьнішчэньня традыцыйнай культуры, прыдумалі свой „тэрмін”, свой назоў разбурэньню, які быў антытэзісам азначэньню „старына”. Гэта ярлык „старьё” (што азначае — старызна).

Тэрмін „старьё” быў асабліва небясьпечны на пабытовым, нізкім узроўні сьвядомасьці, у асяроддзі соцыюма, дзе якраз адбывалася ягонае прыжываньне. У савецкіх навуковых сфэрах маглі казаць што іншае, з прыцягненьнем навуковай тэрміналёгіі, але на практыцы татальная камуністычная палітыка вынішчэньня культуры абапіралася на безапэляцыйную формулу: „Зачэм это старьё!”. І далей чулася прымітыўная нігілістычная дэмагогія, што трэба будаваць „новае”, адмаўляцца ад „старога”, аджылага, глядзець „наперад”, а не „назад” і г.д.

Формула „зачэм старьё” пратрывала да апошняга дня існаваньня СССР.

Камуністычныя варвары вынішчылі ў Беларусі тысячы помнікаў архітэктуры і сакральнага дойлідзтва. Яшчэ ў 1961 годзе ўзрывалі культурныя здабыткі XII-га стагоддзя (царква Дабравешчаньня ў Віцебску), а ў канцы 1980-х гадоў разбурылі Менскае Замчышча XI-га стагоддзя і архэалягічны драўляны Менск, што існаваў у ім. (На месцы Замчышча пабудавалі станцыю мэтро „Няміга”.) Былі разбураныя старадаўнія могілкі і гістарычныя цэнтры беларускіх гарадоў ды мястэчак, зьнішчаныя тысячы прыдарожных крыжоў і капліц ды каменных муроў, вадзяных млыноў ды ветракоў, шмат дзе поўнасьцю ліквідавалі беларускія народныя строі адзеньня (забаранялі апранаць) і народныя рэлігійныя абрады, высьмейвалі аўтэнтычны фальклёр, настройвалі моладзь у школах супраць свайго.

Адначасна ўжывалі іншы татальны, больш выраблены мэтад

вынішчэньня беларускіх традыцыяў культуры, накіраваны ў асноўным на зьнішчэньне фальклёру (песьняў, танцаў, звычаяў, абрадаў, сьвятаў і г.д.). У камуністычнай псэўдатэорыі ён называўся „развитие традиций" (разьвіцьцё традыцыяў) і рэалізаваўся на практыцы найбольш праз „мастацкую самадзейнасьць".

Для камуністаў-ідэолягаў усё жыцьцё — гэта „борьба" (барацьба). Разьвіцьцё — гэта ў іх „барацьба новага са старым". Таму камуністы заўсёды „змагаліся", уступалі ў „вечны бой", вялі „бітву за ўраджай" на „трудовом фронте", скідвалі „працоўны дэсант", ішлі „от победы к победе", „заваёўвалі новыя рубяжы" і г.д. — усё з крыкам ды камандамі.

З традыцыі, згодна камуністычных „тэарэтыкаў", трэба было браць „лепшае", адкідаць „горшае", „несучаснае", і прылучаць „новае", „сучаснае". Крытэрыі вызначаліся „па паняцьцях", задачы — па цыркулярах.

Была створаная сетка сельскіх клюбаў, раённых „дамоў культуры" і „дамоў народнай творчасьці", дзе ў большасьці сядзела цэлая армія недавучак, „арганізатараў культуры" і „разьвівальшчыкаў традыцыяў". Нашэсьце гэтай арміі за дзясяткі гадоў „барацьбы на культурным фронце" прынесла больш шкоды, чым карысьці. Што датычыць традыцыяў, то ня гледзячы на стараньні асобных энтузіястаў, вынішчана было амаль усё жывое.

* * *

Традыцыя ў калектыўным мастацтве — гэта закончаная і дасканалая зьява. Яе далейшае самаўдасканальваньне прыводзіць да канону, які зьяўляецца ***самадастатковым***. Кананізаваная традыцыя існуе стагоддзямі якраз з прычыны гэтых сваіх якасьцяў (дасканаласьці і самадасатковасьці) і таксама ***варыянтнасьці*** — зьявы характэрнай якраз для калектыўнай творчасьці, бо кожны выканаўца ў фальклёрнай традыцыі, прытрымліваючыся канону, зьяўляецца ня толькі выканаўцам, але й творцам, што выяўляецца ***ў імправізацыі***. (Дарэчы, адметнай прыкмеце агульнай фальклёрнай традыцыі).

Адначаснае сумяшчэньне канону, варыянтнасьці і імправізацыі стварае дзівосную зьяву — ***непаўторнасьць*** аўтэнтычнага фальклёру. Гэтая фэнамэнальнасьць рэалізуецца ў працэсе жывога выкананьня (жывога — ня значыць, што на сцэне, а ў натуральных каляндарна-тэрытарыяльных абставінах).

Традыцыю калектыўнай творчасьці, з прычыны яе закончанай формы, нельга структурна зьмяняць, бо гэта прыводзіць да яе разбурэньня і зьнікненьня. Традыцыя, як кананізаваная форма калектыўнага мастацтва, не паляпшаецца нейкім з боку, гвалтоўным умяшаньнем у яе сутнасьць. Яе можна толькі прымаць такой, якой яна ёсьць, і прадаўжаць.

Традыцыю ў адной галіне творчасьці, ці аднаго ўзроўню мастацтва можна скарыстоўваць у іншай галіне, ці ў іншым узроўні мастацтва. Можна скарыстоўваць элемэнты традыцыі, ці яе форму, ці нават яе рэмінісцэнцыі, але ўсё мусіць называцца сваім назовам (бо гэта ўжо не традыцыйная творчасьць). Не павінна быць ***падмены*** аднаго мастацтва іншым, адной галіны творчасьці — іншай.

Менавіта падмена зьяўляецца сутнасьцю і вынікам разбуральнага камуністычнага паняцьця „разьвіцьцё традыцыяў". Якраз устаноўка на падмену выклікала ўмяшаньне ў традыцыйны парадак і разбурэньне аўтэнтычнай народнай творчасьці.

Паколькі ўстаноўка была ідэалягічнай (зьмяніць, палепшыць ды абсучасьніць) і зыходзіла з дзяржаўна-партыйных установаў — усё астатняе давяршвала звычайная чалавечая цемната, бескультур'е і неадукаванасьць „мэтадыстаў" ды функцыянэраў такой палітыкі.

Трэба сказаць, што сярэдні ўзровень адукацыі і эстэтычных паняцьцяў савецкага чалавека адпавядаў узроўню фармулёўкі „разьвіцьцё традыцыяў". Калі савецкі чалавек чуе, што нельга збоку ўмешвацца і зьмяняць традыцыю, тады ён (скажам, доктар якіх-небудзь тэхнічных навук, што мяркуе на ўсе тэмы) зьдзіўляецца: „А як жа тады разьвіцьцё? Што, жыцьцё павінна спыніцца?"

Зрэшты, можна прывесьці па аналёгіі прыклады і з тэхнікі, і з фізікі, і ўвогуле — з прыроды. Нікому, скажам, не прыходзіць у галаву ўдасканаліць форму кола, зрабіць яго больш выцягнутым, ці сплюшчаным, ці хвалісты-увогнутым і т.п. У людзей хапае здаровага сэнсу не задумваючыся разумець, што кола — гэта дасканала завершаная сістэма. Палепшыць яе немагчыма, зьмяніць нельга (бо гэта будзе ўжо ня кола). Можна толькі ім карыстацца, выкарыстоўваць і вар'іраваць (што і робіцца ў тэхніцы). І ніхто не задае пытаньне: хто прыдумаў кола. Прыдумалі людзі (і дарэчы, не адразу).

Традыцыя ў калектыўным мастацтве — гэта таксама „кола" — дасканалая, як мы ўжо адзначылі, завершаная форма (сістэма) выяўленьня адпаведнай сутнасьці. Нельга яе перайначыць.

Тут адлюстраваньне вельмі агульных заканамернасьцяў. Наша фізічная трохмерная прастора ёсьць частка бясконцага сьвету. Наш трохмерны сьвет мае закончаную колькасьць дасканалых, сістэмна завершаных геамэтрычных формаў (геамэтрычных фігур), закончаную колькасьць асноўных колераў, асноўных гукаў; існуюць парогі адчуваньня сьвятла і парамэтры пераменаў стану рэчыва і г.д. Усё зьменлівае багацьце і шматаблічнасьць нашага фізічнага сьвету ёсьць варыянтнасьць і мадыфікацыя пэўных завершаных асноваў. ***Разбурэньне асновы прыводзіць да разбурэньня зьявы.***

Тым часам сістэмная завершанасьць (самадастатковасьць, самадасканаласьць) фізічных асноваў прадвызначае ўнівэрсальную заканамернасьць разьвіцьця і стварэньня ***ўсяго***. Менавіта: адпаведнасьць (адэкватнасьць) паміж формай і зьместам зьявы. Умоўнасьць формы і ўмоўнасьць зьместу маюць цэнтрабежную тэндэнцыю да завершанага адзінства. У ідэале ўмоўнасьць формы і ўмоўнасьць зьместу імкнуцца стаць адной існасьцю і дасягнуць дасканаласьці. Гэтае імкненьне (назавём яго *шляхам гармоніі*) падпарадкоўваецца законам ісьціны: прыгажосьці, прастаты і вечнасьці. (Вечнасьць дасканалай сістэмы ў дадзеным выпадку ёсьць яе завершанасьць у адпаведным сьвеце).

У пачатку 60-х гадоў, калі сьвет быў яшчэ пад уражаньнем адкрыцьця малекулы ДНК, мяне зацікавілі апісаньні трох амэрыканскіх вучоных-адкрывальнікаў (Ф. Крыка, М. Уілкінса, Д. Уотсона) пра тое, як рабілася адкрыцьцё.

Вучоныя перамянілі вялікае мноства структурных мадэляў малекулы пры расшыфроўцы вопытаў. Асноўнымі крытэрыямі адбору мадэлі ў іх былі прастата і ***харaство*** структуры. Малекула павінна была быць прыгожай. Непрывабныя, хоць і дастаткова лягічныя мадэлі, адкідвалі. У выніку — адкрыцьцё падвойнай сьпіралі, простай і дасканалай сістэмы малекулы ДНК.

Вельмі дакладная інтуіцыя. Вучоныя зразумелі, што шукаюць адну з ***асноваў*** існаваньня жывога сьвету і яна павінна валодаць якасьцямі ісьціны.

* * *

Гэтыя пункцірныя развагі я зрабіў дзеля таго, каб падвесьці да тлумачэньня, што ***фэнамэн стваральнага эстэтычнага працэсу ў калектыўнай творчасьці людзей падпарадкаваны ўсеагульнаму сусьветнаму парадку рэчаў і ёсьць ягоным вобразным выяўленьнем***.

Менавіта таму тут няма брыдоты, паскудства, дэкадэнства, пачварнасьці, збачэнства думак, духу сьмерці, упадку і разбурэньня, як гэта часта прысутнічае ў індывідуальным прафэсійным мастацтве. Я не кажу ўжо пра масавую культуру.

Калі меркаваць па якасьці, узроўні і вобразнай сутнасьці эстэтычнага адлюстраваньня народнага духу і народнай адметнасьці, як выяўлена гэта ў аўтэнтычнай калектыўнай творчасьці людзей, то, безумоўна, — гэта вяршыня. ***Нішто і ніхто лепш не выяўляе характво народу, як сам народ у сваёй традыцыйнай мастацкай творчасьці.*** Вядучыя мастацтвы тут — сьпевы і танцы.

Тым часам індывідуальная (прафэсійная) творчасьць гэта ёсьць ***мастацтва нацыі***. Вядучыя мастацтвы тут — літаратура і тэатр. Яны адлюстроўваюць жыцьцё, дух і вобраз народа праз лёсы і вобразы ***асобных людзей***.

Літаратура і тэатр ёсьць сутнасныя атрыбуты нацыянальнай культуры. (Бязь іх нацыя не ўтвараецца і не існуе.) Нацыянальнае мастацтва, як правіла, абапіраецца на народную творчасьць і выпрацоўвае плённую форму выкарыстаньня, галоўным прынцыпам якой ёсьць павага і захаваньне традыцыяў.

Гэта прафэсійная творчасьць ***на падставе*** народнай творчасьці. Тут ёсьць своеасаблівы „гістарызм” (як нэаготыка ў архітэктуры), тут выяўленьне тэатральнасьці і прадстаўленьне народнага сродкамі мастацкай фантазіі. Пры такім падыходзе ўсё вырашае густ і майстэрства сьпевакоў. Падыход эстэтычна апраўданы, хоць і не глыбокі.

Цяперака паўкультурнае асяроддзе ў Нью-Ёрку якраз цікавіцца Ванэсай Мэй*. Безумоўна, што яе аранжыроўкі клясыкі пад сучасныя рытмы і выкананьне зробленыя таленавіта, на добрым узроўні і слухаюцца лёгка. Але гэта ўжо ня клясыка. Гэта другасная творчасьць. І Ванэса не хавае гэтага. Клясыцы такое ня шкодзіць. (Хоць зразумела, што тут звычайны амэрыканскі бізнэс).

Горшая сітуацыя, калі размежаваньня няма, калі на сцэну цягнуць жывую традыцыйную творчасьць, але падпраўляюць яе, „паляпшаюць” ды прерайначваюць, дадаюць „нестаючыя элемэнты” і ўсё гэта выдаецца за народны беларускі аўтэнтычны падыход. Тут зьяўляецца ашуканства, эстэтычная дэзінфармацыя. Дрэнны варыянт — гэта так званая „самадзейнасьць” зь яе апрацоўкамі народных песьняў савецкімі кампазытарамі. Тут адкрытае разбурэньне традыцыі і падмена яе прымітыўным „вакалам” („медленно, протяжно”).

(Фота Ул. Сапагова)

Гуканьне вясны ў Строчыцах. 1998 г.

* * *

Разгледзім некалькі прыкладаў.

Калі ў пачатку 70-х гадоў голасна заявіў пра сябе ансамбль „Песьняры”, нашае пакаленьне маладых беларусаў успрыняло яго зь вялікай прыхільнасьцю і энтузіязмам. Тым часам ***Рыгор Раманавіч Шырма*** — найвялікшы аўтарытэт у беларускай музыкалёгіі і знаўца народнай музыкі — даволі стрымана аднёсься да іхняе творчасьці. Ён перажываў, што ў „Песьняроў” страчана глыбіня, народны беларускі дух і тонкая эстэтыка традыцыйнае песьні. У гэтым Рыгор Раманавіч, безумоўна, меў рацыю. Але ён не крытыкаваў калектыў публічна. Маэстра разумеў, што „Песьняры” і не прэтэндавалі на народнае выкананьне народных песьняў. Яны рабілі свае аранжыроўкі ў межах свайго стылю і выконвалі ўсё на выдатным прафэсійным узроўні. Народную традыцыю гэта не псавала, бо тут не было яе падмены.

Але поўнае варварства, калі малаадукаваныя культработнікі шырокага профілю вучылі „правільна сьпяваць” народных сьпевакоў, цягаючы іх па розных раённых і абласных аглядах мастацкай самадзейнасьці.

Можна ўявіць, што сталася б з бурацкім ці тувінскім гарлавым сьпевам, ці з азербайджанскім мугамам, ці з грузінскім шматгалосьсем, калі б іхных сьпевакоў павучылі савецкія культработнікі.

У Беларусі захавалася арыгінальнае прасторавае грудное сьпяваньне, заснаванае, як і ўсё старажытнае народнае, на пента-

* Маладая асоба, 22 гады, магчыма, — будучая індывідуальнасьць у музыцы.

тоніцы, бяз ладавай афарбоўкі мэлёдыі. Але ў Беларусі савецкія культмасавікі, што ня ведалі часам элемэнтарных рэчаў, „вучылі" народных майстроў „правільнаму вакалу".

Разбурэньне сьпеўных і выяўленчых традыцыяў ішло за саветамі праз сцэну, самадзейнасьць, радыё і тэлебачаньне. Асноўны вынік гэтай дзейнасьці — стварэньне прымітыўных уяўленьняў пра беларускую народную культуру і стварэньне сцэнічнага паказнога кіча. Аднак самы традыцыі і народная творчасьць жыла не на сцэне і ніколі не існавала на сцэне. Звужалася і зьнішчалася таксама натуральнае асяроддзе і ўмовы існаваньня традыцыяў беларускага народнага мастацтва.

* * *

Для таго каб у грамадстве адбывалася цягласьць народнай культуры, каб з пакаленьня ў пакаленьне перадаваліся традыцыі, неабходна, каб існавала ***пастаяннае насельніцтва на пастаяннай тэрыторыі***. Маецца на ўвазе ня толькі агульнанацыянальны маштаб, але і макрасістэмы ў межах геаграфічных мясьцінаў, адміністрацыйных раёнаў і асобных паселішчаў.

Жыхары паселішча, што існуюць у сфэры нацыянальнай і мясцовай традыцыйнай культуры, жывуць аднačасна і ў сваім макрасьвеце, дзе абкультураныя ня толькі дачыненьні паміж людзьмі, але і ўся акаляючая прастора. Як правіла, кожная дарога, лагчына, камень у полі, ручайкі і рэкі, дрэвы і ўзгоркі, лясы ды палі, масты ды грэблі, крыжы пры гасьцінцы — усё мае свой назоў, сваё слова і сваю гісторыю, адлюстраваную ў памяці пакаленьняў вёскі, хутару, горада ці мястэчка.

Сацыяльна-культурнае жыцьцё паселішча — гэта таксама свая гісторыя і свой сьвет, дзе адбываюцца адметныя падзеі, існуюць адстояныя зьявы і дачыненьні. Тут пастаянна жывуць і нараджаюцца людзі. У іхняй памяці і на іх трымаецца тое, што рабілі, ведалі, стваралі дзяды і прадзеды і пяроймуць потым дзеці і ўнукі. Уся краіна пад вялікім дахам нацыянальнага адзінства складаецца з такіх макрасьветаў і асяродкаў.

Усё спыняецца, калі зьнікаюць носьбіты макраінфармацыі, калі адбываецца замена насельніцтва. Усялякая гвалтоўная масавая міграцыя нават у межах невялікіх тэрыторыяў небясьпечная для традыцыйнай культуры.

Камуністы праводзілі русіфікацыю і рыхтавалі ператтварэньне людзей у савецкі народ, штучна перамешваючы насельніцтва. ***Чарнобыль для Беларусі — гэта ня толькі сацыяльна-экалягічная бяда, але і культурная катастрофа.*** (Маецца на ўвазе страта пастаяннага насельніцтва ў чарнобыльскай зоне.)

Гістарычны вопыт засьведчыў, што людзі на ўзроўні народнай культуры, калі яны адарваныя ад сваёй тэрыторыі і памешчаныя ў іншай, нават блізкай, культурнай супольнасьці, нават трымаючыся кампактна, як правіла, трацяць свае традыцыі і асімілююцца іншым асяроддзем (найдаўжэй — на працягу некалькіх пакаленьняў). Выключэньне складаюць толькі некаторыя народы, мэнтальнасьць якіх абапертая на высокія традыцыі старажытнай культуры, адлюстраванай у помніках пісьмовасьці. Гэта, перш за ўсё, габрэі, кітайцы, у меншай ступені — індусы, карэйцы і арабы.

* * *

Калектыўнае народнае мастацтва, заснаванае на традыцыі, спарадзіла і пакінула шмат фэнамэнальных зьяваў творчасьці. Зьвернем увагу, напрыклад, на архітэктуру готыкі. Шмат якія мастацтвазнаўцы лічаць архітэктуру готыкі цудам чалавецтва, вяршыняй дойлідства. Тым часам гатычная архітэктура ў поўным сэнсе ёсьць народнае рамяство і народнае мастацтва. Яго стварыў народ, рамесьнікі, арганізаваныя ў цэхі, якія зьберагалі традыцыі і таямніцы свайго мастацтва і якое майстры перадавалі з пакаленьня ў пакаленьне. Прафэсійныя (індывідуальныя) архітэктары, што займаліся адным праектаваньнем, зьявіліся пазьней, ў пэрыяд рэнесансу ў Італіі.

Фэнамэнальнай зьявай ёсьць кітайская клясычная паэзія (і зьвязаная зь ёй японская).

Кітайскаму вершаскладанству ўжо тры тысячы гадоў. Гэта індывідуальная творчасьць прафэсійных паэтаў, хоць вершы ў Кітаі вучылі складаць кожнага адукаванага чалавека і кожны дзяржаўны чыноўнік умеў іх пісаць. Тут скарбы трохтысячагадовай кітайскай паэтычнай культуры (зь якой карысталі ўсе пакаленьні), і моцная сіла традыцыяў.

Японцы вытанчылі паэтычную музу, сягнулі ў сутнасьць рэчаў і глыбіню душы, кананізавалі формы вершаў, як музычны акорд: танка — пяць радкоў, злучаныя строфы; хоку — тры радкі. І ні ўлева, ні ўправа: вялікае ў малым.

Тут вольная індывідуальная творчасьць у жорсткай традыцыі. Тым часам такія ўстаноўкі для самавыяўленьня стварала толькі калектыўная народная творчасьць.

Фэнамэн кітайскай і японскай паэзіі вядомы ў сьвеце. Ён ставіцца вельмі высока. І калі я падумаю пра гэта — агортвае мяне нейкая бясьсільная маркота, нібы ад прадчуваньня вялікага марнатраўства.

Бо ёсьць яшчэ адзін незвычайны сінтэтычны (г.зн. злучаны зь некалькіх мастацтваў) фэнамэн творчасьці на ўзроўні вяршыняў чалавецтва — сплаў дзівоснай музыкі і вялікай паэзіі. Гэты фэнамэн — ***беларускі песенны фальклёр***, зьява ўнікальная ў Эўропе.

Але хто ведае пра гэта! Я часта быў сьведкам, калі людзі не маглі яго зразумець, усяроўна, як тыя, што не навучаныя слухаць душой, ня ўмелі ўспрымаць клясычную музыку, ці як тыя (прывыклыя да эўрапейскай шматслоўнай паэзіі), што няўцямна гарталі Сайгё, Бусона, Ісу ці Басё.

За апошнія 40 гадоў выдадзена больш за паўсотні акадэмічных тамоў паэтычных тэкстаў беларускага фальклёру. Справа ня ў тым, што ні ў каго такога няма, што гэтае неверагоднае народнае багацьце (хоць сабранае, на жаль, аднабакова) ёсьць толькі рэшткі з таго, што засталося, што гэтая веліч паказвае на велізарную культуру, якую 200 гадоў адмыслова разбуралі і зьнішчалі варвары. Справа ў тым, што ***гэта ёсьць сусьветны ўзровень***, паэтычная энцыкляпэдыя, філясофія духу, гісторыі, побыту, характару і вобразаў харавства беларускага народу, як частка Боскай існасьціны і Боскай красы.

Хто ведае, хто разумее гэта ў эпоху рэгрэсу і дэградацыі эўрапейскай культуры! Адказ „хто" ды „чаму" ляжыць на паверхні. Толькі я ня буду яго паўтараць. Мы жывем у такім становішчы і ў такую пару, калі кожны да Беларусі прыходзіць сам.

2 красавіка 2001 г., Нью-Ёрк.

(„Беларускія Ведамасьці",— 2001, №7(37).

УНУТРАНАЯ АКУПАЦЫЯ

Беларусь ужо некалькі гадоў як знаходзіцца ў становішчы ўнутранай акупацыі. Для шмат якіх людзей за мяжой, якія не знаёмыя з гісторыяй і палітыкай ва Ўсходняй Эўропе, не зусім зразумела, што гэта за вайна такая, пра якую ня чутно, якой, як быццам, не відаць і што гэта за акупацыя краіны, калі адначасна існуе дзяржава, дзейнічае ўрад ды кіраўніцтва выканаўчай улады?

Тым ня менш факт застаецца фактам: не стралялі, не бамбавалі, не наступалі рускія танкі, ня бачылі акупацыйнага войска, а ўся ўлада ў Беларусі пасьля прыходу Лукашэнкі паступова апынулася ў руках расейцаў — функцыянэраў КГБ, выхадцаў з Расеі. Разгортваецца расейская акупацыйная палітыка, зачыненыя беларускія школы і беларускія клясы, спынена разьвіцьцё беларускай вышэйшай адукацыі, перасьледуецца беларуская мова, спаленыя беларускія падручнікі і зноў фальсіфікуецца беларуская гісторыя, паралізаваная беларуская гуманітарная навука, кнігавыдавецтва і друк, разбураецца нацыянальная літаратура і тэатр, беларускае прадпрымальніцтва, гаспадарка і эканоміка, годнасьць беларускай літаратуры ***Васіль Быкаў*** вымушаны эміграваць, перасьледуецца і топчацца беларуская культура, крок за крокам падрыхтоўваецца злучэньне Беларусі з Расеяй і ліквідацыя Беларускай дзяржавы.

Унутраная акупацыя — гэта захоп улады ў краіне, праведзены зьнешнімі сіламі знутры.

Калі мы паглядзім на беларускі ўрад і на вышэйшыя структуры кіраўніцтва ў цяперашняй Беларусі, то ўбачым, што там практычна ўжо не засталося аніводнага беларуса. Пасьлядоўна, крок за крокам, беларускія функцыянэры, нягледзячы на службовую адданасьць рэжыму, былі выведзеныя з ураду ды іншых вышэйшых структураў улады і замененыя на расейскіх генэралаў, палкоўнікаў, агентаў КГБ-ФСБ.

Тое ж самае адбываецца зь беларускім кіраўніцтвам гаспадарчых і эканамічных структураў.

Паступова, абапіраючыся на ўжо апанаваны ўрад, міністэрствы і незаконнага „прэзыдэнта”, расейскія спэцслужбы займаюць усе вузлавыя пасады ў беларускай сістэме ўлады і кіраваньня. Утвараецца сетка рэзідэнтур расейскай разьведкі, узмацняецца ўнутраная антыбеларуская палітыка, накіраваная на разбурэньне беларускай дзяржавы, дэзарганізацыю грамадства і зьнішчэньне нацыянальнай культуры.

У выніку такой дэзарганізацыі, задушэньня нацыянальнага школьніцтва, беларускай мовы і нацыянальнай культуры, грамадства траціць кансалідацыю, робіцца безабаронным перад чужынцамі. Увесь народ апускаюць у галечу і беднасьць. Ствараюцца ўмовы для лёгкага і дармовага захопу беларускай маёмасьці ды нацыянальнай уласнасьці іншаземцамі. ***Праца беларуса марнуецца, перастае даваць яму прыбытак, грамадства не багацее. Працоўная дзейнасьць чалавека накіраваная толькі на выжываньне. Зьніжаецца рэпрадуктыўнасьць насельніцтва. Нацыя пачынае фізічна выміраць.***

Захапіўшы ўладу знутры, акупанты пачынаюць кіраваць краінай. Яны праводзяць таксама зьнешнюю акупацыйную палітыку, накіраваную з аднаго боку на замацаваньне залежнасьці ад дзяржавы-агрэсара, з другога — на анэксію краіны.

Усё гэта перажывае зараз нашае грамадства. Страціўшы нацыянальнае кіраваньне сваёй дзяржавай, беларусы ня ў стане традыцыйна ўплываць на падзеі.

Рускія спэцслужбы да ўлады на Беларусі прывёў Лукашэнка. Раней ён працаваў у сістэме КГБ і яго ворганаў і атрымаў ад іх падтрымку на прэзыдэнцкіх выбарах у 1994 годзе. (Пра гэта засьведчыў сам Лукашэнка.)

Расейская мафія і КГБ паставілі на Лукашэнку і выйгралі на Беларусі.

Шмат якія людзі не разумеюць, што ж адбываецца ў краіне, альбо разумеюць гэта памылкова, шукаюць прычынаў дрэннага стану там, дзе іх няма.

(Фота С. Грыца)

Менск. Шэрыя шыхты.

Апошнім часам хутка перамянілася сітуацыя ў сьвеце. Зьявіліся новыя сацыяльна-арганізаваныя і тэхналягічныя чыньнікі ў грамадстве, якія далі магчымасьць ужываць нетрадыцыйную тактыку вайны. Гэта, напрыклад, электронная, інфармацыйная вайна, вайна канцэнтраванай тэхналягічнай перавагі ці сацыяльна-палітычная вайна мэтадам татальнага дзеяньня спэцслужбаў *(дзеяньнямі спэцслужбаў можна захапіць краіну).*

Расея якраз і валодае такой па-асабліваму арганізаванай сацыяльна-палітычнай спэцыяльнай сілай, якой зьяўляецца савецкі КГБ.

НКВД-КГБ быў асновай камуністычнай сістэмы таталітарызму. Пасьля распаду СССР гэтая сістэма КГБ не была разбураная і ў цэлым захавала сваю арганізацыю. У выніку КГБ уключыўся ў палітычную барацьбу за дзяржаўную ўладу. На сёньняшні дзень КГБ-ФСБ поўнасьцю распараджаюцца ўладай у Расеі і ў Беларусі.

КГБ — гэта ўжо цяпер ня толькі дзяржаўная структура. ***Гэта палітычная сіла***, якая валодае практычна неабмежаванымі магчымасьцямі: палітычнымі сродкамі ўсёй улады і рэсурсамі ўсёй дзяржавы.

Спрэсаваную дзейнасьць расейскіх структураў КГБ-ФСБ, накіраваную на захоп улады ў Беларусі, нашае грамадзтва адчула не адразу. На пачатку гэта была нябачная вайна, зразумелая толькі нямногім, бо яна пачыналася як працяг зьнішчэньні людзей сыгралі якраз спэцслужбы таталітарных краінаў. ***Пры разбурэньні таталітарызму першым чынам неабходна было расфармаваць злачынныя спэцслужбы.*** Што і было зроблена пры ліквідацыі фашыстоўскага (і пазьней савецкага) рэжымаў ў Нямеччыне.

Аднак пасьля распаду Савецкага Саюзу засталіся амаль некранутымі ня толькі крывавы НКВД-КГБ, але і ў грунце сваім — расейская каляніяльная імпэрыя.

Абаронім дзяцей...

каляніяльнай савецкай палітыкі ў звыклых савецкіх формах і ажыцьцяўлялася прывыклай савецкай адміністрацыяй. І толькі потым, калі стала ўсё відавочным і ўзьнікла іншая штодзённасьць, грамадзтва на ўзроўні звычайнага чалавека зрэагавала на адмоўныя перамены.

Азіраючыся на крывавае ХХ-е стагоддзе, мы бачым, што найбольш злавесную ролю ў падрыхтоўцы вайны і ў масавым

Агрэсіўная таемная арганізаваная сіла, якая ня мела нацыянальных межаў, пакінутая сама з сабой, мусіла была знайсьці сваю рэалізацыю ў рускай вялікадзяржаўнай палітыцы.

Яна стала ажыцьцяўляць гэтую палітыку найперш у Беларусі, распачаўшы захоп краіны і вайну — бяз зброі.

28 студзеня 2001 г., Вільня.

ЗМАГАНЬНЕ ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

Разьвіцьцё цывілізаванага грамадзтва, сістэма і структурызацыя ўлады рухаліся такім чынам, што ў непасрэднае змаганьне за ўладу ўцягваліся ўсё большыя масы людзей. Адбываецца дыферэнцыяцыя палітычных інтарэсаў, утвараюцца групы, што выяўляюць гэтыя інтарэсы, узьнікаюць канфлікты паміж агульнымі і групавымі патрэбамі. Адчыняюцца магчымасьці для маніпуляцыяў народам і масавай сьведамасьцю людзей.

У стабільнай і суверэннай нацыянальнай дзяржаве такое становішча ня ёсьць найлепшым. Але, як правіла, існуе магчымасьць яго выправіць і ўдасканаліць.

Другое, што важна: нават найгоршы стан палітычных дачыненьняў не пагражае існаваньню грамадзтва, не зачыняе пэрспэктывы яго разьвіцьця. Гісторыя паказвае, што нават самы дрэнны ўнутраны палітычны рэжым ня можа зьнішчыць народ, нацыю і дзяржаву. Самазьнішчэньня не адбываецца.

Гісторыя зноў жа сьведчыць, што ні адзін незалежны народ, ні адно незалежнае грамадзтва не загінула ад дрэннай унутранай палітыкі, ад унутранай тыраніі, ад дрэннай эканомікі і нават ад голаду, ***калі яно здолела захаваць сваю дзяржаву і незалежнасьць***.

Паўночныя карэйцы маюць пэрспэктыву (хоць цяпер у іх кашмарны рэжым і дрэнная ўнутраная палітыка), кубінцы таксама маюць пэрспэктыву (хоць цяпер там беднасьць і дыктатура). А вось пэрспэктыва курдаў, чувашоў ці мардвы — пад вялікім пытаньнем. Чаму — я думаю, зразумела.

Народ, які ня мае дзяржавы і незалежнасьці, — ня мае магчымасьці свабодна распараджацца сваёй дзейнасьцю і разьвіваць свае інтарэсы. Яго дзейнасьць, у лепшым выпадку, накіраваная тады на выжываньне і на змаганьне за існаваньне, у горшым — на прыстасаваньне.

Вынік можа быць дваякім: альбо народ вытрывае і, скарыстаўшы магчымасьць, створыць дзяржаву і дамажацца незалежнасьці, альбо зьнікне з кнігі жыцьця.

Незалежная дзяржава ёсьць найвялікшая палітычна-праўная каштоўнасьць нацыі.

У стварэньні незалежнай дзяржавы ёсьць сэнс народнай гісторыі. У арганізацыі ўлады ў дзяржаве, у змаганьні за ўладу заключаецца сэнс палітыкі.

Найцяжэй незалежнасьць дасягаецца паўторна, у працэсе дэкалянізацыі і ў змаганьні з імпэрыяй. Дасягненьне незалежнасьці і адстойваньне свабоды тут немагчымае без барацьбы ўсяго грамадзтва.

Вельмі істотна, каб пасьля перамогі тыя, хто змагаліся за незалежнасьць, адразу мелі ўладу ў краіне, адхілілі ад кіраваньня каляніяльную адміністрацыю, ліквідавалі б імпэрскі і заклалі б свой нацыянальны парадак. Гэтым адсякалася б умяшаньне старой імпэрыі ва ўнутраныя справы незалежнай дзяржавы. Далейшае, рэглямантаванае законам, змаганьне за ўладу адбывалася б ужо як суверэнная справа вольнай краіны.

Пасьля распаду СССР толькі народы Прыбалтыкі поўнасьцю ажыцьцявілі неабходныя палітычныя пераўтварэньні, якія гарантавалі незалежнасьць і стабільнасьць улады, заснаванай на нацыянальных інтарэсах.

Складаная сітуацыя ствралася ў Беларусі. Тое, што аднавілася незалежная Беларусь, для Масквы стала поўнай нечаканасьцю. 200 гадоў Масква практыкавала асаблівую палітыку супраць Беларусі — свайго галоўнага ворага на захадзе. Было зроблена ўсё, прытым самым варварскім чынам, каб Беларусь ужо ніколі не паднялася і не існавала. І раптам ... — незалежная Беларусь.

Разгубленасьць расейцаў хутка скончылася. Ужо ў 1992 годзе беларускія адраджэнскія сілы адчулі наяўнасьць ў Беларусі маскоўскіх палітычных тэхналёгіяў. Стаўка расейцаў рабілася на КГБ і савецкую намэнклятуру, якая засталася пры ўладзе. Задача — пранікненьне расейскіх спэцслужбаў на вузлавыя пазыцыі ўлады ў Беларусі, увядзеньне ў палітычную рэальнасьць ідэі інтэграцыі з Расеяй (праз аб'яднаньне грашовых сістэмаў), увядзеньне пасады прэзыдэнта і ўсталяваньне на ёй свайго стаўленьніка.

Гэтыя дзеяньні маскоўскіх палітыкаў і КГБ былі настолькі відавочнымі, што ня бачыць і не разумець таго, што адбывалася, маглі толькі сьляпыя.

25 студзеня 1994 года, выступаючы ў Вярхоўным Савеце ад імя Апазыцыі Беларускага Народнага Фронту, я адзначыў: *„Руская мафія і рускія спэцслужбы імкнуцца захапіць ключавыя пасады ў беларускай дзяржаве і паздымаць зь іх беларусаў, гэтак жа, як яны пры дапамозе Кебіча і Данілава* паздымалі беларусаў у беларускім войску і зьмянілі беларускае кіраўніцтва буйнейшых заводаў на рускіх функцыянэраў.*

Спадар Кебіч і яго акружэньне здрадзілі Беларусі. Яны імкнуцца любымі сродкамі жорстка цэнтралізаваць уладу, рыхтуюць палітычныя ўмовы для інкарпарацыі Беларусі ў склад Расеі перад афармленьнем эканамічнай авантуры аб уваходжаньні Беларусі ў грашовую сістэму Расейскай Фэдэрацыі. Такая палітыка ёсьць антыдзяржаўная палітыка і зьяўляецца злачынствам...

Грамадзяне Беларусі павінны выразна ўсьведамляць, што галоўная небясьпека цяпер для нашага грамадзтва і галоўны вораг нашай дзяржавы ёсьць рускі палітычны і эканамічны імпэрыялізм і кампрадорская дзейнасьць ураду Кебіча." (Беларус, — 1994, люты, №410)

Аднак казаць камуністычнаму парляманту пра небясьпеку для Беларусі было дарэмна. Грамадзтва ж у масе сваёй заставалася савецкім. Потым здрадніцкую эстафэту Кебіча пераняў Лукашэнка.

Палітыканскія тэхналёгіі чужакоў і палітычных цынікаў бездапаможныя, калі ёсьць масавы народны грамадзкі ўздым на змаганьне за агульныя інтарэсы. Тады цынічныя тэхналёгіі можна лёгка адкінуць і перакуліць. Але ўжо ў сярэдзіне 1992 года ўздым скончыўся, а ўлада ў Беларусі не зьмянілася, засталася ў руках савецкай намэнклятуры.

Такім чынам ***пэрыяд стабілізацыі незалежнасьці пачаўся са старой каляніяльнай адміністрацыяй ва ўладзе***, для якой чужымі былі ня толькі беларускія нацыянальныя інтарэсы, але і ўвогуле якое-небудзь нават самае простае дзяржаўнае думаньне. ***Тыя, хто дамагліся незалежнасьці Беларусі, не маглі рэальна ўплываць на палітыку дзяржавы.***

Непрыяцелі беларушчыны, валодаючы ўладай і сродкамі масавай інфармацыі, арыентавалі сваю прапаганду на людзей з дэфармаванай нацыянальнай сьведамасьцю і яшчэ больш дэфармавалі яе. Мноства беларусаў слухалі, верылі і падтрымлівалі не сваіх беларусаў-адраджэнцаў, а ворагаў Беларусі. Сытуацыя склалася амаль трагічная.

Але тут не было нічога незвычайнага. Гэта адваротны бок мэдалю нашай вялікай нацыянальнай перамогі ў 1991 годзе, калі на агульным уздыме, дзейнічаючы дакладна і своечасова, беларускім адраджэнцам удалося дамагчыся незалежнасьці, спыніць дзейнасьць КПСС, вярнуць нацыянальныя сымвалы і беларускія школы. Тым часам вялікая частка грамадзтва не была яшчэ гатовая да актыўных дзеяньняў па абароне незалежнасьці, не разумела каштоўнасьці свабоды, ня ведала, як сябе паводзіць, не арыентавалася, хто сябры, а хто ворагі.

Пасьля выбараў прэзыдэнта летам 1994 года я зьвярнуўся да людзей зь лістом, які быў напісаны, праўда, хутчэй да будучых беларусаў, чым выбаршчыкаў, якія толькі што абралі Лукашэнку. Там напісана: *„Народ, які шмат гадоў атручвалі камуністычнай прапагандай, пастаўлены перад выбарам: альбо незалежная эўрапейская дзяржава Беларусь і самастойная палітыка, альбо страта незалежнасьці і нацыянальнай пэрспэктывы ў абмен на прывідныя абяцанкі апекі іншай дзяржавы. Гэты выбар галоўны, бо вызначае наш народны лёс.*

23 чэрвеня ён адбыўся на карысьць страты, адбыўся хутчэй неўсьвядомлена, пад уплывам прапаганды і дэмагагічнай агітацыі." (Беларус, — 1994, ліпень, №414)

Праз два гады пасьля зьяўленьня прэзыдэнта-крэатуры КГБ, практычна ўсе дасягненьні беларускага адраджэньня ўнутры краіны былі ліквідаваныя.

Наступнай стратэгічнай задачай расейскай тэхналягічнай палітыкі ў Беларусі стала зьнішчэньне беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, канкрэтна — Беларускага Народнага Фронту. Скарыстоўвалі тыповыя прыёмы НКВД, якія заключаліся ў фізічнай ліквідацыі кіраўнікоў руху, у стварэньні нібыта больш шырокай квазіапазыцыйнай арганізацыі, у якую ўваходзіла б рэальная нацыянальна-вызвольная арганізацыя, ствараліся б нібыта сумесныя структуры і на тое падобнае. У выніку дзейнасьць нацыянальна-вызвольнай арганізацыі была б абмежавана, назва яе зьнікла б з палітычнага ўжытку, яе ўцягвалі б у дыскусіі ды канфлікты і, пры дапамозе агентуры, даводзілі б да развалу.

Характэрнай акцыяй такога роду была ініцыятыва стварэньня так званай „хартыі-97", якую шырока падтрымлівалі (нават у міжнародным пляне) у асноўным праз журналістаў. Аднак разгарнуць афёру з „хартыяй" не ўдалося. Адраджэнцы раскусілі задуму.

Больш сур'ёзнай і выніковай аказалася тэхналёгія стварэньня сваёй, паралельнай Вызвольнаму Руху намэнклятурнай апазыцыі да рэжыму і перацягненьня ўвагі на яе, стварэньне ілюзіі іншай альтэрнатывы для дыктатуры.

* За часы БССР высокапастаўлены чыноўнік у Менскім Абкаме партыі, курыраваў КГБ. Ва ўрадзе Кебіча кіраваў антыканстытуцыйнай структурай (Дзяржсакратарыятам), створанай пад ціскам Масквы і КГБ. *(аўт.)*

У арганізацыі намэнклятурнай ***неадраджэнскай*** апазыцыі найбольш стараўся нямецкі дыплямат Ганс Георг Вік, былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны, а цяпер старшыня Місіі АБСЭ ў Менску. Тут расейская дзейнасьць і нямецкая палітыка супадаюць. Нямецкая дыпляматыя дапамагае расейцам інкарпараваць Беларусь узамен за магчымыя эканамічныя ўступкі немцам у Калінінградзкай вобласьці. Вядома, што прамаскоўскія дзеячы („дэмакраты") зь некаторых заходніх фондаў, якія падтрымлівалі грантамі сваю матэрыяльна-залежную агентуру ў „апазыцыі", канкрэтна ўмешваліся ў справу разбурэньня адраджэнцкай палітыкі Фронту і патрабавалі пэўных дзеяньняў супраць кіраўніцтва БНФ. Частка людзей з БНФ перайшла ў кіруемую „аб'яднаную апазыцыю", але зьнішчыць БНФ і разбурыць Беларускі нацыянальна-вызвольны рух не ўдалося. Фронт ачысьціўся ад „прагматыкаў". Аднак падзел Фронту дрэнна адбіўся на ўсёй сытуацыі палітычнага змаганьня ў Беларусі.

Намэнклятурная ці так званая „аб'яднаная апазыцыя", створаная Гансам Вікам, у рэальнасьці зьяўляецца даволі ілюзорнай зьявай і трымаецца на прапагандзе, на „арыентаваных" (так званых „незалежных") рускамоўных СМІ. Яна, практычна, поўнасьцю залежная ад фінансавай дапамогі з Усходу і Захаду (а гэта абмяжоўвае самастойнасьць). Рэальнай палітычнай сілай яна ня ёсьць, альтэрнатывай рэжыму не зьяўляецца, інтарэсы беларускага народу не выяўляе, вялікіх агульнанародных ідэяў ня мае.

Паглядзім, што за людзі выступаюць пад шапкай так званай „аб'яднанай апазыцыі".

Гэта былы савецкі прафсаюзны намэнклятуршчык **У. Ганчарык**; гэта генэрал **П. Казлоўскі** — былы міністар абароны, які павыганяў беларускіх афіцэраў зь беларускага войска; гэта былы прэм'ер-міністар **М. Чыгір** — некалі першы памочнік Лукашэнкі, які кантактуе цяпер з рускім ФСБ (карупцыйную дзейнасьць Чыгіра раскрыў з парляманцкай трыбуны Беларускі Народны Фронт. Даклад С. Антончыка); гэта былы намэнклятуршчык з каманды В. Кебіча — **С. Домаш**; гэта былы 1-ы сакратар райкама КПСС і першы хаўрусьнік Лукашэнкі — **Л. Сініцын**; гэта былы адданы прыхільнік Лукашэнкі і былы сакратар ЦК ЛКСМБ **А. Фядута** — перапоўнены нянавісьцю да Беларускага Народнага Фронту і беларускага Адраджэньня; гэта былы яры камсамолец і няверны слуга Лукашэнкі **А. Лябедзька** і іншыя асобы.

Гэта ўся былая савецка-камуністычна-камсамольская намэнклятура. Яны ніколі не падтрымлівалі беларускае Адраджэньне, яны не падтрымлівалі беларускую нацыянальную ідэю і незалежнасьць Беларусі. Усе яны выступалі супраць Беларускага Народнага Фронту і паўтаралі самыя дзікія кагэбоўскія і камуністычныя выдумкі пра Фронт. Усе яны з каманды Лукашэнкі і шмат хто зь іх заграз у карупцыі, грантах ды падачках. **Усе яны заўсёды парабску глядзелі на Маскву** і цяпер езьдзяць туды адзін за другім шукаць грошай і падтрымкі.

Вось такую кампанію сабралі для беларусаў і кажуць, што гэта „апазыцыя", маўляў, галасуйце за іх, гэта лідары нацыі, цярпельцы, розум ды сумленьне, яны за дэмакратыю.

Мэтад расейскіх спэцслужбаў вядомы: кантроль над уладай і стварэньне сваёй „апазыцыі". Масква зноў, як і ў 1994 г., хоча падрыхтаваць сабе бяспройгрышны варыянт.

1 сакавіка 2001 г.
Нью-Ёрк.

Марка БНР.

АНТЫБЕЛАРУСКАЯ ПРАПАГАНДА

Мэтанакіраваная антыбеларуская прапаганда пастаянна і мэтадычна цягнецца вось ужо скора сто гадоў. Яна пачалася адразу пасьля стварэньня беларускай палітычнай партыі нацыянальнага адраджэньня ў 1903 годзе (Беларускай Сацыялістычнай Грамады), пасьля зьяўленьня газэтаў *„Наша Доля"* (1906 г.) і потым *„Наша Ніва"* (у гэтым жа годзе), пасьля арганізацыі беларускага тэатру і з пачаткам творчасьці ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа***. Усё гэта ў адзін і той жа час.

Царскія ахоўніцкія службы арганізавалі тады свае псэўдабеларускія арганізацыі, пачалі выдаваць свае газэты на расейскай мове, якія якраз і займаліся ганьбаваньнем усяго беларускага.

Такімі арганізацыямі былі, напрыклад, таварыства „Крестьянин" і аднайменная антыбеларуская газэта ў Вільні, узначаленыя агентам Кавалюком. У „таварыства" ўваходзіла каля 30-ці чыноўнікаў ведамства ўнутраных справаў Расеі.

Праз два гады (у 1908 г.) каляніяльныя ўлады стварылі ў Вільні яшчэ адну антыбеларускую арганізацыю „Белорусское общество"; яго ўзначаліў беларусафоб Лукаш Саланевіч. „Общество" выпускала газэту „Белорусская жизнь", якая ў нянавісьці да беларускага Адраджэньня ня мела сабе роўных.

Пазьней Саланевіч трапіў у рускую эміграцыю і выхваляўся, што ён, хоць па паходжаньні „таксама беларус", але выхоўваўся на паэзіі Пушкіна і песьнях Вярцінскага, „а ня нейкага там Купалы".

Быў яшчэ такі беларусафоб Пшчолка ды поп Шофер — кіраўнік чарнасоценнага „Саюзу Міхаіла Архангела" ў Менску і іншыя чарнасоцынцы.

Потым эстафету перанялі камуністы-бальшавікі.

Цяпер, пасьля захопу ўлады ў Беларусі і Расеі, шальмаваньне беларусаў падхапілі савецкія кагэбісты. Зрэшты, незалежна ад палітычнай афарбоўкі ўлады, антыбеларуская прапаганда заўсёды была прэрагатывай рускіх спэцслужбаў. У кагэбоўскай Беларусі яна, гэтак жа, як некалі ў СССР, зьяўляецца дзяржаўнай палітыкай і праводзіцца адкрыта, грубымі спосабамі.

18 сакавіка гэтага году афіцыйнае тэлебачаньне ў Менску (праграма „Рэзананс") выпусьціла свой чарговы паклёп на беларускае Адраджэньне, беларускія ідэі і беларускую інтэлігенцыю. Словы дыктара ілюстравалі, як звычайна, кадрамі нямецкай фашысцкай кінахронікі пэрыяду 2-й Сусьветнай вайны, якія, па задуме прапагандыстаў, павінны былі пасеяць ўяўленьні, што беларуская адраджэнская інтэлігенцыя — гэта фашысты, што беларускія змагары за незалежнасьць Беларусі такія ж, як і гітлераўцы, маюць такія ж самыя мэты і здольныя рабіць такія ж самыя справы. (Гэта значыць, усталяваць у Беларусі фашысцкі рэжым, пабудаваць канцлягеры,

зьнішчыць усіх неарыйцаў (небеларусаў) і, магчыма, разьвязаць вайну ды напасьці на „мірную” Расею.)

Тут не паранойя, а зласьлівы разьлік на зацемненую сьведамасьць у грамадзтве. Прапаганда абсурду і хлусьні якраз і спараджае такую сьведамасьць.

Шмат ёсьць прыёмаў у прапагандыстаў, калі прыдумваецца нейкі абсурдны тэзіс, які спачатку прыпісваюць беларускаму палітыку ці грамадзкаму дзеячу, а потым пачынаюць гэты свой тэзіс удавана гнеўна і злосна высьмейваць.

Затым ідзе апытаньне з тэлекамэрай простых людзей на вуліцах, каб пачуць „голас народа”. Гавораць, напрыклад, якое-небудзь глупства, скажам, пра ліквідацыю ўсялякіх пэнсіяў, ці пра расстрэл усіх камуністаў, ці пра высяленьне ўсіх рускіх і пытаюць у цёткі на тратуары: маўляў, такі і гэтакі кажа так і гэтак. „Как вы к этому относитесь?” Цётка, вядома, кажа, што дрэнна адносіцца. Мэта дасягнута. Ёсьць голас народа.

У прынцыпе — ***гэта сталінская прапаганда***. Яе прыёмы ўзьніклі ў чорна-белых уяўленьнях сталінскіх энкавэдэшнікаў ды партыйных апаратчыкаўаў, для якіх сьвет складаўся з пралетарыяў і капіталістаў, зьмест гісторыі быў у клясавай барацьбе, а сэнс палітыкі — у зьнішчэньні ворагаў.

У расейскай каляніяльна-акупацыйнай палітыцы такая сьведамасьць выяўляецца ў вельмі распаўсюджаным для энкавэдзістаў прыёме, калі прыдумваецца вэрсія (напрыклад, неіснуючы „Саюз вызваленьня Беларусі”, як было у 30-х гадах мінулага стагоддзя), якая выдаецца за рэальны факт і пад яго ажыцьцяўляюцца рэпрэсіі (выбіваюцца паказаньні шляхам катаваньняў, судзяць, расстрэльваюць, ссылаюць і г.д.). У прапагандзе „вэрсіі” прыдумваюцца, каб наводзіць паклёп.

На савецкім радыё і тэлебачаньні сталінская прапаганда найбольш буяла ў часы халоднай вайны. (Каго там толькі ні „закляймілі” савецкія „журналісты”).

Развалíўся Савецкі Саюз, зьнікла КПСС, але засталіся кагэбоўскія „тэлепрапагандысты”. У Расеі гэта цэлая група тэлестукачоў на ГРТ („ОРТ”) і іншых расейскіх каналах, розныя дарэнкі, шараметы ды няўзоравы палохаюць расейцаў Чачнёй, якая, калі паслухаць гэтых „дыктараў”, напала на Расею, хоча захапіць і зьнішчыць увесь рускі народ.

У Беларусі ў электронных СМІ распараджаецца свая група. Тут прыдуманыя свае вэрсіі і свае аб’екты нянавісьці (ворагі). Але мэтады аднолькавыя — сталінскія і гэбэшныя.

Характар тэлепрапаганды адлюстроўвае характар улады, якая усталяваная ў Беларусі і ў Расеі.

Чарговы выказ нянавісьці на менскім тэлеэкране 18 сакавіка зьвязаны з надрукаваньнем майго артыкула „Амэрыка для амэрыканцаў” у газэце „Народная Воля”. Там якраз расказана пра мэтодыку кагэбоўскай прапаганды супраць ідэяў беларускай незалежнасьці, дэмакратыі і свабоды. Тое, што стварылі 18 сакавіка на афіцыйным тэлебачаньні ў Менску, дакладна адпавядае той схеме паводзінаў, пра якую якраз і напісана ў публікацыі.

З гэтага гледзішча праграма менскага тэлебачаньня „рэзананс” на 18 сакавіка гэтага года ёсьць пазнаваўчым ілюстрацыйным матэрыялам да артыкула „Амэрыка для амэрыканцаў”. Нэгатыўную прапаганду спэцыялістам таксама трэба ведаць, каб разумець, якім чынам яна ўзьнікае.

І сапраўды, па гёбэльсаўскай прапагандзе напісана шмат дасьледчыцкіх працаў, выдадзена шэраг кніг. Па сталінскай — ніводнай. У нас жа, у Менску, цэлыя залежы сталінізму, жывы рэлікт, які практычна ўжо не трансфармуецца. Гэта абсалютна ўнікальная зьява — машына часу, назіраньне за якой дазваляе апусьціцца гадоў на 70-40 у гісторыю СССР. Здалёку ўсё добра відаць. Дарэчы, я зусім не іранізую, бо схільны падыходзіць тут да справы як дасьледчык. Рэлікт пара вывучаць, бо калі зьнікне, будзе позна.

Зыходзячы з дасьледчыцкага інтарэсу, працытую тую частку майго артыкула і палажэньні, якія сваёй перадачай праілюстравала праграма тэлебачаньня:

„Тры зьявы Беларускага Адраджэньня выклікалі асаблівую нянавісьць у рускіх бальшавікоў — гэта дзейнасьць Рады БНР, беларускае адраджэньне ў час 2-й Сусьветнай вайны за немцамі і вызвольны лёзунг „Беларусь — для беларусаў”.

У зьнеслаўленьні гэтых каштоўнасьцяў бальшавіцкая прапаганда выкарыстоўвала толькі адзін псіхалягічны аспэкт: падсьведамасьць нянавісьці Другой Сусьветнай вайны.

Усё нацыянальнае беларускае, што завязана было з нацыянальнай ідэяй і беларускім адраджэньнем, аб’яўлялася фашысцкім: ці гэта беларускі нацыянальны Бел-Чырвона-Белы Сьцяг, ці гэрб Пагоня, ці імёны забароненых вялікіх паэтаў, нават проста размова па-беларуску ва ўнівэрсытэце ці ва ўстанове — усё кваліфікавалася стукачамі, савецкімі абывацелямі і прапагандыстамі як „фашызм”. Беларускае падавалі ў двух азначэньнях: альбо „мужыцкае”, альбо — „фашызм”.

Руская камуністычная прапаганда ў Беларусі паўтарала гэтыя, скажам проста — ідыёцкія ярлыкі, з дня ў дзень, тупа, ненавісна і пастаянна, пакуль існаваў СССР.

Палітычная формула нацыянальна-вызвольнага руху „Беларусь — для беларусаў” перакручвалася пад савецкія ідэалягічныя ўяўленьні. За часы камуністычнага СССР ідэалёгіяй рускага імпэрыялізму і русіфікацыі быў так званы „інтэрнацыяналізм”, згодна якога нібыта сьціраліся адрозьненьні паміж акупаванымі народамі ды расейцамі і ствараўся так званы „адзіны савецкі народ” (гэта значыць „адзіныя расейцы”). Палітычны лёзунг нацыянальнай свабоды камуністы апускалі на этнічны ўзровень і тлумачылі, што беларускія „нацыяналісты” (а, значыцца, — „фашысты”) хочуць выгнаць зь Беларусі ўсіх расейцаў, усіх габрэяў, усіх, хто не беларусы, і стварыць этнічна чыстую дзяржаву.

(Фота: „Wprost”)

Менск-96. Сутычка на вуліцы.

Тым часам ***палітычны зьмест лёзунга вызвольнага руху мае антыкаляніяльны сэнс і вырашае пытаньне, каму павінна належыць краіна і хто ў ёй гаспадар****, а ня тое, хто ў ёй павінен жыць (як спэцыяльна перакручвалі калянізатары).*

Злавеснае адценьне набывае подласьць гэтай прапаганды, калі ўлічыць, што этнічныя чысткі і генацыд ажыцьцяўлялі якраз камуністы ў Савецкім Саюзе (прымусовае высяленьне татараў, чачэнцаў, інгушоў і інш.), у былой Югаславіі, у камуністычнай Польшчы (прымусовае высяленьне ўкраінцаў), у камуністычнай Балгарыі (дачыненьні да турак) і г.д. Я ўжо не кажу пра Кітай і азіяцкія рэжымы.

Тым часам нічога падобнага не рабілі дэмакраты і нацыянальна-вызвольныя рухі. У іх іншая, не таталітарная прырода.

Але трэба ведаць камунізм і Расею, каб зразумець характар іхняе прапаганды, пабудаванай на агрэсіўнай хлусьні.

Рэцэдывы гэтай прапагандысцкай агрэсіі мы сустракаем і цяпер. Нічога дзіўнага — існуюць пастаянныя крыніцы рэпрадукцыі старой нянавісьці да беларускага адраджэньня — гэта савецкая псіхалёгія часткі насельніцтва і — галоўнае — нязьменнасьць імпэрскай палітыкі Расеі ў дачыненьні да Беларусі.”

Праграма „Рэзананс” пацьвердзіла ўсе мае высновы.

Можна задаць пытаньне, чаму шалёная антыбеларуская прапаганда такая прымітыўная. Прычына ў тым, што гэтакія людзі, як на тэлебачаньні, і сістэма, у якой яны існуюць, ёсьць, як заведзены будзільнік. Гэта машынка, якая сама па сабе ня думае і думаць ня можа. Той, хто займаецца палітычнай арганізацыяй людзей, ведае, якую шкоду робяць для арганізацыі дурні, асабліва ў кіраўніцтве. Але ў беларускай рэчаіснасьці гэта ня самая вялікая бяда. Дурня-кіраўніка, патраціўшы шмат энэргіі, можна ў нечым пераканаць, нешта яму растлумачыць, нарэшце, прымусіць яго падпарадкавацца закону лёгікі ці бальшыні калектыву.

Калі ж у кіраўніцтве палітычнай арганізацыі агент-стукач, то ўсе дзеяньні і размовы зь ім — марната часу. Машынка заведзеная, і ўсе вашы лягічныя аргументы (і тым больш — эмоцыі) ні да чаго. Будзільнік будзе званіць сваё.

У нестукачоў гэтай машыннай сістэмы таксама свая псіхалёгія (свой унутраны будзільнік). Памятаю, за саветамі ў парткам аднаго акадэмічнага інстытута патэлефанавалі з ЦК, што інстытуту неабходна прыняць польскую дэлегацыю ветэранаў вайны. Дырэктару загадалі зрабіць даклад пра савецка-польскае брацтва і т.п.

За некалькі дзён да прыёму паведамілі, што польскіх ветэранаў ня будзе, прыйдуць савецкія. Дырэктар (таварыш, які трэба) моцна напружваўся, каб зразумець сітуацыю. Але калі, бразгаючы мэдалямі, прыцягнуліся савецкія ветэраны, ён так і ня змог пераарыентавацца. Дырэктар усяроўна прывітаў „польскіх ветэранаў”, не адрываючыся ад паперкі, якую раней падрыхтаваў і якую адобрылі ў ЦК, сказаў пра ўклад польскай зброі ў разгром агульнага ворага і прачытаў даклад пра польска-савецкае брацтва.

Ніхто з савецкіх ветэранаў нічога не западозрыў. (Праўда, адзін усё нешта галавой круціў. Але, як высьветлілася, ён проста лічыў прысутных — „все ли в сборе”). Поўная адпаведнасьць попыту і прапановы.

Вось так і зь менскім тэлебачаньнем, і зь яго афіцыйнай праграмай. Жывая гісторыя саветызму. Матэрыялізацыя залюстранай рэчаіснасьці.

Дасьледваньнем і іроніяй, аднак, тут справа не павінна абмежавацца. У нянавісьці да ўсяго беларускага прыслужнікі рэжыму на менскім тэлебачаньні перакрочылі ўсе межы. Тыя зьнявагі ў адрас беларускай нацыі, беларускай гісторыі і беларускіх людзей, той бруд, які выліваецца тэлебачаньнем на ўсё беларускае, немагчыма цярпець, нельга забыць і ніколі нельга даравацъ.

Якім трэба быць злым, якім адшчапенцам, да якой нізасьці можа апусьціцца чалавек, каб сусьветна паважанага пісьменьніка, вялікую асобу, гонар беларускай нацыі — ***Васіля Быкава*** — абзываць „літаратурным паліцаем”. А менавіта гэтакія словы гучаць у адрас Васіля Быкава на менскім афіцыйным тэлебачаньні, якое, гэтак жа, як і расейскае, ілюструе, што нічога там няма сьвятога, нічога людзкага і нічога беларускага.

Пасьля ліквідацыі акупацыйнага рэжыму ў Беларусі мусяць адбыцца глыбокія перамены ў сацыяльным грамадзтве. ***Людзі подлыя, нізкія, амаральныя, беларусафобы і прадажнікі не павінны будуць займаць пасады дзяржаўнага і высокага грамадзкага ўзроўню.*** Цяперашняе становішча вельмі выразна паказвае, што адбываецца, калі нізкасьць падымаецца ўгару.

Каб запабегчы сацыяльнаму самаатручваньню, супольнасьць мае шэраг грамадзкіх мэханізмаў. Але пасьля ліквідацыі рэжыму (асабліва напачатку) шмат павінна будзе ў гэтым паспрыяць абноўленая, вольная і справядлівая Беларуская Дзяржава.

Марка БНР.

23 сакавіка 2001 г., Нью-Ёрк.

ЧУЖАЯ СУЧАСНАСЬЦЬ І БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІТЫКА

Напісаць гэтыя кароткія развагі мяне падахвоціў Яўген Міраневіч.

У канцы красавіка мяне і вядомага польскага перакладчыка беларускай паэзіі Чэслава Сэнюха запрасіла шаноўная спадарыня прафэсар Альжбэта Смулкова прыехаць у Беласток ва ўніверсітэт на катэдру беларускай культуры, спаткацца з выкладчыкамі ды паразмаўляць пра беларускую гісторыю і маю фота-кніжку „Глёрыя Патрыя”. Гэтая кніжка для мяне — мінулы час дваццацігадовай даўнасьці, хоць і вельмі дарагі.

Прыехалі мы са спадаром Чэславам Сэнюхам, хараша нас спаткалі, сардэчна пагаварылі, кава-гарбата, навокал добрыя людзі, шчырыя беларусы: Яўген Міраневіч — гісторык, аўтар выдатных кніжак, Алег Латышонак, Віталь Луба, выкладчыкі, журналісты.

Вярнуўся я ў Варшаву і праз нейкі час чытаю ў беластоцкай *„Ніве"* артыкул *(13 траўня 2001 г.);* піша сімпатычны Яўген Мірановіч:

„Чытаючы і праглядаючы кніжку Зянона Пазьняка „Глёрыя Патрыя"., можна зразумець, чаму аўтару не пашанцавала ў палітычнай дзейнасьці... Ня веру, што посьпеху ў палітыцы можа дачакаць чалавек, які піша: „Мілая Радзіма, Ты — уся мая памяць. Усё, што бачыў і перажыў за жыцьцё, усё, што пра Цябе чуў і чытаў, і нават уяўляў — усё са мной. Ты такая вялікая і прыгожая перапоўніла маё сэрца і маю галаву..," — і далей, — „Глёрыя! Хвала! Хвала цьвітучаму дрэву! Хвала зямлі і людзям..."

Потым робіцца заключэньне: *„Зьмест кніжкі паказвае, што Пазьняк зьяўляецца фанатыкам жыцьця* (якім толькі мяне „фанатыкам" ужо ні называлі) *і бліжэй яму па натуры да лідэра экалягічнага руху, чым праваДыра народу, які стаіць на ростанях і ня ведае, у які бок павярнуць — да незалежнасьці ці каляніяльнага статусу."*

Далей сябра Мірановіч тлумачыць свае погляды, чаму ён так піша. Пазьняк, на яго думку, *„гаварыў тое, што думаў, а гэта не найлепшая прыкмета для палітыка. Посьпех у палітыцы, —* лічыць Яўген Мірановіч, — *забраніраваны цынікам, якія гатовыя здрадзіць найлепшаму сябру, ідэі, за якую толькі што выказваліся, зьнішчыць тысячы людзей, каб дамагчыся намечанай мэты... Узорам сучаснага палітыка, які, напэўна, ня піша вершаў, а малапраўдападобна, што іх калі-небудзь чытаў, зьяўляецца прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Квасьнеўскі... Пазьняк разважае пра сьвет у катэгорыях маральнае — немаральнае, справядлівае — несправядлівае, хаця ў палітыцы няма месца на маральнасьць. Ведае пра гэта кожны гмінны чыноўнік, кожны павятовы радны і нават парафіяльны вікарны..."* і г.д.

Такія погляды, якія выказаў паважаны сябра Мірановіч, даволі пашыраныя і характэрныя для людзей, якія палітыкай не займаюцца, але, спажываючы інфармацыю пра палітыку, ствараюць пра яе сваё пэўнае ўяўленьне. Яны, як заўзятары на стадыёне, якія глядзяць і думаюць, што лепш разьбіраюцца ў футболе і лепей ведаюць, як трэба гуляць, чым самы футбалісты.

Справа ня ў тым, што працытаваныя погляды максімалісцкія, і таму памылковыя (хоць ёсьць у іх пэўная рацыя і доля праўды), справа ў тым, што гэта спрошчанае асэнсаваньне складаных рэчаў, адлюстраваньне распаўсюджанага цяпер правінцыялізму (гэта значыць, ацэнка шырокага — вузкім, вялікага — малымі меркамі, прымітывізацыя зьявы).

Аляксандар Квасьнеўскі не таму „сучасны палітык" і ёсьць прэзыдэнтам Польшчы, што ня піша вершаў ды іх не чытае (як мяркуе Яўген Мірановіч), і не таму, што ня кажа тое, што думае (тым больш, што ён думае, што кажа), а таму, што яго палітычныя погляды і дзеяньні адпавядаюць уяўленьням і настроям бальшыні палякаў. Гэта галоўнае. Акрамя таго, за ім стаіць вялікая і моцная арганізацыя, зь вялікімі ўплывамі, сродкамі і магчымасьцямі, здольная шырока данесьці пазыцыі Квасьнеўскага да людзей. У такім становішчы, для таго, каб стаць прэзыдэнтам, трэба адпавядаць сітуацыі і патрабаваньням.

Лукашэнка не таму стаў прэзыдэнтам Беларусі, што быццам бы казаў ня тое, што думаў, а таму, што якраз тое, што ён думаў і казаў (а я яго ведаю з 1990 г.), адпавядала пашыраным настроям і падтрымлівалася тады бальшасьцю савецкага насельніцтва, а КГБ як палітычная сіла, якая яго вяла, здолела гэта шырока данесьці да жыхароў Беларусі.

Выбары прэзыдэнта ў Польшчы, у Амэрыцы ды Эўропе — гэта выбар грамадзтвам унутранай арыентацыі палітыкі і разьмеркаваньня жыцьцёвых магчымасьцяў. Тым часам ***выбары прэзыдэнта ў Беларусі ёсьць выбар існаваньня незалежнай дзяржавы, выбар нацыянальнага лёсу: альбо Беларусь незалежная дзяржава, альбо частка Расеі. Так важыцца цяпер пытаньне пра ўладу ў Беларусі***.

Польскія і эўрапейскія крытэрыі палітыкі да Беларусі не падыходзяць. Ня той зьмест. Беларуская палітыка ня мераецца чужой „сучаснасьцю".

Змаганьне адбываецца паміж Масквой, якая поўнасьцю кантралюе беларускую ўладу, і нацыянальнымі незалежніцкімі сіламі Беларусі. Барацьба за ўладу ў Беларусі ёсьць выяўленьне і працяг антыкаляніяльнага канфлікту змаганьня за незалежнасьць.

Вырашальным чыньнікам у такога роду змаганьні ёсьць не сацыяльны *інтэрас*, а ***нацыянальная сьведамасьць людзей***. Вось той доўгатэрміновы капітал, які можа забясьпечыць перамогу ў антыкаляніяльнай барацьбе. Каб яго набыць, трэба сьведчыць ідэалы. Патрэбныя людзі, якія падымуць нацыянальны сьцяг і будуць казаць беларускую праўду (тое, што думаюць). Бяз гэтага дзеяньня нічога немагчыма дасягнуць, ніякай незалежнасьці і свабоды, ніякай падтрымкі на выбарах і ніякай улады. ***Нацыянальна сьведамая эліта павінна абапірацца на нацыянальна сьведамы электарат.***

Гэта галоўны прыярытэт беларускай палітыкі. Без яго — няма будучыні.

Пасьля Савецкага Саюзу на Беларусі засталося дэфармаванае грамадзтва, выхаванае ў антыбеларускім бяспамяцтве, у рускай савецкай школе і ў рускай савецкай арміі. Калі ў 1991 годзе *Беларускі Народны Фронт* скарыстаў грамадзкі інтэрас (скіраванасьць супраць КПСС і хвілёвы страх камуністаў пасьля правалу путчу ў Маскве) і праз парлямант (маючы там толькі 8% дэпутатаў) дамогся незалежнасьці Беларусі, то потым, калі зьнікла КПСС і іншыя грамадзкія раздражняльнікі, нясьпеласьць нацыянальнай кансалідацыі грамадзтва не дазволіла *Фронту* незваротна замацаваць незалежнасьць, і нават прайсьці ва ўладу.

Небясьпечна будаваць палітыку і балянсаваць толькі на інтарэсах, калі вырашаецца лёс народу. Інтарэсы — часовыя. Імі могуць скарыстацца чужыя антыбеларускія сілы. (Прэзыдэнцкія выбары ў 1994 годзе гэта добра праілюстравалі.) Трэба ствараць ***пастаяннае нацыянальнае апірышча ў народзе***, пашыраць нацыянальна-вызвольны грунт. А гэта працэс, які патрабуе часу і адкрытай палітыкі.

* * *

Шмат хто з тых, што гавораць пра палітыку, не задумваюцца, як гэта ў 1991 годзе малалікая фракцыя фронтаўскіх дэпутатаў, на чале з „несучасным" палітыкам перамагла камуністычную бальшыню ў Вярхоўным Савеце, дамаглася незалежнасьці Беларусі, спыніла дзейнасьць КПСС і ЛКСМБ рукамі самых камуністаў. Якой трэба было валодаць палітычнай тактыкай, воляй, сьмеласьцю і рашучасьцю малой групе змагароў, каб перамагчы ў такіх абставінах. Назіральнікам збоку здаецца, што незалежнасьць „звалілася зь неба". Хоць гэта было найцяжэйшае змаганьне і найвялікшая праца.

Я яшчэ не спаткаў чалавека з асяроддзя гаворачых пра палітыку, які б задумаўся, як гэта ў 1988-89 гадах, калі існаваў Савецкі Саюз, усясільныя КПСС і КГБ, можна было іх перамагчы і выйграць справу з Курапатамі. Ім здаецца, што гэта проста так сталася, само сабой. Тое, што змаганьне было адкрытым і гаварылася, што думалася (і што так трэба было), яны, як быццам, і не заўважылі.

Людзі ня могуць прааналізаваць таго, чаго яны ня ведаюць. Для іх добра, калі ўсё добра. А вось калі дрэнна, тады шмат хто пачынае „аналізаваць" ды ацэньваць гэтак, як яму здаецца.

Мушу нагадаць некалькі аксіёмаў. Нацыянальна-Вызвольная апазыцыя і палітыкі, якія, *апэлюючы да грамадзтва*, змагаюцца з амаральным рэжымам і дыктатурай, ня могуць быць цынічнымі і амаральнымі, ня могуць самы хлусіць. Інакш — паражэньне

незваротнае, палітычны нябыт. Цынізм і ашуканства — зброя зусім іншых палітыкаў. Прыклады — адназначныя. Існуе падзел у палітыцы. Не разумець гэтага і ня бачыць — павярхоўнасьць. Гэта першы і галоўны парог, на якім скручвалі сабе шыю шмат якія палітычныя змагары.

Другое. Палітыка ня ёсьць заняткам ні „брудным”, ні „чыстым”. Палітыку робяць людзі. Таму яна такая, якой яе ствараюць палітыкі. Нячыстыя людзі, звычайна, робяць і брудную палітыку.

„Чыстасьць” і „нячыстасьць” у палітыцы ёсьць адлюстраваньне барацьбы маральных установак у грамадзтве. Ня больш. Адны ідуць у палітыку хлусіць і брудзіць, каб здабыць выгаду. Другія — шануюць годнасьць і йдуць, каб дамагчыся паляпшэньня грамадзтва. Гэта на іх сьцідваецца гразь палітычных цынікаў і нягоднікаў. Але гэта ня значыць, што нягоднікі заўсёды перамагаюць. (Калі перамагаюць, а калі — і не. Палітыка — змаганьне.)

Я залічваю сябе да другой групы палітыкаў і ведаю, што дасягнуць высокага нізкімі мэтадамі — немагчыма. А тое, што цябе могуць выпэцкаць ў палітыцы — нічога страшнага, бо „пан ведаў, на што йшоў”. У палітыцы ня толькі „пэцкаюць”, але й зьнішчаюць, і саджаюць у турму (за нішто), і выганяюць у эміграцыю. Цярпі, змагайся і перамагай. Галоўнае, каб сам ня выпэцкаўся.

Безумоўна, што Квасьнеўскі „сучасны палітык”. І Лукашэнка сучасны палітык, і Пуцін „сучасны”, і г.д. Але для мяне прыкладам „сучасных” зьяўляюцца ня гэтыя спадары, а вялікі Ян Павел II, Папа Рымскі, які праводзіць якраз дзейную маральную і сучасную палітыку.

Вядома, гэта — асаблівы прыклад, ілюстрацыя прынцыпу. Але і ў сьвецкай палітыцы, нават у такой руціннай, як эўрапейская, шмат адкрытых, прыстойных асобаў, якіх хоча бачыць у кіраўніцтве ўсялякае сучаснае грамадзтва.

Марка БНР.

* * *

Сябра Яўген Мірановіч працытаваў маю прадмову *„Мілая Радзіма...”*, прачытаў вершы, напісаныя ў тым жа стылі і, відаць, палічыў усю гэтую маю „любоў” прыкметай палітычнай і чалавечай слабасьці суб’екта, якому, з-за яе, *„цяжка рацыянальна думаць пра Радзіму”*.

Шчыра кажучы, я нават зьбянтэжаны. Гэтак неабдумана мог бы нехта сказаць, але толькі не чалавек такога ўзроўню, як Яўген Мірановіч.

Я, грэшны, думаю інакш. Тое, запаветнае, што нашу і неяк выказаў у вершах, гэта тое, што трымае на паверхні ў любых абставінах, што дае сілы, моц і ўпэўненасьць перад любым непрыяцелем, гэта нязломная апора, на якую абапіраешся, калі чуеш тупат насарогаў, ці калі прэ, акружае цябе зграя гіен.

Падабаюцца мне развагі аднаго мудрага беларускага філёсафа жыцьця, якога вельмі шаную і люблю — Антона Шукелойця, — чалавека, які мае вялікі жыцьцёвы досьвед і выраблены палітычны гарт. Ён часта спасылаецца на вопыт беларускага Адраджэньня, які сьведчыць што ў палітыцы, калі справа стане рубам, — перамагае ідэёвасьць, вера ў ідэалы і сіла духу. Гэта ўтрымала нас, беларусаў, палітычна жывымі ў вельмі неспрыяльных, зьнішчальных для нас варунках XX-га стагоддзя.

Гэта стала асновай нашага новага Адраджэньня ў 80-х і 90-х гадах. Толькі сьветлая нацыянальная ідэя можа стаць грунтам велічы і росквіту Беларусі ў XXI-м стагоддзі. Набліжайма ж гэты час зь верай, упэўнена і працадайна, без пэсымізму і расчараваньняў.

27 траўня 2001 г.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №5(35); „Ніва”, — 2001, 17 чэрвеня).

СЛАВА СЛУЦКІМ ГЕРОЯМ!

(Выступ на 80-я ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну)

Беларускі Збройны Чын мае вялікае ідэйнае і духовае значэньне ў Беларускай гісторыі. 80 гадоў таму беларусы Случчыны паўсталі, каб бараніць незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі ад расейска-бальшавіцкай навалы. Гэта было агульнае рушэньне. Падняўся ўвесь народ. Імгненна сабралася войска дабраахвотнікаў, колькасьцю больш за 10 тысячаў чалавек. Не хапала зброі, не было амуніцыі і рыштунку, але беларусы гатовыя былі змагацца з расейскім ворагам за незалежнасьць Беларусі хоць голымі рукамі. Ніхто не жадаў быць пад расейска-бальшавіцкай уладай.

Вось гэты прыклад паводзінаў, гэтая гатовасьць змагацца за волю, за нацыянальны гонар і народную долю ёсьць надзвычай важным узорам для ўсіх нас цяпер, калі на Беларусі пануе прарасейская дыктатура, калі працягваецца ўнутраная акупацыя краіны і незалежнасьць Бацькаўшчыны пад пагрозай.

Свабоду здабывае той народ, які здольны змагацца за незалежнасьць дзяржавы любымі сродкамі і ня лічыцца з сілай ворага. З ворагамі, якія ломяцца ў наш дом, трэба ваяваць, хоць бы яны былі веліканамі, хоць бы іх была цьма. Нават птушка малая абараняе сваё гняздо ад вялізнага зьвера, нават мізэрныя пчолы бароняць свайго вульля.

Гэтак змагаецца за сваю радзіму малалікі, але духоўна моцны чачэнскі народ. Ён годны павагі і ён пераможа.

Слуцкія змагары гэтак жа, як ***Тадэвуш Касьцюшка***, ***Кастусь Каліноўскі***, ***Міхал Валовіч***, ***Эмілія Плятар***, ***Францішак Багушэвіч***, далі нам прыклад змаганьня, паказалі ўзор паводзінаў беларуса, калі ў яго Бацькаўшчыну лезе акупант.

Слуцкі Збройны Чын засьведчыў напад войскаў бальшавіцкай Расеі на *Беларускую Народную Рэспубліку*. Два Слуцкія палкі, аб’яднаныя ў Першую Беларускую Дывізію, баранілі *БНР* ад агрэсіі Расеі. *Гэта была вайна з рускім акупантам*.

Вось што заявіла Беларуская Рада Случчыны 21 лістапада 1920 году: *„**У мамэнт самавызначэньня ўсіх народаў і змаганьна за самастойнасьць і свабоду, Беларуская Рада Случчыны выконвае волю сялянства, паслаўшага яе і даверыўшага ёй абарону нашае Бацькаўшчыны Беларусі, заяўляе ўсяму сьвету аб тым, што***

Беларусь павінна быць вольнай, незалежнай рэспублікай у яе этнаграфічных межах. Абвяшчаючы аб гэтым і выражаючы волю народу, Слуцкая Рада дэкляруе цьвёрда стаяць за незалежнасьць роднае Беларусі і бараніць інтарэсы сялянства ад гвалту з боку чужаземных захопнікаў і ў выпадку патрэбы — нават сілаю аружжа. Ня гледзечы на лічбавую перавагу ворага, думаем, што наша справа — справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе."

У гэты ж самы час у сярэдзіне лістапада ў Мазыры генэрал ***Станіслаў Булак-Балаховіч*** пацьвярджае незалежнасьць *БНР* і аб'яўляе сваё пяцітысячнае войска войскам *Беларускай Народнай Рэспубліцы*. У Мазыры быў створаны *Часовы Ўрад БНР* на чале з ***В. Адамовічам***. Войска *БНР* пачынае адбіваць напады бальшавікоў.

Беларускую Народную Рэспубліку ў яе абарончай вайне тады не падтрымалі ні Антанта, ні Нямеччына, ні Польшча. Эўропа тады прадала Беларусь гэтак жа, як цяпер прадала Чачэнію. У сьнежні войска генэрала *Булак-Балаховіча* і *Слуцкія палкі* вымушаны былі адыйсьці перад мільённай расейска-бальшавіцкай ардой у акупацыйную зону палякаў і раззброіцца.

Ушанаваньне памяці Слуцкіх герояў.

Але на гэтым вайна ня скончылася. Асобныя беларускія атрады ваявалі з акупантамі на Случчыне яшчэ некалькі гадоў.

Мір паміж БНР і савецкай Расеяй ня быў заключаны. Фармальна-юрыдычна Беларусь па сёньняшні дзень знаходзіцца з Расеяй у стане вайны. І мы бачым, як вось ужо больш за 80 гадоў доўжыцца гэтая вайна. Мы ведаем, як расейцы, разам зь немцамі, вынішчылі і забілі мільёны беларусаў.

Чаго нам не хапае цяпер, каб перамагчы ў вайне з Расеяй, якая цягнецца, фактычна, палову нашай гісторыі? Нам не стае ***нацыянальнай салідарнасьці***.

Памятайма: ***беларус беларуса павінен падтрымліваць***. *Мы мусім абараняць свой свайго, беларус беларуса перад чужакамі, незалежна ад таго, бедны беларус, ці багаты, разумны, ці неразумны, добры, ці дрэнны. Нельга, каб беларус прадаваў беларуса*. Нельга дапускацца, каб нас судзілі акупанты. Мы самы сабе суддзі.

Нельга казаць, што наша хата з краю, у той час, калі топчуць нашага брата, бо не павінен маскаль пляваць нам у твар.

Слуцкі Збройны Чын засьведчыў нам жывы прыклад беларускай салідарнасьці ў змаганьні за свабоду Беларусі. Дык мацуйма ж нашае беларускае адзінства!

Надыходзіць адказная пара. Непрыяцелі Беларусі з Усходу і Захаду хочуць умацаваць свае інтарэсы ў Беларусі. Яны зноў хочуць ашукаць беларусаў і будуюць пляны, каб замяніць Лукашэнку на іншага прамаскоўскага стаўленьніка — „дэмакрата", які за капейку прадасьць Беларусь у Расею. Дамаўляючыся зь немцамі і эўрапейскімі лібэраламі, расейцы выкарыстоўваюць прадажных дэмакратаў у Беларусі, падбіраюць ім „адзінага кандыдата" на прэзыдэнта, на якога прымерваюць свайго чалавека.

Трэба спыніць гэтую здраду.

26 лістапада 2000 г.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2000, №7(30).

ФІЗІЧНАЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Гісторыя разьвіцьця эўрапейскіх народаў паказвае, што на працягу стагоддзя кожны народ пры больш-менш звычайных (сярэдніх) умовах існаваньня (гэта значыць, улічваючы войны і моры) павялічваў колькасьць свайго насельніцтва ў два разы.

Вучоныя падлічылі, што ў сярэдзіне XVII стагоддзя беларускае насельніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім складала блізу 3,4 — 3,5 мільёнаў чалавек. На сярэдзіну XVIII-га яно павінна б было павялічыцца да 7 мільёнаў; адпаведна ў сярэдзіне XIX-га — да 14-ці; у сярэдзіне XX-га — да 28-мі , і на пачатак XXI-га стагоддзя мы павінны б налічваць 42 мільёны беларусаў.

Калі дапусьціць магчымасьць нейкіх выключных зьбегаў абставінаў, то беларусаў магло быць цяпер і 50 мільёнаў, і 35 мільёнаў, але ня менш за 30 мільёнаў чалавек. Тым часам нас у Рэспубліцы Беларусь 10 мільёнаў, і гэтая колькасьць не павялічылася на працягу апошніх 50-ці гадоў.

Тэрыторыя цяперашняй Рэспублікі Беларусь амаль у сем разоў большая за плошчу Бэльгіі, але колькасьць насельніцтва аднолькавая, што ў Бэльгіі, што ў Беларусі. Ці, напрыклад, тэрыторыя цяперашняй Беларусі толькі на 19 адсоткаў меншая за плошчу Вялікабрытаніі, але насельніцтва ў 6 разоў меншае. Тэрыторыя Украіны амаль у тры разы большая за плошчу цяперашняй Беларусі, але насельніцтва больш у 5 разоў і г.д.

У сярэднім поясе Эўропы такога анамальнага стану, як у Беларусі, не назіраецца ні ў адной краіне.

Трэба, праўда, улічыць, што ў сярэдзіне XVII стагоддзя у Вялікім Княстве знаходзіліся ўсе беларускія этнічныя землі: і Смаленшчына, і Дзьвіншчына, і Севершчына, і Віленшчына, і Падляшша. Тэрыторыя Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г. разам з гэтымі землямі дасягала блізу 400 тысячаў квадратных кілёмэтраў. Гэта значна больш, чым плошча такіх цяперашніх краінаў, як Італія, Польшча, Вялікабрытанія. Розныя дасьледчыкі і палітыкі (прымаючы пад увагу ваенны час, уцекачоў, вымушаную міграцыю) налічвалі на тэрыторыі *БНР* ад 14 да 17 мільёнаў жыхароў. Цяпер, праз 80 гадоў, на гэтай тэрыторыі таксама пражывае каля 14,5 мільёна людзей. Колькасьць аўтахтонных беларусаў за межамі Рэспублікі Беларусь за гэты час зьменшылася. Балянс павелічэньня беларускага насельніцтва практычна ўсюды аднолькавы — мінусовы.

Першая Сусьветная вайна. Расейцы, адступаючы, паляць беларускую вёску.

За 70 гадоў знаходжаньня ў складзе савецкай Расеі Смаленскі край быў вынішчаны дазваньня і стаў падобным на астатнюю Расею. Вобласьць абязьлюдзела. Насельніцтва ў некаторых раёнах Смаленшчыны зьменшылася ў 10 разоў, урадлівыя землі пазарасталі хмызьняком і мохам.

Цяпер на Смаленшчыне, як і раней, няма ніводнай беларускай школы, ніводнай беларускай газэты ці часопіса, ні беларускага радыё, ні тэлебачаньня. Задушана ўсё.

Беларуская мова ў асноўным засталася ў смаленскіх вёсках ды ў фальклёры.

У Смаленшчыне заўсёды быў даволі высокі ўзровень беларускай сьведамасьці. Бальшавікі, супрацьпастаўляючыся *БНР*, нават БССР аб'яўлялі ў Смаленску. У 1930-х гадах урадам савецкай Беларусі былі падрыхтаваныя неабходныя дакуманты па вяртаньні Смаленшчыны ў склад БССР. Аднак новая хваля сталінскіх рэпрэсіяў утапіла ў крыві ўсе гэтыя намеры.

* * *

Што ж гэта такое адбываецца з нашым народам і нашай супольнасьцю на працягу вось ужо больш чым 300 апошніх гадоў! Чаму такая вялікая гістарычная культура на ўсходзе Эўропы, як беларуская, занепадае, а насельніцтва зьмяншаецца? Чаму беларусы практычна выпалі з гістарычнага парадку дэмаграфічнага разьвіцьця?

18 сакавіка сёлета доктар Вітаўт Кіпель прачытаў у Нью-Ёрку рэфэрат з нагоды 83-й гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі. Ён выказаў дакладную, на мой погляд, думку аб тым, што галоўнай палітычнай звышзадачай пэрманэнтнай расейскай агрэсіі на Беларусь было не настолькі зьнішчэньне беларускай дзяржаўнасьці на заходняй мяжы Расеі, колькі ўвогуле фізічнае вынішчэньне беларускай нацыі. І пачалося ўсё мэтадычна, як лічыць В. Кіпель, менавіта з сярэдзіны XVII стагоддзя, ад часу, калі стала ўжо складвацца расейская імпэрыя. (Расея аб'явіла сябе імпэрыяй у 1721 г.)

Такой самай думкі прытрымліваліся некалі гісторыкі Міхась Ткачоў і Мікола Ермаловіч. Вывучэньнем гэтага пытаньня на раньнім этапе (XVII-е стагоддзе) займаецца гісторык Генадзь Сагановіч і іншыя дасьледчыкі.

* * *

У сярэдзіне XVII стагоддзя была страшная вайна паміж Расеяй і Вялікім Княствам, якая доўжылася з 1654 па 1667 год і закончылася перамогай беларусаў, але вынікі яе для нашай краіны, нягледзячы на перамогу, былі жахлівымі. Па-першае, расейцы на нашу зямлю напалі і вайна доўгія гады адбывалася на нашай тэрыторыі. Але нават ня ў гэтым сутнасьць. Расейцы, заняўшы беларускую тэрыторыю, ужывалі тактыку генацыду — татальнага вынішчэньня цывільнага насельніцтва. Палітыка выпаленай зямлі на часова акупаваных беларускіх землях была сплянаваная рускім царом Аляксеем Міхайлавічам і яго ваяводамі і праводзілася масава, мэтадычна і пасьлядоўна. Маскоўцы стварылі спэцыяльныя атрады, задача якіх заключалася ў тым, каб спальваць беларускія паселішчы і забіваць усіх людзей, вынішчаць усё жывое. Маскавіты арганізавалі прадуманае і пастаяннае людабойства на захопленых землях Беларусі і займаліся гэтым увесь час, пакуль, нарэшце, іх ня выгналі.

У выніку генацыду і ваенных дзеяньняў Беларусь, па падліках вучоных, страціла ад 51 да 53 адсоткаў насельніцтва. Маскоўцы забілі больш за 1 мільён 800 тысячаў цывільных беларусаў. Усходнія беларускія землі: Смаленшчына, Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына — абязьлюдзелі. Там засталося жывых толькі 30 адсоткаў людзей.

З таго часу і да сёньняшняга дня не было больш страшнай народнай катастрофы, чым чалавечая катастрофа Беларусі ў сярэдзіне XVII стагоддзя. Ні генацыд армянаў, ні галакост габрэяў немагчыма нават параўноўваць з тым, што адбывалася ў Беларусі тры з паловай стагоддзі таму.

Вобразна кажучы, з таго часу наш народ нібы падрэзалі. Было амаль поўнасьцю пазабіванае насельніцтва беларускіх гарадоў. (Ад 70 да 95 адсоткаў людзей загінула ў кожным горадзе.) Парушылася сацыяльная структура грамадзтва, зьніклі цэлыя пласты насельніцтва. Беларусь страціла большыню сваіх мяшчанаў, купцоў, рамесьнікаў, эліту гаспадарства. Апусьцелыя землі пазарасталі кустоўем, травой. Беларуская дзяржава і грамадзтва ўжо не змаглі падняцца, хутка аднавіць насельніцтва, маёмасьць, нерухомасьць, рамесную вытворчасьць, багацьце зямлі і людзей.

Як археоляг я займаўся позьнім сярэднявеччам, якраз пэрыядам з XIV да XIX стагоддзя. Нас, дасьледчыкаў, усіх уражвала тая акалічнасьць, як выразна наша зямля адлюстравала катастрофу. Культурныя пласты XVI-XVII стагоддзяў найбольш багатыя і найбольш насычаныя вельмі разнастайным рэчавым матэрыялам высокага ўзроўню. Але вось пайшоў пласт XVIII стагоддзя. Відовішча ўражвае. Ён надзвычай бедны знаходкамі і пусты, намэнклятура і ўзровень знаходак абмежаваныя. І так па ўсёй Беларусі. Зямля зафіксавала катастрофу і рэгрэс матэрыяльнай культуры, занапад гандлю, рамёстваў, узроўню жыцьця,

Радыяцыйная зона на Гомельшчыне. Тут жылі беларусы.

зьмяншэньне колькасьці насельніцтва і зьбядненьне людзей.

У той жа час Расея, пры дапамозе немцаў, ператварылася ў імпэрыю і ўвесь час нарошчвала агрэсію. Зацяжная Паўночная вайна яшчэ больш пагоршыла становішча. Цяпер генацыд беларускага насельніцтва прадаўжаў шалёны рускі цар Пётра I. Наступная руская царыца немка Кацярына дамаглася ў канцы XVIII стагоддзя ліквідацыі беларускай дзяржавы і анэксіі Беларусі.

З гэтага часу, згодна расейскіх плянаў, гісторыя для беларусаў павінна была скончыцца, а народ — не існаваць. Быў зачынены ўнівэрсітэт у Вільні, ліквідаваныя базылянскія манастыры і школы, зьнішчана беларуская адукацыя і кнігадрук, ліквідаваная грэка-каталіцкая вера, забітыя і замучаныя тысячы вуніятаў, манахаў і сьвятароў, спаленыя беларускія кнігі, іконы і абразы. Потым — забароненая беларуская мова і назва Беларусь.

Адразу, ужо з канца XVIII стагоддзя, пачалі зьнішчаць беларускую архітэктуру ў гарадах і перарабляць гістарычную пляніроўку беларускіх гарадоў. Потым стварылі спэцыяльны „будаўнічы дэпартамант", які займаўся разбурэньнем і перабудовай беларускіх цэркваў пад кананізаваны „рускі стыль".

Па маіх падліках, да канца XIX стагоддзя гэты дэпартамант разбурыў і часткова перабудаваў пад рускую моду каля 2000 беларускіх храмаў.

Гэтак жа прадумана вынішчалі здольных людзей, асабліва адукаваную моладзь і шляхту, якую душылі пад відам змаганьня з крамолай. Пэрспэктыўных асобаў з сялянства звычайна забіралі ў рускае войска на 25 гадоў. У рускай вайсковай душагубцы зьніклі тысячы беларускіх талентаў і змагароў. Найбольш вядомая трагічная гісторыя з паэтам Паўлюком Багрымам, якога згнаілі ў расейскім войску, а рукапісы вершаў зьнішчылі. Застаўся адзін толькі выдатны верш, які, дарэчы, забясьпечыў Багрыму месца ў беларускай літаратуры.

* * *

У другой палове XIX стагоддзя рускія палітыкі, вучоныя ды пісьменьнікі істотна ўдакладнілі канцэпцыю вынішчэньня беларусаў. Галоўным яе зьвяном стала татальная русіфікацыя. „Руская школа зробіць больш, чым рускі штык", — казалі яе прапагандысты (тыпу Карнілава). „Главное в русификации края — это чтобы научить белорусских мальчиков петь русские песни", — пісаў у 1896 годзе ў „Биржевых ведомостях" нейкі адданы рускі патрыёт.

Усё, што не памяшчалася ў рамкі русіфікацыі і выходзіла за гэтыя рамкі, перасьледвалася, найбольш здольных — зьнішчалі.

Уражваюць катаваньні паэта Адама Гурыновіча за беларускія вершы. Засталіся нават астрожныя фатаграфіі, дзе яго, зьбітага, сфатаграфавалі як злачынцу.

Пачатак XX-га стагоддзя. Карусь Каганец, Алесь Гарун, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Якуб Колас, Алесь Бурбіс, дзясяткі лепшых — турма і катарга. Пасьля рускай турмы выжыў толькі Якуб Колас. Усе астатнія неўзабаве памерлі ад сухотаў.

1-я Сусьветная вайна. Беларусь страціла каля паўтара мільёна людзей. Вайна вялася не на рускай, а на беларускай тэрыторыі. Пры адступленьні рускія войскі ў абавязковым парадку спальвалі ўсё, што магло б дастацца немцам: збожжа на корані, усе харчовыя запасы, масты, забівалі жывёлу і г.д. Пачаўся голад. Для бальшыні беларускага насельніцтва была аб'яўлена абавязковая эвакуацыя. Шмат інтэлігентных беларусаў схапілі ў рускае войска, адкуль яны ўжо ў большасьці не вярнуліся.

А потым пачаўся бальшавізм, калектывізацыя, сталінізм, Курапаты, брэжнеўшчына ды псіхушкі. Вынік — каля 3-х мільёнаў забітых беларусаў, і сярод іх лепшыя, найбольш адукаваныя, актыўныя, таленавітыя і працавітыя людзі нацыі.

* * *

Тое, што зьнішчэньне Беларусі ўвесь час, пачынаючы з XVII стагоддзя, было галоўным рускім геапалітычным інтарэсам на захадзе, расейцы, фактычна, і не хавалі. (Ельцынская вялікадзяржаўная дактрына аднаўленьня расейскай імпэрыі, складзеная ў 1995 г., таксама пра гэта сьведчаць.)

У рускай заходняй палітыцы ўвесь час існуе ўнутраная ўстаноўка на фізічнае вынішчэньне беларускай нацыі. Становішча, якое склалася, патрабуе спэцыяльнага аналізу, каб выразна высьветліць гэтае ***калектыўнае злачынства цэлых пакаленьняў рускіх палітыкаў, учыненае над беларусамі***. Ненавісныя адносіны да нас, беларусаў, з боку расейскай дзяржавы, асабліва добра відаць, калі нішчыцелі адыходзяць ад прынцыпу выбранасьці і пачынаюць масавае забойства простых людзей — цывільных беларусаў, гэтак жа, як у сярэдзіне XVII стагоддзя.

Звычайна ў такіх выпадках выкарыстоўваецца вайна, альбо нейкія надзвычайныя абставіны, якія часам штучна ствараюцца (як у 30-х гадах). Чым, напрыклад, можна растлумачыць той факт, што калі ў 1944 годзе (пасьля заняцьця Беларусі савецкімі войскамі) моц беларускіх хлопцаў мабілізавалі ў савецкую армію і амаль без абучэньня адразу накіравалі на перадавую? Іх гналі бяз зброі ў непатрэбныя атакі пад нямецкія кулямёты. Альбо зь вінтоўкамі, ды без патронаў. А калі тыя, што выжывалі пад нямецкімі кулямі,

уцякалі назад — іх сустракаў кулямётны агонь энкавэдзісцкіх „заградотрядов". Я ўжо не кажу, што „заградотряды" страялялі таксама і ў плечы.

Так былі расстраляныя тысячы беларусаў. Рускія выкарыстоўвалі вайну, і нават франтавыя баі, з мэтай генацыду беларускай нацыі. Не па немцах ім абходзіла ў першую чаргу страляць, а разам зь немцамі — па беларусах. І не прыдзярэшся: маўляў, загінулі ў баі зь нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Я ўжо ня буду тут гаварыць пра так званых „савецкіх партызанаў" і іхныя дачыненьні да беларусаў у час вайны. Гэта асобная размова. Вядома, як у асяроддзі самых партызанаў энкавэдзісты вынішчалі беларускіх камандзіраў, як правакавалі нямецкія спаленьні беларускіх вёсак, як рабавалі і мардавалі беларускае насельніцтва.

* * *

Вернемся ў 30-я гады. Я ўжо не аднойчы пісаў раней, што сталінскі генацыд на Беларусі меў асаблівы характар. Беларускае насельніцтва вынішчалі плянава. Усім савецкім адміністрацыйным і партыйным кіраўнікам спускалі разнарадку на квартал выявіць адпаведную колькасьць „ворагаў народу". Разнарадка спускалася на кожную беларускую вёску і на кожнае прадпрыемства. Кожнае міністэрства мела свой аддзел па ГУЛАГу.



(Фота Ул. Кармілкіна)

Чарнобыльскі шлях у Менску.

Разнарадкі выконваліся. Кожную ноч каціліся па беларускіх вуліцах і вёсках чорныя энкавэдзісцкія буды-машыны і загружаліся ахвярамі.

У памежжы з польскай акупацыйнай зонай савецкім памежнікам давалі вінтоўку і рыдлёўку. Калі такі памежнік сустракаў у бязьлюдным месцы беларуса ці беларуску, ён павінен быў чалавека застрэліць і сам рыдлёўкай закапаць труп. Сяляне вельмі баяліся, каб не спаткаць ваеннага з рыдлёўкай. (Усё гэта ўжо было надрукавана ў беларускім друку ў 90-х гадах мінулага стагоддзя, але неяк нібы і не ўскалыхнула цяперашніх людзей.)

Сітуацыя з памежнай зонай і нават кампанія з „ворагамі народа" падаваліся нібы працяг становішча вайны і выкарыстоўваліся як маніпуляцыі для зьнішчэньня людзей.

Але зьмест камуністычнага генацыду ня толькі ў яго заплянаванасьці. Вынішчаліся, перш за ўсё, разумныя, працавітыя, адукаваныя, прыстойныя, паважаныя, актыўныя, здаровыя, таленавітыя людзі, эліта народу, інтэлект нацыі. Так былі амаль поўнасьцю зьнішчаныя беларускія вучоныя і пісьменьнікі, палітыкі і грамадзкія дзеячы, мастакі і настаўнікі, адміністратары і гаспадары, нават камуністычны беларускі партыйны апарат.

Гэтая палітыка тлела пасьля вайны. Пазачынялі беларускія школы. Выхаласьцілі літаратуру і мастацтва. Выгналі беларускую мову з афіцыйнага ўжытку. Над скошаным пакаленьнем легіёны наглядчыкаў сачылі, каб нічога не паднялося, каб нічога ня вырасла беларускага.

У 1986 годзе выбухнула Чарнобыльская катастрофа.

* * *

Мы бачым, як беларуская трагедыя Чарнобыля знарок расцягваецца ў часе — гэта ёсьць выкарыстаньне ўмоваў экалягічнай катастрофы дзеля генацыду беларускага насельніцтва.

Беларусы змагаюцца на ўсіх узроўнях, але зададзенасьць вынішчальнай тэндэнцыі з боку рэжыму Лукашэнкі відавочная.

„*Ідзе вялікая Чарнобыльская вайна*, — піша Уладзімер Старчанка. — ***Для беларусаў чарнобыльская навала па сваіх дэмаграфічных наступствах значна пераўзыходзіць Другую Сусьветную вайну***, *калі загінуў кожны трэці беларус. Але яшчэ страшней тое, што мы ня ведаем, на колькі большую за вайну шкоду гэтая катастрофа нам прынясе ў пэрспэктыве." („Ніва", — 2001, 29 красавіка)*

Страшны „ёдны ўдар" у першы тыдзень пасьля аварыі, які накрыў мільёны беларусаў, поўнасьцю справакавала Масква і яе камуністычная каляніяльная адміністрацыя ў Беларусі. У выніку засакрэчаньня катастрофы і маштабаў яе радыяцыйнай небясьпекі, беларуская нацыя атрымала велізарную калектыўную дозу радыяцыйнага абпраменьваньня.

У 1986-87 гг. камуністычна-дзяржаўнай медыцынай, па падказцы зьверху, было вынішчана, шляхам забіцьця плоду, цэлае пакаленьне беларусаў. (Прымушалі жанчын рабіць аборты ў сувязі з чарнобыльскай пагрозай.) Гэта было абсалютна неапраўдана ні зь медыцынскага, ні з маральнага, ні зь якога іншага гледзішча. Потым, прадаўжаючы медыцынскі генацыд, распрацавалі злавесную палітыку па спыненьні нараджальнасьці беларусаў і забіцьцю чалавечага зародка ва ўлоньні жанчыны.

„*Сёньня з кожных трох зачатых беларусаў*, — піша Ўладзімер Старчанка, — *двух забіваюць у жываце маці! Фактычна, некалькі пакаленьняў беларусаў у літаральным сэнсе былі спушчаныя ў бальнічны ўнітаз. Гэта нябачны ў сьвеце і ганебны факт... Гітлеру такое і ня сьнілася."*

І сапраўды, ня сьнілася. У Беларусі, дзе зьмяншаецца насельніцтва, практыкуюць стэрэлізацыю жанчынаў. Жанчыны горада Барысава засьведчылі, што ім, адразу ж пасьля народзінаў дзяцей, лекары жаночай кансультацыі ***ўльтыматыўна*** прапаноўвалі ў якасьці кантрацэптываў карыстаць так званую „унутрыматачную сьпіраль" або іншыя сродкі прадухіленьня цяжарнасьці. Калі ж парадзіхі адмаўляліся гэта рабіць, ім „мэдыкі" не выдавалі дакументы дзеля атрыманьня належнай у такіх выпадках грашовай дапамогі на немаўлят.

Барысаўчанка ***Ірына Сільніцкая*** (маці двух дзяцей, меншаму —

9 месяцаў) сьведчыць: *„Сказалі: пакуль не паставіш сьпіраль, ніякай дапамогі табе ня будзе. Дапамогі я так і не атрымала, бо сьпіраль я ставіць не захацела... Грошай катастрафічна не хапае”. („Беларускія Ведамасьці”, — 2000, №4(27), с.13)*

Аналягічныя гісторыі распавялі барысаўчанкі ***Галіна Раскоша, Алеся Ясюк***, ***Ларыса Грэбнева*** ды іншыя.

У жаночай кансультацыі горада Барысава загадчыца гінекалягічнага аддзяленьня Тамара Барысавец патлумачыла, што такі „парадак” вызначае пастанова Саўміна БССР, прынятая летам 1991 г. Загадчыца паведаміла таксама, што іхняя „кансультацыя” праводзіць ***стэрэлізацыю шматдзетных маці***, каб пазьбегнуць, маўляў, нараджэньня хворых дзяцей і росту „асацыяльных” сем’яў. *(„Беларускія Ведамасьці”, — 2000, №4(27), с.13)*

15-га чэрвеня мінулага году супраць гінекалягічнага генацыду адкрыта выступілі барысаўскія жанчыны і мужчыны. Група асобаў арганізавала пікет. Усіх арыштавалі і судзілі.

У выніку масавага забойства зародкаў людзей, а таксама з прычыны хваробаў, выкліканых радыяцыяй, беларуская нацыя раптам пачала хутка выміраць. Вымірае ўжо ў сярэднім сто тысячаў беларусаў у год. ***Калі беларуская супольнасьць ня здолее пазбавіцца ад агрэсіі расейскага каляніялізму і ня выправіць становішча з Чарнобылем, то ў XXI стагоддзі не застанецца ніводнага беларуса. Увесь народ вымардуюць і вымараць у пень, да апошняга чалавека***.

Я ўжо пісаў ня раз пра тое, як вынішчыўшы беларускую нацыянальную эліту і абапіраючыся на прамаскоўскую каляніяльную адміністрацыю ў Беларусі, расейскае КГБ у сярэдзітне 90-х гадоў палітычным мэтадам ажыцьцявіла захоп беларускай улады знутры. Адбылася ўнутраная акупацыя. Зараз падрыхтоўваецца захоп нацыянальнай маёмасьці Беларусі пад выглядам прыватызацыі і адначасна ажыцьцяўляецца акупацыя беларускай тэрыторыі.

Тыя забруджаныя радыёактыўнымі рэчывамі землі на Гомельшчыне і Магілёўшчыне, зь якіх прымусова выселілі беларусаў, цяпер інтэнсіўна засяляюць крымінальнікамі, наркаманамі, „бамжамі”, рускімі адкідамі грамадзтва з Расеі, Сібіры, краінаў Сярэдняй Азіі і Каўказу. Гэтыя адлучаныя ад нашых людзей тэрыторыі ўжо не пустуюць. Там ствараецца руская крымінальная зона з сваім самакіраваньнем, непісанымі законамі і фінансамі (ад перавалу наркотыкаў). Каляніяльныя ўлады Беларусі даюць ім від на жыхарства, і нават грамадзянства. Так адбываецца калянізацыя беларускай чарнобыльскай тэрыторыі Расеяй.

Гэта тыповая і гістарычная расейская палітыка. На замацаваньне здабытых тэрыторыяў кідалі (высялялі, выганялі, заахвочвалі) крымінальнікаў, бандытаў, тацяў, авантурыстаў ды валацуг. Імі, перш за ўсё, засяляліся падбітыя землі каля Каўказу, на Поўдні ды ў Сібіры, зь іх фармаваліся банды Ермака ды Сьценькі Разіна, ды „вольнае казацтва”. Гэтак аднаўлялася новая імпэрыя Чынгіз-Хана.

Тое самае робіцца цяпер у сучасным варыянце. Расея, за кошт чарнобыльскай Беларусі, вырашае свае праблемы перанасычанасьці крымінальнікамі, уцекачамі зь мясьцінаў, дзе яна вядзе брудныя войны, бамжамі, апушчанымі людзьмі, абрабаванымі рускім крымінальным „капіталізмам”. Расея ськівае іх у чарнобыльскую Беларусь і адначасна займае расчышчаную ад беларусаў тэрыторыю. Пры патрэбе, там апынецца і зброя, і неабходныя людзі, і падымецца прапагандысцкі лямант („рускіх абіжают”).

Акупацыя беларускай зямлі расейскай крымінальшчынай адбываецца на вачах тысячаў беларусаў, сагнаных з радзімы. Гэта ў іхных, ужо зарослых быльлём, родных хатах бадзяжны паселены гун...

Ці разумее хоць беларуская інтэлектуальная маса, ці разумеюць вярхі грамадзтва сэнс гісторыі, што рухаецца перад імі?.. Ці хочуць яны жыць, ці жадаюць яны шчасьця дзецям?

Старчанка разумее. Ён піша: *„Фактычна на працягу 15 постчарнобыльскіх гадоў супраць беларусаў каляніяльнымі ўладамі вядзецца неабвешчаная прыхаваная вайна, мэта якой —* ***зьнішчэньне беларускага народа, вызваленьне жыцьцёвай прасторы і засяленьне яе прышлымі элемэнтамі****. Дзеля гэтага не выкарыстоўваюцца, як у ранейшыя часы, самалёты, танкі,*



(Фота А. Кляшчука, 1995 г.)

Гомельшчына. Ціхі чарнобыльскі генацыд.

агнястрэльная зброя, газавыя камэры і не будуюцца „асьвенцымы”. Хаця і пачалася яна ўвесну 1986 года якраз з таго, што савецкія ваенныя самалёты асаджалі радыяцыйныя аблокі на Гомельшчыну і Магілёўшчыну.

У век інфармацыйных і палітычных тэхналёгіяў у гэтым няма патрэбы. Асабліва, калі гаворка ідзе пра зьнішчэньне зрусіфікаванага за 200 гадоў каляніяльнага існаваньня „братняга” беларускага народу, якому нож пад сэрца можна засунуць, гледзячы проста ў вочы і гаворачы пяшчотныя словы пра вечную любоў і інтэграцыю. Нашыя даверлівыя людзі ўсяроўна пярэчыць ня будуць.” („Ніва”,— 2001, 29 красавіка)

Аўтар прыходзіць да высновы, што трэба ***„паўстаць на абарону сваіх дзяцей, бо іншага ня дадзена!”***.

* * *

Чарнобыль — гэта бясспрэчны факт злачынства, учынены над беларускай нацыяй. Злачынства ад самага пачатку цынічна разыгрывалася на нашых вачах.

Па сваіх наступствах, якія ўжо ёсьць, і асабліва якія яшчэ наступяць, чарнобыльскі генацыд можна параўнаць толькі з людабойствам сярэдзіны XVII стагоддзя, з калектывізацыяй і

бальшавіцкім тэрорам 30-х гадоў. Чарнобыль страшны тым, што наступствы яго разьвіваюцца на працягу пакаленьняў, разбуральна дзейнічаюць і нарастаюць, як лавіна ў гарах. 50 мільёнаў кюры, што адпавядае 500-м атамным хірасімскім бомбам, абрынулі на наш народ у 1986 годзе. Гэты ўсяленскі выбух, запаволены ў часе, — прадаўжаецца.

Адносіны цяперашняга рэжыму да чарнобыльскага пытаньня дакладна ўкладваюцца ў рамкі канцэпцыі вынішчэньня беларусаў з выкарыстаньнем сітуацыі. (У дадзеным выпадку — ядзернай катастрофы.)

У прынцыпе, па маіх назіраньнях, рэжым Лукашэнкі ў цэлым падрыхтаваны да правядзеньня масавых рэпрэсіяў беларускай эліты. Рабіць гэта будуць, вядома, не беларусы, а хутчэй за ўсё, рускія часткі „спэцназу”. Сістэма ўжо створаная і доступ расейскіх ваенных у беларускія ўнутраныя войскі адчынены. Практычныя навыкі адпрацоўваюцца на чачэнцах у Ічкерыі.

Пакуль што ў Беларусі зьнішчаюць толькі актыўных людзей, якія, на думку тых, хто гэтым кіруе, могуць нейкім чынам пагражаць уладзе. Пры стварэньні адпаведных умоваў, якімі зьяўляюцца перш за ўсё анэксія Беларусі, уключэньне яе ў склад Расеі і ліквідацыя дзяржаўнасьці, махавік бандыцкай палітычнай машыны сучаснага рускага кагэбізму запрацуе на ўсю моц. У гэтым можна не сумнявацца. Беларуская нацыя тады будзе фізічна вынішчаная. Арсэналу прыёмаў у расейцаў хапае. (Мы бачым, што яны робяць ў Чачэніі.)

* * *

Раздумляючы над сказаным, зноў і зноў вяртаюся ва ўяўленьнях у XVII-е стагоддзе, бо адтуль усё пачалося. Надлом здарыўся менавіта тады, калі раптоўна, за кароткі час, Беларусь страціла больш за палову сваіх жыхароў і апусьцела зямля.

Калі разглядаць народ як адзіны арганізм, то магчыма, што для кожнай супольнасьці ёсьць нейкая парогавая мяжа людзкіх стратаў, перакрочыўшы якую, народ ужо ня можа ўзьняцца і нібы застывае ў разьвіцьці ў вечным цярпеньні і змаганьні самога з сабой. Непрыяцелям застаецца толькі мэтадычна зьнішчаць эліту паралізаванага грамадзтва і валодаць яго душой.

Уражвае, што вялікі народ вялікай краіны, якая распрасьціралася ад мора да мора, стаў аб’ектам генацыду; выйграў вайну, але страціў насельніцтва і ўпаў.

І не даюць падняцца гэтаму народу. Як толькі ён выкарабкваецца, каб стаць на ногі, яго тут жа зноў сьпіхваюць у яму.

Беларускі сьвет так і не знайшоў спосабу эфэктыўнай барацьбы з варварствам. А гэта мусіў бы быць актыўны спосаб. Бо ***нельга ваяваць толькі на сваёй тэрыторыі***.

* * *

Які выхад, як збавіцца ад вынішчэньня? Выснова відавочная. Цяперашняе пакаленьне беларусаў, і асабліва тое, якое ўступае зараз у актыўнае жыцьцё, ***павінны перагледзець дачыненьні з Расеяй*** і тыя адносіны да яе, якія былі накінутыя нам за часы акупацыі і савецкага каляніялізму. Расею нельга дапускаць у беларускую палітыку. Нельга мець ніякіх агульных справаў з Расеяй, ніякіх саюзаў і карпарацыяў ды сумесных прадпрыемстваў. Трэба захоўваць зь ёй мірныя дачыненьні праз добрую мяжу. Неабходна будзе, магчыма, на даўжэйшы час, абмежаваць да мінімуму (5-10 адсоткаў) гандаль з Расеяй, каб аберагчы беларускую палітыку, эканоміку і фінансавую сістэму ад расейскіх разбуральных уплываў, дэфолтаў, інфляцыі, палітычных і эканамічных авантураў.

(Фота: „Свабода”)

Хлопчык.

Неабходна спыніць штучна створаную і нявыгадную нам энэргетычную прывязанасьць да рэсурсаў Расеі; ліквідаваць наступ рускай маскультуры і сістэму дэзінфармацыі ў электронным інфармацыйным полі Беларусі. Трэба паставіць заслон палітычнай агрэсіі з боку Расеі на Беларусь.

Цяперашнія беларусы мусяць, нарэшце, зразумець: ніколі ў гісторыі Расея не была нашым сябрам і прыхільнікам, ня ёсьць цяпер і ніколі ня будзе ў будучыні, пакуль застанецца імпэрыяй. Спрачацца можна з сябрамі. Зь непрыяцелямі трэба трымацца на адлегласьці і захоўваць карэктныя дачыненьні. Гэта называецца — мірнае суіснаваньне.

Усялякае збліжэньне з Расеяй было і будзе небясьпечным і разбуральным для беларусаў. Бо варожасьць з боку Расеі і расейцаў да беларускай дзяржаўнасьці, свабоды і незалежнасьці — пэрманэнтная. Цяперашняя руская палітыка зноў, і як заўсёды, гэта наглядна пацьвярджае.

Ня гледзячы ні на якія перамены ўлады ў Крамлі, Расея застанецца ўвесь час агрэсіўнай у дачыненьні да Беларусі і іншых краінаў да таго часу, ***пакуль яна будзе існаваць як імпэрыя*** і захоўваць кангламэрат каляніяльных народаў. Рускія ня могуць стаць свабодным народам, уціскаючы і душачы іншыя народы і кажучы (як у Чачэніі), што ўсюды „іхняя зямля”. Брудная вайна і людабойства, якое праводзіць Расея ў Ічкерыі, выклікае агіду да рускай палітыкі.

Маючы суседам агрэсіўную імпэрыю на ўсходзе, цяперашнія і будучыя беларускія палітычныя дзеячы мусяць будуць заўсёды праводзіць актыўную міжнародную дзейнасьць, калі ўсьвядомяць толькі, пры якіх умовах можа бясьпечна існаваць Беларусь. *Карфаген павінен быць разбураны*. Павінны быць спыненыя гэты вечны агрэсіўны паход на Захад і зьнішчэньне Беларусі, што доўжацца стагоддзямі.

* * *

Дзеля таго, каб выжыць і зьберагчы нацыю, беларусам неабходна першачаргова вырашыць дзьве задачы: ***канчаткова збавіцца ад расейскага каляніялізму і ліквідаваць наступствы Чарнобылю***. Адно з другім спалучанае. Без спыненьня каляніяльнай палітыкі Расеі ў Беларусі, без умацаваньня незалежнай Беларускай дзяржавы, беларускага права і свабоды, пазьбегнуць вынішчэньня і ліквідаваць Чарнобыльскую вайну немагчыма.

У 1988 годзе, зыходзячы зь неабходнасьці вырашэньня гэтых дзьвюх галоўных задачаў, паўстаў, аб’яднаны нацыянальнай ідэяй, *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”*.

Тое, што ўдалося падняць *Фронту*, выклікае павагу і зьдзіўленьне у тых, хто разумее маштабы вынішчэньня нацыі. Але спыніць расейскую каляніяльную агрэсію і перамагчы ў Чарнобыльскай вайне, калі змагаецца толькі актыўная частка змагароў, — цяжка. Гэта задача ўсяго беларускага грамадзтва.

18 сакавіка - 29 красавіка 2001 г.
Нью-Ёрк, Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №6(36); „Народная Воля”, — 2001, 18 ліпеня).

ВЯЛІКІ КУПАЛА

Як добра мець такога паэта, вуснамі якога прамаўляла вольная Беларусь! Гэта магутны талент і дар Божы для беларусаў, на ўсе часы.

Янка Купала ідэйна і эстэтычна засьведчыў сьпеласьць беларускай нацыянальнай літаратуры, адлюстраваў у творчасьці лёс нацыі на тым этапе яе існаваньня, выявіў беларускую нацыянальную ідэю ў эстэтычнай форме і нацыянальныя каштоўнасьці — у вобразах мастацкай красы.

Чым жа нязьменны і чым дарагі нам зараз, цяпер, наш вялікі нацыянальны паэт? Ён дарагі нам любоўяй да Беларусі, да яе волі і незалежнасьці. Ягоная любоў, выяўленая ў мастацкай форме, гэта ня ёсьць хараство суб'ектыўнага замілаваньня, кшталту: „Люблю мой край, старонку гэту”. Ягоная любоў ёсьць адлюстраваньне ўнівэрсальнасьці сьветабудовы і парадку рэчаў, які прадвызначае паставу і паводзіны чалавека. Бо нельга быць несвабодным. Нельга быць нявольнікам — і спадзявацца на шчасьце. Нават дабрабыту нявольныя людзі ня мецьмуць, бо колькі б яны ні працавалі, вынікі іхняе працы забяруць калянізатары, тыя, ад каго залежныя нявольнікі, тыя, хто валодае іхняй краінай.

Памятаючы Купалу, глянем цяпер на гэтых, што абяцаюць народу „сто” ці „трыста” даляраў зарплаты, дакляруюць рынкавую гаспадарку, багацьце ды кажуць: галоўнае — эканоміка, а не свабода, ня мова, ня сьцяг і ня Бог.

„Чаго хочаш?” — спыталі б такога. „Хачу — дабрабыт.” „Ня будзеш яго мець. Бо, каб стаць заможным, трэба быць незалежным!”

Вось дзе найвялікшая каштоўнасьць і найвялікшая праўда Беларускага Адраджэньня! *„Гэта бітва йдзе сусьветна між сьвятлом і апраметнай!”* — пісаў Янка Купала.

Шчасьце людзей недасягальнае бяз вольнай будучыні ўсіх, без незалежнасьці Бацькаўшчыны. Будаваць нацыянальную будучыню трэба пачынаць зь вялікай ідэі, з Храма, а не з хлява.

„На Вялікі Сход! Па Бацькаўшчыну!” — клікаў Купала. „На прастор!”, „На бітву, будучыя сілы!”

Купала, маючы Боскі талент, казаў праўду наўпрост, гучна, голасна і магутна. Гэта рабіла яго вялікім і моцным. І нават сьмяротныя ворагі, гэтае выпарэньне пекла, — рускія бальшавікі — баяліся Купалы і, ненавідзячы, дваццаць гадоў не рашаліся яго забіць. (Пакуль не заманілі паэта ў Маскву.)

„Паўстань з народа нашага, прарок, і ў буры гром удар, пад звон кайдан!”

Гэтак пісаў і марыў Янка Купала. Ён якраз і быў тым найвялікшым прарокам і песьняром Беларускага Адраджэньня, які сказаў аб галоўным:

„Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў — на свабоду,
Зваў з цемры — да сьвятла”.

Ідэйная пазыцыя і творчасьць Янкі Купалы ёсьць ідэальны прыклад, узор паставы і думаньня для беларусаў, якім неабыякавы лёс Беларусі, якія марацЬ пра шчасьце Айчыны.

Гэта такая зьява, што пакуль будзе існаваць Беларусь, пакуль будзем мы на Зямлі, дагэтуль будзе вялікім — Купала. Ён — Вялікі Наш. Ён — частка нашай Будучыні.

Няхай жа памяць пра нашага генія станецца вечнай! Няхай творчасьць ягоная лучыцца з нашым змаганьнем. Хай вееца сьцягам і ўспаможа нам — у свабодзе.

7 ліпеня 2002 г., Варшава-Менск.

АМЭРЫКА — ДЛЯ АМЭРЫКАНЦАЎ

Не шукайма сьляды нашых продкаў, а шукайма тое, што шукалі яны. Так казалі некалі мудрыя людзі.

Нашы продкі шукалі шчасьця, велічы і свабоды. Гэта было найвялікшае шуканьне, бо яму ахвяраваліся, за яго змагаліся і рызыкавалі жыцьцём. Такое змаганьне мае асаблівы сэнс, калі пад пагрозай знаходзіцца лёс народа, ці калі незалежнасьць яго страчана. Тады рушэньне рана ці позна набывае грамадзкую шырыню і выяўляецца ў форме нацыянальна-вызвольнага руху. Нацыянальна-вызвольны рух меў усеагульны характар. Ён узьнікаў там, дзе існавалі імпэрыі. ***Вызвольны рух — гэта заўсёды канцэпцыя змаганьня з імпэрыяй за свабоду і незалежнасьць***.

У Эўропе працэс вызваленьня з-пад імпэрскіх путаў найбольш інтэнсіўна адбываўся ў другой палове XIX і пачатку XX стагоддзяў, калі мноства народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы адваявалі сваю незалежнасьць.

Тады ў Эўропе змагаліся супраць чатырох імпэрыяў: Турэцкай Атаманскай імпэрыі, Аўстра-Венгерскай, Прусіі і Расеі. Але найперш, яшчэ ў XVIII стагоддзі пачала трашчэць Брытанская каляніяльная марская імпэрыя.

Першымі супраць брытанскага панаваньня паўсталі амэрыканцы. У той час наш вялікі беларус і герой гэнэрал Андрэй Тадэвуш Касьцюшка змагаўся за свабоду Амэрыкі. У цэнтры Вашынгтону яму стаіць бронзавы помнік на ўвесь рост.

Амэрыканцы першымі выявілі сутнасьць і формулу антыкаляніяльнага змаганьня за незалежнасьць. Яна вызначаецца ў закліку і сцьвярджэньні: ***„АМЭРЫКА — ДЛЯ АМЭРЫКАНЦАЎ!”***.

У гэтых словах выяўлены ўнівэрсальны зьмест дэкалянізацыі і нацыянальна-вызвольнай барацьбы, дзе б яна ні адбывалася. Калі грамадзтва не наблізілася да зьместу і разуменьня гэтага сцьвярджэньня, значыць яно яшчэ цалкам не пасьпела да вызвольнага змаганьня.

І сапраўды, чаму краіна, зямля, на якой спрадвеку жыве і працуе пэўны народ, павінна належыць нейкай іншай краіне, чаму нейкія іншыя павінны ў ёй распараджацца і карыстацца зь яе багацьцяў ды з працы яе народу? Гэта ж парушэньне прыроднага і Боскага права. Гаспадар на зямлі той народ, які асвоіў і акультурыў яе сваёй працай, розумам і духам ад самага пачатку і спрадвеку, які стварыў на ёй культурнае грамадзтва цягам перадачы вынікаў працы ад продкаў з пакаленьня ў пакаленьне і прадаўжае на ёй жыць, тварыць і працаваць.

Эўрапейскія пасяленцы ступілі на амэрыканскі мацярык як піянэры і як калянізатары і адначасна самы апынуліся ў каляніяльнай залежнасьці ад мэтраполіяў. Яны сутыкаюцца з індзейцамі, што там жылі на пэўных тэрыторыях і адначасна займалі незаселеныя першародныя землі, якія абкультурылі і

пераўтварылі сваёй працай, стварылі на іх цывілізаванае грамадзтва.

Барацьба за незалежнасьць ад мэтраполіяў вынікала з натуральнага права, а знакаміты і клясычны лёзунг вызвольных змагароў — „Амэрыка — для амэрыканцаў!” — адлюстроўваў гэтае права.

Потым, змагаючыся за незалежнасьць супраць імпэрыялізму, кожны народ выкарыстоўваў гэтае права ў сваім закліку і ў сваёй форме: „Мадзьяршчына (Венгрыя) — для мадзьяраў”, „Балгарыя — для балгараў”, „Італія — для італьянцаў”, „Беларусь — для беларусаў” і г.д.

Беларускія адраджэнцы пачатку XX-га стагоддзя выдатна разумелі гэтую ідэю. Лёзунг „Беларусь — для беларусаў” быў сінонімам сцьвярджэньня „Незалежная Беларусь”.

На грунце гэтай вялікай ідэі ў 1918 годзе была ўтворана Беларуская Народная Рэспубліка, прадэкляравана дэмакратыя і свабода.

У 1920-х гадах вялікі паэт і прарок беларускага адраджэньня Янка Купала па-мастацку выявіў і адлюстраваў вызвольны лёзунг незалежнасьці і свабоды ў выдатным творы — п’есе „Тутэйшыя”. У п’есе ў надзвычай яркай і вобразнай форме паказана, як чужынцы, імпэрыялісты ўсіх колераў, акупанты з усходу і з захаду топчуцца па безабароннай Беларусі, абдзіраюць і зьневажаюць беларускі народ, ды даказваюць яшчэ свае прыдуманае „права” на акупацыю Беларусі. І тады станоўчы герой твора напрасткі грымотна зьвяртаецца да ўсіх з магутным і справядлівым заклікам беларускага Адраджэньня: „Беларусь — для беларусаў!”.

Янка Купала ў словах свайго станоўчага героя таксама выводзіць генэзіс ***нацыянальна-вызвольнай ідэі*** з натуральнага права і кліча ісьці ўсьлед за Амэрыкай па шляху незалежнасьці і свабоды.

Калі мы хочам спыніць акупантаў і гандаль нашай зямлёй, калі мы хочам сапраўды адрадзіць сваю дзяржаву і незалежнасьць, калі мы сапраўды цэнім свой гонар і хочам быць вольнымі людзьмі і гаспадарамі, — мы мусім паставіць заслон усялякай акупацыі, каляніялізму і чужой імпэрскай палітыцы і напісаць на сваім сьцягу выразна і запаветна: „Беларусь — для беларусаў”.

Так казаў вуснамі сваіх драматычных герояў Янка Купала.

Для калянізатараў з усходу і з захаду, якія праводзілі інтэграцыю, асіміляцыю ды вынарадаваньне беларусаў, усьведамленьне беларусамі вызвольнай мэты — „Беларусь — для беларусаў” — было цьвіком у труну ўсёй захопніцкай палітыкі. На гэтым шансы акупантаў канчаліся. Няма нічога дзіўнага, што п’еса Янкі Купалы была забароненая.

У 20-х — 30-х гадах мінулага стагоддзя ворагі Беларусі з Усходу і з Захаду галоўны ўдар накіравалі на разгром Беларускага Нацыянальна-вызвольнага Руху. Сумеснымі намаганьнямі ім гэта ўдалося. Тысячы беларускіх адраджэнцаў былі расстраляныя ў Курапатах ды засьценках НКВД, забітыя падасланымі забойцамі, укінутыя ў ГУЛАГ ды Картуз-Бярозу, высланыя ў Сібір ды азіяцкія стэпы; беларускія палітычныя і грамадзкія арганізацыі пазачынялі і забаранілі, беларускі адраджэнскі друк ліквідавалі, беларускія кнігі спалілі ды арыштавалі ў спэцаддзелах бібліятэк. А потым, ужо ў пасьляваенны час, адбывалася мэтадычнае ганьбаваньне і абплёўваньне ўсяго адраджэнскага беларускага — вялікіх людзей, палітыкаў, пісьменьнікаў і паэтаў; фальсіфікавалі беларускую гісторыю, перакручвалі і замоўчвалі падзеі, зьнеслаўлялі вялікія і справядлівыя ідэі.

Тры зьявы Беларускага Адраджэньня выклікалі асаблівую нянавісьць у рускіх бальшавікоў — гэта дзейнасьць Рады БНР, беларускае адраджэньне ў час 2-й Сусьветнай вайны за немцамі і вызвольны лёзунг „Беларусь — для беларусаў”.

У зьнеслаўленьні гэтых каштоўнасьцяў бальшавіцкая прапаганда выкарыстоўвала толькі адзін псіхалягічны аспэкт: падсьведамасьць нянавісьці Другой Сусьветнай вайны.

Усё нацыянальнае беларускае, што завязана было з нацыянальнай ідэяй і беларускім адраджэньнем, аб’яўлялася фашысцкім: ці гэта беларускі нацыянальны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, ці гэрб *Пагоня,* ці імёны забароненых вялікіх паэтаў, нават проста размова па-беларуску ва ўнівэрсытэце ці ва ўстанове — усё кваліфікавалася стукачамі, савецкімі абывацелямі і прапагандыстамі як „фашызм”. Беларускае падавалі ў двух азначэньнях: альбо „мужыцкае”, альбо — „фашызм”.

Руская камуністычная прапаганда ў Беларусі паўтарала гэтыя, скажам проста — ідыёцкія ярлыкі, з дня ў дзень, тупа, ненавісна і пастаянна, пакуль існаваў СССР.

Палітычная формула нацыянальна-вызвольнага руху „Беларусь — для беларусаў” перакручвалася пад савецкія ідэалягічныя ўяўленьні. За часы камуністычнага СССР ідэалёгіяй рускага імпэрыялізму і русіфікацыі быў так званы „інтэрнацыяналізм”, згодна якога нібыта сьціраліся адрозьненьні паміж акупаванымі народамі ды расейцамі і ствараўся так званы „адзіны савецкі народ” (гэта значыць „адзіныя расейцы”). Палітычны лёзунг нацыянальнай свабоды камуністы апускалі на этнічны ўзровень і тлумачылі, што беларускія „нацыяналісты” (а, значыцца, — „фашысты”) хочуць выгнаць зь Беларусі ўсіх расейцаў, усіх габрэяў, усіх, хто не беларусы, і стварыць этнічна чыстую дзяржаву.

Тым часам ***палітычны зьмест лёзунга вызвольнага руху мае антыкаляніяльны сэнс і вырашае пытаньне, каму павінна належыць краіна і хто ў ёй гаспадар***, а ня тое, хто ў ёй павінен жыць (як спэцыяльна перакручвалі калянізатары).

Злавеснае адценьне набывае подласьць гэтай прапаганды, калі ўлічыць, што этнічныя чысткі і генацыд ажыцьцяўлялі якраз камуністы ў Савецкім Саюзе (прымусовае высяленьне татараў, чачэнцаў, інгушоў і інш.), у былой Югаславіі, у камуністычнай Польшчы (прымусовае высяленьне ўкраінцаў), у камуністычнай Балгарыі (дачыненьні да турак) і г.д. Я ўжо не кажу пра Кітай і азіяцкія рэжымы.

Тым часам нічога падобнага не рабілі дэмакраты і нацыянальна-вызвольныя рухі. У іх іншая, не таталітарная прырода.

Але трэба ведаць камунізм і Расею, каб зразумець характар іхняе прапаганды, пабудаванай на агрэсіўнай хлусьні.

Рэцыдывы гэтай прапагандысцкай агрэсіі мы сустракаем і цяпер. Нічога дзіўнага — існуюць пастаянныя крыніцы рэпрадукцыі старой нянавісьці да беларускага адраджэньня — гэта савецкая псіхалёгія часткі насельніцтва і — галоўнае — нязьменнасьць імпэрскай палітыкі Расеі ў дачыненьні да Беларусі.

Нягледзячы на маштабныя спробы расейскіх спэцслужбаў у канцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя разграміць Беларускі нацыянальна-вызвольны рух, нічога ім не ўдалося. Вызвольны Рух мацнее і пашыраецца. Ён зьяўляецца рэальнай сілай, якая выяўляе нацыянальныя інтарэсы Беларускага Народу і супроцьстаіць расейскай імпэрскай палітыцы інтэграцыі і захопу нашай краіны.

На сьцягах і харугвах беларускага Адраджэньня несьмяротныя словы Янкі Купалы —”Жыве Беларусь!” і лёзунг амэрыканскага змаганьня за незалежнасьць, які зноў жа голасна падняў наш вялікі пясьняр — ***„БЕЛАРУСЬ — ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ!”***. Гэта ***наша*** зямля.

І пакуль зьмест гэтых словаў трымае высока і змагаецца за яго хоць частка людзей, ніякі антыбеларускі рэжым ня будзе існаваць доўга. Ніякі агрэсар ня будзе ўпэўнены, што стане жыць за наш кошт і намі, беларусамі, кіраваць. Мы абавязкова вернемся да нармальнага стану, умацуем дзяржаву і незалежнасьць, усталюем права, справядлівасьць і дэмакратыю.

Гэта ня марныя словы, бо гісторыя і вопыт іншых пацьвярджаюць правільнасьць вызвольнага шляху. Ствараць можа толькі свабодны народ. І толькі свабодны народ здольны шанаваць свабоду іншых народаў.

22 лютага 2001 г., Нью-Ёрк.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №3(33); „Народная Воля”, — 2001, 14 сакавіка).

ІДЭАЛЫ БНР НАМ СЬВЕЦЯЦЬ

(З выступу ў Нью-Ёрку)

Акт 25 Сакавіка зьяўляецца найвялікшай падзеяй беларускай гісторыі ХХ-га стагоддзя.

Галоўная мэта сацыяльна-палітычнага разьвіцьця кожнага народа — стварэньне сваёй незалежнай дзяржавы.

Беларусы мелі сваю дзяржаву ўжо 1000 гадоў таму. Але ў канцы XVIII стагоддзя мы сталі ахвярамі змовы трох імпэрыяў і страцілі суверэнітэт. Потым, на працягу XIX стагоддзя, беларусы пяць разоў паўставалі разам з палякамі, каб вярнуць незалежнасьць. Незалежнасьць удалося вярнуць толькі ў 1918 годзе, але ненадоўга. Тым ня менш агонь свабоды быў запалены. І гэта быў вялікі подзьвіг беларускіх адраджэнцаў.

Потым, калі ўжо адбылася расейска-бальшавіцкая акупацыя, бальшавікі, каб зрабіць няважнымі *Акт 25 Сакавіка* і існаваньне *РАДЫ БНР*, арганізавалі марыянэткавае адміністрацыйна-дзяржаўнае ўтварэньне пад назвай БССР.

На працягу 25 гадоў бальшавікам разам з палякамі ўдалося разграміць беларускі нацыянальна-адраджэнскі рух і фізічна зьнішчыць тысячы палітычна актыўных беларусаў.

Але беларускія адраджэнцы стварылі моцную палітычную эміграцыю, захавалі і актывізавалі дзейнасьць *РАДЫ БНР*.

Гэта быў другі подзьвіг беларускіх адраджэнцаў. Усе спробы бальшавіцкай агентуры разбурыць палітычныя структуры беларускай эміграцыі і зьнішчыць *РАДУ БНР* — праваліліся.

Дзеячы *Рады БНР* зьберагалі высокія *ідэалы 25 Сакавіка* і перадалі іх пакаленьням на Бацькаўшчыне. Яны захавалі ідэі, дакуманты, цягласьць незалежнай беларускай дэмакратычнай улады і нашы сьвятыя нацыянальныя сымвалы — *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* і *гэрб „Пагоню”*.

У канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя *ідэалы Сакавіка* і сымвалы беларускай незалежнасьці падхапіў Беларускі Народны Фронт. 25 жніўня 1991 года, скарыстаўшы гвалтоўны правал кагэбоўскага путчу ў Маскве, дэпутаты Беларускага Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце вельмі малымі сіламі (8 адсоткаў дэпутатаў), але пры падтрымцы ўсяго Вызвольнага Руху, дамагліся прыняцьця канстытуцыйнага закону аб незалежнасьці Беларусі, спынілі дзейнасьць КПСС і камсамолу на тэрыторыіі Беларусі, прымусіўшы прагаласаваць за гэта спалоханых, разгубленых і дэмаралізаваных дэпутатаў-камуністаў — 86 адсоткаў „дэпутацкага корпусу” (дарэчы, кіруючую намэнклятуру). Гэта быў трэці ўнікальны подзьвіг беларускіх адраджэнцаў у ХХ стагоддзі.

Потым усё нібы пачалося па другім крузе, як у першай палове ХХ-га стагоддзя. Зноў маскоўская акупацыя Беларусі, толькі ўжо знутры, праз прэзыдэнта-стаўленьніка і старыя каляніяльныя структуры ўлады. Зноў усё робіць арганізаваная расейская партыя палітычнай агрэсіі. Толькі цяпер гэта не расейскія камуністы, а расейскія кагэбісты, не ВКПБ, а КГБ.

Пасьля захопу ўлады ў Беларусі расейцы зноў, як у 20-х і 30-х гадах мінулага стагоддзя, паспрабавалі першым чынам зьнішчыць Беларускі Нацыянальна-Вызвольны адраджэнцкі рух. Галоўны ўдар быў скіраваны супраць Беларускага Народнага Фронту. Але ім не ўдалося нас ліквідаваць, нягледзячы на дапамогу нямецкай дыпляматыі і розных заходніх фондаў.

Беларускі Народны Фронт дзейнічае і будзе дзейнічаць; умацавалася ягоная палітычная *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ*.

Цяпер настрой у беларусаў пераменьваецца. Лукашэнка ня мае падтрымкі бальшыні ў беларускім грамадзтве.

Сёлета антыбеларускі рэжым рыхтуецца правесьці прэзыдэнцкія выбары. У гэтым становішчы ён, каб ацалець, можа спадзявацца толькі на ашуканства і сілу. Тым часам Масква можа спадзявацца толькі на ашуканства і замену Лукашэнкі на іншага маскоўскага стаўленьніка. Калі не атрымаецца, то будзе імкнуцца пакінуць Лукашэнку.

Але што б ні здарылася, як бы ні разьвіваліся падзеі і колькі б Захад ні дапамагаў Расеі, ***ніштo ўжо ня зьнішчыць і не стрымае беларускай незалежнасьці***.

Мы выступаем супраць расейскай агрэсіўнай палітыкі, дзе б яна ні адбывалася: у Беларусі, у Грузіі ці ў Чачэніі. ***Мы ня хочам мець ніякіх агульных справаў, ніякіх саюзаў і ніякіх агульных інтарэсаў з Расеяй як краінай небясьпечнай, крымінальнай і агрэсіўнай***.

Наша нацыянальная будучыня, да якой мы імкнемся, — гэта вольная, незалежная, дэмакратычная і справядлівая Беларусь у сфэры эўрапейскіх дачыненьняў і эўрапейскай цывілізацыі.

Мы ўдзячныя амэрыканцам за падтрымку беларусаў у справе абароны правоў чалавека ў Беларусі, але мусім заявіць зьмест аднаго з галоўных лёзунгаў Беларускага Вызвольнага Руху: ***„Не правы чалавека — галоўнае для беларусаў, а незалежнасьць і свабода, бо не бывае „правоў чалавека” пад акупацыяй”***.

Наша канцэпцыя палітыкі палягае на ідэалах БНР і дае магчымасьць адразу вырашыць шэраг праблемаў людзей.

Гэтая канцэпцыя — незалежнасьць і свабода Беларусі. Гэта Беларуская дзяржава і Беларуская мова, Беларуская школа і Беларуская культура, Беларускія грошы і Беларуская эканоміка, Беларускае войска і Беларуская палітыка, Беларускае права і Беларуская дэмакратыя. Наша канцэпцыя — далей ад Расеі і бліжэй да ўсіх эўрапейскіх суседзяў.

18 сакавіка 2001 г.
Нью-Ёрк.



Гэрб БНР.

З ЦЫКЛУ: ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ:

ПЕРШАЕ, ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СПРАВЯДЛІВЫЯ ВЫБАРЫ — ВЫДАЛІЦЬ ЗЬ БЕЛАРУСІ ВІКА

Першая рэальная, але няўдалая, спроба легітымізаваць рэжым Лукашэнкі адбылася ў кастрычніку 2000 г. на выбарах у „палату". Шлях да гэтай падзеі з боку Масквы і нямецкай дыпляматыі быў доўгі, але мэтанакіраваны. Тут выявілася рэакцыя на дэклярацыю *V-га Зьезду (1997 г.) Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* аб стварэньні *Беларускага Вызвольнага Руху* супраць нэакаляніяльнай палітыкі Расеі ў Беларусі.

У сувязі з лістападаўскім пераваротам ў 1996 годзе, „антылукашэнкаўская апазыцыя" мусіла разваліцца. Яна была часовым супрацоўніцтвам розных антылукашэнкаўскіх сілаў (ад фронтаўцаў да прамаскоўскіх „дэмакратаў" і камуністаў), пагрунтаваным на канкрэтнай мэце — імпічманце Лукашэнкі. Са зьнікненьнем магчымасьці імпічманту разбурыўся грунт для канкрэтнага злучэньня інтарэсаў і апазыцыйнага аб'яднаньня супрацьлеглых поглядаў. Рэальнымі ж засталіся вялікадзяржаўная палітыка Расеі і асноўны каляніяльны канфлікт паміж сіламі расейскага імпэрыялізму і сіламі беларускай незалежнасьці.

Пра гэтае становішча і пэрспэктывы я пісаў у перадзьездаўскім артыкуле *„Вызвольны Рух" (газэта „Свабода", 1997 г.)* і казаў на Зьездзе. Неабходна было скарыстаць сітуацыю ўздыму і арганізаваць яе ў вызвольнае адраджэнцкае рушэньне. Дзеля гэтага былі распачатыя акцыі ***„Грамадзянства БНР"***, ***„Адстаўка"***, пазьней — збор подпісаў ***„За незалежнасьць"***, ***„Беларуская Салідарнасьць"*** і інш. Справы паварочваліся так, што расейскія каляніяльныя сілы на Беларусі маглі быць проста зьмеценыя з палітычнай сцэны.

Контрадзеяньні супраць беларусаў былі на гэты раз прадуманымі і канцэптуальнымі. Увосень узьнікла закамуфляваная агентурная ініцыятыва — „Хартыя-97", якую рухалі праз журналістаў і дыпляматыю. „Хартыю" плянавалі супроцьставіць *Беларускаму Вызвольнаму Руху* і *Фронту*. Гэтая ідэя не была да канца ажыцьцёўленая (па пэўных прычынах) і пазьней „Хартыя" ператварылася ў асяродак „пераваду" рэсурсаў з Захаду і мэтанакіраванай (выпрацаванай) прапагандысцкай інфармацыі (накіраванай, у істоце сваёй, супраць *Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху*).

У гэты ж час у якасьці кіраўніка Місіі АБСЭ ў Менск прыязджае былы нямецкі амбасадар у Маскве і потым былы кіраўнік зьнешняй разьведкі Нямеччыны **Ганс-Георг Вік**. Вік выступіў ініцыятарам захаваньня старой антылукашэнкаўскай апазыцыі на новай аснове. Ён прапанаваў так званы „перамоўны працэс" з рэжымам улады, ідэю „круглага стала" і ўдзел апазыцыі ў парляманцкіх выбарах на падставе дамоўленасьці (кампрамісу) з Лукашэнкам.

Менавіта Вік спрычыніўся да стварэньня, на падставе гэтых прапановаў, так званай „аб'яднанай апазыцыі" і завёў справу беларускага змаганьня ў сьляпы завулак.

Ганс Вік і іншыя нямецкія „дыпляматы" пераконвалі палітыкаў на Захадзе, што рэжым Лукашэнкі можна „палепшыць", што яго быццам бы можна „дэмакратызаваць". Прызнаньне таго, што рэжым Лукашэнкі „палепшыўся", давала б магчымасьць пэўным заходнім зацікаўленым колам, зьвязаным зь нямецкімі палітычнымі (эканамічнымі, фінансавымі) інтарэсамі, прызнаць гэты рэжым і заплюшчыць вочы на „інтэграцыйную" палітыку Расеі па анэксіі Беларусі.

Нямецкі геапалітычны інтэрас накіраваны, перш за ўсё, на Польшчу. І ў гэтым пляне пэўныя колы нямецкай палітыкі глядзяць на Беларусь як на разьменную манэту ў геапалітычных гешэфтах з Расеяй. Ні для расейскага, ні для нямецкага капіталу (Рургаз з Газпромам і г.д.) непатрэбная незалежная беларуская транзітная тэрыторыя і расходы, зь ёй зьвязаныя. (Ня кажам ужо пра стратэгічныя фактары.) Нямецка-расейскія інтарэсы тут супадаюць, як супадалі сотні гадоў.

Ганс Вік, валодаючы ўплывам на разьмеркаваньне заходніх сродкаў сярод створанай ім „аб'яднанай апазыцыі", мае дачыненьне да спробы разбурэньня *Беларускага Народнага Фронту* — адзінай сілы ў Беларусі, якая здольная супрацьстаяць усёй гэтай нямецка-рускай нэакаляніяльнай палітыцы.

У цэлым, атака на *Фронт* пацярпела фіяска. Але, тым ня менш, прыхільнікам сорасаўскай дэмакратыі ўдалося адкалоць вялікую групу фронтаўцаў, якая, таксама пад назвай „БНФ" арганізавана ўвайшла ў сістэму „аб'яднанай апазыцыі".

У кастрычніку 2000 г., у час „выбараў" ў „палату", вікаўская палітыка легалізацыі рэжыму набывае рэальныя формы. Меркавалася, вядучы двайную гульню, з аднаго боку, падтрымаць няўдзел апазыцыі у выбарах, з другога — уцягнуць партыі „аб'яднанай апазыцыі" ў выбары, прызнаць іх дэмакратычнымі і легалізаваць „палату".

З гэтага нічога не атрымалася па некалькіх прычынах. Па-першае, Лукашэнка не пайшоў ні на якія, нават мінімальныя, саступкі. Выбары сапраўды былі па-варварску недэмакратычнымі. Па-другое, двурушныя дзеяньні Віка былі дрэнна падрыхтаванымі на беларускім і міжнародным узроўні. Па-трэцяе, „палітыка" Віка на так званых „перамовах" і „выбарах" пастаянна выкрывалася прадстаўнікамі *Народнага Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, якія запатрабавалі няўдзелу партыяў і насельніцтва ў выбарах і ўклалі потым велізарную працу ў рэалізацыю гэтай справы.

Нямецкія паплечнікі Віка, ня гледзячы на непасрэдны подкуп сябраў партыі „Народная Грамада" і іншых апазыцыйных „дэмакратаў", якім далі грошы за ўдзел у „выбарах" (па пяць тысячаў даляраў на згодніка), нічога ня здолелі перамяніць. Бальшыня беларусаў не галасавала. Выбары правалíліся, але рэжым Лукашэнкі груба сфальсіфікаваў вынікі галасаваньня, і АБСЭ не пайшло на рызыку, каб іх прызнаць. Легалізацыя рэжыму была адкладзеная на выбары прэзыдэнта ў 2001 годзе.

Да гэтага часу Ганс Вік (асабліва пасьля выказваньня ў Беластоку ў верасьні 2000 года пра сваю антыбеларускую палітыку ў рамках АБСЭ) страціў усялякую павагу ў беларусаў. Структуры *Беларускага Вызвольнага Руху* аб'явілі яго **пэрсонай нон-грата** і запатрабавалі ад міжнародных арганізацыяў і МЗС Нямеччыны адкліканьня Віка зь Беларусі.

У абарону Віка парадаксальным чынам заўсёды станавілася ўлада Лукашэнкі, арганізоўваючы паказныя пагрозы і быццам бы атаку на Віка (каб заблытаць грамадзкасьць і заглушыць патрабаваньні *Вызвольнага Руху*). Але рабленьне супольнай прамаскоўскай палітыкі рэжымам Лукашэнкі, Вікам і Масквой — відавочнае.

Эўрапейскія канфармісты ў міжнародных арганізацыях, „усьвядомленыя" за гэты час Вікам, нямецкай і рускай дыпляматыяй, далі выразна зразумець, што прэзыдэнцкія выбары на Беларусі яны схільныя прызнаць пры любых выніках (хіба што парушэньні заканадаўства будуць вельмі скандальнымі). Ведаючы

гэта, упэўнена пачуваецца Вік, дэманструе паказную ўпэўненасьць Лукашэнка, спакойна чуецца Масква, як па нотах, гуляюць сваю брыдкаю партыю пяць намэнклятурных кандыдатаў ад вікавай „аб'яднанай апазыцыі" і іншыя падстаўныя фігуры.

Некаторыя „апазыцыянеры-дэмакраты" зразумелі настрой спонсара і аддана працуюць у „патрэбным накірунку".

„Как „лукашисты", так и оппозиционеры, должны четко уяснить, — піша дэмакратычная спадарыня Т.Процька, — допустить нелегитимного, с точки зрения мирового сообщества, президента, нельзя." * *(Народная Воля, — 2001, 20 лютага)*

Камэнтары, як кажуць, непатрэбныя.

„Апазыцыянер-дэмакрат" Сяргей Калякін выказваецца ў рэчышчы палітыкі Віка зусім адкрыта.

„Они (гэта значыць, заходнія міжнародныя арганізацыі — З.П.) не против сегодня признать Палату представителей. Но они не знают, как это сделать.., идет постепенная смена позиции и, фактически, налаживаются отношения с государственной властью... Западные дипломаты пытаются объяснить власти: мы хотим вас признать, но вы хоть что-то сделайте, чтобы мы могли это сделать." ** *(Белорусский рынок, — 2001, №21)*

Мушу зазначыць, што ўсё выглядае ня гэтак проста. Але такую сітуацыю адносінаў да рэжыму Лукашэнкі вось ужо гадамі стварае Ганс Вік і нямецкая дыпляматыя. Ім прыходзіцца часта выдаваць жаданае за рэальнае. Праўдападобнасьць няпэўнасьці надаюць дэмакратычныя балбатуны.

Тым ня менш, справа сур'ёзная. Устаноўка эўранемцаў зразумелая. Праўда, ня гледзячы на фінансавыя рычагі, наўрад ці здолее Вік і эўрапейскія канфармісты істотна ўплываць на паводзіны кантралёраў і назіральнікаў за галасаваньнем на выбарах. Акрамя таго, *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Народны Фронт* ствараюць сваю сістэму назіральнікаў. Небясьпека, аднак, у тым, што, ня гледзячы на ўсе магчымыя факты парушэньняў выбарчага заканадаўства, прадстаўнікі міжнародных эўрапейскіх арганізацыяў, якіх „праінфармавалі" Ганс Вік і кампанія, могуць праігнараваць парушэньні і прызнаць выбары за законныя і дэмакратычныя.

Каб запабегчы пагаршэньню становішча і ня даць разьвівацца філісьцерскай авантуры эўраканфармістаў, **неабходна выдаліць зь Беларусі Віка**. Тое, што за гэтую пэрсону нон-грата трымаюцца як пэўныя палітыкі ў эўраструктурах, так і Масква (дзе Вік часта бывае), цяпер надта добра відаць.

Менавіта *Беларускаму Нацыянальна-Вызвольнаму Руху* зноў прыдзецца ўзяць на сябе важную задачу.

Выдаленьне з краіны асобы, якая пад шапкай міжнароднай праваабарончай арганізацыі займаецца дзейнасьцю, што супярэчыць нацыянальным інтарэсам Беларусі і не сумяшчальная з мэтамі гэтай арганізацыі, зьяўляецца неабходным прававым дзеяньнем. Трэба аздаравіць абставіны на выбарах у Беларусі і, нарэшце, спыніць маніпулятараў з Усходу і Захаду, якія, як бачым, даўно аб'ядналіся.

Калі Беларусь страсе з сябе гэтых „дабрадзеяў", што апанавалі яе, як камары, тады яна пойдзе хутка наперад, да справядлівага парадку, дабрабыту, спакою і сьветлай сваёй нацыянальнай будучыні.

16 чэрвеня 2001 г.
(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №6 (36).

* „Як „лукашысты", гэтак і апазыцыянеры, павінны выразна ўсьвядоміць: дапусьціць нелегітымнага, з пункту гледжаньня сусьветнай супольнасьці, прэзыдэнта нельга." *(з рус.)*

** „Яны ня супраць сёньня прызнаць Палату прадстаўнікоў. Але яны ня ведаюць, як гэта зрабіць.., адбываецца паступовая зьмена пазыцыі і, фактычна, наладжваюцца адносіны з дзяржаўнай уладай... Заходнія дыпляматы спрабуюць растлумачыць уладзе: мы хочам вас прызнаць, але вы хоць што-небудзь зрабеце, каб мы маглі гэта зрабіць." *(з рус.)*

СФАЛЬШАВАНЫЯ ВЫБАРЫ

Амаль тыдзень доўжыўся бессаромны спэктакль пад назвай „галасаваньне за прэзыдэнта". Скарыстаўшы палажэньне Закона аб магчымасьці папярэдняга галасаваньня для тых, хто ў дзень выбараў ня можа знаходзіцца па месцы жыхарства, улады рэжыму па загаду зьверху на працягу 5-ці дзён арганізоўвалі масавы і прымусовы прывоз („прыгон") выбаршчыкаў на выбарчыя ўчасткі для галасаваньня, з намаўленьнем галасаваць за Лукашэнку. Адначасна аб'язджалі хаты і вёскі са скрынямі для галасаваньня.

(Фота В. Драчова; „Кур'ер")

Як выбралі, так і жывём.

Кантраляваць такія „выбары" не далі магчымасьці (ды й вельмі цяжка). Скрыні на ноч заставаліся, як правіла, у кабінэтах мясцовых начальнікаў, альбо ў выбарчых камісіях. Кантралёры за галасаваньнем ня ведалі і не маглі ведаць, што адбываецца са скрынямі па начах.

У выніку ў некаторых раёнах пачалося „сацспаборніцтва" рэжымнай намэнклятуры за высокія паказчыкі папярэдняга галасаваньня. Дзе-ні-дзе паказчыкі дасягнулі 50-55 адсоткаў папярэдне прагаласаваных. (Некаторым п'яніцам давалі нават выпіць гарэлкі, каб прагаласаваў, „як трэба".)

Калі 9-га верасьня пачалося нармальнае галасаваньне, то выбары былі ўжо папярэдне зроблены на карысьць Лукашэнкі. Тым ня менш ў гэты дзень фальсіфікацыі прадаўжаліся ў шырокім маштабе. На шмат якіх участках назіральнікаў увогуле не

дапусьцілі да назіраньня. А тым, каго дапусьцілі, дазволілі назіраць толькі з адлегласьці 10 мэтраў, пры гэтым яны не павінны былі рухацца і ўставаць зь месца. Назіраць за падлікам галасоў кантралёраў увогуле не дапусьцілі.

Нават у гэтакіх умовах назіральнікі заўважылі мноства грубых парушэньняў, склалі сотні пратаколаў.

У Наваполацку назіральнікі зрабілі засаду на выбарчую камісію і злавілі іх у той момант, калі яны выносілі скрыню для галасаваньня, каб замяніць на іншую. У Гомельскай вобласьці „сацспаборніцтва" выбарчых камісіяў і „вертыкалі" дало рэкордны адсотак галасоў за Лукашэнку: ад 90 да 95 адсоткаў. Прытым, на некаторых участках, як заўважылі назіральнікі, бюлетэняў увогуле не лічылі і запісалі стопрацэнтовую колькасьць прагаласаваных. Гэтакага не было нават за саветамі. (Там спыняліся на 99,99 адсотку.)

У выбарчыя камісіі не былі ўключаныя назіральнікі ад партыяў і палітычных арганізацыяў. У камісіях сабралі выключна адну пралукашэнкавую прамаскоўскую масьць. Так што лічылі, як хацелі, і рабілі таксама, што хацелі.

(Фота: „Свабода")

„Пятая калёна" Расеі — электарат Лукашэнкі.

У дзень выбараў была зроблена беспрэцэдэнтная дыверсія ўладаў. Поўнасьцю адключылі сувязь (тэлефоны, факсы, мабільныя тэлефоны, інтэрнэт, электронную пошту) у офісах партыяў, беларускіх і „дэмакратычных" арганізацыяў, выбарчых штабах, карпунктах рэдакцыяў газэтаў і радыё. Краіна беларусаў асьлепла і аглохла на цэлы дзень. Дзейнічала толькі сувязь у афіцыйных уладаў і ў выбарчых камісіях.

Гэты факт наглядна паказаў на ўзровень акупацыйнага кантролю КГБ над нашай краінай.

Ужо вечарам Лукашэнка з кампаніяй сьвяткавалі „чэсны" „выбар народу". За Лукашэнку, аказваецца, прагаласавала 75,6 адсотка выбаршчыкаў.

Прадстаўнікі АБСЭ гаварылі блытаныя супярэчлівыя фразы пра „недэмакратычныя выбары" і... пра шкоду ізаляцыі рэжыму ў Беларусі. Але назаўтра, 10-га верасьня, Злучаныя Штаты Амэрыкі і краіны Эўрапейскага Зьвязу выразна выказаліся аб непрызнаньні прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі за справядлівыя.

Апазыцыйная намэнклятура і калябаруючыя зь ёй „дэмакраты" ды некаторыя былыя франтаўцы выглядалі нікчэмна і разгублена. „Несмотря ни на что, это победа демократии, потому что все мы объединились",* — сказаў „адзіны" намэнклятурны кандыдат **У. Ганчарык**. „Ура-а-а-а", — пачулася ў адказ сярод дэмакратаў на мітынгу дэмакратыі на Цэнтральнай плошчы ў Менску. (Сабралася каля тысячы чалавек.)

— У іх нешта не ў парадку з галавой, — сказаў мне адзін назіральнік выбарчага спэктаклю ў Беларусі. — Якая тут „победа демократии"?

Вялікі стратэг **Ганс Вік** сплянаваў усё, як у Нямеччыне: 14 тысячаў незалежных назіральнікаў павінны былі зрабіць паралельны падлік галасоў, каб выявіць фальсіфікацыю. Выбралі 500 выбарчых участкаў для паралельнага лічэньня. Згодна „стратэга", прадстаўнікі назіральнікаў павінны былі пазнаёміцца на месцы з пратаколамі камісіяў і параўнаць з сваімі практыкаваньнямі. Але рэжым у Беларусі — гэта не Нямеччына. Тры тысячы падрыхтаваных назіральнікаў улады ўвогуле не зацьвердзілі і не акрэдытавалі. Астатніх — у сто камісіяў не дапусьцілі да назіраньня, іншым — адмовіліся паказваць пратаколы і якія-небудзь дакументы. Акрамя таго, як я ўжо пісаў, — адключылі ўсялякую сувязь.

Нямецкая „стратэгія" тут жа развалілася. Аказваецца, намэнклятурная „апазыцыя" была абсалютна непадрыхтаваная да такога павароту справаў.

(Нядаўна ў Беларусі выйшла на расейскай мове арыгінальная кніжка *Яўгена Будзінаса „Дураки".*)

Пасьля паўночы лідары і дарадцы апазыцыі намэнклятурных „дэмакратаў"забарыкадаваліся ў Палацы культуры савецкіх прафсаюзаў і задумаліся, што рабіць далей. „Цэнтр супраціўленьня рэжыму" ахоўвала некалькі дзясяткаў маладых хлапцоў. Але калі яны зажадалі, як і належыцца, вывесіць над „цэнтрам супраціўленьня" беларускі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, то лідары „апазыцыі" тут жа зашыкалі, замахалі рукамі і — забаранілі. (Маўляў, каб пазьбегнуць правакацыі.)

„Дыскусіі былі малавынікoвымі, — піша, пацяшаючыся, *„Gazeta Wyborcza" (11.09.2001г.)*

— А можа, надрукаваць нам крыху лістовак? Гэтакіх невялічкіх.., — прапанаваў ў канцы камуніст **С**.**Калякін**... Але аказалася, аднак, што няма нават паперы на лістоўкі."

Пра ўзровень савецкай каляніяльнай намэнклятуры на Беларусі найлепш сьведчаць так званыя „царскія вёскі" вакол беларускіх гарадоў. У пачатку 90-х гадоў, выклікаўшы штучную гіперінфляцыю, камуністычная намэнклятура, маючы ўладу, прыгарнула да рук усе ашчадныя зьберажэньні беларусаў, што ляжалі ў дзяржаўным банку. Абрабавалі ўсю нацыю.

Але як жа распарадзіліся прыўлашчанымі грашыма народа савецкія начальнікі, што баяліся эканамічных рэформаў і стаялі за калгасы? Яны ня ўклалі іх ні ў бізнэс (у якім не разьбіраліся), ні ў вытворчасьць. Пачалі масава будаваць „катэджы" вакол гарадоў. Катэджы аказаліся нерэнтабельнымі і дарагімі ў эксплуатацыі палацамі-даўгабудамі, жыць у якіх было б вельмі дорага. (Дабудаваўшы пад дах, яны раптам зразумелі, колькі будзе каштаваць эксплуатацыя такога хорама і жыцьцё ў хораме, разам з пракладкай кабеляў, праводкай вады, каналізацыі, цеплатрасы, электрычнасьці і г.д.)

Так і засталіся „царскія вёскі" недабудаванымі да канца, як помнік намэнклятурнай абмежаванасьці і нацыянальнага марнатраўства (ці па-просту — ідыятызму). „Законна ўкрадзеныя" народныя грошы ператварылі ў груду цэглы мёртвых дамоў.

Цяпер гэтых „арыгіналаў" адкапаў Вік з Масквой у якасьці „дэмакратычнай апазыцыі", пасьля таго, як аслабілі і адціснулі ўбок *Беларускі Народны Фронт*.

Савецкая намэнклятура зноў сыграла сваю дрэнную „гістарычную" ролю: дапамагла Лукашэнку (сваёй нікчэмнасьцю) дэманстратыўна сфальшаваць выбары і застацца пры ўладзе, няхай сабе і нелегальнай і не прызнанай. Гэтай яго ўлады Маскве можа стаць дастаткова, каб паступова поўнасьцю захапіць Беларусь.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №8(38); Выбралі...)

---

* Нягледзячы ні на што, гэта перамога дэмакратыі, таму што ўсе мы аб'ядналіся. *(з рус.)*

ВАРВАРЫ

Расейскі штотыднёвік *„Новая газета”* надрукаваў (а польская *„Gazeta Wyborcza”* передрукавала) інтэрв'ю журналісткі ***Ганны Паліткоўскай*** *з генэралам* **Шаманавым**, па загадах якога забітыя і замардаваныя тысячы людзей у Чачэніі. Генэрал Шаманаў — адзін з найбольшых рускіх злачынцаў — спачатку камандаваў заходняй групай рускіх войскаў у Чачэніі, а цяпер камандуе 58-й арміяй, якая праводзіць экзэкуцыі на чачэнскай зямлі.

Журналістка спытала генэрала пра забітых цывільных людзей, якія ня здолелі выйсьці з Алхан-Юрту праз „калідор”, што быццам бы адчынілі для іх расейцы. Генэрал Шаманаў адказвае*: „Тое, што яны ня выйшлі на працягу тыдня дзеяньня калідору*, — *гэта была іхняя справа... Сярод забітых*, — кажа генэрал, — *былі людзі, так ці інакш зьвязаныя з бандытамі”* (гэта значыць, з Чачэнскай Арміяй, — З.П.)

плякатамі і фатаграфіямі скалечаных пад рускімі бомбамі чачэнскіх дзетак, бяз ручак, бяз ножак, бяз пальцаў, абпаленых і пабітых, жывых і мёртвых.

Ахмет, чачэнец з Джахар-Гала, гадоў пад 60, расказаў мне, што рускія скрозь параскідалі шмат спэцыяльных мінаў у выглядзе дзіцячых цацак: лялькі, зайчыкі, мячыкі, аўтаручкі. Знойдзе такую „цацку” „бандыт” ці „бандытка”, пачне бавіцца, пакруціць — міна ўзрываецца. Глядзіш — „бандыцік” бяз пальцаў, а то і бяз ручкі, ды без вачэй. *„Дабро павінна мець межы*, — з націскам кажа генэрал Шаманаў журналістцы. — *Калі бандыты не разумеюць нашай маралі, то яны павінны быць ліквідаваныя. А як жа інакш? Яны ж жывуць у Расеі”*, — цьвердзіць Шаманаў.

Паколькі жонак і дзяцей бандытаў трэба лічыць бандытамі і ўсе, хто не разумее „нашай” (рускай) маралі, павінны быць

Абпалены вайной. (Чачэнія, 2000).

Чачэнскі „тэрарыст” Аліхан Асманаў (6 гадоў).

„Кім ёсьць, на вашу думку, жонка „бандыта”? — пытае журналістка. *„Бандыткай”,*— адказвае генэрал. „А дзіця „бандыта”, гэта таксама „бандыт”? *„Таксама”,* — адказвае Шаманаў.

Трэба разумець мэнтальнасьць варвараў: усё, што ім супрацiўляецца — ёсьць „зло”; тыя, хто супраць іх змагаюцца, — „бандыты”; усе разбурэньні, гвалты і забойствы варвары робяць дзеля „дабра” (гэта значыць, каб ім, варварам, было добра).

У варвараў адсутнічае паняцьце аб'ектыўнай каштоўнасьці маралі. Маральнае (добрае) — усё тое, што робяць варвары. Такой раней была псіхалёгія гунаў і манголаў. (Практычна, маралі там яшчэ не існавала.) Варвары (варварскія імпэрыі) спачатку пачыналі забіваць іншых, бо іншыя былі чужыя. А потым, выклікаўшы супраціўленьне гвалту і забойству, забівалі ўжо за супраціўленьне гвалту, за „бандытызм”, „тэрарызм” і г.д. Такая схема вось ужо 200 гадоў выкарыстоўваецца рускімі на Каўказе супраць чачэнцаў, абхазаў, чаркесаў, інгушоў і г.д.

Першага чэрвеня ў сьвеце адзначалі *Дзень абароны дзяцей*. У Варшаве перад Місіяй АБСЭ і заходнімі амбасадамі адбылася вялікая дэманстрацыя чачэнскіх уцекачоў. (Яно і зразумела, бо Захад здрадзіў, здаў Чачэнію.) Было шмат чачэнскіх жанчынаў з

зьліквідаваныя, то што ж такое „наша мараль”? — пытаецца журналістка ў генэрала. І тады савецкі генэрал, п'яніца і бязбожнік, расеец, член КПСС з сяржанцкага ўзросту, забойца, які хоча „ліквідаваць” жанчын і дзяцей, вызначае „нашу мараль” як ... *„збор абавязковых правілаў існаваньня ў эўрапейскай хрысьціянскай культуры”.*

Раней такім было прасьцей. Забівалі ў імя ідэалаў камунізму. Цяпер вярнуліся да праваслаўя, да „нашай маралі”. Тым больш, што генэрал КГБ Рыдзігер, ён жа Патрыярх Маскоўскі Алексій ІІ, ужо дзесяць разоў „асьвяціў” ліквідацыю чачэнцаў.

Чачэнцы — мусульмане. У іх іншая культура, іншыя „правілы існаваньня”, іншы сямейны ўклад, традыцыі, дачыненьні. Яны не разумеюць „нашай маралі”. Калі не пачнеце жыць па-нашаму — будзем забіваць, кажуць генэралы ад нагана і кадзіла.

Ахмет пацьвярджае, што кожнаму расейскаму вайскоўцу ў Чачэніі дадзены вусны загад: забіваць усіх чачэнцаў ад 10 да 60 гадоў. Палітпрапаганда простая, як у вандроўнікаў: калі не забіць дзіця, то зь яго вырасьце „бандыт”, калі не забіць жанчыну, то яна народзіць „бандыта”. Гэты загад выдаваўся расейскім галаварэзам яшчэ ў Першую руска-чачэнскую вайну (1994-1996) і дзейнічае цяпер.

Сакавік. 2000 год. Рускія тэрарыстычныя войскі ў акупаванай Чачэніі праводзяць „свабодныя” расейскія выбары рускага прэзыдэнта. Прымусілі галасаваць чачэнцаў, што засталіся жывымі. „Выбары” паказалі ўсенародную “падтрымку” Пуціну.

Прыкладаў псіхалёгіі сярэднявечча і варварскіх паводзінаў вельмі шмат у крымінальнай Расеі. (Чаго варта, напрыклад, афіцыйная аб’ява пра ўзнагароду ў адзін мільён даляраў за галаву Шаміля Басаева.) Расейскае радыё „Рэха Масквы” (лічыцца дэмакратычным, па расейскіх мерках) зьвярнулася з пытаньнем да сваіх слухачоў: „Ці згаджаецеся вы з поглядам генэрала Шаманава, што жонкі і дзеці бандытаў — гэта бандыты?” 62 адсоткі рускіх „дэмслухачоў” адказалі, што згаджаюцца і падтрымліваюць генэрала. (Што ўжо казаць пра не „дэмслухачоў”...)

Зрэшты, інакш і быць не магло. Ранейківалі на камунізм. Цяпер гэтай шырмачкі не існуе. Засталася адна Расея. Тая самая крымінальная, ілжывая і крывавая, дзе масава галасавалі за сьмерць іншых, дзе масава даносілі, ухвалялі генацыд і перасьлед, дзе лягеры, турма і расстрэлы былі паўсядзённым бытам, дзе жонак прымушалі адмаўляцца ад мужоў, а мужоў ад жонак. („*Калі яна не бандытка*, — кажа пра чачэнак генэрал Шаманаў, — *то няхай пакіне свайго бандыта-мужа*.”) Тая самая Расея, дзе бацькі выракаліся дзяцей, а дзеці даносілі на бацькоў, дзе былі спэцыяльныя лягеры для жонак „ворагаў народа” і сваякоў „ворагаў народа”; дзе былі спэцыяльныя дзіцячыя дамы, сірацінцы, куды звозілі дзяцей расстраляных, зьмянялі ім прозьвішчы ды імёны.

Усё ўжо было ў гэтай страшнай, рабскай, жорсткай імпэрыі, дзе доўжыцца вечная хлусьня, вечны гвалт і вечнае забойства.

Вось вытрымкі з службовага ліста ад 15-га сьнежня 1999 года Сакратара Савета Бясьпекі Расейскай Фэдэрацыі Сяргея Іванова да Старшыні Дзяржаўнай Думы Расеі камуніста Генадзя Селязьнёва:

„Члены Савета Бясьпекі РФ абмеркавалі сітуацыю, якая склалася пры выкананьні другога этапу антытэрарыстычнай апэрацыі па ліквідацыі бандфармаваньняў на тэрыторыі Чачэнскай Рэспублікі, і выпрацавалі рабочую канцэпцыю рэалізацыі ейнага завяршальнага этапу...

Удзельнікі абмеркаваньня пагадзіліся, што горныя пасяленьні чачэнцаў, якія складаюць менш 20% усіх населеных пунктаў Чачэнскай Рэспублікі, не ўяўляюць якой кольвечы значнай эканамічнай ці іншай каштоўнасьці ні для дадзенага суб’екта фэдэрацыі, ні для Расеі ў цэлым, і іх трэба цалкам зьліквідаваць у сэктары Бамут-Зандак-Ітумкале. Пры гэтым тут трэба стварыць умовы, цалкам непрыдатныя для пражываньня людзей ў будучым, а рэшту мірных жыхароў з гэтай часткі Чачні неабходна перасяліць у ейныя паўночныя раёны за раку Церык, ці асіміляваць у іншых рэгіёнах Расеі...

Усе натуральныя пабудовы (уключаючы культавыя і гістарычныя) горнага рэгіёну, старажытныя родавыя вежы будуць прыраўняныя да аб’ектаў схаваньня бандфармаваньняў і будуць татальна зьнішчаныя. Пасьля сканчэньня вайсковай апэрацыі, з гэтай часткі рэспублікі неабходна вывезьці ўсе будаўнічыя ды іншыя матэрыялы. У інтарэсах Расеі неабходна зрабіць гэты рэгіён безжыцьцёвым.”

Ну чым гэты антычалавечы плян генацыду і вынішчэньня чачэнцаў розьніцца ад праектаў Гітлера, Бормана, Сталіна, Берыі ды плянаў НКВД?!

Канцэнтрацыйныя („фільтрацыйныя”) лягеры ў Чачэніі, дзе катуюць ды мардуюць людзей, нікога ўжо не зьдзіўляюць. Маўляў, гэтак можна. Так і трэба. ***У Расеі ніхто ніколі ні ў чым не каяўся, ніколі ніхто ні ў каго не парсіў прабачэньня. Тут масава ўхвалялася любое варварства ў інтарэсах рускай імпэрыі.***

Ухваленьне ўсім рускім грамадзтвам генацыду ў Чачэніі яшчэ раз пацьвярджае, што ва ўсіх антычалавечых выступах, ва ўсіх грахах сваёй крывавай гісторыі „рускі народ”, разам з рускай уладай і рускімі генэраламі, нясе калектыўную адказнасьць за злачынствы супраць чалавецтва.

Разам з тым, вынішчэньне чачэнскай нацыі Расеяй — гэта ёсьць тэст, выпрабаваньне гуманістычнай трываласьці палітычных прынцыпаў лібэральнай Эўропы. Тэст, які паказвае на падвойнасьць, фальшывасьць гэтых прынцыпаў. Гэта экзамен, якога Захад зноў не вытрымлівае.

2000 г., чэрвень, Варшава.
(„Беларускія Ведамасьці”, — 2000, №4(27); „Народная Воля”, — 2000, 9 сьнежня).



Чачэнская сталіца Джахар-Гала (былы Грозны), зьнішчаная расейскай авіяцыяй і артылерыяй. Здымак 2000 г.

Цывільныя жыхары Чачэніі ў расейскім фільтрацыйным (канцэнтрацыйным) лягеры.

НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ ГЭТА ЁСЬЦЬ ІСНАВАНЬНЕ НАЦЫІ

(Выступ на Ўсебеларускім Зьезьдзе за незалежнасьць 29 ліпеня 2000 года.)

Для кожнага народа стварэньне незалежнай дзяржавы ёсьць сьведчаньне і сэнс гістарычнага разьвіцьця. Калі народ траціць дзяржаву і незалежнасьць, то ягоная гісторыя спыняецца. Страта гісторыіі ёсьць сьмерць. Таму няма большай каштоўнасьці для нацыі, чым дзяржава і дзяржаўная незалежнасьць. ***Гэта ёсьць пытаньне свабоды і нявольніцтва, існаваньня і небыцьця. Альбо мы гаспадары, альбо — нявольнікі. Альбо мы ёсьць — альбо нас няма. Гонар і Бацькаўшчына — вось чым мусяць быць напоўненыя нашыя душы.***

Дзеля вяртаньня свабоды і здабыцьця дзяржаўнай незалежнасьці мы, беларусы, змагаліся два стагоддзі. ***25 Сакавіка 1918 году абʼяўлена Незалежнасьць БНР***. Але Беларусь была адразу акупаваная і падзеленая з двух бакоў, бо не пасьпела стварыць свае ўзброеныя сілы.

Падсумоўкай беларускай барацьбы ў XX-м стагоддзі стаў ***Акт аб Незалежнасьці Беларусі, прыняты 25 жніўня 1991 году***. Яму папярэднічала прыняцьце ***Дэклярацыі „Аб суверэнітэце Беларусі" 27 ліпеня 1990 году***. Гэтыя тры падзеі ёсьць вызначальныя этапы нашай 200-гадовай барацьбы. І нічога няма для нас важнейшага ў нацыянальнай гісторыі XX-га стагоддзя.

Цяпер перад беларускай нацыяй зноў, як і ў 1918-м годзе, паўстала задача абараніць незалежнасьць ад агрэсіі расейскага імпэрыялізму. Але калі 82 гады таму Незалежная Беларусь сутыкнулася *з ваеннай агрэсіяй і акупацыяй зьнешняй*, то *цяпер мы маем справу з унутранай акупацыяй, якую праводзяць расейскія спэцслужбы праз рэжым Лукашэнкі.*

Канцовая мэта гэтай палітыкі — поўная ліквідацыя дзяржаўнасьці Беларусі і зьнішчэньне беларускай нацыі.

Беларускія калябаранты з акупацыйным рэжымам не разумеюць, што з узмацненьнем акупацыі-інтэграцыі ўсе яны паступова будуць адхіленыя ад улады па этнічнай прыкмеце і потым ліквідаваныя. І апошнім у гэтым шэрагу стане сам Лукашэнка.

Гэты працэс ужо ідзе. Правіла такое, што здраднік нацыі заўсёды ёсьць закладнікам ворагаў Бацькаўшчыны. Рана ці позна надыходзіць час, калі здраднік робіцца непатрэбным. Дапамагаючы ворагу, здраднік капае сабе магілу. Тут адлюстраваны ***Боскі закон — нельга здраджваць. Нельга здраджваць Бацькаўшчыне.***

Тыя ганарлівыя людзі, што першы раз здрадзілі Беларусі, калі вялі да ўлады Лукашэнку, былі першымі ж, выкінутыя з гэтае ўлады. Другі раз — яны здрадзілі ўжо Лукашэнку. Трэці раз — яны зноў здраджваюць Беларусі, калі дамаўляюцца з расейцамі, каб коштам незалежнасьці Айчыны вярнуцца да ўлады. Так заканчваецца дарога сьляпых і замыкаецца кола здрады.

Трэба зламаць гэтае кола. Альтэрнатывай акупантам ёсьць мы, Беларусы. Не дэмакраты і не „супэрдэмакраты", а мы, Беларускі Народ, мы — Беларуская Нацыя спынім акупацыю.

Беларусам пара даўно зрабіць высновы з гісторыі. Пакуль існуе Расея як вялікадзяржаўная каляніяльная сістэма — датуль будзе існаваць руская імпэрыялістычная палітыка. Сутнасьць гэтай палітыкі на захадзе — зьнішчыць Беларусь. Ня мае ніякага значэньня, якая будзе ўлада ў Расеі і хто будзе кіраваць імпэрыяй. Гэтая палітыка працягваецца ўжо сотні гадоў, і Расея не хавае сваёй мэты.

Расейскай акупацыйнай інтэграцыі мы мусім супроцьставіць нашу ***Беларускую Салідарнасьць*** і абарону Незалежнасьці Беларусі. *Беларуская Салідарнасьць* за Беларусь і Незалежнасьць — гэта вялікая сіла, пра магутнасьць якой шмат хто з нас не здагадваецца. Яна гуртуецца, вырастае і павялічваецца. Наш Усебеларускі Зьезд ёсьць сьведчаньне патрэбы такой салідарнасьці ў абароне Айчыны і адлюстроўвае беларускую волю мільёнаў людзей. Гэта грунт, ад якога залежыць выніковасьць нашага змаганьня і перамога.

Ніколі беларусы не аддадуць ужо сваёй свабоды, ня страцяць Незалежнасьці. Мы мусім быць гатовымі змагацца за Незалежнасьць Бацькаўшчыны ўсімі сродкамі, і калі на нас палезуць з войскам, — узяцца за зброю і зброяй бараніць Беларусь.

Беларусь была ад пачатку і будзе надалей вольнай, незалежнай дзяржавай, краінай працавітых гаспадароў, дзе ўсталюецца справядлівы лад, і ніякая нечысьць ня зможа пляваць нам у твар. Будзьма пэўныя і набліжайма гэты час!

(„Беларускія Ведамасьці", — 2000, №5(28)

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ:

1. ЧАЛАВЕК

Калі задумацца над жыцьцём чалавека, мераючы яго гісторыяй, грамадзкімі дачыненьнямі і вечнасьцю, то прыходзім да высновы аб існаваньні агульначалавечых каштоўнасьцяў, якія ў кожным народзе маюць сваістае асэнсаваньне і значэньне, як грунт, на якім палягае культурнае быцьцё людзей на Зямлі.

Агульначалавечыя каштоўнасьці ёсьць, перш за ўсё, каштоўнасьці нацыі. Гэта сам чалавек, народ, мова, зямля (тэрыторыя, на якой жыве чалавек і народ), літаратура, дзяржава, сьцяг і г.д. Існаваньне чалавека ў грамадзтве накіраванае найперш на захаваньне і абарону гэтых каштоўнасьцяў. Абсалютнасьць іх не падвяргаецца сумненьню (не зьяўляецца дыскусійнай).

Чалавек, ягонае жыцьцё і душа, ёсьць першаснымі каштоўнасьцямі самога чалавека. Людзі, падзеленыя ў грамадзтве палітычнымі і сацыяльнымі антаганізмамі, бывае, могуць кожны па-свойму і кожны з свайго гледзішча дбаць пра дабро ўсёй нацыі, ненавідзячы адзін аднаго. Ці справядліва гэта, ці дапушчальна, ці павінна так быць?

Безумоўна, што так быць не павінна. Але гэта ёсьць. Ёсьць, практычна, паўсюдна, толькі ў рознай ступені і ў розных праявах. Таму мы, насуперак нашым жаданьням і перакананьням, вымушаныя прызнаваць рэальнасьць. Аднак гэтая рэальнасьць дапушчальная толькі да пэўнае мяжы.

Такой мяжой ёсьць цана жыцьця чалавека, дакладней — ягоная сьмерць. Народ можа быць адзіным, пакуль не перакрочаная гэта мяжа. Таму цывілізаванае права, ствараючы юрыдычныя нормы, заўсёды імкнецца да абмежаваньня нянавісьці.

Людзі, аб'яднаныя адной культурай, адным этнасам, адной гісторыяй, ня гледзячы на супроцьлеглыя палітычныя арыентацыі, павінны памятаць пра агульнае, дбаць пра агульныя нацыянальныя інтарэсы і бачыць супольную нацыянальную пэрспэктыву. Бо нашчадкі палітычных праціўнікаў могуць быць зусім не праціўнікамі, а сябрамі. Жыцьцё не стаіць на месцы. Палітычныя дактрыны зьмяняюцца, а народ, этнас, нацыя — застаюцца.

Пры ўсёй жорсткасьці палітычных непрыхільнасьцяў, заўсёды можа надыйсьці час, калі беларус беларуса мусіць і абавязаны падтрымаць. Бо толькі тады можа існаваць беларуская палітыка, беларускі народ, беларуская дзяржава, беларуская культура ды беларуская мова, пакуль існуюць беларусы.

Гаворачы пра каштоўнасьць чалавека, мы разглядаем яго шырока: як каштоўнасьць фэнамэнальную, этнічную і народную (тое ж самае — нацыянальную). У хрысьціянскай цывілізацыі стварылася яшчэ адна тыпалёгія чалавечай адметнасьці — індывідуальнасьць душы (пра гэта я ўжо пісаў раней).

У другой палове XX-га стагоддзя чалавек-індывідуальнасьць стаў разглядацца ў сацыяльна-этычных дактрынах дэмакратычнага сьвету як найвышэйшая каштоўнасьць, якая валодае прыярытэтам перад народам, дзяржавай і грамадзтвам. Аднак, пасьля прыходу левых да ўлады ў дэмакратычных краінах (у выніку распаду СССР) і з узмацненьнем працэсу глябалізацыі, дактрынёрства аб „правах чалавека” перарасло ў нешта, накшталт сурагату сацыяльнай рэлігіі чалавека, з выразнымі тэндэнцыямі нэапаганства ў этыцы і культуры.

Штучнасьць і аднабокасьць гэтай дактрыны „абсалютнага чалавека” стала відавочнай, калі яна пачала ператварацца ў пануючую ідэалёгію левай дэмакратыі.

Тым часам, калі мы ўважліва ўгледзімся ў гісторыю і прааналізуем грамадзкія ды прыватныя дачыненьні людзей, то прыдзем да высновы, што і палітычныя эліты, і людзі ў цэлым імкнуцца да гарманізацыі дачыненьняў паміж грамадзтвам, дзяржавай і асобным чалавекам.

З гледзішча агульных інтарэсаў, ёсьць аб'ектыўныя тэндэнцыі да парытэту памж асобай і грамадзтвам (дзяржавай).

Канцэпцыя парытэту, на мой погляд, больш эфэктыўная ў абмежаваньні зла. Яна бліжэй да гармоніі супольнасьці і больш разумная, валодае большай мерай справядлівасьці і шырэйшым паглядам на існаваньне людзей.

* * *

Імкненьне да гармоніі ў чалавечай супольнасьці вынікае з гарманічнай прыроды чалавека, якую ён рэалізуе ў працэсе існаваньня. Чалавек як зьява жыцьця, як духоўны і прыродны фэнамэн ёсьць трыадзіны: чалавек-дзіця, чалавек-жанчына, чалавек-мужчына. Тут адзіны чалавечы сьвет, адна прырода і адначасна — тры сьветы, тры прыроды.

Калі мы супаставім нашыя зьвесткі пра прыроду, рэлігію, космас, гісторыю і чалавека, то заўважым дзіўную карэляцыю функцыяў і падабенства з унівэрсальнасьцю ўсёй сьветабудовы. Фэнамэн гарманічнага чалавека (гэта значыць, абстракцыя, якая выводзіцца з рэальнасьці) набліжае нас да меркаваньня, што чалавек ёсьць вобраз і мадэль (аналёгія) усяго існага, усяго сусьвету, узор (канструкцыя) разьвіцьця духу.

Ёсьць над чым задумацца, чаму, як напісана, Бог стварыў чалавека па вобразу і падобнасьці сваёй.

Калі спрасьціць аналёгію і канкрэтызаваць думаньне, то можна разважаць такім чынам. Пояс, чалавечая сярэдзіна — гэта энэргія і абмен. У гары — тры вышэйшыя субстанцыі: сэрца, розум і, як мяркуецца, душа. Ніжэй — працяг роду, распад, інстынкт палавін.

Калі жыцьцёвая канцэнтрацыя думак, дзеяньняў, паводзінаў і матывацыя засяроджаныя на верхнім узроўні, тады адбываецца высокае разьвіцьцё асобы і грамадзтва (узвышэньне).

Калі канцэнтрацыя накіраванасьці і прыярытэты засяроджаныя на нізкім узроўні — адбываецца дэградацыя (прымітывізацыя) асобы і заняпад (распад) супольнасьці.

Раздумленьне над гэтым прыводзіць да высновы, што тут дзейнічае абсалютная заканамернасьць, якая не прадугледжвае выключэньняў.

Накладаньне і праекцыя арыентацыяў асобы у гістарычных грамадзтвах адносна будовы цела карэлююцца з пэрыядамі ўздыму і заняпаду.

Цывілізацыйная катастрофа адбываецца тады, калі грамадзтва набліжаецца да вобразу Садома і Гаморы.

Гэтакі накірунак існаваньня асобы (апушчэньне ўніз) прывёў да крызісу антычнага грамадзтва і разьвіваецца цяпер у Эўра-Амэрыканскім сьвеце былых хрысьціянаў.

Прыродная і надпрыродная сістэма чалавека (мужчыны-жанчыны), практычна, усюды на Зямлі аднолькавая. Асабліва прыцягвае ўвагу аднолькавасьць дзеяньняў, паняцьцяў і рэакцыяў дзяцей у людзей розных расаў і народаў. З уключэньнем у соцыюм, аднак, рэзка зьмяняецца іхны малюнак паводзінаў і ацэнкі рэальнасьці.

Тым часам відавая ўласьцівасьць духа і натуры трыадзінага чалавека не залежыць ад соцыюма (хоць узаемазьвязаная і соцыюм здольны на яе ўплываць). Прэцэзійная дакладнасьць натуры чалавека і сіла прыроднага наканаваньня ўражвае сваёй магутнасьцю і сваёй зададзенасьцю трыадзінства, як шляху да гармоніі чалавечага існаваньня.

Псіхалягічная прырода, будова цела і біялёгія мужчыны ад пачатку спрыяе яму быць больш незалежным у выбары паводзінаў. Ён актыўны дасьледнік і пераўтваральнік сьвету, зьнішчальнік перашкодаў, заваёўнік і набытчык.

Прырода жанчыны, на якой палягае функцыя прадаўжэньня роду, спрыяе арганізацыі асяроддзя. Жанчына замацоўвае, кансэрвуе, абчалавечвае тое, што здабыта. Без кансэрвуючага, абчалавечваючага фактару жанчыны чалавек не падняўся б з прыроды і першабытнасьці. Яго актыўнасьць дзеля здабыцьця і пераўтварэньня сьвету без „замацаваньня" магла б абярнуцца ў шлях спажываньня і разбурэньня, калі ў імкненьні наперад за плячыма застаюцца адны руіны.

Гэтае наша дапушчэньне добра відаць у гісторыі на прыкладзе варварства. У варвараў, практычна, адсутнічала каштоўнасьць чалавека. Жыцьцё чалавека нічога ня значыла. У гістарычных манголаў часоў Чынгіз-хана сьмяротнае пакараньне ажыцьцяўлялася тут жа, калі мангол разьліў на зямлю малако з курдзюка альбо памачыўся ў юрце. Але калі нехта па нейкай прычыне забіваў іншага, на гэта амаль не зьвярталі ўвагі. Забойства трактавалася як прыватная справа.

Роля жанчыны ў варварскім грамадстве была мізэрнай. Тым часам і надпрыродная сістэма чалавечай натуры, пра якую я казаў у пачатку, і функцыя жанчыны ў гэтай сістэме чалавека, і гісторыя цывілізаванага сьвету паказваюць, што ўсялякі заняпад грамадства, распад у ім маральных правілаў, нормаў і дачыненьняў, не прыводзяць да ягонага краху і разбурэньня, пакуль дэмаралізацыя не паралізавала чалавека-жанчыну. Гэтаму ёсьць шмат прыкладаў. Чалавек-мужчына змагаецца, здабывае, стварае, зьмяняе, але сьвет трымаецца на жанчыне.

Дасьледавана, што неабарачальнае выраджэньне і выміраньне этнічнай супольнасьці характарызуецца дэградацыяй трыадзінага чалавека. Спачатку перастаюць паважаць старых людзей і клапаціцца пра старых бацькоў. Потым перастаюць цікавіцца выхаваньнем дзяцей, іхным жыцьцём і будучыняй. І нарэшце, мужчына перастае змагацца за жанчыну, уплываць на яе жыцьцё, цікавіцца яе лёсам; жанчына траціць сорам, перастае паважаць сваё цела, ня хоча дзяцей.

У мяне не адчыняецца рот, каб сказаць, якія працэсы маральных пераменаў назіраюцца ў нашым беларускім грамадстве...

Але ня ўсё страчана. Дамагаючыся вялікага, не забывайма пра малое. Трэба змагацца, клапаціцца за кожную душу, за кожнае добрае людскае слова, за кожнага чалавека. Так, як робяць гэта шмат хто ў нашай краіне.

* * *

Унівэрсальны прынцып гармоніі ў сусьвеце ёсьць любоў. Гэта надпрыродная зьява жыцьця, сваіста праяўляецца ў натуры чалавека і зьяўляецца асновай сям'і, дзе якраз трыадзіны чалавек рэалізуецца найбольш дасканала. ***Сям'я, побач з дзяржавай, ёсьць найвялікшае цывілізацыйнае дасягненьне чалавека***. Гуманны, псіхалягічна паўнавартасны чалавек вырастае, як правіла, у паўнавартаснай, добрай сям'і. З гэтай прычыны інстытут сям'і, гэтак жа, як і жыцьцё чалавека, ёсьць ***вялікай каштоўнасьцю нацыі***, вымагае спэцыяльнай аховы яго ў грамадстве і стварэньня спрыяльных умоваў існаваньня.

Пачынаючы з другой паловы ХХ-га стагоддзя (пасьля 2-й Сусьветнай вайны), назіраецца інтэнсіўны працэс распаду сям'і, практычна, ва ўсім сьвеце (але найбольш — у Эўропе і Амэрыцы). Узіраючыся ў глыбіню пісанай гісторыі, мы не знаходзім чагосьці падобнага, з чым маглі б параўнаць тое, што адбываецца зараз з сям'ёй. Распадаюцца амаль дзьве трэці шлюбаў, зьяўляюцца хваравітыя канцэпцыі аб непатрэбнасьці сям'і, усё больш людзей (асабліва жанчынаў) сьведама не ўступаюць у шлюб, каб жыць самым з сябе (з вымогаў цела і пачуцьцяў), карыстацца гатовым, ня мець дзяцей і ня мець абавязкаў. (Гэта найбольш назіраецца ў Заходнім сьвеце.)

З мноства канкрэтных прычынаў гэтай зьявы я б вылучыў тры, найбольш агульныя. Першая — гэта культурны разрыў паміж пакаленьнямі, што прывяло да разладу ў перадачы традыцыяў, і нават элемэнтарнага вопыту.

Нагадаю, што для нармальнага і пасьлядоўнага разьвіцьця культуры (гэта значыць, з засваеньнем досьведу) павінны быць аўтарытэты (эліта), пастаяннае насельніцтва (на пастаяннай тэрыторыі), узаемаабмен і лучнасьць пакаленьняў. Мінімум тры пакаленьні (дзед, бацька і сын) павінны мець агульныя асноўныя каштоўнасьці. Хуткія зьмены ў грамадстве дызарыентавалі мэханізм перадачы культуры.

Другая агульная прычына — упадак маралі. Трэцяя — бездухоўнасьць.

Самае дрэннае, што зьява дэградацыі і распаду сям'і — гэта вынік агульнага працэсу абясцэньваньня і рэдукцыі нацыянальнай цывілізацыі. Эўропа айчынаў перакшталтоўваецца ў Эўропу спалучаных вытворцаў і спажыўцоў. Будуецца інтэграцыя па матэрыяльных інтарэсах на фоне фатальнага ўпадку духоўнай і гуманістычнай культуры.

Мы, беларусы, стварылі нацыянальную дзяржаву ў 1918 годзе, і ў тым жа годзе страцілі незалежнасьць. З прычыны больш чым 70-гадовага пэрыяду савецкай акупацыі і камуністычнага вынішчэньня, мы ня мелі магчымасьці стабілізаваць нацыю ў рэжыме дзяржаўнага існаваньня. А гэта (дзяржаўная стабілізацыя) — абавязковы этап. Пасьля 1991 года (калі мы вярнулі незалежнасьць) трэба было прайсьці страчаны этап паскоранымі тэмпамі. Але з 1994 года ізноў усё затрымалася.

Кардынальна зьмяніўся сьвет. Той хвалі нацыянальнага ўздыму і нацыянальнага будаўніцтва, якая была ў Эўропе ў пачатку ХХ-га стагоддзя, больш не існуе. Мы ўжо ня можам плысьці на яе вяршыні. Няма нават прыбою. Але ж мы мусім, мусім дабудаваць наш нацыянальны дом, мусім мець над ім дах, каб не загінуць у абставінах, калі зьмянілася асяроддзе і плыні, і мы засталіся адны.

Мы, беларусы, павінны зразумець, што ў справе нацыянальнага будаўніцтва нам ніхто (абсалютна ніхто) не дапаможа, акрамя нас самых. Будуць прапаноўваць сваё разуменьне дэмакратыі. Але нікога не цікавіць наш нацыянальны лёс.

Таму, якія б ні былі павароты лёсу, якія б ні перажывалі мы выпрабаваньні, трэба найперш шанаваць і зьберагаць нашых людзей.

* * *

Самае страшнае цяпер для беларусаў — гэта Чарнобыльскі генацыд. Створаныя сапраўды сатанінскія ўмовы для пастаяннага вынішчэньня беларускай нацыі. За апошнія сем гадоў страчана паўмільёна насельніцтва. Змагаючыся за пасьлячарнобыльскае існаваньне, ня кожны чалавек здае сабе справу і ня кожны ўсьведамляе, што беларусам прыходзіцца весьці барацьбу з варожымі сіламі ўсяго сьвету. Уся сусьветная атамная энэргетыка пад шыльдай МАГАТЭ з усім сваім фантастычным капіталам (500 мільярдаў даляраў) стараецца схаваць ад сьвету страшныя вынікі атамнай катастрофы ў Беларусі, зьменшыць іх і сфальшаваць. Іх не цікавіць здароўе і лёс беларусаў.

Такую ж самую пазыцыю займае Расея, якая адмыслова забрудзіла ядзернымі ападкамі Магілёўскую вобласьць, ня выплаціла беларусам кампэнсацыю за Чарнобыль і нясе адказнасьць за катастрофу.

Чарнобыльскі генацыд небясьпечны для ўсіх, але найперш — для дзяцей. Цяпер, гледзячы на маштабы і мэтады чарнобыльскага

вынішчэньня, некаторыя беларусы кідаюцца ў роспач, разумеючы, што толькі праводзячы адмысловую дзяржаўную палітыку, можна зьменшыць біду. Але палітыка не ў беларускіх руках.

У Чарнобыля існуюць як бы зьнешнія пачатковыя прычыны. Але ня менш небясьпечная страта нашых людзей, што зыходзіць з унутраных, як бы зь нябачных прычынаў, зь якімі ізноў жа, вельмі цяжка змагацца без дапамогі дзяржавы.

Прыпамінаю малазначны выпадак з 1995 года. Каля гадзіны ночы ў Менску я сьпяшаўся на апошні тралейбус па пустой вуліцы. Насустрач ішоў нейкі малады чалавек гадоў 25-ці і нешта ў мяне спытаў (ці то пра прыпынак, ці то пра гадзіну). Калі я яму адказваў, ён мяне пазнаў.

— Выбачайце, — кажа потым хлапец, назваўшыся, — але ці мог бы я вам сказаць адну вельмі важную для Беларусі рэч, якая не дае мне спакою?

— Кажыце, — згаджаюся я.

— Трэба ратаваць беларускіх жанчынаў! Згінем. Згіне Беларусь, — усхвалявана загаварыў нечаканы спадарожнік.

Тут ужо зьбянтэжыўся я. Высьветлілася, што хлапец вельмі перажывае, што беларускіх дзяўчат падманваюць розныя агенты ды нягоднікі, вывозяць за мяжу, абяцаючы ўладкаваць на добрую працу. Адбіраюць пашпарты і перадаюць у рабства заходнім сутэнёрам.

— Трэба нешта рабіць, трэба спыніць, — хваляваўся хлапец. — Гэта зьнявага! Ганьба! Страцім Беларусь... У нас такія жанчыны!

Часам мне ўспамінаецца гэты разумны беларускі хлапец, які засьведчыў, што жывы наш народ, жыве, ня гледзячы ні на што, і будзе жыць.

У цяжкіх антыбеларускіх варунках існаваньня ***беларус беларуса павінен падтрымліваць і адзін аднаму дапамагаць***. Асноўным прынцыпам дачыненьняў паміж людзьмі павінна стаць Беларуская Салідарнасьць, падтрымка і спрыяньне адзін аднаму. Шмат якія народы перажывалі цяжкія часы, але разам, зьбярогшы сябе і падтрымліваючы кожнага, перамаглі навалу і пазбавіліся вынішчэньня.

У беларусаў ёсьць магчымасьць перамяніць адмоўны ход сваёй гісторыі. Патрэбная толькі воля.

6 верасьня 2001 г., Варшава.

2. БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Беларуская нацыя існуе, пакуль жыве Беларуская мова. Мова ёсьць галоўны вынік і сродак культуры.

Калі мы над гэтым задумаемся глыбей, то адчуем, што велічнасьць гэтай зьявы — чалавечай мовы — настолькі грандыёзная, што ўражвае нашу сьвядомасьць. І сапраўды, гэта цуд культуры, матэрыялізаванае думаньне і праяўлены дух. У мове мы, людзі, бачым сябе. Гэта люстэрка нашага існаваньня, адбітак нашых душаў.

Вытокі мовы пакрытыя хвалюючай таямніцай, як і ўсё нашае паходжаньне на Зямлі. Калі ўявіць, што чалавек разьвіваўся з прыроды, і паспрабаваць накрэсьліць схему, зрабіць мадэль ягонага пераходу ў стан культурнага існаваньня, то прыходзім да высновы, што абстрактнае думаньне, памяць роду (гэта значыць — гістарычная памяць) і мова ўзьніклі і разьвіваліся адначасова і ўзаемна ўплывалі самыя на сябе.

Гэтак адбывалася самаўдасканаленьне трох асноваў культуры: абстрактнага думаньня, гістарычнай памяці і мовы. Навуковыя дасьледваньні чалавечай жыццядзейнасьці ў старажытнасьці і сьведчаньні простых формаў існаваньня чалавечага грамадзтва ў цэлым пацьвярджаюць нашу траістую схему разьвіцьця сьвядомасьці і мовы людзей.

Зьяўленьне мовы як структураванага інструманту інфармацыі азначала рэзкі прарыў у культуру, у грамадзкае і гістарычнае існаваньне чалавека. Адначасна запрацавала зваротная сувязь. Мова стала найвялікшым сродкам культуры, дзейнічала як матор культурнага разьвіцьця, спрыяла стварэньню чалавека разумнага, фармаваньню чалавечага грамадзтва.

Прарыў з прыроды ў культуру адбываўся найперш праз мову. Бяручы пад увагу гэтую рэвалюцыйную ролю мовы ў разьвіцьці культуры чалавецтва, асабліва робіцца зразумелым вялікае і крылатае цьверджаньне аб тым, што напачатку было *Слова*. Мова трымае ўсё: культуру, гісторыю, памяць, грамадзтва, сумоўе людзкіх душаў. Мова аб'ядноўвае і мацуе, вядзе за сабой. Вось жа сапраўды правільна: напачатку — было *Слова* (гэта значыць, на пачатку культуры).

* * *

Што яшчэ ўражвае нашае ўяўленьне, дык гэта шматаблічнасьць мовы. На Зямлі жыве мноства народаў і этнічных групаў, і, адпаведна, існуе вялікая колькасьць розных моваў. Кожная мова, нібы шчыт, які зьберагае і выдзяляе народ сярод іншых народаў, і адначасна, — гэта плятформа, на якой угрунтаваная культурная індывідуальнасьць чалавечай супольнасьці.

Аглядаючы пісаную гісторыю людзей, мы заўважаем, што заўсёды, калі гінула мова, то гінуў і народ. Тут узаемасувязь, сутнасныя дачыненьні, якія глыбока і афарыстычна адлюстраваў наш вялікі Багушэвіч. „***Шануйце мову нашу, беларускую, каб ня ўмёрлі",*** — напісаў паэт.

Шмат моваў зьнікла на Зямлі, і зьнікае па сёньняшні дзень. Прычыны розныя. Але найчасьцей — гэта несамастойнае існаваньне (адсутнасьць незалежнай дзяржаўнасьці) і грамадзка-палітычная сацыяльная катастрофа.

Але шмат моваў трываюць і ня гінуць, ня гледзячы на неспрыяльныя абставіны. Шмат якія мовы адраджаюцца, вяртаюцца да жыцьця амаль зь нябыту. Перадусім, тут велізарнае значэньне мае дух народа (этнаса), яго ўпэўненасьць у сабе, закаранеласьць у сваю духоўную культуру і гісторыю, і, як вынік, — сьвятое шанаваньне сваёй мовы і ўсяго свайго.

Грамадзка-палітычная катастрофа можа зьнішчыць любую мову (нават самую распаўсюджаную) тады, калі зьніклі, замерлі ці ліквідаваныя яе этнічныя носьбіты. Такія зьявы, як генацыд, этнацыд, лінгвацыд, мнемацыд, якія вынікаюць, як правіла, з імпэрскай палітыкі, а таксама з ксэнафобіі і нянавісьці, вельмі небясьпечныя для моваў найперш несвабодных народаў (посткатастрафічных супольнасьцяў). Аднак разбурэньне імпэрыі пры пэўных абставінах таксама можа выклікаць зьнікненьне імпэрскай мовы, прытым нават тады, калі існуе прызнаная імпэрская літаратура.

Тыповымі прыкладамі зьяўляюцца Рымская і Атаманская імпэрыі. Рым разбурыўся, зыходзячы з унутраных прычынаў (перш за ўсё, — з-за ўпадку маралі). Рымская (лацінская) мова гучэла ў Сэнаце, сцьвярджалася ў літаратуры і на ўсіх канцах імпэрыі. Але пад друзам гэтай імпэрыі была пахаваная і вялікая рымская мова, ператварылася потым у мёртвую лаціну.

Чаму так сталася? Сталася так таму, што не было ўжо этнічных носьбітаў гэтае мовы. Лацінскі этнас дэградаваў, бо стлуміў у сабе этнічную сьведамасьць, інстынкт аддзяленьня ад чужога. Этнічная сьведамасьць замянілася імпэрскай. Лаціна рымская абслугоўвала імпэрскую культуру, імпэрскую ўладу і імпэрскую дзяржаву. Яна адрозьнівалася ад этнічнай лаціны. З разбурэньнем рымскай улады і дзяржавы, са стратай рымскага набілітэту, рэзка зьмяніліся функцыі дзяржаўнай лаціны, а ў рэальным штодзённым жыцьці, на

самым нізкім (вусным) узроўні не было каму на ёй размаўляць. Лаціна памерла.

Трэба ўлічыць, што імпэрыя (гэта значыць — імпэрская ўлада і імпэрская культура) іманэнтна, зыходзячы з сутнасьці сваёй прыроды, імкнецца зьнівіляраваць і разбурыць любы этнас, у тым ліку і свой, які даў пачатак імпэрыі.

Мова Атаманскай імпэрыі, у адрозьненьне ад рымскай мовы, узьнікла на дэдуктыўным прынцыпе. Гэта была штучная мова, створаная на аснове старажытных моваў Усходу (у асноўным, пэрсідзкай) і абслугоўвала яна якраз толькі імпэрскую дзяржаву, арыстакратыю, чынавенства, афіцыйную культуру і ўвогуле — вярхі. Асноўны народ імпэрыі — туркі — размаўляў на сваёй народнай анаталійскай (турэцкай) мове.

Пасьля разбурэньня і распаду Атаманскай імпэрыі новая Турцыя, будуючы новую нацыянальную дзяржаву, абаперлася якраз на народную этнічную мову, на якой размаўляў народ, і зрабіла яе дзяржаўнай мовай краіны. Тым часам мова Атаманскай імпэрыі аджыла. У ёй не было патрэбы. Са зьнікненьнем імпэрскіх вярхоў на ёй не было каму гаварыць.

Калі мы зьвернем увагу на рускую імпэрыю (Расею), то заўважым там адначасна дзьве схемы функцыянаваньня мовы: індуктыўную, з апорай на этнас, і, ў пэўнай ступені, штучную, прыдуманую форму рускай мовы, якая ў апошнім стагоддзі значна рэдуцыравалася, дзякуючы літаратуры. Тым ня менш, улічваючы няспынную абсалютызацыю імпэрскай ідэалёгіі і адпаведна — псіхалёгіі, і беручы пад увагу таксама няспынную дэградацыю асноўнага этнасу, існуе вялікая верагоднасьць, што пры разбурэньні расейскай імпэрыі рускую мову можа напаткаць нават ня мёртвае ўжываньне, як у пострымскай сітуацыі, а глыбокі маргіналізм і звужэньне да лякальнага асяродка. (Заўважым, што ніякія інфармацыйныя сістэмы тут не дапамогуць.)

Тое ж самае, улічваючы цяперашні працэс асаблівай дэструкцыі ангельскага этнасу, можа напаткаць і ангельскую мову. (Як гэта каму на слых ня здасца неверагодным.) Штуршок такому ходу гісторыі можа пакласьці пасьпешны ўпадак і распад Злучаных Штатаў Амэрыкі.

Гэтакая верагоднасьць, па маіх назіраньнях, увесь час павялічваецца і абумоўлена ўнутранымі прычынамі. У ЗША беззваротна нарошчваюцца тыя ж працэсы, што некалі ў Рыме, толькі разьвіваюцца больш хуткімі тэмпамі. (Ізноў жа, паўтаруся, ніякія інфармацыйныя сістэмы тут не ўратуюць, бо сістэма — гэта прылада.)

Імпэрыя, аказваецца, ня можа гарантаваць вечнага (і, тым больш, жывога) існаваньня імпэрскай мовы. Значна лепш гэта спраўджвае і рэалізуе *нацыянальная дзяржава*, якая і ўзьнікла (прынамсі, у Эўропе) у барацьбе зь імпэрыяй. (Прытым змаганьне йшло, перш за ўсё, за права існаваньня і разьвіцьцё нацыянальнай мовы.)

* * *

Стварэньне нацыяў і нацыянальных дзяржаваў ёсьць гістарычная зьява, якая мае ня толькі свае грамадзкія прычыны, але і храналягічныя рамкі (найперш у Эўропе). Сьцісла можна іх пазначыць ад апошняй чвэрці XVIII па першую чвэрць XX-га стагоддзяў. У гэты пэрыяд сфармаваліся і высьветліліся ўсе нацыянальныя канцэпцыі культуры, свабоды і незалежнага дзяржаўнага існаваньня.

Як правіла, нацыянальныя рухі пачыналіся з самапазнаньня, асьветніцтва, стварэньня нацыянальнага мастацтва, літаратуры, тэатра. Потым разьвіваліся у палітычнае змаганьне зь імпэрыяй і заканчваліся стварэньнем нацыянальнай дзяржавы.

Уражвае ў гэтым працэсе тое, што народы паўсюдна прызнавалі і паўсюдна змагаліся за дзьве асноўныя каштоўнасьці: за *нацыянальную мову* і за незалежнасьць (гэта значыць — за нацыянальную дзяржаву).

Сэнс асьветніцкай і мастацкай дзейнасьці быў падпарадкаваны адной мэце: ***сцьвярджэньню нацыянальнай мовы***.

Гэтую задачу найперш узялі на сябе газэты, літаратура і асабліва вандроўныя тэатры, якія ўзьнікалі паўсюдна. Творца вэнгерскага прафэсійнага тэатра Ота Келеман, які стварыў вэнгерскую вандроўную трупу яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя, прызначэньне свайго тэатра і тэатральнага мастацтва сфармуляваў коратка і выразна: сцьвярджэньне і прапаганда вэнгерскай мовы. (Вэнгры змагаліся тады зь нямецкім засільлем.)

Аналягічна разумеў задачы тэатра Ігнат Буйніцкі і такія яго акторы, танцоры і сьпевакі, як Леапольд Родзевіч ды Алаіза Пашкевіч (Цётка). Гэтак жа ацэньвалі ў той час нацыянальную місію тэатра дзеячы вандроўнай сцэны на Ўкраіне, у Малдове ды Румыніі, у Баўгарыі ды Сэрбіі, у Чэхіі, Славакіі, Летуве і г.д.

Нацыянальныя рухі ўсьведамлялі нацыянальную мову як галоўную каштоўнасьць нацыі, сцьвярджэньню яе ў грамадзтве падпарадкоўвалі ўсю сваю нацыянальна-асьветніцкую дзейнасьць.

* * *

Беларуская нацыянальная ідэя рэалізавалася ў 1918 годзе, калі была створаная ***Беларуская Народная Рэспубліка*** і аб’яўлена яе незалежнасьць. Аднак неўзабаве незалежнасьць была страчаная, і нацыянальнай стабілізацыі не адбылося.

Расейскі камуністычны генацыд і ўсе формы вынішчэньня цярпелі тры пакаленьні беларусаў. У сэнсе культурным, і асабліва — псіхалягічным, 73 гады савецкай акупацыі — гэта чорная дзіра, правал у нацыянальнай сьведамасьці народа. Калі ў 80-х гадах XX-га стагоддзя аднавіўся беларускі рух за незалежнасьць і за культурнае адраджэньне нацыі, новыя адраджэнцы (некаторыя з жахам і з роспачу) убачылі, што сутыкнуліся з узроўнем нацыянальнай сьведамасьці грамадзтва, як у канцы XIX-га стагоддзя.

Камунізм, савецкая акупацыя, вынішчэньне ўсяго беларускага фатальна затармазілі псіхалягічнае разьвіцьцё грамадзтва, дэфармавалі ўнутраны сьвет беларуса, адкінулі сьведамасьць мноства людзей да абсурднай мяжы.

„Зачэм этат беларускі язык?”; „Какая разьніца, на каком языке гаварыць?”; „Каму нужэн этат суверэніцет, главнае, чтобы жылась харашо” і г.д., — вось тыповыя цьверджаньні шмат якіх па-савецку адукаваных беларусаў канца XX-га стагоддзя.

На жаль, гэта рэальнасьць, і, як кажуць, тут не да сьмеху. Людзі з такой сьведамасьцю — ня рэдкасьць, яны трымаюць уладу, кіруюць беларускім грамадзтвам. На Беларусі адбылася кансэрвацыя саветызму палітычнымі мэтадамі, з выкарыстаньнем аўтарытарнай улады.

Фантасмагарычнасьць сітуацыі ў тым, што пакуль вялікая частка постсавецкага беларускага грамадзтва паўтарае сэнтэнцыі, кшталту, „зачэм язык” і „какая разьніца”, ні пра якую нацыянальную і сацыяльную свабоду, ні пра якое разьвіцьцё эканомікі, ні пра які дастатак і ні пра якое годнае жыцьцё ня можа быць і гаворкі. Бо такое грамадзтва, якое ня мае агульнасьці галоўных нацыянальных каштоўнасьцяў і, тым больш, адмаўляе іх, такое грамадзтва ня ў стане абараняць свае нацыянальныя інтарэсы. Прытым ня тое, што, скажам, прыродныя рэсурсы, зямлю, фінансы, прадпрыемствы, прыродныя багацьці, але і асабістую працу. Такі беларус будзе шмат і цяжка працаваць, але заўсёды застанецца бедным, не разумеючы прычынаў сваёй беднасьці.

Прыгадваю выпадак з пачатку 90-х гадоў. У час адной з нашых дэпутацкіх паездак па Беларусі, якія практыкавалі дэпутаты *Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце*, мне прышлося чуць у цягніку

размову нашых сяброў-дэпутатаў з адным заслужаным пэнсіянерам-настаўнікам. Заслужаны настаўнік, беларус, з гонарам расказваў па-руску, колькі добрых людзей ён навучыў за жыцьцё. Адзін — генэралам у Мурманску, нехта выехаў у Акадэмію навук у Пецярбург, хтосьці цяпер жыве і нешта робіць важнае ў Растове, нехта — спэцыялістам у Навасібірску, а ягоных двох сыноў, дык уладкаваліся ў Маскве. Адзін — выкладчык ва ўнівэрсітэце, а другі — інжэнер, нечым там кіруе, жаніўся на маскоўцы і ўжо гадуе двох дзяцей. Настаўнік быў вельмі задаволены.

— А якая ў вас пэнсія? — пацікавіліся ў настаўніка.

— Ой, ведаеце, малаватая, — пажаліўся ён. — Я яшчэ падпрацоўваю, маю некалькі гадзінаў у школе, бо пэнсіі не хапае.

— Чаму ж так? — запыталіся ў яго. Настаўнік разьвёў рукамі.

— А цяпер вось глядзіце, — заўважылі мае калегі. — Вы ўсё жыцьцё працавалі, навучалі беларусаў на рускай мове. Беларускі ўнівэрсітэт (таксама на рускай мове) падрыхтаваў зь іх спэцыялістаў, якія паехалі ў Расею і пачалі там працаваць, а значыцца даваць прыбытак рускай дзяржаве і плаціць падаткі ў рускі бюджэт. На адукацыю гэтых спэцыялістаў, на навучаньне іх рускай мове Расея не затраціла ні капейкі. Гэта вынік вашай працы. А дзе ж ён, гэты вынік, для вас? Дзе ваш прыбытак? З чаго ваша пэнсія, з чыйго бюджэту?

— Праўда.., — зьдзівіўся настаўнік.

— А што б было, калі б уся адукацыя была па-беларуску ў сістэме дзяржаўнай беларускай мовы? — прадаўжалі мы. — Куды была б найперш сьціраваная ўвага нашых маладых спэцыялістаў і ваш „труд"? Аб'ектыўна — ці ж не на вашыя інтарэсы? А што было б, калі б усю беларускую адукацыю перавесьці на ангельскую мову? — працягвалі мы далей. — Да каго б мы былі прывязаныя і дзе б палягала тады прычына нашай беднасьці і бядоты: на Ўсходзе ці на Захадзе?

Настаўнік быў крыху ашаломлены. Гэты савецкі інтэлігент ніколі не задумваўся над такімі пытаньнямі. Але гэтакая размова была б нармальнай дзе-небудзь у 1890-х у вагоне Лібава-Ровенскай чыгункі, а не цяпер, праз сто гадоў, калі час для многіх беларусаў адначасна зьмяніўся і адначасна, як бачым, спыніўся ў самым пачатку.

Беларуская мова як найважнейшая зьява культуры ёсьць таксама аснова нашай нацыянальнай свабоды і найважнейшы чыньнік эканамічнага разьвіцьця.

Вось чаму нацыянальная ідэя імкнецца да стварэньня нацыянальнай дзяржавы ў нацыянальнай мове і на нацыянальнай тэрыторыі. Гэта дзеля таго, каб рэалізаваць жыцьцёвы (гэта значыць, духоўны і матэрыяльны) патэнцыял народа, каб стварыць аптымальныя ўмовы духоўнага камфорту і матэрыяльнага дастатку для ўсёй нацыі.

* * *

Страты нацыянальнага патэнцыялу і тармажэньне нацыянальнай ідэі нават на сто гадоў, пры ўсіх ускладненьнях, не выглядаюць вялікай бядой, калі б аднавіць незалежную, вольную, нацыянальную дзяржаву, якая б праводзіла палітыку ў інтарэсах нацыі. Тады зусім не спатрэбіцца яшчэ сто гадоў, каб вярнуць страчанае і дагнаць час. Бо калі зьнікаюць перашкоды, тады раней затарможаныя зьявы разьвіваюцца паскоранымі тэмпамі. Паскарэньне — гэта агульны закон разьвіцьця растарможаных працэсаў і назіраецца ўсюды: у мастацтве, у літаратуры, у прыродзе, у грамадзтве. Праз 10-15 гадоў нармальнага нацыянальнага разьвіцьця ў паскоранасьці ўжо не існавала б грамадзкай адсталасьці і сьведамасьці, тыпу „зачэм" і „какая разьніца".

Але разумеючы закон паскоранасьці, мы павінны ўсьведамляць яго катэгарычную імпэратыўнасьць. Тое, што было перапынена і ня зроблена сто гадоў таму, на пачатку стабілізацыі нацыі, тое мусіць быць хутка (паскорана) зроблена цяпер. Пераскочыць праз абавязковыя этапы разьвіцьця, праз абавязковыя ацэнкі і абавязковыя каштоўнасьці — нельга. Яны ў аднаўленых умовах павінны быць пройдзеныя імкліва, хоць бы пункцірам, але абавязкова пройдзеныя і замацаваныя. Інакш зьява (у дадзеным выпадку — беларуская нацыя) не рэалізуецца, як сістэма.

Беларусы, тыя, што, як наш настаўнік, заклапочаныя толькі „сваім" і не прывыклі задумвацца над „нашым", над агульным, мусяць выразна сабе ўсьвядоміць, што калі беларуская мова ня будзе адроджаная, ня зойме належныя ёй дзяржаўныя, грамадзкія, культурныя і маральныя прыярытэты, то беларуская гісторыя можа неўзабаве скончыцца. Удакладняю: канец гісторыі — гэта катастрофа. Гэта — канец нацыі. Катастрофа суправаджаецца зьбядненьнем і дэградацыяй насельніцтва, стратай уласнасьці, зямлі, прыроды, дзяржавы, вынікаў працы. Нават сваёй працай чалавек перастане распараджацца сам.

Мы ўжо нешта падобнае выцерпелі ў XX-м стагоддзі. І таму цяпер, калі цудам засталіся жыць, нам цяжка падняцца з каленяў.

* * *

Функцыя нацыянальнай мовы ў нацыянальным грамадзтве — усеабдымная: ад духоўнага да эканамічнага выяўленьня. Аднак ня ўсюды яна выяўляецца непасрэдна. І ў гэтым хаваецца адна з цяжкасьцяў у разуменьні сутнасьці нацыянальных каштоўнасьцяў для саветызаванага чалавека.

Найбольшая складанасьць для новага беларускага Адраджэньня палягае яшчэ і ў тым, што за сто гадоў моцна зьмяніліся ўмовы і дачыненьні ў Эўропе. Пэрыяд утварэньня нацыяў якраз закончыўся ў першай чвэрці XX-га стагоддзя. Нацыянальная ідэя ў міжнароднай сьведамасьці стала як бы не актуальнай, бо гэта ўжо пражыты і пройдзены этап. А значыць аслабілася і гатовасьць да міжнацыянальнай салідарнасьці.

З 80-х гадоў мінулага стагоддзя пашырылася ў сьвеце ідэя інтэрнацыянальнай дэмакратыі, уздымаецца на катурны міжнародная дактрына „правоў чалавека", узмацняюцца лібэральныя імкненьні да інтэграцыі Эўропы і глябалізацыі сьвету. Міжнародныя дэмакраты і міжнародныя лібэралы працуюць разам над стварэньнем новых дэмакратычных супэр-імпэрыяў, супэр-дзяржаваў.

Для прадстаўнікоў гэтай звышідэалёгіі (гэтай дэмакратыі *uber alles*) нашыя, актуальныя для нас, нацыянальныя праблемы стогадовай даўніны, наша балючасьць, нашае роспачнае імкненьне выкараскацца з той бяздоннай курапацкай ямы, куды ўсадзілі наш народ недабразычліўцы, нашае стараньне ўратаваць найперш нашу мову ды незалежнасьць — усё гэта здаецца ім (шмат каму) анахранізмам. Бо ў іх мова, культура, незалежнасьць — само сабой зразумелае, яны з гэтым нарадзіліся і думаюць, што ўсё гэта існуе натуральна, у парадку рэчаў, як горы, рэкі і даліны.

Але ж у нас — ня так. Мы мусім, паскорана мусім (!) прайсьці этап дзяржаўнага ўсталяваньня нацыянальных каштоўнасьцяў і стабілізаваць нацыю разам з дэмакратыяй. Інакш у нас ня будзе будучыні.

Мы ня можам ігнараваць аб'ектыўныя законы разьвіцьця. Нам трэба дагнаць гісторыю. Мы маем на гэта найвялікшае права. Бо нас зьнішчалі, нам не давалі жыць.

Побач з фактарам пераменаў, якія адбыліся на працягу XX-га стагоддзя і ўскладнілі беларускую палітыку, застаўся нязьменны чыньнік — Расея, зь яе шавінізмам, імпэрскімі амбіцыямі і непрыхаванымі вялікадзяржаўнымі прэтэнзіямі на Беларусь. Гэты чыньнік небясьпечны. Калі б ня ён, не карэляцыя і не ўзаемадзеяньне яго з пераменамі ў сьвеце, беларускіх праблемаў у такім выглядзе, у якім яны існуюць сёньня, проста ўжо б не было.

Бальшавіцкі генацыд — гэта вельмі істотны аспэкт у беларускай трагедыі. Ніхто ня мае права і ніхто ня можа падважваць і адмаўляць нашу незалежнасьць, нашу беларускую мову, нашыя сымвалы, нашу свабоду, адзінства зямлі і гісторыі, не спытаўшыся тых амаль трох мільёнаў беларусаў, якіх нявінных забілі ў часе тэрору. Тых беларускіх пісьменьнікаў, інтэлігентаў, вучоных і простых сялянаў, якіх расстралялі толькі за тое, што былі беларусамі.

* * *

Якая ж яна, нашая сьвятая для нас, Беларуская Мова? Ці можна неяк глянуць на яе збоку, каб ацаніць аб'ектыўна? Як яна гучыць для іншых, як яе ўспрымаюць?

Кожная свая мова для кожнага народа — найлепшая і найпрыгажэйшая. І гэта правільна. Бо ў мове выяўляецца сутнасьць натуры народа, які яе стварыў, відаць яго душа, адбіваецца сваісты склад розуму і манера думаньня, матэрыялізуюцца рытмы духа і цела (гэта значыць, тэмпэрамэнту). Таму ў кожнай мове ёсьць свой характэрны рытм, свая мэлёдыя і сваё гучаньне, а лексіка падпарадкаваная вобразнай сістэме ўспрыняцьця сьвету людзьмі, якая ў розных этнічных супольнасьцяў (першасных носьбітаў мовы) адметная.

Гэтым тлумачыцца зьдзіўляючая для некаторых дасьледчыкаў зьява, што разумовыя і творчыя здольнасьці чалавека найлепш выяўляюцца ў роднай для яго мове. Тут рэалізуецца сумоўе — гарманізацыя рытмаў, распазнаўчых знакаў, найкарацейшых дарог паміж розумам, душой, тэмпэрамэнтам цела і мовай чалавека. Дасягаецца склад (камплект) аптымальнасьці асобы.

Гэта ня толькі тэарэтычныя разважаньні. Там, дзе можна прааналізаваць зьяву на масавых прыкладах і ў шырокай практыцы, вынікі відавочныя. У пачатку 90-х гадоў, калі ўзьнікла, нарэшце, магчымасьць адчыніць беларускія школы ў гарадах і разьвіваць беларускае школьніцтва, то праз нейкі час было зафіксавана, што беларускія дзеці ў беларускіх школах лепш пасьпяваюць, лепш вучацца, лепш засвойваюць матэрыял і лепш разьвіваюцца, чым беларускія дзеці ў такіх жа рускіх школах. Гэта натуральна. Адбылася гарманізацыя сваістага складу мовы і чалавека, аптымалізацыя разьвіцьця асобы. Карацей, сваё спаткалася са сваім.

Аналягічную зьяву заўважылі таксама нашыя фальклярысты. Ёсьць шмат сьведчаньняў такога роду, калі беларус, які сфармаваўся ў горадзе, у рускай мове, і ўспрыняўшы ўсе праявы савецкай эрзац-культуры, апынуўся раптам у вясковым асяроддзі сярод удзельнікаў аўтэнтычнага фальклёру і нечакана, пад уплывам эмоцыяў і ўзрушэньня, уключаўся ў народныя танцы ды сьпевы. У яго выяўляліся характэрныя рухі танцу і характэрныя прыёмы народнага сьпяваньня. Ён пачынаў ужывацца ў фальклёрнае дзеяньне, і гэтае дзеяньне, невядомае яму раней, аказваецца, не было для яго чужым.

Людзі кожнага народу, кожнага этнасу валодаюць характэрнымі рухамі, якія стасуюцца зь іхняй псіхалёгіяй, з эмацыйным станам, думкамі і мовай, на якой яны гавораць. Гэта мы называем *этнапластыкай*. Гарманізацыя яе з мовай таксама накіраваная на аптымальнае выяўленьне асобы чалавека.

Аказваецца, нацыянальная мова зьяўляецца ня толькі галоўным чыньнікам сацыяльна-палітычнага адраджэньня нацыі, ня толькі зьвязваючым элемэнтам нацыянальнай культуры, але і фактарам найлепшага разьвіцьця асобы чалавека, перашаснай умовай яго гарманічнага існаваньня.

* * *

Аднак за 73 гады выпрабленага гвалту над беларускай мовай за часы СССР, што афіцыйна прыкрываўся нібыта палітыкай білінгвізму ў Беларусі, сярод вялікай часткі насельніцтва стварылася вельмі некарысная зьява для беларускай культуры, менавіта, крэалізацыя (дэструктыўнае зьмешваньне) беларускай і рускай моваў. У выніку шмат беларусаў (як правіла, людзей невысокага культурнага ўзроўню) гавораць цяпер на гэтакай зьбедненай „паўмове" ці на своеасаблівай піджын-рускай (гібрыднай) мове. (Успомнім „клясычныя" прамовы Старшыні Вярхоўнага Савета Мікалая Дземянцея. Ёсьць і сьвежыя прыклады.)

Трынаццаць гадоў таму мне ўжо прыходзілася пісаць пра разбуральныя вынікі прымусовага двухмоўя на Беларусі. *(Радуга, — Таллинн, 1988, №4)* Тады беларуска-рускі „піджын" я назваў беларускім словам „трасянка", ня думаючы, што гэты тэрмін прыжывецца потым ў паняцьцях пра мову. Цяперака я паўтару тут некаторыя палажэньні.

(Фота: „Ніва")

Чарговы „обшчэчэлавечэскі": Дую сьпік Беларэйшан?

Паўмова „трасянка" — галоўная прычына абмежаванага культурнага ўзроўню. (І цяпер мы разумеем, чаму. Крэалізацыя — гэта не ўзбагачэньне, а зьніжэньне культуры мовы, якое адлюстроўвае ўпадак культуры асобы.) Культурны чалавек не размаўляе на крэалізаваным піджын. Таму сфэра распаўсюджаньня „трасянкі" за савецкія часы — сярэднія і ніжнія стратыграфічныя сацыяльныя пласты. Грамадзкая лякалізацыя гэтай паўмовы, у сваю чаргу, забясьпечвае рэпрадукцыю і сацыяльную ўстойлівасьць „трасянкі", а значыцца, і нізкага ўзроўню духоўнай культуры, якая ў цэлым выяўляе тут тэндэнцыю да далейшага зьніжэньня. Яшчэ ў 60-80-х гадах стварылася сітуацыя, калі прычына і вынік бескультур'я зьвязаныя неразрыўна, гэта значыць, прычына (паўмова) выступае вынікам, а вынік — прычынай.

Паўмоўе значнай часткі насельніцтва Беларусі вельмі згубна адбіваецца на разьвіцьці культуры. Разумовая энэргія народа траціцца і не атрымлівае разьвіцьця. Прымусовы савецкі білінгвізм ігнараваў аксіёму, што без вызначэньня прыярытэту чалавек ня

можа *адначасна* разьвівацца і існаваць у двух культурах. Дызарыентаваная асоба не атрымлівае паўнавартаснага духоўнага разьвіцьця. Паўмоўны індывідыум не адчувае тонкасьцяў духоўных сувязяў (што, дарэчы, засяроджана ў мове і выяўляецца праз гаворку), дрэнна думае абстрактнымі паняцьцямі, часта ня ў стане тэарэтычна асэнсаваць зьяву, а калі і разумее больш складаныя дачыненьні, то ня ўмее іх выказаць, сфармуляваць і выразна растлумачыць субясэдніку. Пачынаецца пакутлівы падбор словаў, неадэкватнае ўжываньне паняцьцяў, заіканьне і спыненьне на кожнай дрэнна дапасаванай фразе, „эканьне", „мэканьне" і г.д. Тут праяўляецца не паталягічнае заіканьне, а тармажэньне сьвядомасьці, прыпыненьне на кожным слове як вынік разбалянсаванасьці думаньня і моўнага выяўленьня, як вынік неразьвітых здольнасьцяў апэраваць паняцьцямі і неваloданьне сістэмнай структурай мовы (бо ў „паўмове", між іншым, адзінай структуры няма).

Паўмоўнае існаваньне прыпыняе ўнутраны спантанны працэс культурнага разьвіцьця чалавека, таму што тармозіць нацыянальнае самапазнаньне (ідэнтэфікацыю) яго грамадзкага, культурнага і духоўнага „Я".

Аднак здольнасьць да *спажываньня* культуры пры гэтым застаецца. Толькі яна, гэтая здольнасьць, зьмяняе арыентацыю з унутранага сьвету на зьнешняе асяроддзе, з актыўнай пазыцыі на пасіўную (спажывецкую). У выніку ўзьнікаюць умовы для разьвіцьця і спажываньня масавай культуры, эрзацу, сурагату, імітацыі духоўных каштоўнасьцяў.

Шкоду, якую наносіць беларускай культуры паўмова „трасянка" (і ўвогуле, дэградацыя мовы, распаўсюджваньне чужых слэнгаў, жаргонаў, вульгарызмаў, паняцьцяў і г.д.) ніхто не падлічваў, і, як я ўважаю, ня шмат хто разумее, бо, як мяркуюць, справа ў прычынах, і зь імі трэба змагацца. Правільна. Але калі б так усё было проста, то трасянкавыя палітыкі не кіравалі б уладай у дзяржаве.

Найлепшы сродак выратаваньня беларускай мовы — гэта паўсюдна пачаць на ёй гаварыць. Гаварэм жа, і будуць нас паважаць.

* * *

Знаёмства зь іншай мовай пачынаецца са слуханьня, як яна гучыць, з адчуваньня яе мэлёдыкі і рытму словаў, якія мы ацэньваем, паводле нашага густу ці законаў эстэтыкі. Ужываюцца ацэнкі: прыгожая — непрыгожая. Спэцыялісты стварылі нават адмысловую сістэму тэставаньня моваў па мэлядычнасьці, гучнасьці, колькасьці адкрытых складоў і звонкіх зычных ды галосных гукаў, камбінацыі звонкіх зычных з галоснымі, па вакальных магчымасьцях і г.д. Беларуская мова ў гэтакім тэставаньні займае шостае месца ў сьвеце.

Наўрад ці трэба да гэтакіх дасьледваньняў адносіцца надта сур'ёзна, але ўсяроўна прыемна.

Я сустракаў шмат добрых людзей сярод палякаў, латышоў, украінцаў, ангельцаў, якія былі захопленыя вымаўленьнем, словамі і мэлёдыкай нашай мовы, прасілі пагаварыць па-беларуску і слухалі з захапленьнем, нібы музыку.

Памятаю, у 70-х гадах я пазнаёміўся з маладым літоўцам з Каўнаса Ёзасам Рыбікаўскасам. У дзяцінстве ён прачытаў на пачку з макаронамі словы на незнаёмай мове. Высьветлілася, што напісана па-беларуску. Ёзаса гэтая мова так зацікавіла і потым так спадабалася, што ён вывучыў яе, бегла гаварыў, нават вершы пісаў па-беларуску. Пасьля ён прыязджаў спэцыяльна ў Менск, каб паслухаць беларускую мову (так яму было прыемна). Праўда, у Менску яго напаткала вялікае расчараваньне.

Латышская літаратуразнаўца Мірдза Абала выдатна размаўляе па-беларуску. У 70-х гадах яна сказала мне, што яе цягне на Беларусь, як магнітам, і што яна заўсёды стараецца прыехаць на Гарадзеншчыну, каб толькі пагаварыць па-беларуску ды паслухаць беларускае мовы.

У цэлым жа, я лічу, што на сьвеце няма непрыгожых моваў. Кожная мова — прыгожая, бо выяўляе асабовую сутнасьць бясконцага, невычарпальнага, шматаблічнага Боскага сьвету. Гаворачы, напрыклад, пра звонкую мэлядычнасьць італьянскай мовы, у нас звычайна ўзьнікае жаданьне спаслацца на дасканаласьць *бэль-канта*, на традыцыі італьянскай опэры і г.д. Але немагчыма ўявіць у італьянскай мове, скажам, тувінскі гарлавы сьпеў. Тым часам па сіле ўзьдзеяньня і глыбіні выяўленьня нашага, але не прывычнага нам сьвету і ў не прывычнай нам эстэтыцы, гэта ёсьць магутнае мастацтва. Для вобразнага выяўленьня яму адпавядае якраз тувінская мова. І зьбегі зычных тут вельмі дарэчы. Яны на месцы гэтак жа, як італьянская вакальнасьць мовы на месцы ў опэрным *бэль-канта*.

* * *

Чым я найбольш захоплены ў Беларускай мове, гэта яе вобразнасьцю і ёмкасьцю слова (і па зьмесьце, і па гучаньні). Другое, што мне надта падабаецца, гэта шматварыянтнасьць гучаньня і напісаньня словаў, і потым — багацьце сінонімаў. Тут рай для паэтаў, можна плаваць і купацца, плюскацца ў такой багатай мове, было б толькі што казаць.

Калі глянем у гісторыю нашай мовы, то займае дых. Беларуская мова існавала даўно, яшчэ на племянным узроўні ў дапісьмовы пэрыяд. На думку гісторыкаў, як мінімум, у VI-м стагоддзі, яна ўжо была. Але на самай справе — раней. Гэта можна зразумець, аналізуючы гісторыю і аўтэнтычны фальклёр (асабліва тэксты).

У X-м стагоддзі пісьмовасьць распаўсюдзілася на Беларусі разам з Хрысьціянствам у чужой старабаўгарскай мове. Гэтая славянская мова, часткова набліжаная да беларускай, стала адыгрываць ролю афіцыйнай, кніжнай, „граматнай" мовы, мовы, на якой пішуць і размаўляюць пісьменныя людзі (найперш, сьвятары і сацыяльныя вярхі). У пэўнай ступені, яна займала такое ж становішча ў старажытнай Беларусі, як пазьней — мова вярхоў у Атаманскай імпэрыі. Старабаўгарская мова ў беларускай культуры — *гэта была мова бяз этнасу*, гэта ад пачатку была мёртвая мова. Паступова, з разьвіцьцём грамадзтва і ўскладненьнем функцыяў дзяржавы, адбывалася лексічнае ўзаемапранікненьне моваў і экспансія жывой беларушчыны ў мёртвую кніжную мову.

Асабліва гэта стала відаць у XIV- XV стагоддзях. Ужо ў XVI-м стагоддзі, у пэрыяд *Рэнесансу*, мёртвая старабаўгарская мова зьнікае з грамадзкага ўжытку і лякалізуецца толькі ў праваслаўнай царкве, і то, як царкоўны (царкоўна-славянскі) афіцыёз. У дзяржаўных і грамадзкіх дачыненьнях у *Вялікім Княстве Літоўскім* запанавала старабеларуская кніжная мова, якая канчаткова выцесьніла, запаланіла і перамагла ранейшую кніжную старабаўгарскую мову.

Тут варта заўважыць, што рускія савецкія гісторыкі-шавіністы называлі старабаўгарскую мову „древнерусским языком" і будавалі на гэтым цэлыя антынавуковыя канцэпцыі аб міфічным „древнерусском государстве" (пад якім падразумевалі Кіеўскую Русь і часова залежныя ад яе землі), аб „узьнікненьні" беларусаў, украінцаў і рускіх зь міфічнай „древнерусской народности" (якой ніколі не існавала) і аб пачатку беларускай мовы з XIV стагоддзя, а беларускай гісторыі — з 1917 года.

Рускія афіцыёзныя гісторыкі прыдумвалі гісторыю, каб абгрунтаваць нібыта натуральнасьць існаваньня СССР, расейскі каляніялізм і расейскія прэтэнзіі на Ўкраіну і Беларусь.

Я сказаў у пачатку, што, азіраючыся на гісторыю нашай мовы,

займае дых. Таму што на старабеларускай дзяржаўнай мове неверагодна шмат напісана, таму, што я зачараваны яе багацьцем, вобразнасьцю, распрацаванасьцю і хараством. Пачытаўшы на старабеларускай кніжнай мове, разумееш, чаму Максім Багдановіч, седзячы ў расейскім горадзе Яраслаўль і акунуўшыся ў чытаньне гэтай мовы, стаў вялікім паэтам. Вось жа і сапраўды, што *„як алень спрагнелы, мкнець да вады крынічнай, шукаю Бога я”.*

Апошняя зьмена кніжных і афіцыйных моваў адбылася шмат дзе ў Эўропе (і ня толькі ў Эўропе) у XVIII-XIX стагоддзях, у пэрыяд узьнікненьня нацыянальных рухаў супраць імпэрыяў, з разьвіцьцём літаратуры *рамантызму* і ў выніку стварэньня нацыянальных дзяржаваў.

У гэты час адбываецца пранікненьне ў літаратурны і афіцыйны ўжытак народнай мовы (гэта значыць мовы, на якой гаварылі і сьпявалі шырокія масы народа). Менавіта гэтая мова стала мовай нацыянальнай літаратуры, менавіта за яе змагаліся нацыянальныя рухі, менавіта на ёй будавалася нацыянальная дзяржава і новая нацыянальная культура. Беларуская гісторыя, таксама як і гісторыя іншых народаў, добра ілюструе гэты моўны працэс.

Цяперака, азірнуўшыся за сабой, углядаючыся ў глыбіню, у наш народны лёс, можам сказаць коратка і ёмка: Беларуская мова — гэта мы.

* * *

Але ёсьць яшчэ вышэйшая цана мовы, якая не вымяраецца нават жыцьцямі. ***Мова належыць усім пакаленьням народу, якія жылі дагэтуль і якія будуць жыць потым. Мова належыць мінуламу і будучыні. Ніхто ня мае права разбуральна распараджацца лёсам нацыянальнай мовы (а толькі станоўча), ніякі чалавек і ніякое пакаленьне народу. Мова ёсьць трансцэндэнтная, вечнасная каштоўнасьць нацыі.*** Таму пытаньне існаваньня ці абмежаванасьці ўжываньня мовы ніколі і нідзе не вырашаецца на рэфэрэндумах. Бо людзьмі (пакаленьнем) могуць маніпуляваць. Не дазваляюць вынясеньня лёсу мовы на рэфэрэндум і беларускія законы.

* * *

У цяперашніх абставінах, калі ўлады рэжыму прыніжаюць беларускую мову, зачыняюць беларускія школы ды беларускія газэты, па афіцыйных крыніцах вядома, што больш за 86 адсоткаў грамадзянаў Беларусі лічаць беларускую мову сваёй роднай, але толькі каля сарака адсоткаў карыстаюцца ёй ў жыцьці.

І тут узьнікае пытаньне, якое мне задавалі ўсюды, на якое ня проста адказаць і цяжка ўсім растлумачыць. Бо не разумеюць. Пытаньне гэтае гучыць так: *„А чаму беларусы між сабой не гавораць па-беларуску?”* Усе на сьвеце між сабой гавораць па-свойму. Цыганы, якія ніколі ня мелі і ня маюць сваіх школаў, бо не існуе цыганскай пісьмовасьці, а між сабой — гавораць па-цыганску. Ня знойдзеш цыгана, які б не гаварыў па-цыганску. Дык у чым жа справа?

Ня стану і я адказваць на дзіўнае пытаньне, тым больш, паўтаруся, што нідзе нас у гэтым не разумеюць. Зазначу толькі, што, для датрыманьня чалавечай годнасьці і нават найпрасьцейшага культурнага звычаю ці маральнага рушэньня, заўсёды патрэбнае стараньне і сіла духа. У канцовым выпадку вырашае воля. Нішто ня можа перамагчы волю людзей, калі яна моцная і калі яна ёсьць. З гэтага гледзішча не павінна б існаваць праблемы беларускай мовы ў Беларусі. Бо заўсёды можа стацца так, як усе захочуць.

Мы мусім усьвядоміць, што ў нас самых засяроджаная велізарная магчымасьць: без вялікай бойкі, бяз грукату, бяз шуму і стратаў у корані пераняміць становішча і высока падняць нашу беларускую мову ў нашай краіне. Менавіта так думаюць і робяць усе ва ўсім сьвеце. Патрэбныя толькі хаценьне, воля і добры чын.

Дык чаму ж беларус зь беларусам не гавораць па-беларуску?..

28 верасьня 2001 г., Варшава.
(„Народная Воля”, — 2001, 31 кастрычніка, 2 лістапада).

3. БЕЛАРУСКІ НАРОД

Найвялікшай каштоўнасьцю Беларускай Нацыі ёсьць Беларускі Народ. Народ — гэта фізічнае цела нацыі. Гэта ўсе мы і кожны з нас разам. Культура, мова, вера, характар, мэнтальнасьць ёсьць як бы аўра народу (душа), вытворнае духа і дзейнасьці. У гэтакім адзінстве „душы” і „цела” толькі й можа існаваць народ.

Калі мы гаворым пра каштоўнасьць народу, то перш за ўсё маем на ўвазе ягонае існаваньне, ягоную ***бытнасьць***, прысутнасьць у жыцьці. Народ павінен ***быць***. Дзеля гэтага грамадзтва клапоціцца пра стварэньне ўмоваў існаваньня народу і пэрспэктываў ягонага разьвіцьця.

Аўра ствараецца толькі на ўзроўні грамадзкага ўсьведамленьня народнай пэрспэктывы і забясьпечвае несьмяротэльнасьць народу. Фігуральна і сымвалічна вечнасьць народу можна паказаць так: ЛЮДЗІ — ДОМ — ХРАМ. Лёгка зразумець (і гэта пацьвярджаецца гісторыяй), што дэградацыя і самавымiраньне пачынаецца заўсёды ў адваротным парадку — з разбурэньня ХРАМА, са зьнішчэньня аўры (г. зн. мовы, рэлігіі, культуры і г.д.). Потым разбураецца ДОМ (г. зн. адбываецца страта ўласнасьці, маёмасьці, дзяржаўнасьці, расстройства працоўных дачыненьняў, марнатраўства грамадзкага багацьця і г.д.).

Пасьля разбурэньня ДОМА перад людзьмі застаюцца два шляхі: альбо адраджэньне (гэта значыць найперш — адраджэньне ХРАМА), альбо заміраньне, зьнікненьне з культуры і геаграфічнае мапы чалавецтва. (У цяперашняй цывілізацыі такі стан можа зацягвацца харытатыўнай дапамогай, гуманітарнымі падачкамі на выжываньне. Але гэта не ўплывае на працэс выміраньня).

Адраджэньне заўсёды пачынаецца (і толькі магчымае) з духоўнай ідэі адбудовы ХРАМА (сьвятыні). Ізноў паўтаруся: гэта значыць мовы, гістарычнай памяці, культуры, рэлігіі, сымвалаў, велічы і г.д. Ідэалёгіі, якія дэкляруюць будаваць толькі ДОМ, як правіла, узьнікаюць у спэцыяльных абставінах, маюць матэрыялістычна-папулісцкі ці падвойны характар і вырастаюць ва ўмовах рэгрэсу, самы зьяўляюцца адлюстраваньнем заняпаду.

Будаўніцтва сьвятыні вымагае ахвярнасьці, бо яно не абгрунтаванае матэрыяльнымі мэтамі. Каб будаваць храм, трэба ўмець думаць духоўнымі сымваламі, асэнсоўваць іх і адчуваць патрэбу. Вымагаецца адпаведны ўзровень грамадзтва, каб быць народам і мець індывідуальную адказнасьць за нацыянальныя інтарэсы.

Узровень дасягаецца ў выніку стварэньня абставінаў *гістарычнага разьвіцьця*. Тады вялікую ролю пачынае адыгрываць характар улады і дзейнасьць грамадзкай эліты.

Тым часам пры выхадзе з заняпаду і ў пэрыяд нацыянальнага адраджэньня найвялікшую ролю адыгрывае нацыянальнае асьветніцтва і нацыянальная эліта, накіраваная на стварэньне ХРАМА. Дарога павінна весьці да сьвятыні. Грамадзтва мусіць мець ідэалы.

Ніякія прагматычныя інтарэсы не прыводзяць да нацыянальнага адраджэньня народа, бо адраджэньне патрабуе ахвярнай барацьбы і не зьяўляецца прагматычным дзеяньнем.

Гісторыя чалавецтва набрала вялікі грамадзкі вопыт, што рабіць і чаго не рабіць. Ня трэба, напрыклад, будаваць Бабілёнскую вежу,

але заўсёды трэба берагчы сьвятыню, нават калі ад яе засталася толькі сьцяна.

Шляхі і вынікі нацыянальнага адраджэньня добра вядомыя, маем шмат прыкладаў. Тым часам амаль не гаворыцца пра працэсы і вынікі рэгрэсу. У гэтым ніхто не зацікаўлены. А калі і гаворыцца, то ў скажоным выглядзе, найчасьцей сьведама падмяняючы паняцьці, бо рэгрэсуючае грамадзтва ня ў стане пра сябе адпаведна паведамляць. Заняпад адных часта адпавядае інтарэсам іншых.

Ацэнка народам самога сябе розная на схіле і на ўздыме. Адраджэньне, што вымагае ахвярнасьці, менш праймаецца стратамі, бо на ўздыме на месца аднаго становяцца двое.

Тым часам пры заняпадзе страты неаднаўляльныя. Адсюль патрабаваньне рознай стратэгіі існаваньня. Пры ўзьлёце вырастае роля і вартасьць асобы. Але менавіта на схіле прыходзіць усьведамленьне каштоўнасьці кожнага чалавека, патрэбнасьці дапамагаць народу на этнічным узроўні, незалежна ад палітычнае і ідэалягічнае арыентацыі. У найбольш здаровай часткі людзей тут спрацоўвае інстынкт выжываньня. Гэта разумны інстынкт, бо народ існуе пакаленьнямі, а палітычныя погляды, ідэалёгія не абавязкова перадаюцца ў спадчыну. Кожнае пакаленьне сінтэзуе сваю ідэйна-палітычную рэальнасьць. Дзеці не абавязкова ва ўсім паўтараюць бацькоў. Але з пшаніцы вырастае пшаніца, а з бобу — боб. Культурнае поле трэба берагчы ад зарастаньня.

Тым часам у пэрыяд дэградацыі відавы інстынкт (у дадзеным выпадку, інстынкт захаваньня этнасу) якраз аслаблены. Людзі не трымаюцца сваіх, сваёй зямлі, звычаяў, сям'і, бацькоў, дзяцей, традыцыяў і г.д. Зьнікаюць паняцьці і патрэбнасьць ідэалаў, абавязкаў перад усімі, аслабляецца здольнасьць да супраціўленьня, да барацьбы за што-небудзь, нават за самыя неабходныя асабістыя інтарэсы (не кажам ужо пра інтарэсы народныя).

Працэс заняпаду народа гэта ёсьць, перш за ўсё, заняпад сьведамасьці. Аднак гэты рух па схіле ня ёсьць пэрманэнтным распадам. Адбываецца эфэкт сьціскаваньня. Нейкая частка народу (этнасу) на ўзроўні асобаў і цэлых групаў не паддаецца разбурэньню, захоўвае сваю ўнутраную ідэнтычнасьць і здольнасьць супраціўляцца. Колькасьць такіх людзей можа быць рознай і заставацца доўгі час на пастаянным узроўні.

Менавіта дзякуючы перш за ўсё гэтай „сьціснутай" здаровай колькасьці людзей магчымы ёсьць фэнамэн *нацыянальнага адраджэньня,* і пружына тады пачынае выпроствацца (пры ўмове, калі зьберaглася бытнасьць этнасу).

Калі ж дэградаваны этнас зьнікае і засталася толькі „сьціснутая" ягоная частка, то яна (гэтая частка, якая ідэнтыфікуе сябе) ёсьць самая моцная. Яна можа гістарычна рэалізавацца ў сваіх сьціснутых межах і выявіць надзвычайную здольнасьць да выжываньня (паколькі тут засталася спрэсаваная здаровая сіла загіблага народу).

Тыповымі прыкладамі такой „спрэсаванай" гістарычнай рэалізацыі ёсьць, на мой погляд, краіны Балтыі (Эстонія, Латвія, Летува). Мы яшчэ назіраем таксама шмат дзе ў сьвеце працэс барацьбы за незалежнасьць такіх народаў, што панесьлі этнічныя страты і захавалі толькі сваё народнае ядро). Гэта валійцы, флямандцы, чачэнцы, татары, адзін з найстарэйшых народаў Эўропы — баскі — і іншыя.

Выпадкаў канчатковага народнага заміраньня, аднак, яшчэ больш. Блізкія прыклады: прусы, яцьвягі, правансальцы, хазары і інш.

Беларускі народ уваходзіць у трэцюю групу дачыненьняў, менавіта: нацыянальнага адраджэньня і існаваньня ў форме нацыянальнай дзяржавы. У гэтым стане знаходзіцца пераважная большасьць народаў Эўропы. Аднак Беларускае Адраджэньне, якое палітычна рэалізавалася ў 1918 годзе і стварыла беларускую

нацыянальную дзяржаву, неўзабаве было перапыненае акупацыяй і расчляненьнем Беларусі паміж Расеяй і Польшчай. Нацыянальныя сілы, якія павінны б былі ў нармальных умовах забясьпечваць якраз дзяржаўную стабілізацыю беларускай нацыі, змушаныя былі адхіліцца на барацьбу з акупацыйнай палітыкай за выжываньне народа і неўзабаве ў большасьці былі фізічна зьнішчаныя; рэшта выгнаная за межы Беларусі.

Да паловы XX стагоддзя Беларускае Адраджэньне было разгромлена, а ягоныя дзеячы ліквідаваныя. Прытым сталінскія бальшавікі імкнуліся зьнішчыць перш за ўсё найбольш сьведамую, здаровую частку народа.

Тут трэба адзначыць, што генацыд на Беларусі расейскія бальшавікі праводзілі плянава (гэта значыць, што забівалі беларусаў па разнарадцы). Але адначасна зьнішчалі выбарачна, адпаведныя групы насельніцтва, найперш і менавіта — лепшых людзей. Так было забіта агулам каля трох мільёнаў беларусаў. Таму калі ў 80-х гадах (з падрастаньнем новага пакаленьня) пачалося вызвольнае змаганьне за беларускае адраджэньне і дзяржаўную незалежнасьць, выпростваньне пружыны ўжо не набрала належнай сілы, каб адным махам (як у іншых краінах) скончыць з акупацыйнымі дачыненьнямі і рэшткамі каляніялізму.

Мы назіраем перапляценьне супярэчлівых працэсаў. У перашай палове 90-х гадоў дамінавалі адраджэнскія тэндэнцыі. З другой паловы 90-х павялічваюцца праявы рэгрэсу.

Генацыд, русіфікацыя і вынішчэньне беларускага народу ў XX-м стагоддзі былі настолькі разбуральнымі для нацыі, што стварылі ў народзе характэрныя праявы заняпаду: абыякавасьць да палітыкі, гісторыі, культуры, да нацыянальных ідэалаў; адсутнасьць нацыянальнага радыкалізму; няздольнасьць да супраціўленьня і барацьбы; канцэнтрацыя на прыватным жыцьці і г.д.

І рэгрэсіўная тэндэнцыя, і адраджэнскі рух абазначылі „ядро народу" (сканцэнтраваны этнас), лік якога ў 80-х гадах быў вельмі малы і сягаў у сярэднім аднаго-двух мільёнаў чалавек (10-20%). Гэтая лічба была добра відаць падчас гарбачоўскага ўсесавецкага рэфэрэндуму вясной 1991 года. Тут акрэсьленая велічыня, якая заўсёды вызначаецца пры комплекснай рэакцыі на нацыянальныя праблемы і нацыянальныя сымвалы, такія, як абарона нацыянальнай незалежнасьці, беларускай мовы, беларускай школы, беларускага войска, беларускага гэрба *Пагоня* і *Бел-*

(Фота Ул. Карміхіна)

Дзяды — 2001.

Чырвона-Белага Сьцяга, гатовасьць змагацца з імпэрскай палітыкай Расеі.

Гэтая цэнтральная велічыня (нацыянальна актывізаванае „ядро народу") цяпер істотна павялічылася, нягледзячы на супярэчлівыя палітычныя тэндэнцыі, і перакрочыла за палову. Але, з прычыны контравэрсійных абставінаў, яна мае, аднак, даволі размытыя межы. (Што ў цэлым якраз і адлюстроўвае становішча пераменнага руху.)

Мушу адзначыць, што ў стабільных незалежных краінах апора грамадзтва на нацыянальных каштоўнасьцях і сымвалах сягае заўсёды далёка за 90 адсоткаў. Нацыянальныя каштоўнасьці — тут бясспрэчныя пастулаты для ўсіх грамадзянаў краіны.

* * *

У беларускім грамадзтве існуюць паняцьці, якія ў сьведамасьці людзей на Захадзе альбо адсутнічаюць, альбо падразумяваюць крыху іншае значэньне. Напрыклад, няма такога шырокага паняцьця, як „інтэлігенцыя", што падразумявае ў нас людзей адпаведнага культурнага, адукацыйнага, сацыяльнага, інтэлектуальнага і маральна-этычнага ўзроўню, вылучаных па роду заняткаў і дзейнасьці. На Захадзе такое абагульненьне і шырокае вызначэньне патрабуе дадатковага тлумачэньня.

Нешта падобнае назіраецца і ў разуменьні слова „народ". Але сутнасьць тут не ў разыходжаньнях з Захадам, а ў разыходжаньні з часам.

На Беларусі — і сярод інтэлігенцыі, і сярод палітыкаў, і ўвогуле ў грамадзтве — пануюць яшчэ народніцкія паняцьці пра народ, якія склаліся ў XIX-м стагоддзі (найбольш у рамантычнай літаратуры). Маўляў, народ — гэта найперш сяляне, пастаяннае насельніцтва, што фізічна працуе на зямлі і выяўляе ў сабе асноўныя прыкметы этнасу. Тыя, што пісалі пра гэта і любілі „народ", былі шляхтай, панамі, разначынцамі і г.д. Адным словам, быў „народ", і былі „яны".

Потым „народ" палюбілі рэвалюцыянеры і распаўсюдзілі гэтае паняцьце таксама на рабочых і на ўсіх, хто займаўся непасрэдна вытворчай ручной неінтэлектуальнай працай. Значыцца — на сацыяльныя нізы грамадзтва.

А калі так, то зьявілася жаданьне народ ашчасьлівіць. Гісторыя дамовых унутраных войнаў і ўнутранай барацьбы за ўладу сьведчыць, што як толькі зьяўляюцца энтузіясты перавярнуць усё ўверх дном, — „шчасьце" не за гарамі.

У расейскай імпэрыі найбольш „шчасьцетворнымі" аказаліся бальшавікі. Грамадзтва, якое яны пабудавалі, выглядала надзвычай проста: з аднаго боку ўжо „шчасьлівы", часткова ацалелы народ, з другога — партыя (бальшавікоў, значыць). Усё гэта называлася: „партия и народ — едины".

Таму калі ў Савецкім Саюзе нейкі партыйны „таварыш" гаварыў пра народ — усё было зразумела, што ён меў на ўвазе. Калі ж гэтак гаварыў не „таварыш", то, як выяўлялася, пад уплывам „таварышаў" і пад узьдзеяньнем адукацыі (дзе вывучалі паэтаў тыпу Някрасава, „філёсафаў", тыпу Чарнышэўскага і палітыкаў, кшталту Леніна), ён разумеў тое ж самае, толькі па паняцьцях XIX-га стагоддзя.

Народ — у савецкім уяўленьні — гэта простыя, як правіла, менш адукаваныя людзі, масы, якія займаюцца пераважна ручной працай, вытворчасьцю і гуртуюцца ў натоўп, рабочыя ды калгасьнікі.

Савецкае (ці савецка-народніцкае) паняцьце пра народ бытуе ў Беларусі па сёньняшні дзень. Зьявіліся нават нэўрастэнікі, гатовыя праклінаць быццам бы „дурны народ" (як яны кажуць), што ня йдзе на барыкады і галасуе за Лукашэнку.

Нацыянальна-дэмакратычнае разуменьне паняцьця „народ" (беларускі народ) — іншае. Народ, як я ўжо казаў у пачатку, — гэта ўсе мы — беларусы, жыхары нацыянальна-дэмакратычнай дзяржавы. Гэта ўсе мы — людзі аднаго беларускага этнасу, яго мовы, гісторыі і тэрыторыі, незалежна ад адукацыі, сацыяльнага стану і роду заняткаў.*

Паводле прынцыпаў нацыянальна-дэмакратычнай дзяржавы, кожны беларус ёсьць частка беларускага народа, кожны можа (мае магчымасьць) сказаць: народ — гэта я. Сумяшчэньне індывідуальных інтарэсаў і пачуцьцё адказнасьці за ўсіх — гэта той стан, якім характарызуецца народ у дэмакратыі айчынаў.

* Прадстаўнікі іншых дзяржаваў і іншых нацыянальнасьцяў, якія маюць беларускае грамадзянства і валодаюць усімі правамі, зьяўляюцца інтэгральнай часткай беларускага грамадзтва (у палітычным і юрыдычным сэнсе). У нацыянальна-культурным сэнсе яны могуць карыстацца правамі нацыянальных меншыняў.

Тым часам, калі пагаварыць зь беларусамі, то шмат хто думае, быццам народ — гэта нехта, а ён — так сабе: інтэлігент, ці вучоны, студэнт, ці ўвогуле „просты чалавек".

За часы акупацыяў і вынішчэньняў у беларускім народзе (як і ў кожным іншым) набралася шмат неадпаведных, чужых, аджылых меркаваньняў, наносных якасьцяў, якія адмоўна ўплываюць на мэнтальнасьць, перашкаджаюць адпаведна ацэньваць рэчаіснасьць.

Гэтыя „адмоўныя якасьці" можна, што называецца, раскласьці па палічках. Але я ня бачу аніякай неабходнасьці ў такога роду аналізе і катэгарычна супраць выстаўленьня народных балячак напаказ у той час, калі зачыняюць беларускія школы, зьневажаюць беларускую мову, аплёўваюць беларускія сымвалы, гісторыю і культуру, Васіля Быкава, Кастуся Каліноўскага, і ўсё гэта называецца афіцыйнай палітыкай. Трэба нам шукаць іншыя спосабы народнай размовы і пазбаўленьня ад недахопаў, чым выстаўленьне іх на публічны агляд у няволі. (Мы ўжо маем гістарычны вопыт самабічаваньня перад чужымі.) Пра нашыя народныя ўнутраныя бядоты публічна мы будзем гаварыць у вольнай Беларусі (калі застанецца ў гэтым патрэба).

Вышэйшая праўда ня ў тым, што ў нас склаліся тыя ці іншыя адмоўныя звычкі, а ў тым, што цяпер, як на вайне, патрэбная адказнасьць і разумная самаацэнка, нельга даваць аргуманты нягоднікам і ворагам беларушчыны, каб яны потым пацьвельваліся і зьневажалі наш народ, спасылаючыся на выказваньні самых беларусаў.

Калі йдуць у адведкі да хворага чалавека, то не кажуць яму, як ён кепска выглядае і што можа памерці, бо вышэйшая праўда ў іншым — падтрымаць хворага, каб выздаравеў.

Нам, беларусам, патрэбна цяпер не самакрытыка і не самаедзтва, а ***самападтрымка***, станоўчыя прыклады і станоўчыя ідэалы. (Тым больш, што самаедзтва — адна з заганаў у нашым грамадзтве.)

Памятаю, нядаўна ў Чэхіі група чэхаў і беларусаў слухала беларускую песьню, дзе сьпявак-беларус вітаў беларускую „нацыю", абзываючы яе грубым зьняважлівым словам.

„Калі б такое пра чэхаў сьпяваў чэх, — сказаў адзін, — яго б проста..." (Тут я не перадаю, што б зь ім зрабілі, каб не пашыраць экстрэмісцкія выказваньні, але прысуд быў бы вельмі жорсткі.)

Іншая справа, што чэхі такога не сьпяваюць. Не прыходзіць у галаву. А беларусы — нічога. Слухаюць. Прывыклі, відаць.

Зважайма, аднак, што як мы думаем, так мы і жывём. А не наадварот.

Беларускі народ — гэта ты і я, ён і яны. Не забывайма, што народ існуе на доле (кансэрватыўная ягоная частка), але разьвіваецца ўгары.

Народ, як ужо гаварылася, жыве ў лепшых сваіх прадстаўніках. Павінен быць баланс, давер, лучнасьць паміж элітай і паспольствам (грамадзтвам). І найперш — у разуменьні і ўспрыняцьці нацыянальных каштоўнасьцяў. На верхавіне ж народу палягае і трымаецца найвялікшая адказнасьць за ягоны лёс.

Ці ўсьвядоміла сабе гэта наша беларуская „верхавіна"? Вось дзе пытаньне.

* * *

Што трэба рабіць, каб народ існаваў, ствараў і разьвіваўся, як забясьпечыць стабільнасьць ягонай трыадзінай структуры быцьця?

Як і ва ўсялякай канструкцыі, ідэйнай ці матэрыяльнай, тут ёсьць асновы (апоры), на якіх трымаецца ўвесь баланс зьявы. Калі гэтыя апоры выбіць, структура пачынае распадацца, зьява не разьвіваецца. На зьберажэньне такіх апорных асноваў нацыі павінна накіроўвацца агульная энэргія народа. (Тут падкрэсьліваю, што менавіта *агульная энэргія*, як імпэратыўнае дзеяньне, якое не падлягае сумненьню і ўсьведамляецца як неабходнасьць.)

На ўзроўні ЛЮДЗЕЙ галоўным зьберагаючым і фармуючым грунтам зьяўляецца ***салідарнасьць***. Пачуцьцё салідарнасьці рознае ў розных народаў. Мы гэта выразна бачым на практыцы і заўсёды можам ацаніць вынікі гэтай рознасьці.

Салідарнасьць — вялікая сіла, моц народа. Калі народ салідарызаваны, ён вытрывала пераносіць удары лёсу (страту незалежнасьці, акупацыю, генацыд, рэпрэсіі, перасьлед і інш.). Салідарны народ — непераможны, на салідарнасьці трымаецца грунт яго незалежнасьці і свабоды.

Пачуцьцё салідарнасьці — гэта частка мэнтальнасьці народа, яно складваецца гістарычна на працягу жыцьця пакаленьняў. Яго нельга адразу зьнішчыць і адразу набыць. Патрэбныя адпаведныя ўмовы і доўгі працэс, замацаваны ў падсьведамасьці.

Трэба разумець, што народу з малой салідарнасьцю цяжка самарэалізавацца (асабліва ў неспрыяльных умовах), ён лягчэй паддаецца асіміляцыі і без супраціву здольны растрачваць свой духоўны і народны набытак. Аднак салідарнасьць можна шматкроць павялічыць тады, калі народ усьведамляе яе неабходнасьць.

На ўзроўні ДОМУ галоўным апірышчам зьяўляецца ***незалежнасьць*** (дзяржаўная незалежнасьць). Гэтая пазыцыя дасягаецца і зьберагаецца толькі агульным калектыўным дзеяньнем і зьяўляецца ўмовай нармальнага разьвіцьця.

Народнае разьвіцьцё найбольш поўна забясьпечваецца дзяржаўнай палітыкай. Таму на структурным узроўні ДОМУ няма нічога важнейшага за дзяржаўную незалежнасьць, бо толькі тады ўвогуле можна нешта гарантавана плянаваць і рабіць у маштабе ўсёй нацыі.

Цяперашні актуальны лёзунг Беларускага Народнага Фронту: *„Не правы чалавека — галоўнае для беларусаў, а незалежнасьць і свбода, бо не бывае „правоў чалавека" пад акупацыяй",* — гэты лёзунг зыходзіць якраз з разуменьня прыярытэту дзяржаўнай незалежнасьці. Калі ня ставіць галоўнай мэтаю барацьбу за свабоду і незалежнасьць, то можна ўвесь час змагацца за „правы чалавека" (дасягаючы мізэрнасьці цаной вялікіх ахвяраў), але змарнаваць будучыню ўсёй нацыі. Будучыня найперш — у свабодзе, а не ў выпрошваньні правоў перад акупантамі і дыктатарам.

Змагацца за правы неабходна. Але без барацьбы за волю — гэта лёгіка калябарантаў. Хаця (тут я зраблю адступленьне ад тэмы) нельга адмаўляць нацыянальнай калябарацыі з акупацыйным рэжымам у сфэры адміністрацыі, бо трэба абараняць народ любымі спосабамі. Аднак і ў абароне трэба мець на мэце змаганьне за незалежнасьць.

Шмат якія беларускія адраджэнцы пэрыяду 2-й Сусьветнай вайны сьведама пайшлі працаваць у цывільную акупацыйную адміністрацыю, адчынілі беларускія школы, тэатры, арганізавалі беларускую моладзь, у канцы вайны — беларускія вайсковыя адзінкі, выхавалі паўтысячны беларускі афіцэрскі корпус і адначасна (яны ж) адразу стварылі антынямецкае падпольле — таемную Беларускую Незалежніцкую Партыю, якая змагалася зь немцамі. (І якую гэстапаўцы вынішчылі амаль на палову.)

Потым тысячы беларускіх адраджэнцаў стварылі моцную беларускую палітычную эміграцыю на Захадзе, аднавілі дзейнасьць Рады БНР, удзельнічалі ў халоднай вайне супраць СССР, зьберагл беларускія сымвалы і Беларускую нацыянальную ідэю, якую ў 80-х гадах зноў узьняў і сцьвердзіў нанова Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне".

Другі прыклад калябарацыі: 20-я гады, беларускія дзеячы паверылі абяцаньням бальшавікоў і вяртаюцца на Беларусь. Яны працуюць дзеля Бацькаўшчыны, беларускай навукі, асьветы, культуры, не стварыўшы ніякага антыакупацыйнага падпольля і не змагаючыся з бальшавізмам. Практычна, усе яны неўзабаве былі

фізічна зьнішчаныя НКВД, перастраляныя, як качкі, а тыя, што трапілі ў ГУЛАГ, толькі перад сьмерцю зразумелі сваю памылку.

Трэці прыклад: пасьляваенная беларуска-савецкая калябарацыя. Тут згнечаны нават інстынкт супраціўленьня. Абарона Беларушчыны ідзе на ўзроўні адстойваньня нацыянальных правоў, дазволеных у межах камуністычнай дактрыны і савецкай палітыкі. Хоць кожны разумеў, што ўсё вырашае не камуністычная дактрына, а крамлёўская ўлада.

Цяперашняя сітуацыя паказвае, што Масква (дакладней — нацыянальных дзяржаваў. Сцьверджаньне нацыянальнай мовы адбывалася рознымі шляхамі, але паўсюдна гэтае пытаньне ўспрымалася тады як палітычнае і вырашалася часам у зацятай барацьбе з імпэрскай палітыкай вялікіх дзяржаваў.

Мова, якая ў сваёй фэнамэнальнай сутнасьці зьяўляецца наймагутнейшым сродкам культуры (бо фармалізавала і сфармавала чалавечае думаньне), у пэрыяд стварэньня нацыяў асэнсоўваецца якраз у гэтым культуралягічным значэньні як галоўны, зьвязваючы і культурны чыньнік нацыі.

Дзіцячы фальклёрны тэатр „Госьціца”. Менск.

маскоўская палітычная ўлада: КГБ-ФСБ) зрабіла тактычныя высновы са стогадовай барацьбы зь беларускім Адраджэньнем. Яна імкнецца насадзіць рускую вышэйшую адміністрацыю ў Беларусі, выключыўшы супрацоўніцтва зь беларусамі нават на ўзроўні былых савецкіх функцыянераў і ствараючы пры гэтым сваю квазіапазыцыю з былой каляніяльнай намэнклятуры. (Тактыка так званага „кіруемага канфлікту”.)

Практычна, ідзе франтальнае зьнішчэньне ўсяго беларускага. (Цяпер узяліся за разбурэньне *Курапатаў,* за беларускія кадры і за закрыцьцё апошніх беларускіх газэтаў.) Сітуацыя падобная, як у 1943 годзе за часы гаўляйтара фон Готбэрга — беларусафоба і шэфа Гэстапа, які арганізаваў забойствы дзеячоў Беларускай Незалежніцкай Партыі і ліквідацыю прыхільнага да беларусаў Вільгэльма Кубэ.

* * *

Але вернемся да нашай размовы пра апорныя асновы народу.

На ўзроўні ХРАМУ, у сфэры ідэяў, творчасьці, веры, культуры, галоўным апірышчам зьяўляецца ***нацыянальная мова***.

Я ужо казаў у разьдзеле пра беларускую мову, што змаганьне за ўсталяваньне нацыянальнай мовы было першасным пытаньнем нацыянальнага фармаваньня народаў, стварэньня нацыяў і

Гэты чыньнік унівэрсальны як для эвалюцыйных гістарычных нацыяў, гэтак і для новых, піянэрскіх, каляніяльных ці эміграцкіх грамадзтваў, такіх, як, скажам, ЗША, Канада, Аўстралія і інш. Працэсы моўнай уніфікацыі тут даволі вядомыя і складваліся часам у выніку жорсткай ваеннай і палітычнай барацьбы. Адгалоскі яе не закончыліся па сёньняшні дзень. (Напрыклад, змаганьне французкамоўнага Квэбека за незалежнасьць ад Канады).

Агульнапрынята, што працэс складваньня нацыяў спыніўся ў пачатку XX-га стагоддзя. Але змаганьне за незалежнасьць і нацыянальнае Адраджэньне там, дзе засталіся рэшткі каляніялізму і імпэрскай палітыкі, прадаўжаецца па сёньняшні дзень (Каўказ, Балканы, Вялікабрытанія, Усходняя Эўропа, Расея).

Імпэрская палітыка спарадзіла шэраг тактычных і прапагандысцкіх прыёмаў у барацьбе з нацыянальным Адраджэньнем і нацыянальнай мовай.

Самым небясьпечным палітычным вывертам імпэрскай стратэгіі ў змаганьні з нацыямі ёсьць падмена нацыянальнай ідэі рэлігійнай (канфэсійнай) ідэяй. Такая маніпуляцыя, калі яна прышчаплялася ў грамадзтве, заўсёды прыводзіла да бясконцай братабойчай барацьбы і разьліву крыві, да падзелаў народа па канфэсійнай

прыкмеце, да нацыянальных стратаў. У тым ліку — і моўных (Ірляндыя). Найбольш характэрныя прыклады — Балканы, Каўказ, Вялікабрытанія-Ірляндыя. (Мы ня кажам тут пра так званы „трэці сьвет".)

У сфэры прапагандысцкай дэмагогіі існаваў (і прадаўжае існаваць) цэлы набор прыёмаў супраць усталяваньня нацыянальных моваў: ад даказваньня „непаўнавартаснасьці" і „памерласьці" чыёй-небудзь мовы (напрыклад, Карл Маркс пра чэхаў, рускія — пра „инородцев" і г.д.) да сцьвярджэньня ўвогуле — другаснасьці мовы ў сістэме нацыянальных каштоўнасьцяў. Маўляў, мова, быццам бы, ня мае значэньня. Галоўнае — „самастойнасьць", „свой шлях". Гатовыя былі няшчыра гаварыць нават пра „незалежнасьць" (аўтаномію) у складзе імпэрскай дзяржавы. Нацыя, маўляў, можа быць і бяз мовы, а вось „народнасьць", „адметнасьць" — трэба паважаць.

„Мы — за Белоруссію, но противъ белорусского языка", — казалі афіцыйныя расейскія непрыяцелі Беларушчыны у пачатку XX-га стагоддзя (прадстаўнікі розных агентурных таварыстваў, тыпу „Белорусское Общество", „Крестьянин", газэта „Белорусская жизнь", усялякія саланевічы, кавалюкі і іншыя „дзеячы"). У гэтай думцы выяўлялася сутнасьць ахоўніцкай ідэалёгіі „западнорусизма". На ёй тоўпіліся потым розныя „абласьнікі" ды „інтэрнацыяналісты".

У апошнія гады існаваньня Савецкага Саюзу, калі ўжо набірала моцы новае Беларускае Адраджэньне, зноў зьявіліся людзі, якія то тут, то там пачыналі гаварыць: маўляў, „язык не нада — нада свабода"; „главное ликвидировать тоталитаризм", „главное не язык, а демократия". Потым, калі атрымалі ня тую „дземакрацію", пачуліся галасы: „главное не язык, а права человека" і г.д.

Лапідарныя сэнтэнцыі, аднак, зьяўляюцца зусім не спантанна. Пытаньні прыдуманыя на ўсе ўзроўні. „Што лепш, — пытаюць, напрыклад, — калі хто гаворыць па-беларуску і супраць незалежнасьці, ці калі хто гаворыць па-руску, але за незалежнасьць?" Глядзіш, які-небудзь прастак і задумаецца. (Ёсьць людзі, гатовыя па наіўнасьці выбіраць нават паміж куляй і вяроўкай, хоць выбіраць трэба іншае, бо тут няма выбару.)

Гэтакая палітпрапаганда на бытавым узроўні, нават самага прымітыўнага кшталту, — далёка не бясшкодная справа ў каляніяльна дэфармаваным грамадзтве.

Цікавае назіраньне. Калі нават у вельмі агульных рысах прааналізаваць антыбеларускую дзейнасьць у нашай краіне на працягу другой паловы XX-га стагоддзя, так ці гэтак выкліканую ўсходняй палітыкай, то заўважаем, што найбольшая актыўнасьць, найбольшая колькасьць зьвязаных тэмаў і найбольш выразныя тэндэнцыі разбурэньня відаць былі якраз у накірунку зьнішчэньня беларускай мовы. Тут праходзіў магістральны ўдар па беларускай нацыі, які яшчэ раней пакінуў у гісторыі ўнікальныя сьведчаньні цемрашальства. (Напрыклад, афіцыйная забарона ў 1840-м годзе рускім Сэнатам ужываньня назвы „Беларусь" — і, адпаведна, беларускай мовы — ці рэпрэсіўны сталінскі асіміляцыйны дэкрэт аб „рэформе" беларускай мовы і набліжэньні яе да расейскай.)

Уражвае, аднак, нават ня гэтак характар антыбеларускіх дзеяньняў, колькі іхная бязьлітасная пасьлядоўнасьць, цягласьць, на працягу ўсёй гісторыі дачыненьняў з чужой уладай, накіраваная да адной палітычнай мэты — поўнага зьнішчэньня Беларускай культуры, Беларускай дзяржаўнасьці, Беларускага народа і русіфікацыі яго рэштак.

* * *

Выключнасьць антыбеларускай палітыкі з боку Масквы тлумачыцца, перш за ўсё, старым цывілізацыйным канфліктам. Пасьля разбурэньня і заняпаду Кіева (Кіеўскай Русі) вызначыліся два варагуючыя цэнтры аб'яднаньня ўсходніх славянаў: Вільня (Вялікае Княства Літоўскае) і Масква (Масковія, потым — Расея). Больш магутнае і эўропаморфнае Вялікае Княства, тым ня менш, было ўрэшце разбурана, бо апынулася паміж дзьвюх экспансіяў: захопніцкай з Захаду (немцы) і агрэсіўнай, варварскай — з Усходу (манголы, Масква). Падзел Усходняй Эўропы адбыўся ў канцы XVIII стагоддзя, пасьля таго, як ўсходняя і заходняя экспансіі аб'ядналіся і Беларусь цалкам трапіла ў зону Расеі.

Для Расеі гэта была найвялікшая стратэгічная перамога за ўсё яе існаваньне. Ліквідаваны асноўны супернік. Царызм лічыў, што ўтрымаць у будучыні гэтую заваёву, стратэгічную тэрыторыю і манапольную пазыцыю ён зможа толькі разбурыўшы беларускую дзяржаву, зьнішчыўшы беларускую гісторыю і беларускую мову (паколькі гэта ўсё ўзаемазьвязана).

Татальнае, агульнае вынішчэньне беларускай культуры, русіфікатарская асіміляцыя стала афіцыйнай палітыкай Расеі ў Беларусі, праводзілася непасрэдна (XIX ст.), праз каляніяльную адміністрацыю (XX ст., камунізм), цяпер робіцца праз дыктатуру стаўленьнікаў.

* * *

Калі мы адзначаем апорную функцыю мовы ў вышэйшых (ідэйных) дачыненьнях народа, то маем на ўвазе нармальны эвалюцыйны працэс разьвіцьця цывілізацыі, натуральны працэс фармаваньня нацыяў і разьвіцьця культуры ў межах аднаго ўзроўню грамадзтва.

Мы не разглядаем тут зьявы трэцяга сьвету, арганізацыю дзяржаваў на руінах эўрапейскага каляніялізму тымі этнічнымі супольнасьцямі ды плямёнамі, якія займаліся паляваньнем, жывёлагадоўляй ды зьбіральніцтвам, ня мелі сваёй пісьмовасьці, альфабэту, культурнай гісторыі, але з адыходам калянізатараў стварылі, пры іх дапамозе, свае ўрады і адміністрацыю на партугальскай, францускай ці іншай эўрапейскай каляніяльнай мове. Зьявы гэтакай дэкалянізацыі і дзяржаўнасьці часьцяком даволі змушаныя і хімерычныя, з прычыны папярэдніх гвалтоўных каляніяльных парушэньняў, глыбокай дэфармацыі натуральных дачыненьняў ды патрэбаў разьвіцьця больш простых супольнасьцяў.

Дэкалянізацыйныя працэсы ў трэцім сьвеце вельмі наглядна паказваюць, што калі мова народа не зьяўляецца інфармацыйным чыньнікам ягонай гісторыі (гэта значыць, пісанай фіксацыі падзеяў, ня кажам ужо пра літаратуру), то зьвязваючая (культурная) функцыя мовы аслаблена. Чым больш культурны народ, тым мацнейшае культуратворнае (і адпаведна, палітычнае) значэньне мае для яго нацыянальная мова. Невыпадкова разьвіцьцё нацыянальнай мовы, яе існаваньне, ужываньне, зьберагаючыя абставіны рэгулююцца ня толькі нацыянальным грамадзтвам, але і дзяржаўнымі законамі.

Беларуская мова ў гэтым сэнсе — надзвычай яркі прыклад высокай культуратворнай напоўненасьці яе інфармацыйнай ролі ў грамадзтве. Наша старажытная гісторыя напісана па-беларуску. Сотні тамоў Мэтрыкі Вялікага Княства Літоўскага, кнігі Магістратаў беларускіх гарадоў, перапіска знакамітых людзей, дыпляматаў, вялікія помнікі права — Статуты Вялікага Княства, старажытная перакладная літаратура, дыярыушы, потым тэксты Школьнага тэатру, Батлейкі, казані і граматыкі, прамовы і канты, духоўныя творы — усё гэта, ня гледзячы на вынішчэньні, захавала наша гісторыя ў выдатнай беларускай мове. Я не кажу ўжо пра гісторыю і літаратуру нашага нацыянальнага Адраджэньня ў XIX-м і XX-м стагоддзях.

Калі б уявіць немагчымае, што беларуская мова якім-небудзь катастрафічным чынам раптам зьнікла (пра што стараюцца нашыя непрыяцелі) і народ застаўся б бяз мовы, то ўся беларуская гісторыя і культура сталася б для яго адсечанай, мёртвай для новых

пакаленьняў беларусаў. Яны як бы павісьлі б у паветры, безабаронныя перад русіфікацыяй і анэксіяй, пазбаўленыя грунту нацыянальнага існаваньня. На гэтым бы беларуская гісторыя і скончылася, нацыя зьнікла б, як туман, як пыл над вадой.

Успомнім 73 гады камуністычнай русіфікацыі, калі вынішчылі мову ў афіцыйным ужытку, сфальсіфікавалі беларускую гісторыю, абулі культуру ў лапці і пачалі яе адлік з 1917 года. Яшчэ адно-два пакаленьні такога існаваньня, і ... я ня ўпэўнены, ці адбылося б ужо Беларускае Адраджэньне.

Беларуская мова — гэта мы. Мы існуем як гістарычная нацыя толькі таму, што жыве ў грамадзтве беларуская мова і людзі яе падтрымліваюць. Нашае нацыянальнае Адраджэньне і народнае існаваньне, гэтак жа, як існаваньне іншых народаў Эўропы, зьвязанае з адраджэньнем і жыцьцём нацыянальнай мовы. ***Наша беларуская народная вечнасьць — у беларускай мове.***

Гэта ёсьць абсалютная праўда, неабходнасьць, якая не падлягае дыскусіі.

* * *

Акупацыя Беларусі і жорсткая антыбеларуская палітыка праводзілася якраз тады, калі ўся Эўропа будзілася да нацыянальнага жыцьця. Татальная забарона мовы выключыла легальнае разьвіцьцё беларускай літаратуры. У падпольлі нацыянальная літаратура разьвівацца не магла. (Хоць і зьявіліся беларускія ананімныя творы.) У выніку беларусы страцілі ў XIX-м стагоддзі мноства творчых людзей, якія вымушаны былі пісаць на іншых мовах і аддалі свае таленты іншым народам.

Літва! Радзіма мая! Ты, як здароўе.
Як даражыць табой трэба, толькі той зьведаў,
Хто цябе страціў...

У самым пачатку нацыянальнай эры Беларусь страціла найвялікшага паэта. Можам даказваць цяпер, колькі заўгодна, як думаў Адам Міцкевіч, скуль паходзіў, што любіў, пра што пісаў, як адлюстраваў наш беларускі быт і дух. Але ён пісаў па-польску і ўзбагаціў Польшчу. Ён ня быў чытэльным для беларускага народа, а для тых, хто чытаў (па-польску), ён быў ужо не сваім. Вырашыла мова.

Толькі праз сто гадоў другі раз нарадзіўся яшчэ адзін беларускі Міцкевіч, якога народ ужо ня страціў. Ён стаў Коласам на роднай ніве. Ягоная „Новая Зямля" ёсьць найвялікшым шэдэўрам і праграмным творам беларускага існаваньня. Перамагла беларуская мова.

* * *

Падсумоўваючы размову аб апорнасьці (цэнтральнасьці) беларускай мовы на ўзроўні вышэйшых дачыненьняў жыцьця нацыі і азіраючыся на пройдзены гістарычны шлях супраціўленьня і выжываньня, з палёгкай адзначаю, што ў неверагодна цяжкіх умовах безвыходнасьці і страт беларусы здолелі абмінуць найбольш небясьпечныя камяні, пасткі магчымых будучых няшчасьцяў і пазьбеглі разбуральнай бяды. Мы шмат страцілі: і сталіцу, і велізарныя тэрыторыі, і мільёны насельніцтва, але захавалі ўнітарнасьць нацыі, адзінства культуры і адзінства народу пры шматлікасьці канфэсіяў. Пры невысокім (пакуль што) узроўні нацыянальнага пачуцьця нас, беларусаў, аб'ядноўвае, перш за ўсё, наша культура, гісторыя, мова і не разьядноўвае рэлігія.

Гэта вялікае народнае дасягненьне. У змаганьні з імпэрыяй мы пазьбегнулі таго, ад чаго не зьберагліся некаторыя іншыя народы (ірляндцы, сэрба-харваты, ліванцы і г.д.) — канфэсійнай нянавісьці. Беларусам не змаглі навязаць канфэсійны разлом нацыі, мы разумна абмінулі той час, калі такое магло стацца.

Псіхалягічнаму адзінству і талеранцыі беларусаў паспрыялі самы падзеі: пратэстантызм і зьнішчэньне пратэстантызму, Вунія і потым зьнішчэньне Вуніі рускімі, затым насаджэньне рускага праваслаўя ды палянізацыя тутэйшага каталіцызму, а потым перасьлед усялякай рэлігіі бальшавікамі і г.д. Народ адчуў, што канфэсія ня ёсьць тым грунтам, на які можна моцна абаперціся. Вывад, які стыхійна быў зроблены з гістарычных пераменаў і які адпавядаў псіхалягічнаму складу беларуса, такі: *з суседзямі трэба жыць згодна*. Беларус ня любіць канфліктаваць. Гэта той выпадак, калі нашыя сацыяльныя недахопы зьяўляюцца працягам нашых гістарычных пераваг.

Мы, прывыклыя да нармальнага людзкага абыходжаньня адзін з адным, не зважаючы на рознасьць, часам недаацэньваем гэтае сваё жыцьцё.

Каб ацаніць сябе, варта глянуць на іншыя месцы ў стыку былых імпэрыяў. Сэрба-харвацкі народ (а гэта адзін народ) гаворыць на адной сэрба-харвацкай мове (таксама ў Босьні, Чарнагоры і Герцагавіне). Толькі для заходняга насельніцтва (харватаў) яна пішацца лацінкай, для ўсходняга (сэрбаў) — кірыліцай. Усходнія — праваслаўныя, заходнія — каталікі. Кожныя маюць сваю дзяржаву і пры нагодзе ненавідзяць адзін аднаго ды рэжуць з такой лютасьцю, што па сёньняшні дзень ня ў стане разабрацца з гэтым нават Гаагскі Трыбунал. (Я ўжо не кажу пра сэрба-харватаў мусульманаў у Босьні і Герцагавіне.)

Такія ж самыя пэрспэктывы, такая ж небясьпека падсьцерагала ў гісторыі і нас, беларусаў. Больш таго, — нас штурхалі да гэтага нашыя непрыяцелі (а некаторыя, найбольш тупыя, штурхаюць яшчэ й цяпер). Але нічога не дамагліся. То ці ж ня мудры, ці не вялікі наш Беларускі Народ!

Апошняя фармальная небясьпека нацыянальнага расколу была абмінута ў 1912 годзе, калі беларускія адраджэнцы, згуртаваныя вакол падпольнай БСГ *(Грамады)* і легальнай *„Нашай Нівы"* (з большага — каталікі) вырашылі, што трэба ўжываць для газэты адзіны альфабэт, апыталі чытачоў і перайшлі толькі на кірыліцу. (Раней газэта друкавалася падвойна: на кірыліцы і на лацінцы.)

Рашэньне было разумным і правільным. Патрэбны быў толькі адзін альфабэт, і толькі на кірыліцы трэба было пісаць і друкаваць тым, хто рэальна ацэньваў рэчаіснасьць, ведаў гісторыю, думаў пра беларускае Адраджэньне і адзінства нацыі. Цяпер, як кажуць валійцы, мы ўжо за вуглом.

* * *

Ужо дзьвесьце гадоў беларусы прыглядаюцца да сябе, як бы шукаючы прычынаў народнай бяды і выйсьця з залежнага стану.

Выйсьце заўсёды ёсьць. Хаця б, напрыклад, падрыхтаваць станоўчыя палітычныя зьмены. Але, па-першае, гэтыя зьмены трэба зрабіць самым. Другое — як бы і куды б мы ні „выходзілі", мы заўсёды спаткаемся самы з сабой. Адсюль усё і пачынаецца: з унутранага (індывідуальнага і грамадзкага) усьведамленьня нацыянальных патрэбаў і нацыянальнай неабходнасьці, з гатовасьці рабіць, як трэба, а не „як хочацца", са спадзяваньня на сябе.

Патрэбная духоўная асьветніцкая праца, культурная і палітычная, вялікая і штодзённая, бо нічога само не адбудзецца, ніхто для нас нічога ня зробіць, нічога ня „дасьць". Беларуская інтэлігенцыя, часам, забываецца пра гэта і чакае нечага ад „народу", абураючыся за бязьдзейнасьць. Аднак, у пэрыяд апатыі, у міжчасьсі якраз толькі нацыянальная эліта можа і мусіць дапамагчы народу ўсьвядоміць свой грунт, адчуць сілу, расплюшчыць вочы, пракласьці шлях у вечныя каштоўнасьці нацыі, ў храм, які здольны пабудаваць усе разам.

1-20 лістапада 2001г., Нью-Ёрк-Варшава.

4. БЕЛАРУСКАЯ ТЭРЫТОРЫЯ І ПРЫРОДА

Кожны народ жыве на сваёй зямлі, якая зьяўляецца ягонай тэрыторыяй. Гісторыя сьведчыць, што тэрыторыя была і ёсьць найгалоўнейшым нацыянальным багацьцем, найвялікшым народным дабром.

Кожны народ імкнуўся абараніць сваю жыцьцёвую прастору, а некаторыя — пашырыць яе за кошт іншых. За тэрыторыю ішло змаганьне і бясконцыя войны.

Зьява і паняцьце прасторы ёсьць паважная праблема філясофіі, матэматыкі і фізічных навукаў. Прастора, злучаная з часам (ці дакладней — *„прастора-час")*, ёсьць асновай быцьця фізічнага сьвету. (Гэта значыць — рухомай рэальнасьці, сьвету, у якім мы жывём.)

Прасторавыя парамэтры формы і руху (існаваньня) мусіць мець любое цела, элемэнт, часьцінка ці стан часьцінкі (хваля) на ўсіх узроўнях фізічнага сьвету. Але ўсьведамленьне, пачуцьцё жыцьцёвай прасторы ўласьцівае толькі істотам жывой прыроды.

Усялякі жывы індывідыюм (асобіна) акрэсьлівае сваю прастору (гэта значыць межы, у якіх існуе, рухаецца). Прытым, чым больш высокая біялягічная і псіхічная арганізацыя жывой істоты, тым больш выразнае акрэсьленьне ёй сваёй прасторы. Найбольш абазначана яна ў чалавека, што выклікала адпаведныя сацыяльныя формы яе працягу (кшталтаваньне жыльля, уласнасьці, недатыкальнасьці асобы і г.д.).

Сацыяльнае асэнсаваньне сваёй індывідуальнай прасторы чалавекам не заўсёды супадае з рэалізацыяй. Яно можа розьніцца, не супадаць з магчымасьцямі, залежыць найперш ад узроўню разьвіцьця і культуры грамадзтва.

Няроўныя таксама біялягічныя інстынкты адчуваньня ўласнай прасторы, зьвязаныя непасрэдна з целам. Спэцыялісты адзначаюць, напрыклад, значную шырыню індывідуальнай (біялягічнай) прасторы ў нашчадкаў англа-саксаў і кельтаў і іншыя (меншыя ці большыя) парамэтры ўспрыняцьця яе ў прадстаўнікоў суседніх зь імі этнічных супольнасьцяў і групаў.

З таго, што мне ўдалося назіраць асабіста, ездзячы па сьвеце, я магу толькі пацьвердзіць агульныя меркаваньні. Людзі ў Амэрыцы, напрыклад (нават у такім тлумным і выключным горадзе, як Нью-Ёрк), на вуліцах, у транспарце, у грамадзкіх, гандлёвых месцах, у чэргах — усюды, практычна, не датыкаюцца адзін да аднаго. Калі ў вузкім месцы, на вуліцы, на эскалатары, у вагоне ці ў краме вас мінаюць, то абавязкова просяць прабачэньня. Гэта азначае, што, маўляў, выбачайце, я небясьпечна мінаю вашу тэрыторыю, але я добра да вас настроены, толькі павінен тут прайсьці.

Калі нехта, напрыклад, у чарзе (дзе стаяць, як правіла, амаль што за мэтр адзін ад аднаго) незнарок даткнуўся да іншага, то іншы недаўменна адварочваецца і глядзіць, у чым справа, чаго ад яго хочуць. Таму сітуацыя, каб нехта не заўважыў, што даткнуўся да іншага і не папрасіў бы прабачэньня, проста выключаецца. Інакш — гэта нядобрая сітуацыя.

За пяць гадоў пэрыядычнага знаходжаньня ў Амэрыцы, іншых, скажам так, „тэрытарыяльных" адносінаў між людзьмі — я не назіраў. Тым часам за гэты пэрыяд я ні разу ня бачыў, каб нехта ў гарадзкім транспарце (мэтро ці аўтобусе) саступіў месца старому, калеку ці жанчыне. Людзі (сталыя і маладыя) проста ня ведаюць, што так трэба рабіць. Іх такому не навучылі.

Гэтыя два прыклады праяўленьня сацыяльнай культуры маюць рознае падложжа: з аднаго боку — абкультураны інстынкт пачуцьця прасторы, з другога — маральны нуль, не прыгнечаны тэрытарыяльны эгаізм асобіны.

Абкультураны інстынкт, разуменьне тэрытарыяльнага права, павага да шырокай індывідуальнай прасторы чалавека спрыяе прыязным дачыненьням паміж людзьмі.

Грамадзтва, дзе ў масе, у натоўпе не датыкаюцца адзін да аднаго, не штурхаюцца, не зьневажаюць, не гавораць грубых словаў, стварае добрыя ўмовы для самапачуцьця асобы. І наадварот: там, дзе адсутнічае пашана да прасторавай аўтаноміі чалавека, адбываецца нарастаньне азлобленасьці і агрэсіі.

Раней, за саветамі, мне рэгулярна прыходзілася назіраць такую карціну. Падыходзіць пусты вясковы аўтобус. Ля дзьвярэй скапліваецца натоўп, чалавек 15-20 і шчыльна цiснуцца, чакаюць, пакуль шофер сходзіць у аўтобусную станцыю, вернецца і адчыніць дзьверы. Зь вяртаньнем шафёра ціск павялічваецца, куча робіцца нібы адзінае цела, і, калі дзьверы адчыняюцца, яно — гэтае сьціснутае чалавекацела з жанчынаў і мужчынаў — не адразу можа нават зайсьці праз праём у пусты аўтобус. Нарэшце прарываюцца першыя, ускокваюць унутр і, штурхаючыся, з шумам разьбягаюцца па салоне.

Калі потым спакойна зайсьці ў аўтобус, то людзі ўжо сядзяць, стаяць і размаўляюць між сабой, як ні ў чым ні бывала. Ніхто не адчувае ні зьбянтэжанасьці, ні прыніжэньня, ні сораму за тое, што толькі што адбывалася перад зачыненымі дзьвярыма.

Тут жа побач, за рэспубліканскай мяжой, у балтыйскіх суседзяў, быў той жа сацыялізм, тыя ж калгасы, такі ж узровень жыцьця, практычна, такі ж узровень бытавой культуры і тыя ж савецкія аўтобусы, „ПАЗы" ды „ЛАЗы", але не стваралася перад імі гэтакае „чалавекацела".

Я прывёў адзінкавы прыклад. Але „чалавекацела" у нас узьнікае ўсюды, часта — зь нечаканай нагоды, без аніякай лягічнай неабходнасьці і абгрунтаваньня. Мы лічылі гэта раней вынікам дэфіцытнага сацыялізму.

Можна дыскутаваць аб бытавой культуры, аб неабкультуранасьці прыродных інстынктаў, і тут — рацыя. Але ў падложжы гэтай неабкультуранасьці — розны маштаб асэнсаваньня ўласнай прасторы, рознае адчуваньне індывідуальнай тэрыторыі.

Напрошваецца лапідарнае пытаньне: ці не карэлюецца маштаб асэнсаваньня ўласнай прасторы індывідыумам з патрэбнасьцю індывідуальнай свабоды? Напрасткі тут нічога не карэлюецца. Гэта відавочна. Хоць і можна выявіць пэўныя сувязі. Мае значэньне, аднак, сама зьява, сам фэнамэн індывідуальнай прасторы, які ў вельмі адметны і своеасаблівы спосаб праяўляецца на калектыўным, грамадзкім узроўні быцьця людзей як народу, калі ягоная тэрыторыя ёсьць неад'емнай часткай народнага існаваньня.

* * *

Паўнавартаснае этнічнае асэнсаваньне сваёй калектыўнай жыцьцёвай прасторы зьявілася ў людзей толькі пасьля пераходу да земляробства і аседлага жыцьця. Людзі, прывязаныя да аднаго месца, сталі глыбей адчуваць патрэбнасьць гэтай знаёмай канкрэтнай прасторы. Яна стала больш пазнавальнай для чалавека, часткай ягонага штодзённага жыцьця. Прырода, зноў жа, канкрэтызаваная ў прасторы, становіцца ня толькі агульным асяродзем існаваньня, але як бы прыродным домам. Пастаяннае месца, пастаянная прырода і пастаянныя суседзі спрыялі сталым кантактам паміж людзьмі, далейшаму разьвіцьцю паняцьцяў „сваё" і „наша". Людзі адной тэрыторыі, якія ўжо раней адрозьнівалі сябе ад чужых па мове і сваяцтве, асеўшы на зямлі, умацавалі сваё супольнае адзінства, наладзілі пастаянства сувязяў у пастаянных абставінах.

Калі лічыць, што людзі эвалюцыйна разьвіваліся з прыроды, то самаўсьведамленьне сваёй грамадзкай асобнасьці і адрозьненьне ад іншых групаў людзей павінна было мець першасны штуршок

якраз ад усьведамленьня сваёй калектыўнай тэрыторыі. Паняцьцевае разьвіцьцё мовы і думаньне паспрыялі *асэнсаваньню* супольнай прасторы як чыньніка лучнасьці людзей. Фігуральна гэта выглядала так: маўляў, тыя, што гавораць інакш і робяць паіншаму, — жывуць *„там”*, а мы — *„тут”*. *Тутэйшасьць* ёсьць форма супольнага ўсьведамленьня.

Пераход да земляробства і аседлага жыцьця быў плённым для ўмацаваньня і паглыбленьня *этнічнай сьведамасьці*. У сфэры пастаяннага, прывязанага да мясцовасьці насельніцтва лепш разьвілася этнічная культура (перадача традыцыяў праз лучнасьць пакаленьняў).

Асэнсаваньне калектыўнай прасторы паспрыяла ўнутранай кансалідацыі раньніх этнасаў. За *агульную* тэрыторыю вялося *сумеснае* змаганьне. Тэрыторыя этнічнага расьсяленьня стала перашаснай супольнай каштоўнасьцю.

афармляюцца сацыяльна-праўныя дачыненьні зямельнай ўласнасьці, зьяўляюцца гарады, пісьмовасьць, фіксуецца пісаная гісторыя.

Тэрытарыяльна-прыродны чыньнік тут, як і раней, адыгрывае асноўную псіхалягічна-ацэначную ролю. Але моўна-культурныя і сацыяльна-палітычныя аспэкты пачынаюць дамінаваць у грамадзкіх паводзінах і ў грамадзкім выбары.

Гэта асабліва стала добра відаць з разьвіцьцём гарадоў і ростам гарадзкога насельніцтва. Гарады былі месцам канцэнтрацыі больш разьвітай культуры і больш складаных сацыяльна-культурных адносінаў. Тут быў і больш высокі, ідэйна асэнсаваны ўзровень народнай сьведамасьці. Гарадзкое грамадзтва больш аддаленае ад прыроды, яно існуе ў сфэры *створаных ім* дачыненьняў і ў асяроддзі *арганізаванай ім* сацыяльна-архітэктурнай прасторы. Народная сьведамасьць у сфэры лепш арганізаванага асяроддзя і



Мапа Беларускай Народнай Рэспублікі.

У гэты час глыбока асэнсоўваецца прырода як неад’емная частка існаваньня. Экзыстэнцыянальная і псіхалягічная залежнасьць ад прыроды ў этнічных народаў вельмі моцная. Для гэтакіх людзей прыродная прастора ёсьць іхная агульная радзіма. Гэта тое, што іх найбольш злучае, дае першасныя сродкі для выжываньня, забясьпечвае жыцьцёвую рэалізацыю, веру ў свае сілы і псіхалягічны камфорт жыцьця.

* * *

Наступны этап грамадзкай самаацэнкі і самавыяўленьня — *народная сьведамасьць*. Яна замацоўваецца ў грамадзтве тады, калі ўзьнікае дзяржава (дзяржаўная арганізацыя ўлады) і

абкультуранай прасторы гарадоў набывае больш абстрагаванае (а значыць больш абагуленае) асэнсаваньне, апэрыруе лягічнымі катэгорыямі, сістэмнымі паняцьцямі. Супольная (народная) сьвядомасьць гаражанаў (мяшчанаў) менш зьвязаная з псіхалягічным асэнсаваньнем прыроднай прасторы і кансалідуецца на рацыянальным абгрунтаваньні свайго калектыўнага (народнага) адзінства. А гэта, як бачым, ёсьць вышэйшы і мацнейшы ўзровень сьведамасьці.

Народная сьведамасьць — гэта тое ж этнічнае, калектыўнае ўсьведамленьне сябе, але дамінуючым і фармуючым фактарам яе (псіхалягічным і рацыянальным) зьяўляецца *культура*.

Сучасная культура разьвівалася найперш праз гарады. Гарады

былі (і застаюцца цяпер) маторам культуры. Зразумела, чаму культурна арганізаванае грамадства заўсёды імкнулася зблізіць горад зь вёскай, не дапусьціць вялікага разрыву паміж гарадзкім і вясковым існаваньнем. (Пра гэта я пісаў у артыкуле „Урбанізацыя".)

Такім чынам стварэньне дзяржаўнасьці (дзяржаўнай улады) і ўзьнікненьне гарадоў (рост гарадзкога насельніцтва) у праўна арганізаваным земляробчым грамадстве паспрыяла афармленьню *народнай сьведамасьці* жыхароў адной мовы, адной культуры і адной тэрыторыі.

* * *

Наступны этап кансалідацыі людзей — *нацыянальная сьведамасьць*. Яе афармленьне зьвязанае з пачаткам працэсу пераходу да індустрыяльнага грамадства. Пераход паўсюдна суправаджаўся бурным ростам гарадоў, які быў выкліканы разьвіцьцём машыннай (таварнай) вытворчасьці. У выніку адбылося пераразьмеркаваньне балянсу насельніцтва ў карысьць гарадзкога.

У ХХ-м стагоддзі бальшыня насельніцтва індустыяльных краінаў жыве ў гарадах. Асноўным сродкам уласнасьці становяцца грошы, што паспрыяла павелічэньню індывідуальнай свабоды чалавека і мабільнасьці яго ў грамадстве.

У гэтых умовах (на індустрыяльным узроўні разьвіцьця грамадства) нацыянальная сьведамасьць становіцца *формай ідэалёгіі* і грунтуецца, найперш, на *нацыянальнай ідэі*. Гэта значыць на такой ідэі, якая імкнецца да стварэньня *нацыянальнай дзяржавы* і асэнсоўвае нацыянальныя каштоўнасьці грамадства (найперш — мову, народ, тэрыторыю, культуру, гісторыю, рэлігію і г.д.) як сродкі яго фэнамэнальнага існаваньня, кансалідацыі і разьвіцьця.

Зразумела, чаму з разьвіцьцём нацыянальнай сьведамасьці пачалі развальвацца імпэрыі, што былі турмой народаў. (Народы, сцьвярджаючы нацыянальныя каштоўнасьці, імкнуліся стварыць самастойныя нацыянальныя дзяржавы.)

Суадносіны гарадзкога і сельскага насельніцтва ў індустрыяльным грамадстве мелі вялікае значэньне для фармаваньня нацыянальнай сьведамасьці. У традыцыйным эвалюцыйным разьвіцьці нацыі працэс адбываўся напружана, але бесканфліктна. У адраджэнскім разьвіцьці (гэта значыць шляхам змаганьня з імпэрыяй ці за незалежнасьць ад іншай дзяржавы) рашаючай была барацьба за сцьвярджэньне нацыянальнай мовы і за горад (за гарадзкое насельніцтва).

Некаторыя нямецкія інтэлектуалісты ў сярэдзіне XIX стагоддзя (напрыклад, К.Маркс) пісалі пра чэхаў як пра загіблы народ, які канчаткова анямечаны і ўжо ніколі не падымецца. Але ў другой палове XIX стагоддзя рэзка ўзмацнілася чэшскае нацыянальнае Адраджэньне. Таварныя адносіны выклікалі павелічэньне насельніцтва гарадоў, куды перасяляліся чэшскія сяляне, якіяператвараліся там у дробных прадпрымальнікаў, гандляроў, рамесьнікаў, купцоў, рабочых і г.д. Яны-то найперш і падтрымалі чэшскі нацыянальна-культурны і адраджэнскі рух. Гарады пачалі рабіцца ўсё больш чэшскімі па мове і па насельніцтву. Урэшце яны й вырашылі зыход нацыянальнага змаганьня за чэшскую культуру і чэшскую незалежнасьць.

Гэта клясычны шлях нацыянальнага Адраджэньня ў Эўропе. Такой дарогай ішлі і беларусы. Шмат якія беларускія нацыянальныя дзеячы дэкляравалі стаўку выключна на вёску і не давяралі зрусіфікаванаму гораду. Яны лічылі, што сьведамы беларус, вышаўшы з вёскі і атрымаўшы нацыянальную адукацыю, апануе і створыць нанова беларускую гарадзкую культуру.Так яно і пачынала рухацца. Але зьнешне-палітычныя сілы і акупацыі прыпынілі і дэфармавалі гэты рух.

Трэба ўлічыць, што зьява індустрыялізацыі грамадства, — гэта не нацыянальны, а *цывілізацыйны* працэс, які выклікаў зрух у нацыянальнай сьведамасьці людзей. Паўтаруся, што галоўны яго цывілізацыйны вынік — утварэньне нацыяў і перабалянсаваньне насельніцтва з сельскага ў гарадзкое.

Большасьць людзей індустрыяльнага грамадства (як мы ўжо адзначылі) жыве ў гарадах. Гэтага не назіраецца, напрыклад, у „трэцім сьвеце". Там большасьць — бедныя і жывуць у вёсцы. Гэтым якраз і характарызуецца „трэці сьвет". Сацыяльная дэмаграфія тут мае вызначальны культуралягічны сэнс.

Увогуле, трэба мець на ўвазе, што ў працэсе цывілізацыйнага руху некаторыя народы ці этнічныя супольнасьці па тых ці іншых прычынах выпадаюць з агульнага цывілізацыйнага разьвіцьця. Яны альбо зьнікаюць, альбо цяжка існуюць (экзыстуюць).

Тысячу гадоў таму, калі балты і славяне (цяперашнія беларусы) суіснавалі побач, то нашыя продкі стварылі гарады, мелі пісьмовасьць і передавую рэлігію (Хрысьціянства). Балты нічога гэтага ня мелі і не стварылі. Вынік — яны растварыліся дазваньня ў славянскім моры, не пакінуўшы пасьля сябе нават успамінаў, акрама, хіба што, гідронімаў ды назоваў, тыпу „Дулебы", „Яцьвягі" ці „Дзяволтва".

Этнічная сьведамасьць з апірышчам на тэрыторыю, прыроду, традыцыю і род не змагла супрацьстаяць народнай кансалідацыі, што абапіралася на дзяржаву і культуру (і гарады, як цэнтры культуры), плюс на Хрысьціянства, як дактрынальную цывілізацыйную рэлігію.

Другі прыклад: этнічныя сібірскія народы, якія расейскі імпэрыялізм проста стаптаў, збэсьціў, паламаў, спаіў; абрабаваў і згадзіў іхную зямлю і прыроду, прастору выжываньня. Лёс іхны незайздросны. Цяжка нават сказаць, ці ёсьць у гэтых народаў якая-небудзь пэрспэктыва.

Пэрспэктыва людзей (тэрыторыяў), што былі пад заходняй калянізацыяй, лепшая, але фактам ёсьць тое, што некаторыя зь іх, як і пэўная частка ісламскага сьвету, выпалі з індустрыяльнай цывілізацыі.

Сітуацыя драматычная, бо пакуль што безвыходная. Лёгка пралічыць і даказаць, што трэці сьвет ня можа ў гэтай сітуацыі дагнаць разьвітыя краіны. (Таму ён і „трэці сьвет", — гэта кляймо.)

З другога боку, павялічваецца нянавісьць, эгалітарызм, эміграцыя. Нарастае канфлікт паміж цывілізацыямі, які вельмі нагадвае дачыненьні паміж Рымам і варварамі. Фактычна, гэта той самы канфлікт, такога ж роду, толькі на іншым узроўні і ў іншых умовах.

* * *

Беларусь добра індустрыялізаваная краіна (працэс разьвіцьця затармазіўся толькі за апошнія сем гадоў). Яе структурная дэмаграфія цалкам адпавядае індустрыяльнаму грамадству. Толькі чвэрць насельніцтва жыве ў вёсках, а тры чвэрці — у гарадах. Аднак гэты цывілізацыйны ўзровень не карэлюецца зь невысокай нацыянальнай сьведамасьцю грамадства.

Токое становішча мае сваё тлумачэньне і абумоўлена, перш за ўсё, трагічнымі ўмовамі ХХ-га стагоддзя, у якіх апынулася Беларусь. Пасьля генацыду і вынішчэньня эліты грамадства ў 1920-1940-х гадах, краіна апынулася ў калгасна-саўгасным рэжыме. У 1950-х гадах, калі пачалася адміністрацыйная (сацыялістычная) індустрыялізацыя, афіцыйнае і афіцыйна-грамадзкае жыцьцё ў гарадах было зрусіфікаванае ў выніку палітыкі КПСС. Беларускія школы былі ўжо зачыненыя, а беларуская мова — перасьледвалася, не дапускалася ў афіцыйны і грамадзкі ўжытак. Стваралася атмасфэра непрыняцьця беларускай мовы (і яе носьбітаў), паколькі яна, згодна палітыкі КПСС, мусіла

„адміраць”, бо пры камунізме плянавалася адна мова (падразумевалася, што руская). Пра гэта пісаліся псэўданавуковыя дысертацыі, чыталіся даклады на канфэрэнцыях і лекцыі ў інстытутах, паэты плакаліся ў вершах („Кажуць, мова мая адамрэ...” і г.д.).

Інтэлігентаў, якія цьвёрда баранілі мову і беларушчыну, называлі „нацдэмамі” ды „нацыстамі” (а гэта тады былі небясьпечныя палітярлыкі). Іх перасьледвалі, іншых людзей, што размаўлялі па-беларуску, абзывалі „калхозьнікамі”, „дзярэўняй”, і ўсё гэтае антыбеларускае варварства адкрыта падтрымлівалася зграяй начальнікаў, савецкіх кіраўнікоў, камуністаў, савецкіх палкоўнікаў ды іхных жонак, кагэбістаў, савецкіх настаўнікаў ды камсамольцаў і г.д.

У пачатку 60-х гадоў вясковым людзям дазволілі атрымліваць пашпарты (раней калгасьнікам пашпарты не выдавалі) і больш свабодна перамяшчацца. Пачыналася адміністрацыйная індустрыялізацыя, будаўніцтва гігантаў вялікай хіміі, меліярацыя ды інтэнсіфікацыя і г.д. З пачаткам 60-х назіраецца масавая міграцыя сельскіх людзей у зрусіфікаваныя гарады. За кароткі час насельніцтва Менска павялічылася ўдвая. Ужо на 1979 год на вёсцы засталося толькі 28 адсоткаў жыхароў, амаль 72 адсоткі жылі ў горадзе. Усё гэта яшчэ больш умацавала нацыянальна-дэмаграфічную карціну ў беларускіх гарадах, якія былі беларускімі па пераважным нацыянальным складзе насельніцтава.

Аднак чэшскага варыянту (як сто гадоў таму) не атрымалася. На вуліцах загучэла „трасянка”, і горад зноў моўна зрусіфікаваўся. Больш таго, масавы і раптоўны прыход вясковага насельніцтва ў гарады канчаткова дабіў рэшткі даўняй беларускай гарадзкой культуры. Акурат у гэты час амаль бесперашкодна зьнішчаліся гістарычныя цэнтры беларускіх гарадоў, помнікі архітэктуры, пераймяноўвалі вуліцы і г.д. Для прыбылага вясковага насельніцтва горада гарадзкая гісторыя нічога ня значыла, горад быў для іх чужым асяроддзем і не зьяўляўся родным домам. Яны хутчэй стараліся атрымаць прапіску, размаўляць па-руску (як начальства), стаць у чаргу на кватэру і гадоў праз 15 атрымаць яе. (Жыльлё і разьмеркаваньне жыльля было ў руках дзяржаўнай бюракратыі.) На гэтым жыцьцёвыя мэты гарадзкога вяскоўца, практычна, заканчваліся. Нашыя гарады па сваім сацыяльна-культурным узроўні і характару насельніцтва сталі нагадваць вялікія вёскі (толькі без беларускай мовы).

Справа ў тым, што ў 60-70-х гадах у беларускія гарады перасяліліся не эканамічна вольныя людзі, як некалі ў Чэхіі (каб знайсьці працу, зарабіць грошай, адкрыць бізнэс, пачаць вытворчасьць, гандль і г.д.). У беларускія савецкія гарады ўцёк нядаўна запрыгонены, загнаны, запалоханы калгасьнік з адпаведнай псіхалёгіяй, залежнасьцю, няўпэўненасьцю ў сабе і мінімумам патрабаваньняў. Але нават гэты мінімум ён павінен быў яшчэ заслужыць у адміністрацыйнай сістэмы.

Гэта была заплянаваная міграцыя ў таталітарным савецкім сьвеце пад чужой уладай: без свабоды, без дачыненьняў уласнасьці, без пашаны да беларуса і нацыянальных ідэй.

Дэфармаваная этнічная сьведамасьць ня ў стане супраціўляцца ніякай экспансіі, якая валодае канцэптуальнай культурнай (ці квазікультурнай) ідэалёгіяй і ня ў стане захоўваць сваё асяроддзе ў агрэсіўных чужародных умовах. З сьведамасьцю „тутэйшых” у таталітарных абставінах цяжка стварыць нацыянальную гарадзкую культуру, а з псіхалёгіяй „вясковасьці” і ўсьведамленьнем другаснасьці — нельга яе перайначыць.

Каб дасягнуць мэты, асіміляцыйная палітыка імкнецца, перш за ўсё, сцьвердзіць сваю мову на акупаванай тэрыторыі, зьнішчыць нацыянальныя эліты і асіміляваць гарады. Калі гэта рэалізуецца, то далейшы ход асіміляцыі і разбурэньне нацыянальнай культуры адбываецца ўжо хутка і паўсюдна.

Калі ў гэтых абставінах нацыя траціць мову і пераходзіць на мову асімілятараў, то яна ўцягваецца тады ў самазьнішчэньне, бо неабходныя цывілізацыйныя працэсы (напрыклад, урбанізацыя, прыватызацыя, інфарматыка, адукацыя, уніфікацыя дзяржаўнай сістэмы, стандартызацыя і г.д.) пачынаюць дзейнічаць не як нацыянальна кансалідуючыя, а як асіміляцыйныя (нацыянальна разбуральныя) мэханізмы.

* * *

У беларусаў, як і ў іншых народаў (асабліва ў тых, што змагаліся за нацыянальнае адраджэньне), існуюць аднačасна розныя ўзроўні сьведамасьці. Але калі ў іншых ранейшыя, ужо гістарычныя, ўяўленьні пра сябе выяўляюцца як рэліктавыя зьявы, то ў нас, з прычыны асаблівасьцяў гісторыі, яны даволі пашыраныя. Асобы з этнічнай, і асабліва з „трасянковай” сьведамасьцю (этнічна дэфармаванай), не адмаўляюцца ад прыналежнасьці да беларускай нацыі і да Беларускай краіны, але не разумеюць значэньня і не даражаць нацыянальнымі каштоўнасьцямі і інтарэсамі нацыі: беларускай мовай, помнікамі беларускай гісторыі і культуры, беларускай тэрыторыяй, прыродай і г.д.

Анатоль Казловіч у сваіх філясофска-псіхалягічных развагах пра беларускую прыроду і чалавека ў ёй дакладна заўважыў, што для шмат якіх вясковых беларусаў прырода, прастора, у якой яны жывуць, і ёсьць іхная Бацькаўшчына, іхнае паняцьце пра Радзіму, іхны Дом, апошні прыстанак, куды яны імкнуцца, дзе яны знаходзяць упэўненасьць і душэўны спакой. Але калі чужынцы пачалі крамсаць іхную Радзіму, асушаць ды выпростваць, высякаць ды капаць — яны маўчалі. Яны нават не супраціўляліся. Хоць месца ім на іхнай зямлі ўжо амаль не пакінулі.

На жаль, гэта тыповыя паводзіны ігнараваных людзей з этнічнай сьведамасьцю. Аналягічна паводзяць сябе іншыя людзі і цэлыя народы з тэрытарыяльна-прыроднымі паняцьцямі Бацькаўшчыны ў сутыкненьні з вынішчэньнем іхняга жыцьцёвага асяроддзя (народы Поўначы, Сібіры і г.д.).

Змагацца за сваю прыродную Бацькаўшчыну, супраць вынішчэньня зямлі пасьлядоўна могуць толькі асобы, аб’яднаныя нацыянальнай ідэяй, а не насельніцтва на ўзроўні рэліктавай (і, тым больш, дэфармаванай) сьведамасьці.

Гэта агульнае месца. Няправільна было б бачыць на Беларусі нейкае выключэньне ці абвінавачваць вясковых беларусаў у тым, да чаго іх змусіла савецкая ўлада, чужынцы і прыбышы, перад якімі яны былі безабаронныя. І мы гэтага ня робім. Людзі, перажыўшы генацыд і ня злучаныя агульнай нацыянальнай мэтай, баяліся выступаць супраць савецкай „уласьці”. Страх захаваўся па сёньняшні дзень.

Але каб перамагчы і нават каб захавацца, трэба супраціўляцца ўсялякаму вынішчэньню.

* * *

Тое, што прастора і прырода мае велізарны псіхалягічны ўплыў на чалавека, —гэта аксіёма. Культурныя людзі стараюцца палепшыць сваю прастору і асяроддзе, дзе існуюць.

Падсумоўваючы вопыт, можна зрабіць заключэньне, што існуе, відавочна, пэўны псіхалягічны парог ва ўспрыняцьці „дрэннай” (іншай) прасторы, перайшоўшы які чалавек не вытрымлівае, траціць сьведамасьць, адбываецца параліч псіхікі. (Псіхалягічны эфэкт парогавай прасторы скарыстоўвалі, напрыклад, рускія энкавэдзісты-бальшавікі пры катаваньні людзей.)

Псіхапарогавым эфэктам валодае, на мой погляд, касьмічная прастора за межамі зямной гравітацыі, дзе экстрымальныя ўмовы для чалавека канчаюцца і пачынаецца псіхічны хаос (цёмнае царства Гаргоны-Мядузы, як сказалі б старажытныя грэкі).

Некалі, у XVIII-XIX стагоддзях, філёсафы будавалі пазнаваўчыя

сістэмы геаграфічнага дэтэрмінізму, дзе дамінуючым фактарам уплыву на характар і паводзіны людзей лічылі якраз прастору, геаграфічнае асяроддзе, залежнасьць ад геаграфічнай шырыні, клімату, вышыні над узроўнем акіяну і г.д.

Погляды геаграфічнага дэтэрмінізму былі вельмі аднабокімі, каб растлумачыць філясофскія праблемы з свайго гледзішча. Тым ня менш, пэўны сьлед у разуменьні зьяваў яны пакінулі.

Я, праўда, не рызыкнуў бы напрасткі зьвязваць прасторавы характар беларускага краявіду з характарам народу, хоць пэўную адпаведнасьць можна знайсьці на этнічным узроўні.

Прыродны ўплыў быў раней і існуе цяпер. Мы ўвесь час адчуваем яго ў эмацыйным успрыняцьці. Гэта становіцца добра зразумелым, калі ад'едзеш ад Беларусі далей. Тады шмат якімі беларусамі апаноўвае настальгія (мэлянхолія, дэпрэсія) па беларускай прасторы і краявідах. Я шмат разоў назіраў гэта ў беларусаў за мяжой і перажываў сам.

Гэта вельмі цяжкі псіхічны стан, які ў некаторых (як правіла, у тых, хто ня ў стане вярнуцца) доўжыцца гадамі і які я нікому б ня зычыў перажываць. Чалавек адчувае боль душы. Ва ўяўленьні, днём і ноччу, узьнікаюць краявіды Бацькаўшчыны і адчуваньне страчанага замілаваньня. Пачуцьцё страчанасьці любові ў некаторых даходзіць да роспачы, да самазабыцьця, да фетышызацыі прадметаў, гукаў і пахаў Айчыны, да галюцынацыяў у рэальнасьці і да нематываванага адчаю (плачу).

Такое адчуваньне можна параўнаць са станам, як пасьля страты каханай ці са стратай (сьмерцю) самага блізкага чалавека. Толькі душа шчыміць шматкроць мацней і даўжэй.

Калі чалавек мае моцную волю і разумее, што зь ім адбываецца, то можна перамагчы настальгію па роднай прасторы, задушыць у сабе боль, загнаць яго на дно. Але калі не змагацца, то, як кажуць, Бог — бацька. Тады дапамагчы можа толькі час.

Тысячы беларусаў пасьля 2-й Сусьветнай вайны, якія апынуліся за межамі Бацькаўшчыны, і шмат хто цяпер прайшлі праз такое выпрабаваньне.

Але ўсё гэта, як кажуць, цяжкая проза. (Хоць, можа, й ня ўсім ведамая). Мяне захапіла іншае адкрыцьцё, якое выявілася само сабой. Трэба было толькі параўнаць.

Я аб'ехаў усю Беларусь, уздоўж і ўпоперак і па пэрымэтру. У беларускім краявідзе паўсюдна адчуваецца нейкая цёплая таемнасьць, нейкая сьвятасьць, прысутнасьць сьветлага Духа. Беларускі краявід мае нейкую Боскую пячатку, душэўную заспакоенасьць. Вось жа нездарма нарадзілася выслоўе: „На Беларусі Бог жыве".

На Беларусі гэтая Боскасьць была для мяне абсалютна відавочнай, і я меркаваў, што так ёсьць ва ўсёй прыродзе. Усюды на Зямлі, думаў я, павінна бачыцца пячатка Бога.

Але потым, паезьдзіўшы трохі па сьвеце і паўзіраўшыся, я нідзе такога, як на Беларусі, ня ўбачыў і не адчуў.

Можа быць, у гэтакім адчуваньні Боскасьці беларускай прыроды ёсьць блізкая псіхалягічная аснова, як і ў перамене прасторы? Але ўсё гэта, як і раней на Беларусі, фіксуецца мной у спакойным стане духу і дастаткова рацыянальна.

Тут справа не ў суб'ектыўнасьці. Прырода, як і чалавек, мае сваё аблічча. Ёсьць людзі з добрымі вачыма, сьветлай усьмешкай і спагадным тварам, мы кажам, з Боскім абліччам. Гэтыя людзі валодаюць канцэнтрацыяй дабра.

Прырода таксама валодае такімі асаблівасьцямі ў выяўленчым сэнсе яе вобразу. І гэта (аснова асаблівасьцяў) якраз паддаецца дакладнаму вывучэньню і дасьледваньню. Распрацаваныя пэўныя сістэмы. Так што тут няма містыкі.

Беларуская прырода — унікальная зьява, зьбег выдатных геалягічных, геаграфічных, кліматычных, марфалягічных, экалягічных, флярыстычных, гідралягічных і дэмаграфічных абставінаў, якія ствараюць сваісты вобраз прасторы і аўру прыроды, у якой прыхільна і добра жывецца сваістаму чалавеку, які здольны гэтае Боскае хараство (падкрэсьліваю: пагрунтаванае на аб'ектыўнай прыроднай аснове) адпаведна ўспрыняць, цаніць, шанаваць і любіць.

Вось тут і ўзгадавалася ўзаемасувязь паміж беларускім чалавекам і беларускай прыродай. Пра іншыя дачыненьні ў сфэрах народнага і нацыянальнага грамадзтва мы ўжо гаварылі вышэй.

* * *

Мушу падкрэсьліць яшчэ раз, што на нацыянальным узроўні разьвіцьця нацыянальныя каштоўнасьці грамадзтва ацэньваюцца і ўсьведамляюцца ім у значэньні ідэй.

Клопат, пачатак, ініцыятыва ў пытаньні разьвіцьця сьведамасьці заўсёды зыходзіла і мусіць зыходзіць ад энтузіястаў, ад эліты нацыі. Эліта не павінна чакаць нацыянальнай ініцыятывы зьнізу і абвінавачваць людзей у бяздзейнасьці, бо нацыянальная ініцыятыва заўсёды ішла зьверху (гэта значыць, ад сьведамых людзей — ад ідэйнай эліты).

Ініцыятыва эліты — гэта ня заклікі. Гэта ёсьць асьветніцкая праца і дзейнасьць у нацыянальных інтарэсах ва ўсіх сфэрах грамадзкага жыцьця. Нацыянальная сьведамасьць грунтуецца ўжо ня толькі на жыцьцёвай прасторы (ізноў жа, паўтаруся), ня толькі на займаемай тэрыторыі, ня толькі на прыродзе, але на *нацыянальнай ідэі*, *нацыянальных інтарэсах* і *нацыянальных каштоўнасьцях* (мове, культуры, гісторыі, дзяржаве і г.д.).

Істотна аднак тое, што нацыянальная ідэя можа рэалізавацца (у форме нацыянальнай дзяржавы) толькі на *нацыянальнай тэрыторыі.* Іншых прыкладаў у гісторыі не існуе.

Азначэньне нацыянальнай тэрыторыі мае праграмны сэнс для беларускага Адраджэньня.

„Наша зямля, наша нацыянальная тэрыторыя ад пачатку існаваньня на ёй людзей ёсьць наша зямля, — адзначаецца ў дакумантах беларускага Адраджэньня. — *На ёй мы, беларусы, і нашы продкі жылі спрадвеку. На ёй мы стварылі нашу гісторыю, культуру і дзяржаву. Наша зямля ёсьць часткай нас самых, нашага гістарычнага, культурнага і нацыянальнага існаваньня. Нічога няма даражэйшага за нашу Беларускую зямлю. Наша зямля непадзельная, недатыкальная, сьвятая.*

Аніхто — ніякі чалавек, ніякая група людзей, ніякі дзяржаўны орган, ніякая краіна, ні Беларуская дзяржава, ні Беларускі народ — ня можа распараджацца лёсам Беларускай зямлі, бо яна належыць ня толькі нам, ня толькі тым, хто жыве цяпер, але й будучым пакаленьням беларусаў, датуль, пакуль будзе наш род у Сусьвеце.

Наша зямля ёсьць наш вечны Дом, вечная спадчына, якая сягае за межы часу — непадзельны маярат, асьвечаны найвышэйшым гістарычным правам і найвышэйшым абавязкам, неад'емная каштоўнасьць беларускай нацыі. Нашу Беларускую зямлю трэба любіць, берагчы, шанаваць, абараняць ад страты і спусташэньня, умець змагацца за яе." (Праграма Партыі БНФ, 1999 г.)

Нацыянальная тэрыторыя адыграла гістарычную ролю ў самапазнаньні і самаўсьведамленьні нас як народа, паспрыяла фармаваньню нашага этнічнага характару, псіхалёгіі і мэнтальнасьці, была і ёсьць нашай жыцьцёвай прасторай, дзе мы можам гістарычна (гэта значыць — і ў будучыні, вечна і бясконца) жыць, разьвівацца і існаваць.

Беларуская тэрыторыя, гэтак жа, як Беларуская мова і Беларускі народ, ёсьць найвялікшай каштоўнасьцю беларускага быцьця на Зямлі.

8 сьнежня 2001 г., Варшава.

5. БЕЛАРУСКАЯ ІДЭЯ

Першаснай інтэлектуальнай і духоўнай каштоўнасьцю нацыі ёсьць Нацыянальная ідэя. Без яе нацыя ня можа ні ўзьнікнуць, ні існаваць. Гэта ёсьць нацыянальная ідэалёгія: ўсьведамленьне неабходнасьці незалежнага нацыянальнага існаваньня; стварэньне нацыянальнай дзяржавы; разьвіцьцё нацыянальнай культуры; усьведамленьне нацыянальнай самакаштоўнасьці самых сябе (народа, нацыянальнай супольнасьці).

Асэнсаваньне Нацыянальнай ідэі і дэтэрмінацыя яе (прычыннаабумоўленая сувязь) з кожнай нацыянальнай асобай ёсьць чыньнікам нацыянальнай сьведамасьці грамадзтва.

Палітычная практыка і гісторыя краінаў паказала, што калі ў грамадзтве няма „першаснай каштоўнасьці нацыі” ці калі Нацыянальная ідэя нясьпелая, а нацыянальная сьведамасьць людзей невысокая, то ніякія іншыя перавагі, нават вельмі значнага матэрыяльнага кшталту, не дапамогуць грамадзтву самаразьвіцца, сцьвердзіцца і свае перавагі рэалізаваць.

Ні багатыя прыродныя рэсурсы, ні вялікая колькасьць маёмных, адукаваных людзей, ні культурная спадчына гістарычнага мінулага, ні разьвітая эканоміка — нішто не паспрыяе, калі насельніцтва не ўсьведамляе агульных інтарэсаў і агульных каштоўнасьцяў нацыі, калі не разумее абсалютнай нацыянальнай каштоўнасьці самых сябе, сваёй супольнасьці, мовы, культуры і гісторыі. Такое грамадзтва страціць свае багацьці, апынецца ў залежнасьці ад іншых, дэградуе, занепадзе.

Прывяду прыклад. У 1991 годзе (у год аднаўленьня незалежнасьці і ліквідацыі ўлады КПСС) Беларусь, адносна сваіх суседзяў (Польшчы, Летувы, Латвіі, Украіны) была самай перадавой краінай па жыцьцёвым узроўні. У Беларусі (адносна гэтых краінаў) была добра разьвітая структура таварнай вытворчасьці і эканомікі, высокая навукаёмкасьць вытворчасьці, збалянсаванасьць прамысловасьці, стратэгічная вытворчасьць, нафтавая, хімічная, электронная, аптычная, тэкстыльная і харчовая, транспартная і г.д. Тут была найлепшая ў былым СССР чыгунка, найлепшая сельская гаспадарка, найбольшая колькасьць ворнай зямлі ў Эўропе з разьліку на душу (каля аднаго *га*). Тут была высокаразьвітая фундамэнтальная і ўжытковая навука, структураваная сістэма сярэдне-спэцыяльнай і вышэйшай адукацыі, добры ўзровень медыцыны, высокі ўзровень і вялікі працэнт адукаваных спэцыялістаў, добрая кваліфікацыя рабочых і агульная адукацыя насельніцтва, наяўнасьць важных прыродных рэсурсаў.

Ніводная з пералічаных краінаў ня мела тады такога становішча. Эканамічны патэнцыял Беларусі перавышаў патэнцыял значна большай па насельніцтву Польшчы (ня кажам ужо пра войскі і ўзбраеньні).

Цяпер, аднак, праз 10 гадоў Польшча — ўжо ў НАТО, краіна з рынкавай эканомікай, мае эўрапейскі выгляд, зьбіраецца ў Эўразьвяз. Пайшлі наперад Балтыйскія краіны, умацавалі валюту, будуюць новую гаспадарку. Нават Украіна, дзе быў даволі нізкі жыцьцёвы ўзровень і вельмі складаныя праблемы ў эканоміцы, выбралася на лепшую пэрспэктыву, добра ўспрымаецца ў сьвеце.

Толькі ў Беларусі за гэты час усё змарнавана. Яна зьбяднела, зьехала найніжэй і само існаваньне яе дзяржаўнай незалежнасьці пастаўлена пад пагрозу.

У чым жа прычына, чаму так сталася ў краіне, якая рэальна магла б быць наймагутнейшай і найбагацейшай на Ўсходзе Эўропы, гэтакім усходне-эўрапейскім драконам, як спрабавалі ўжо характарызаваць яе будучыню.

Так, згодзен, ёсьць пытаньне зьнешняй палітыкі. Расея адчула ва ўзвышэньні незалежнай Беларусі сьмяртэльную небясьпеку для сябе, для існаваньня яе як імпэрыі, для таемных мараў усё вярнуць. Эканамічна магутная, з высокім жыцьцёвым узроўнем Беларусь паўплывала б на ўвесь рэгіён як станоўчы прыклад, стала б зьвязваючым зьвяном новага жыцьця ва Ўсходняй Эўропе. Імпэрскія ўплывы Расеі тут бы вельмі аслабелі, прыйшлося б разьвітацца з імпэрскімі марамі на Захадзе і будаваць раўнапраўныя дачыненьні.

Таму беларускі напрамак быў аб’яўлены кірункам нумар 1 па важнасьці ў расейскай зьнешняй палітыцы, і ўся магутнасьць яе спэцслужбаў, дыпляматыі, хітрасьць розумаў „гайдароў” і так званых „расейскіх дэмакратаў” запрацавалі ў зададзеным рэжыме.

Менск, 1997. Змагар за Беларусь.

Яны дасягнулі вынікаў. Беларусь узначаліў свой прарасейскі кіраўнік, які дапамог расейскім спэцслужбам ажыцьцявіць акупацыю беларускай улады знутры.

Аднак зьнешнія прычыны — гэта ўсё ж недастатковае тлумачэньне заняпаду Беларусі. Адсутнасьць шырокага разуменьня ў беларускім грамадзтве таго, што рэальна адбылося і адбываецца, адсутнасьць рэальнага і шырокага супраціўленьня ўнутранай акупацыі гавораць аб тым, што прычына — ўнутры.

Ва ўсіх суседніх краінах не было такога матэрыяльна-эканамічнага ўзроўню, як у Беларусі, але існавала галоўнае, што рабіла іх моцнымі, гарантавала нацыянальнае і дзяржаўнае існаваньне і разьвіцьцё. Гэтае галоўнае — ***высокая нацыянальная сьведамасьць людзей, нацыянальная самасьвядомасьць грамадзтва***. Гэта зрабіла іх свабоднымі, гэта дапамагло стварыць ім нацыянальную дзяржаву і падняцца зь нізін.

Беларусь, якой пасьля вайны за часы СССР, ня гледзячы на вынішчэньне і генацыд, пашанцавала акамуляваць сваю працу ў сістэме савецкай гаспадаркі і часткова ўтрымаць яе вынікі на сваёй тэрыторыі, гэтай працавітай Беларусі не ўдалося захаваць на ўзроўні сваю нацыянальную культуру. Краіна страціла беларускую школу (якая фармуе беларускую асобу), не зьберагла павагу да беларускай мовы ў грамадзтве, трапіла пад навалу шалёнай саветызацыі, дэнацыялізацыі і русіфікацыі.

У пачатку 90-х гадоў у беларускім грамадзтве было ўсё для новага годнага нацыянальна-дзяржаўнага эўрапейскага разьвіцьця. Але не было галоўнага: ***моцнай нацыянальнай сьведамасьці людзей***. У выніку — наша грамадзтва страціла ўсе свае матэрыяльныя перавагі і магчымасьці, апынулася перад пагрозай страты незалежнасьці, народнай маёмасьці і ўвогуле — гістарычнага існаваньня.

Вось што такое нацыянальная сьведамасьць людзей. Гэта калектыўны розум нацыі. Гэта сьведчаньне існаваньня духоўнай індывідуальнасьці народа, якая дзейнічае разумна, паводле агульнай неабходнасьці патрэбаў і інтарэсаў нацыі.

Калі б у 1991 годзе гэтая беларуская нацыянальная сьведамасьць ужо б была адроджана, лёс Беларусі быў бы іншым.

Незалежнасьць Беларусі вярнуў беларускі нацыянальна-дэмакратычны авангард (гэта значыць Народны Фронт, і ўсе, хто вакол яго). Першыя, што нацыянальна адрадзіліся, рынуліся на сьведамае і сьвятое змаганьне і малою сілаю —перамаглі. Гэта было няпроста. Бо справа вымагала выключнасьці, не цярпела прамаруджаньня, нясьмеласьці і памылак.

Але далей, каб вырашыць пытаньне новай нацыянальнай улады і новай нацыянальнай дзяржавы, трэба было абаперціся на сьведамае гэтым нацыянальным задачам грамадзтва, на сьведамыя грамадзкія сілы. Сілаў было замала.

Ужо летам 1992 года Масква (у асноўным спэцслужбы), злучыўшыся з беларускай каляніяльнай адміністрацыяй (урадам і намэнклятурай) перайшла ў наступ на вольную Беларусь.

* * *

Нацыянальная ідэя — гэта *ідэя аб'яднаўчага выбару*. Гэта абазначае, што яна ня ёсьць ідэяй кампрамісу, але — прынцыпу. Тут трэба выбіраць: альбо-альбо. Але тым часам гэта ёсьць ідэя менавіта аб'яднаўчая для ўсіх, нават калі б спачатку за ёй стаяў толькі адзін чалавек, ці двох, ці — невялічкая група.

Чаму гэтак ёсьць? Таму што Нацыянальная ідэя — нішто іншае, як вынiковая, практычная і ўнiвэрсальная мэта, якая аб'ектыўна вынікае з жыцьцёвага становішча і з духоўных інтарэсаў народа.

Нацыянальную ідэю ніякі мудрэц не прыдумаў. Яе нарадзіла нацыя. Людзі аднае культуры, аднае мовы, аднае гісторыі, тэрыторыі, знаходзячыся ў аднолькавых сацыяльна-палітычных умовах, пастунова ўсьведамляюць аднолькавую нацыянальную неабходнасьць. Нават тыя, што з пабочных прычынаў спачатку не разумелі і не прымалі Нацыянальнай ідэі, ці тыя, што былі да ўсяго абыякавыя. Нацыянальная ідэя, пашыраючыся, разьвіваючыся, увасабляючыся і сцьвярджаючы сябе, паступова набірае падтрымкі, бо аб'ектыўна — не супярэчыць грамадзкім інтарэсам народа, а толькі выяўляе і фармулюе іх. Нацыянальная ідэя рухаецца як шлях нацыянальнай праўды. Кожны ў народзе знаходзіць там свой інтэрас, яна ня ёсьць ідэяй абстрактнай, але канкрэтнай формулай, абапертай на агульнае народнае дабро.

Уявім найпрасьцейшыя прыклады. Калі, магчыма, вельмі простаму чалавеку тлумачыць: ты працуеш на зямлі і хочаш мець яе ва ўласнасьць. Ты атрымаеш такую квоту зямлі, якую зможаш апрацаваць. Дадзім табе трактар наперад, у кошт крэдыту. Выплаціш крэдыт з ураджаю, пастунова, за 10 гадоў. Гарантуем табе, што прадасі сваю бульбу і жыта. Але дзеля гэтага нам усім разам трэба стварыць сваю дзяржаву з сваіх людзей, каб мець свае законы „пра твой трактар", тваю зямлю і гарантыі продажы жыта на ўнутраным рынку, пра твае падаткі і мыта на межах (каб абараніць тваю працу) і г.д. То ўрэшце рэшт, ці ні пагодзіцца з гэтым чалавек?

Альбо пытаем: калі мы з табой будзем мець сваю беларускую ўладу, то ці будзе яна перайменоўваць тваю вёску Быкоўшчына ў вёску „Сірэнь"?

Нацыянальная ідэя, нават у дэталях, у самым простым, — гэта ідэя здаровага сэнсу. Яна свая. Таму яна аб'яднаўчая, патрабуе асьветніцтва, тлумачэньня сваім людзям, і змаганьня за яе — з чужой палітыкай.

Той жа прыклад, але ў рэчышчы ідэі абстрактнай (чужой, нездаровага сэнсу). Ты працуеш на зямлі, але ня маеш яе. Давай адбяром у тых, хто мае яе шмат, і дадзім табе, колькі трэба. Але потым — абагулімся, складзем зямлю ў вадно, разам з жывёлай і інвэнтаром. І будзеце ўсе разам, такія, як ты, на ёй працаваць. Бульба і жыта — агульныя. Частку ўраджаю падзеліце паміж сабой, а астатняе — Маскве, за тое, што нас аберагае і намі кіруе. Быкоўшчыну назавем „Камінтэрн".

Тлумачэньні, мяркую, непатрэбныя. Як укаранялася гэтакая ідэя — добра ведама. Яе не растлумачыш, не пакажаш, не дакажаш і ня ўспрымеш, ці ты адукаваны, ці ты неадукаваны. Бо яна не вынікае ні з жыцьцёвых абставінаў, ні з сацыяльных патрэбаў, ні са здаровай лёгікі. Гэта тыповая разбуральная, разьяднаўчая ідэя, не адпаведная жыцьцю, якая (каб існаваць) патрабавала маўзэра, калючага дроту і лёзунгу: „Хто ня з намі, той супраць нас."

* * *

Нацыянальная ідэя ёсьць ідэяй прынцыпу і выбару, але (як я ўжо адзначыў) — не канструкцыяй кампрамісаў. Некаторыя наіўныя людзі (зрэшты, і зацятыя дэмагогі таксама) шчыра мяркуюць, што ва ўсіх выпадках грамадзкіх сутыкненьняў і суперніцтва процілеглых тэндэнцыяў у палітыцы ды сярод людзей, трэба заўсёды не канфліктаваць, а шукаць нечага агульнага, прыймальнага для ўсіх. Такія людзі здаюцца палітычнымі мудрацамі, разважаюць то пра „цэнтрызм", то пра „мастацтва кампрамісу" і г.д., думаючы, што валодаюць унівэрсальнай тэхналёгіяй дэмакратыі.

Квінтэсэнцыю такой „тэхналёгіі" выявіў некалі ў польскім Сэйме наш беларускі сэнатар Аляксандар Уласаў: „Усё будзе добра, панове, — зьвяртаўся ён да сэнатараў-дыскутантаў, — толькі нічога ня трэба рабіць".

Кампраміс магчымы (і можа быць плённым) па зьбліжаных і альтэрнатыўных пазыцыях. Сутнасьць жа ў тым, што ў Нацыянальай ідэі не існуе нацыянальнай альтэрнатывы. Яе абагуленасьць — абсалютная. Яе альтэрнатыва знаходзіцца за межамі нацыі і зьяўляецца — антаганізмам. Кампраміс паміж антаганізмамі, практычна, немагчымы (альбо — альбо). Хіба што гэта будзе кампраміс абсурду.

Не існуе здаровага кампрамісу, скажам, паміж антаганізмам жыцьця і сьмерці: быць ці ня быць. Але аб'яднаўчы сэнс для людзей (здаровы сэнс), ня гледзячы на дыямэтральную супроцьлегласьць ідэяў, знаходзіцца ў пазыцыі жыцьця: „Быць."

Значыцца, калі мы гаворым „быць", — мы можам урэшце ўсіх аб'яднаць, хоць бы бальшыня меркавала зь нейкіх прычынаў, што „быць" — ня трэба.

За „быць" (гэта значыць, жыць) — трэба змагацца, бо жыць — мусім усе.

Добра, што за часы Хрыста не было дэмакратыі. А то арганізавалі б „круглы стол" па дасягненьні кампрамісу паміж Хрыстом і фарысеямі.

Ідэя ад ідэі розьніцца, і ня ўсё — дзеліцца папалам. Каб разумець гэта, Бог і даў чалавеку розум.

Калі глянуць на гісторыю эўрапейскага Адраджэньня ў XIX стагоддзі, то ўбачым якраз такую аб'яднаўчую карціну: рух Нацыянальнай ідэі ад малога — да вялікагга, праз асьвету і змаганьне і нясеньне Крыжа дзеля шчасьця і будучыні ўсяго народа. Гэта такое змаганьне, дзе кожны венгр, ці кожны чэх, ці кожны беларус быў у Нацыянальнай ідэі — сябрам.

* * *

Пэўная катэгорыя людзей у Расеі і іхныя прадстаўнікі ў Беларусі вельмі ня любяць Беларускую Нацыянальную Ідэю. Але заўважана, што яны яе і баяцца. Пакусваюць, ды з-падцішка, скрытна, між іншым, не ўдаючыся ў вялікія разважаньні. А так, звычайна, робяць выгляд, што яе няма. Ды й самы яны, маўляў, амаль клапоцяцца пра Беларусь, шукаюць, быццам бы, шляхоў выхаду (у Расею, вядома).

Мітусьня ўсё гэта, пустата і дэмагогія. Пераможа праўда, бо такая яе прырода. Беларусь была і будзе. Але за Беларусь трэба змагацца.

Каб змагацца, трэба быць разам. Аб'яднаць беларусаў можа толькі *Белларуская Ідэя.* А гэта ёсьць Ідэя нашага вольнага нацыянальнага жыцьця ў незалежнай Беларускай дзяржаве. Беларусаў ня можа злучыць чужая Нацыянальная ідэя, ці чужая дэмакратыя, а толькі — разлучыць. Вось чаму за сваю ідэю трэба змагацца супраць чужароднага.

Сапраўды так. Ёсьць толькі адна дарога выратаваньня Беларусі: узмацняць Беларусь, берагчы ўсё беларускае. Супраціўляцца зьнішчэньню, русіфікацыі, этнацыду. Нельга цярпець, каб нас паніжалі, тапталі ў гразь наша імя, зьняважалі нашу мову і род, забіралі маёмасьць.

Як гэта ня дзіўна, але, каб абараніцца, трэба вельмі ня шмат: адчуць гонар за свой народ і адказнасьць за ягоную будучыню.

28 траўня 2002 года, Варшава.

6. КУЛЬТУРА, ГІСТОРЫЯ, МАЁМАСЬЦЬ

Часам гаворыцца, што чалавек — гэта культура. У гэтым ёсьць сэнс. Дакультурны чалавек мусіў бы быць часткай прыроды (ці больш сьцісла — жывёльнага сьвету). Ці быў дакультурны пэрыяд у чалавека на Зямлі, сказаць цяжка, хоць дзеля гэтакага меркаваньня хараша выбудоўваецца лягічны ланцужок і пад рукой — розныя прыклады. Але пакуль што гэта ўсяго толькі навукова-лягічныя канструкцыі, а не дакладная навуковая сістэма. Тым ня менш, мы мусім карыстацца тым, што маем, — лёгікай вылучэньня чалавека з прыроды, абапіраючыся на фрагмэнты дакладных ведаў.

Калі прааналізаваць значэньне, гісторыю і сэнс слова „культура", то прыходзім да высновы, што яно выяўляе асноўнае паняцьце і спосаб чалавечага існаваньня на Зямлі. ***Культура — гэта ўсё, што створана рукамі і розумам чалавека***. Вышэй культуры ёсьць толькі Бог і прырода.

Вылучэньне чалавека з прыроды — гэта быў шлях у культуру. Чалавек, утвараючы культуру, сам зьяўляецца яе стварэньнем (у сфэры культуры ён стварае сябе). У той жа час чалавек ёсьць часткай прыроды і Боскага Духу.

Мяркуючы па-філясофску, чалавек, разьвіваючыся ў культуры, ёсьць зьявай прыроды, якая, надзеленая Боскім Духам, пазнае сама сябе. Таму сэнс культуры — у чалавеку.

Ня цяжка зразумець, што фізічны чалавек у прынцыпе ня можа выйсьці за межы прыроды (усяго існага), а фізічнае жыцьцё чалавецтва абмежавана пэрыядамі прыродных пераменаў.

Таму чалавек ня можа быць „царом прыроды", як сцьвярджалі неадукаваныя людзі, бо прырода ў анталягічным сэнсе — бясконцая (адваротна пэрспэктыўная ў шырыню) і ў гнасеалягічным зьмесьце — непазнавальная (проста пэрспэктыўная).

У чым жа тады зьмест культуры, калі яна, існуючы паралельна, ня можа выйсьці за межы прыроды?

Культура гэта ёсьць духоўнае цела фізічнага чалавецтва, форма, у якой разьвіваецца чалавек. Гэта нібы дом, які людзі могуць абсталяваць, як сьвятыню, як храм, альбо ператварыць яго ў хлеў. Бо чалавек культурны, у адрозьненьне ад істоты прыроднай (жывёлы), валодае *свабоднай воляй*.

Пераходны, канцовы сэнс культуры можна зразумець, калі разглядаць яе як асяроддзе дзеля ўдасканаленьня чалавечай душы і разьвіцьця чалавечага духу (гэта значыць, як сфэру выяўленьня вечнага розуму).

Мы, беларусы, ствараючы і адраджаючы нашу культуру, ніколі не павінны забывацца пра вечнасны, духоўны сэнс народнага існаваньня.

Ёсьць таксама вузкае разуменьне тэрміну культуры. Яно ўключае ў сабе сфэры творчасьці, мастацтва, этыкі, самаарганізацыю грамадзтва. Ёсьць сваістыя катэгорыі культуры. Напрыклад, агульначалавечая культура, нацыянальная культура, народная культура (пад якой звычайна падразумяваюць фальклёр), мастацкая, бытавая, індывідуальная культура і г.д. Усе культурныя дачыненьні ўзаемазьвязаныя і, у рознай ступені, узаемазалежныя.

Нас цікавіць тут нацыянальная культура як асноўная каштоўнасьць нацыі. Некалькі пакаленьняў беларусаў жыло пры камуністычным рэжыме, пад расейска-савецкай акупацыяй. Тады ідэалёгія і палітыка ў галіне нацыянальнай культуры вызначалася падвойна. У афіцыёзным пляне лічылася, што нацыянальная культура (гэтак жа, як і мова) ёсьць часовая зьява. Пры камунізме, маўляў, да якога ўсё няўхільна рухаецца, будзе адна камуністычная культура (і адна мова). На просьбу ўдакладніць, што гэта будзе за культура і якая мова, прапагандысты (псэўдавучоныя) звычайна ухіляліся ад адказу альбо намякалі, што „возможно, это будет взбагаченная национальными культурами русская культура и русский язык, как самые высокоразвитые и наиболее распространенные".

Другі варыянт тлумачэньня гэтакай пазыцыі адбываўся на паўафіцыйным (непублічным, непісьмовым) узроўні, дзе гаварылася, што беларуская нацыянальная культура і мова „никому не нужны", што трэба жыць іншай, „более передовой" рускай культурай, і гаварыць — па-руску, бо „все понимают и везде говорят".

Узровень гэтакай шавіністычнай прапаганды, як кажуць, недыскусійны. Але бывае, што чым больш прымітыўная прапаганда, тым лепш яна засвойваецца простымі людзьмі. З такой зьявай нялёгка змагацца, бо на прапагандысцкі прымітыў павінен быць контр-прымітыў. Тады успрымаецца.

Вядома, усё вырашаецца нацыянальнай асьветай у нармальнай краіне. Але ў акупаванай краіне, дзе такой асьветы няма (ці яна забаронена), а нацыянальныя асьветнікі і шмат якія культурныя людзі — зьнішчаныя, у такой краіне могуць існаваць самыя неверагодныя антыкультурныя ўяўленьні.

* * *

Нацыянальная культура акамулюецца ў генетычнай памяці, у інтэлекце чалавека і ў набытых інстынктах. У грамадзкім сэнсе, нацыянальная культура адкладваецца *ў гісторыі* і выяўляецца ў людзкіх (грамадзкіх) дачыненьнях. З гэтага вынікае, што чалавек нармальна разьвіваецца толькі ў сістэме сваёй нацыянальнай культуры, але можа ўзбагачацца ў іншай нацыянальнай культуры. Такім чынам, кожная нацыянальная культура у дачыненьні сама да

сябе ёсьць *сістэма існаваньня і разьвіцьця*, а ў дачыненьні да іншай нацыянальнай культуры яна выступае як *сістэма ўзбагачэньня*. Адсюль зразумела, што нацыянальная культура ёсьць абсалютнай умовай культурнага існаваньня, а множнасьць культураў ёсьць чыньнікам *паскоранага культурнага разьвіцьця* кожнай нацыянальнай культуры і культуры чалавецтва ў цэлым. І чым большая множнасьць, тым лепшыя ўмовы, тым большая магчымасьць разьвіцьця.

Гісторыя ёсьць часткай культуры. Гэта яе памяць і назапашаны вопыт. Аб значэньні веданьня гісторыі для асобы і грамадзтва шмат напісана і сказана.

Без гісторыі культура не разьвіваецца, як не разьвіваецца чалавек без памяці. Каб лепш зразумець, паспрабуем уявіць такога чалавека. Скажам, з сёньняшняга дня асоба перастае раптам памятаць усё, што было. Чалавек адразу нібы выпадае з сацыяльна-культурнага жыцьця. Перастае быць паўнавартаснай асобай. Ня зможа далей ні нармальна жыць, ні працаваць.

Расейскія камуністы, зьнішчаючы беларускую гісторыю, фальсіфікуючы і зачыняючы яе для цэлых пакаленьняў, стваралі непаўнавартасныя ўмовы культурнага разьвіцьця, спрыялі інтэлектуальнай люмпэнізацыі (адсутнасьці духоўных каштоўнасьцяў) і культурнай няразьвітасьці ў грамадзтве. А гэта выклікала дэфармацыю нацыянальнай сьведамасьці, неадэкватныя грамадзкія паводзіны народа.

Па-за культурай (гэта значыць, увогуле па-за культурным чалавечым грамадзтвам) чалавек не разьвіваецца як культурная індывідуальнасьць (дзічэе).

Выходзіць, што для нармальнага і праўдзівага існаваньня і разьвіцьця грамадзтва і чалавека неабходна, каб былі моцныя нацыянальныя (народныя, этнічныя) культуры, каб іх было шмат і каб людзі, жывучы ў сістэме адной нацыянальнай культуры, маглі рухацца па сьвеце (ці хаця б ведаць, што ў ім робіцца).

У рэальнасьці аднак, назіраюцца істотныя адхіленьні ад узору, узьнікаюць войны і канфлікты з мэтай захопу чужой тэрыторыі ды маёмасьці, прыдумваюцца пачварныя тэорыі ды ідэалёгіі, дзеля асіміляцыі ці вынішчэньня нацыяў, снуецца хітрая палітыка і таемная дыпляматыя, правакуецца культурная экспансія, міграцыі, дыверсіі, імпэрыялізм у культуры і г.д.

(Фота Яна Булгака, 1910-я гг.)

Старая Вільня.

На працягу ўсёй гісторыі культурнага існаваньня людзей назіраецца пастаянная разбуральная тэндэнцыя: зьменшыць множнасьць культураў (якія ствараюцца ў выніку культурнага разьвіцьця чалавецтва.)

Найвыразьней гэтая зьява ўвасоблена ў ідэалёгіі, псіхалёгіі і палітыцы імпэрыі. Ці ёсьць у гэтым нейкі аб'ектыўны рацыянальны сэнс? На жаль, ёсьць. Для хутчэйшага і вышэйшага разьвіцьця культуры патрэбная ня толькі множнасьць, але і канцэнтрацыя магчымасьцяў, рэсурсаў, грамадзкай сілы. Так узьнікалі вялікія цывілізацыйныя імпэрыі, заснаваныя на крыві і касьцях загіблых народаў, дзе будаваліся велічныя храмы, калёны, помнікі, сфінксы, акведукі ды пірамiды, тэатры ды стадыёны, а вайна была сродкам культурнага прагрэсу.

Канцэнтрацыя багацьцяў і культуры ў імпэрыях выклікала зайздрасьць малакультурнага, так званага „варварскага сьвету", зь якім імпэрыі вялі пэрманэнтныя войны. У выніку гэтакіх войнаў узьнікалі нават варварскія імпэрыі (напрыклад, Манчжурыя, Залатая Арда, імпэрыя Тамэрляна, Расея* і г.д.), якія пагражалі зьнішчэньнем любой культуры.

Цывілізацыйныя старажытныя імпэрыі зьнікалі, аднак, перш за ўсё, з унутраных прычынаў (заняпад маралі, духоўная дэградацыя), а ня толькі пад ударамі варвараў. Бо нішто ня можа доўга трываць, заснаванае на гвалце і крыві. На месцы імпэрыяў зноў ажывалі ацалелыя народы, адраджалася множнасьць культураў, якія разьвівалі свае народныя традыцыі і вельмі выбарачна засвойвалі культуру імпэрскую.

У XX-м стагоддзі разваліліся і спынілі сваё існаваньне, практычна, усе (акрамя Расеі) сусьветныя імпэрыі (у тым ліку, і каляніяльныя). Утварылася мноства нацыянальных і посткаляніяльных дзяржаваў. Назапашаны велізарны вопыт па самазахаваньні і адраджэньні нацыянальнай культуры.

У гэты ж час становіцца зразумелым (а ў канцы XX-га стагоддзя замацоўваецца ў палітыцы), што вялікая традыцыйная вайна (вайсковая франтавая кампанія) стала эканамічна непасільнай і эканамічна ня выгаднай, а вынікі яе — надзвычай разбуральныя і гвалтоўныя для культуры, якая, з ускладненьнем сваёй структуры, стала больш датклівай на разбурэньне.

Да пачатку XXI стагоддзя і спосабы вайны, і імпэрская палітыка пачалі мяняць аблічча. На месца „нэакаляніялізму" прыходзіць „глябалізацыя" (якая ўжо выклікала канфлікт з ісламскім сьветам), а замест традыцыйнай ваеннай акупацыі часьцей і часьцей ужываецца эканамічная вайна, распрацоўваюцца мэтады інфармацыйных, кібэрнэтычных, прапагандысцкіх, фінансавых войнаў, выкарыстаньне разьведкі, спэцслужбаў і г. д.

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь (як я ўжо адзначаў раней) была захоплена Расеяй у выніку скаардынаваных дзеяньняў расейскіх спэцслужбаў і савецкага КГБ, з выкарыстаньнем дзеючых мэханізмаў фармаваньня ўлады. Гэта новы від вайны: акупацыя знутры пры дапамозе спэцслужбаў.

На працягу ўсіх гадоў гэтай вайны (з 1994-га) адбываецца пасьлядоўнае вынішчэньне асноваў беларускай культуры, гісторыі, эканомікі, незалежнасьці і дзяржаўнасьці. Старая імпэрыя з адсталай эканомікай, культурай, з традыцыйнымі сьціраваньнямі

на захоп тэрыторыяў, на генацыд, тэрор і асіміляцыю (такую тэрарыстычную вайну яна вядзе ў Чэчэніі) распачала ў Беларусі новы мэтад вайны — ўнутраную акупацыю, расьцягнутую ў часе, шляхам стварэньня ўмоваў для самазьнішчэньня беларускай нацыі.

Экспансія любой імпэрыі (варварскай ці цывілізацыйнай) ёсьць заўсёды пагроза множнасьці культураў, духоўнаму і фізічнаму існаваньню народаў.

Прыклад зь Беларусяй яскравы, але можам паглядзець на сьвежы прыклад зь іншага боку: як адбываецца экспансія цывілізацыйнай глябалізацыі, наступ супэрімпэрыі. Якім мэтадам тут зьнішчаецца мова, культура, духоўныя традыцыі народаў (інакш бо „глябалізацыі" ці новага каляніялізму плянэты ня станецца). Гэты мэтад ёсьць *культурны імпэрыялізм* (распаўсюджаньне камэрцыйнай збочанай мас-культуры па рынучных каналах). „Культурны імпэрыялізм", распуста і збочанасьць агрэсіўнай мас-культуры ідуць наперадзе глябалізацыі і здольныя разваліць, зьнішчыць, спаганіць любую чалавечую культуру, „зжэрці" любую мараль, разбэсьціць нармальнае грамадзтва.

Радыкальныя ісламісты ў Аўганістане (талібы) пачалі змагацца з культурным імпэрыялізмам даступным ім варварскім мэтадам (рэпрэсіямі) і вышлі з-пад кантролю супэр-імпэрыі. Праз нейкі час, пад выглядам злаўленьня Бін-Ладэна, які хаваўся ў Аўганістане, Аўганістан як дзяржава** быў сьцерты з твару зямлі тысячамі бомбаў ды ракетаў. Талібы перасталі існаваць.

Вось такое „радыкальнае ўмяшальніцтва", як кажуць у хірургіі. (Дарэчы, а дзе Бін-Ладэн? Але, зрэшты, ня важна, дзе. Галоўнае, што ўсё у парадку і з „правамі чалавека", і з „ідэаламі дэмакратыі" таксама.)

Дадам толькі, што Аўганістан — стратэгічны ключ да Сярэдняй Азіі і ўсяго Ўсходу. Праз яго — ўсе шляхі. Гэта яшчэ Аляксандар Македонскі ведаў, калі туды ішоў рызыкаваць сваёй галавой і арміяй.

Такім чынам, там, дзе паўстае пытаньне аб існаваньні альбо аб становішчы народаў, заўсёды, першым чынам, узьнікае пытаньне аб нацыянальнай культуры. Усім да яе раптам зьяўляецца справа.

Але, можа, у Беларусі інакш, можа тут — нейкае выключэньне з правіла? Можа, і сапраўды, як кажуць саветы, „какая разница?".

Мэта сучаснай, „тэхналягічнай" вайны, гэтак жа, як і мэта традыцыйнай збройна-вайсковай кампаніі — аднолькавыя: захоп нацыянальнай маёмасьці, тэрыторыі і рэсурсаў. Культура сама па сабе менш цікавіць акупантаў, але, каб дасягнуць мэты, ім трэба зьнішчыць культуру. ***Бо культура, мова, гісторыя ёсьць кансалідуючым чыньнікам нацыі.*** Яны злучаюць народ, робяць яго сьведамым дзеля нацыянальных інтарэсаў, спрыяюць адпорнасьці народа пры замаху на ягоную ўласнасьць і свабоду. Без культуры народ раззброены.

Усьлед за стратай нацыянальнай культуры ідзе страта нацыянальнай ўласнасьці. Што гэта абазначае — тлумачыць няма патрэбы. Галечу і выміраньне, беднасьць. Зьнішчыўшы нацыянальную культуру, мову, гістарычную памяць народа, чужынцам значна лягчэй забраць („прыватызаваць", купіць за бясцэн) нацыянальную ўласнасьць, напрацаваную пакаленьнямі, захапіць рэсурсы, фабрыкі ды заводы, зямлю, лясы, дарогі, ваду, нетры, палі ды паветра. Народ становіцца нікім і нічым на сваёй зямлі, якая робіцца ўжо не яго. Чалавек можа пайсьці, праўда, на працу, да новых гаспадароў-акупантаў, бо ім патрэбная будзе танная рабочая сіла. Але на гэтым пэрспэктыва яго і замкнецца.

Савецкага простага беларуса, які кажа „какая разница", ужо рыхтуюць да нявольніцкай пэрспэктывы. Лібэрал-калябаранты да таго ж яшчэ хлусьліва „растлумачаць" яму (па-руску), што, маўляў, ня мае значэньня, чыя ўласнасьць, важна гарантаваная праца, рабочыя месцы, заробкі. І савецкі „пралетар", даведзены да галечы гэтымі калябарантамі ды чужынцамі, павінен (па задуме) узрадвацца, што ўзамен за ягоную нацыянальную ўласнасьць дадуць яму пустыя гарантыі працы на прыбытак рабаўніку. (Як быццам нешта значаць гарантыі беднаму ды слабому.)

(Фота З. Пазьняка)

„Сьвятая Ганна" і „Бернардынец". Вільня, 2001 г.

Ці вось іншы прыклад савецкага. Гандляр, прадпрымальнік робіць грошы, мае фірму. „Быстрэй бы пад Расію, — кажа мне гэты малады нявольнік. — Расійскія законы лушчэ для бізнеса. Тагда і мы паднімемся." Камэнтар непатрэбны.

* * *

Людзі, не аб'яднаныя нацыянальнай памяцьцю, гісторыяй і культурай, якія не разумеюць каштоўнасьці нацыянальнай культуры, страцілі нацыянальную культуру і адчужаныя ад яе, такія людзі ня ў стане валодаць нацыянальнай сьведамасьцю, зразумець нацыянальныя інтарэсы як свае інтарэсы і стварыць нацыянальную дзяржаву. Нават уласнасьць, якой яны асабіста валодаюць, будзе імі страчана ва ўмовах чужынскай акупацыйнай палітыкі, сутнасьць якой ім звычайна таксама — незразумелая.

Беларус, які валодае нацыянальнай сьведамасьцю, беражэ таксама і каштоўнасьці нацыянальнай культуры. Ён разумее: каб мець маёмасьць, памнажаць уласнасьць і стаць заможным, неабходная самастойнасьць і дзяржаўная незалежнасьць.

Каб лепш жыць у народзе, трэба найперш, рупіцца пра свабоду для народа, а не пра грошы для сябе. Бо ня маючы незалежнасьці і свабоды, людзі будуць працай сваёй узбагачаць тых, ад каго залежныя, тых, хто будзе над імі гаспадаром, хто будзе распараджацца ў іхным доме (у іхнай краіне). Калянізатар зацікаўлены ўзбагаціцца коштам і працай нявольніка, а ня тым, каб памножыць яго дабрабыт. У сваёй краіне трэба быць гаспадаром.

Некалі я напісаў для сябе малы верш (нібы зацемку, дзеля памяці):

— Ці хочаш свабоды?
— Хачу — дабрабыт.
— Ня будзеш яго мець.
Бо, каб стаць заможным,
Трэба быць незалежным.

* * *

Велізарнай каштоўнасьцю культуры зьяўляюцца талент і інтэлект нацыі (адукаваныя людзі). Гэтыя акамуляваныя каштоўнасьці зрабіліся ў сучасным сьвеце першаснымі рэсурсамі культурна-эканамічнага разьвіцьця народа (ня нафта, ня газ, не жалезная руда, а менавіта інтэлект).

Адначасна талент і інтэлект даўно ўжо сталі таварам міжнароднага клясу, які зь беларускага боку расходуецца за бясцэн, задарма нават у Афрыку, і проста марнуецца ад таго, што рэальна не існуе ў акупаваным беларускім грамадзтве абароны інтэлекту як нацыянальнай уласнасьці народу. Каб абарона існавала, патрэбна ня толькі незалежная нацыянальная палітыка, але і сьведамасьць нацыянальнага існаваньня.

* * *

Разважаючы пра нацыянальныя каштоўнасьці, зьвернем увагу на паяднаньне іхных духоўных і матэрыяльных кшталтаў. Тут выразна прасочваецца залежнасьць характару матэрыяльнага ўгрунтаваньня грамадзтва ад ўсьведамленьня ім духоўных, маральна-этычных і культурных здабыткаў нацыі.

Аказываецца, што свабода, эканамічнае разьвіцьцё і дабрабыт людзей у нацыянальным грамадзтве апасродкавана залежныя ад кшталтаваньня ў ім найперш духоўных і культурных каштоўнасьцяў нацыі (мовы, гісторыі, культуры, нацыянальных традыцыяў, маралі, этыкі, мастацтва, нацыянальнай ідэі, інтэлекту, усьведамленьне нацыянальных абавязкаў і г.д.).

Зрэшты, яно зразумела само сабой. Але пра дачыненьні культуры неабходна гаварыць. Нават пра самае відавочнае. Бо доўгі савецкі пэрыяд і затым — частковая ягоная рэанімацыя (антыбеларускі рэжым) зьмянілі шмат дзе сам характар думаньня людзей. Шмат каму падсьведама здаецца, што духоўныя інтарэсы ня маюць самакаштоўнасьці, што за ўсялякім духоўным зрухам стаіць матэрыяльны інтэрас.

Можа б яно так і выгляла, калі б чалавек ня жыў духоўным жыцьцём. Першаснасьць у канкрэтных выпадках можа быць дыскусійнай, але агульны вызначальны кшталт культуры, сувязь і ўзаемазалежнасьць — відавочныя.

Прыярытэтнасьць частак можна вызначыць па магчымасьці ўзнаўленьня цэлага. Страціўшы матэрыяльнае, але захаваўшы культуру і дух, усё можна ўзнавіць. Страціўшы культуру і дух, можам страціць і матэрыяльнае. І калі страцім, то без культуры, бяз духу, без ідэі ўжо нічога не адновім.

Бо лепш умець, чым мець, ня ўмеючы. Лепш ведаць, чым валодаць, ня ведаючы. Беларуская культура ёсьць найвялікшы нацыянальны скарб.

15 чэрвеня 2002 г., Варшава.

---

* Нагадаю ізноў, што „варварамі” раней звычайна называлі тыя народы (дзяржавы), якія не стваралі высокай культуры (гэта значыць, духоўнай, не ўжытковай культуры: літаратуры, тэатра, архітэктуры і т.п.), а займаліся, галоўным чынам, вайной, ваенным рабаўніцтвам і заваёўніцтвам. Расея мела характэрныя рысы варварскай імпэрыі. Расейскі Цар Мікалай I, які цараваў у XIX ст., характарызаваў Расею як „ваенную дзяржаву”, а Сталін (у XX-м стагоддзі) рыхтаваў сусьветную рэвалюцыю, заваяваньне Эўропы і Азіі, перабудаваў усю імпэрыю на ваенна-лягерны лад.

** Дзяржаўная ўлада ў акупаваным войскамі НАТО Аўганістане мае фармальны характар і ў сапраўднасьці не выходзіць за межы Кабула.

(Фота З. Пазьняка)

Віленшчына асеньнім днём. 2001 г.

ЛЁГІКА СТРАТАЎ І АДРАДЖЭНЬНЯ

Пры поглядзе на гісторыю беларускага Адраджэньня ўражвае, як упарта яно падымалася ў кожным пакаленьні беларусаў і як аднолькава, штораз больш выраблена, яно вынішчалася імпэрскай машынай Расеі.

Беларускае змаганьне — гэта заўсёды была барацьба авангарда. Тут былі ахвярнасьць, гераізм і сіла духу, і — трагічнае вынішчэньне. Трагічнасьць барацьбы (што на справе абазначае несьмяротнасьць ідэі, вялікасьць прыкладу) падымала на змаганьне наступныя пакаленьні. І ўсё паўтаралася.

Лёгіка і прычыны гэтага паўтору пагібелі пакаленьняў паказваюць на асаблівую выраблeнасьць расейскай палітыкі вынішчэньня беларускага супраціву, на яе змасаваны ўсеабдымны характар. З гэтакай пэрманэнтнай, гіпертрафіраванай злой сілай ня мог парадзіць геройскі, але малалікі авангард. Недастаткова было гераізму, які, пры вузкасьці змагарных колаў і пагібелі змагароў, спараджаў у наступных пакаленьнях мэмарыялізацыю мэнтальнасьці людзей (псіхалёгію аплакваньня і жалю). Патрэбна было стварэньне глыбокай, масавай салідарнасьці ў барацьбе за агульную ідэю.

Беларускаму Адраджэньню ва ўсе часы не хапала шырокага і грунтоўнага асьветніцтва ў грамадзтве. Не былі ўключаныя мэханізмы самаасьветніцтва, не сфармаваны выразны і пазнавальны вобраз ворага; бяду і зло разумелі ў адцягненым (абстрактным) сэнсе.

Асьветніцтва вымагала цяжкай, часамі шэрай, непрыкметнай і будзёнай працы. Але менавіта гэтае асьветніцтва, у першую чаргу, пад корань стараліся зьнішчыць ворагі беларускага Адраджэньня. Замкнутае кола. Як зь яго выйсьці? Пытаньне, якое стаіць перад новымі пакаленьнямі.

* * *

У канцы XVIII стагоддзя, у выніку трох разбораў Рэчы Паспалітай, Беларусь (як інтэгральная, суверэнная частка Рэчы) страціла дзяржаўны суверэнітэт. Уся яе тэрыторыя апынулася пад Расеяй.

Існавалі дзьве галоўныя прычыны страты незалежнасьці. Першая, гэта тая, што Беларусь знаходзілася на ўскраіне эўрапейскай цывілізацыі і стрымлівала агрэсію варвараў: спачатку татара-манголаў і мангольскай Залатой Арды, потым — маскоўцаў і Расейскай імпэрыі, якая вырасла з мангольскага заваёўніцтва.

На ўсход ад Беларусі, за Смаленскам і Дзясной, была яшчэ геаграфічная Эўропа, але па мэнтальнасьці і дзяржаўнаму ўладкаваньню грамадзтва гэта была Азія са зьмешаным канглямэратыўным насельніцтвам, жорсткімі звычаямі і адсталай культурай.

„Мы на самым краі хрысьціянства, — пісаў вялікі Гусоўскі. — Як лес безгалосы, мы пад сякерай.”

Другая прычына: сілавая разьяднанасьць і палітычны канфармізм Эўропы. Цывілізацыйнымі катэгорыямі, гэтак, як Мікола Гусоўскі, думалі ня многія. Можныя эўрапейцы не імкнуліся падтрымаць тых, хто „на краі хрысьціянства” прымаў на сябе ўдары з усходу, а наадварот, клапаціліся аб прыдбаньні новых тэрыторыяў за іхны кошт для сваіх імпэрыяў, уступаючы ў змову з Масквой.

Стагоддзямі змагаючыся паміж двух агнёў, магутная Беларусь абяскровілася. Вялікае Княства Літоўскае было разбурана, Беларусь захоплена Масквой.

* * *

Барацьба за незалежнасьць Вялікага Княства і ўсёй Рэчы Паспалітай пачалася адразу, пасьля канчатковага забору. Паўстаньне Андрэя Тадэвуша Касьцюшкі. Вынікі паражэньня: вынішчэньне краю, рэпрэсіі актыўных людзей, эміграцыя.

Наступная спроба вызваліцца — 1812 год, паход Напалеона. Барацьба з маскоўцамі набывала ўсенародны характар. Ня толькі шляхецкае войска змагалася з расейскім ворагам побач з французкай арміяй, але і беларускія сяляне, мяшчане — зьнішчалі акупантаў. У Менску, напрыклад, мяшчане і шляхта ўзялі ўладу ў свае рукі за тыдзень да заняцьця горада аддзеламі французскага маршала Даву.

Вынікі паражэньня кампаніі, бяздарна прайгранай французамі: рэпрэсіі беларускай шляхты, эміграцыя актыўных людзей.

1830 год — чарговае паўстаньне шляхты і барацьба за незалежнасьць. Зброю ўзялі нават жанчыны. (Геройская Эмілія Плятар.)

У выніку паражэньня гэтага паўстаньня, расейцы, як і пасьля 1794 і 1812, амаль пад корань вынішчылі заможную беларускую шляхту і магнацтва, выгналі іх у эміграцыю, саслалі ў Сібір. Маёнткі і землі рэпрэсаваных паразадавалі рускім памешчыкам, фаварытам рускага двара. Тых, што ацалелі, узялі пад нагляд, пазбавілі права перамяшчэньня, маёнткі абклалі непасільнымі рэпарацыямі, штрафамі і штогадовымі выплатамі ў акупацыйную казну.

У гэты час (1831-1839) была зьнішчаная і патопленая ў крыві найбольш пашыраная беларуская рэлігія (канфэсія) — Вунія (80% вернікаў), спаленыя тысячы беларускіх кніг і сьвятых абразоў, зьнішчаныя і разрабаваныя кляйноты, разбураныя сьвятыні, манастыры. У 1840 годзе забароненая беларуская мова і назва краіны — Беларусь.

Уся беларуская барацьба за свабоду да паловы XIX стагоддзя вялася шляхтай пад сьцягам аднаўленьня незалежнасьці краіны, адраджэньня Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

* * *

У сярэдзіне XIX стагоддзя змаганьне за незалежнасьць працягвала ацалелая дробная шляхта, што стаяла найбліжэй да сялянства.

Пачаўся новы, шляхецка-народніцкі этап змаганьня, пагрунтаваны ня толькі на саслоўна-дзяржаўнай ідэі свабоды, але і на этнічна-культурным, моўным адзінстве. (Тыповым прадстаўніком і вястуном шляхецка-народніцкай беларускай пазыцыі быў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.)

Менавіта ў гэты час назва „Беларусь” пачынае ўжывацца як новы нацыянальна-кансалідуючы тэрмін, назоў народа і ўсёй краіны, што гістарычна склалася як Літва (Вялікае Княства Літоўскае).

1863 год. Студзенскае паўстаньне. Узьнялася дробная шляхта (апошняя рэзэрва збройнага супраціву), якую месцамі падтрымалі сяляне-касіянеры. Кастусь Каліноўскі, стоячы на грунце Вяліка Княства, выяўляў у сваёй пазыцыі ўжо і народніцкую ідэю Беларусі. Ідэю нацыі.

Вынікі паражэньня студзенскага паўстаньня. Тысячы шляхецкіх змагароў пакараныя сьмерцю, тысячы адпраўленыя на катаргу, больш 30 тысячаў навечна сасланыя ў Сібір і казахскія стэпы. Іхныя маёнткі і землі — забраныя пад Расею,

на ўласнасьць накладзеныя непасільныя выплаты ў рускую казну і рэпарацыі. За падазронымі ўстаноўлены паліцэйскі нагляд, абмежаванае права выезду з маёнтку. Маса дробнай шляхты, спосабам бюракратычных маніпуляцыяў, была пазбаўлена шляхецтва і пераведзеная ў сялянства.

* * *

На гэтым (з фізічным і сацыяльным вынішчэньнем шляхты) фактычна, скончылася цэлая эпоха шляхецкага збройнага змаганьня за незалежнасьць і аднаўленьне Вялікага Княства.

Пачаўся новы этап беларускага Адраджэньня, этап беларускай ідэнтыфікацыі і нацыянальнай кансалідацыі грамадзтва.

Фармуецца новая нацыянальная эліта з ацалелай шляхты, сялянства і мяшчанаў, але вызначальную ролю адыгрывалі выхадцы са шляхты. Галоўным прынцыпам вызваленьня робіцца нацыянальнае асьветніцтва і палітычная дзейнасьць. Найбольшыя надзеі на Адраджэньне нацыі зьвязваюцца зь беларускай вёскай. Апірышча на інтэлігенцыю. З пачаткам XX-га стагоддзя і да Першай Сусьветнай вайны беларускі нацыянальна-адраджэнцкі рух набывае ўжо значны размах.

* * *

1914 год, вайна. Расейскія ўлады аб’яўляюць спачатку ўсеагульную мабілізацыю, а потым, з разгортваньнем нямецкага наступленьня (1915 год), абавязковую эвакуацыю насельніцтва, асабліва інтэлігенцыі, інтэлектуальных пластоў грамадзтва, спэцыялістаў. Пры адступленьні рускай арміі з Беларусі загадана было ўсё спальваць і зьнішчаць: запасы прадуктаў, жыўнасьць, збожжа на палях, сады, студні; гарэлі вёскі і масты; выганялі людзей ў Расею.

Пасьля вайны сталі відавочнымі велізарныя матэрыяльныя страты Беларусі. Загінула каля паўтара мільёна беларусаў.

Аднак беларускае нацыянальнае Адраджэньне расейцам спыніць не ўдалося. 25 Сакавіка 1918 года аб’яўлена незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі. Расейцы не змаглі перашкодзіць. Беларуская дзяржава аднавілася ў нямецкай зоне акупацыі, калі вайна хілілася да заканчэньня.

* * *

Утварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі і аб’яўленьне незалежнасьці БНР перакрэсьліла ўсю зьнішчальную працу расейцаў у Беларусі за XIX стагоддзе. Высновы яны зрабілі адразу. Галоўнай небясьпекай для ўлады расейскага бальшавізму ў Беларусі яны палічылі Беларускае нацыянальнае Адраджэньне і найпераш — Раду БНР.

У самым канцы 1918 года Беларуская Народная Рэспубліка была акупаваная рускім бальшавізмам. У 1921 годзе, у выніку Рыскай змовы, расейцы і палякі падзялілі Беларусь на дзьве часткі. Утварыліся дзьве зоны акупацыі. Ва ўсходняй частцы Беларусі засталася фармальна існаваць БССР — марыянэткавае дзяржаўнае ўтварэньне.

Франтальны наступ на ўсё беларускае пачаўся ў другой палове 20-х гадоў. Ён меў усеагульны характар: у БССР, у зоне польскай акупацыі (Заходняя Беларусь) і ў эміграцыі, дзе дзейнічала маскоўская разьведка супраць БНР.

Рэпрэсіі канца 20-х пачатку 30-х гадоў пачаліся са зьняцьця спэктакляў у беларускіх тэатрах, закрыцьцём беларускіх часопісаў, з перасьледу творчай інтэлігенцыі і закончыліся масавымі арыштамі і высылкамі найбольш актыўных, творчых і адукаваных беларусаў на расейскую Поўнач, у Сібір, у расейскія турмы, на пасяленьне ў Расею і г.д.

У другой палове 30-х гадоў узьнялася новая хвала расейскіх вынішчэньняў на Беларусі, найбольш жорсткая — клясычны генацыд. Акрамя таго, што забівалі і расстрэльвалі тых беларусаў, якія былі адукаваныя, працавітыя, маёмныя, паходзілі са шляхты, валодалі талентам, займалі пасады ў адміністрацыі і г.д., адбывалася яшчэ плянавае масавае вынішчэньне людзей па тэрытарыяльна-бюракратычнаму прынцыпу („спускалі” разнарадкі на арышт на кожны сельсавет, акругу, вобласьць ці вёску і г.д.).

У выніку — забілі мільёны беларусаў, амаль поўнасьцю вынішчылі беларускую адміністрацыю, заможных гаспадароў, творчую інтэлігенцыю, пісьменьнікаў, мастакоў, настаўнікаў, практычна, усіх адраджэнскіх палітыкаў. Да пачатку Другой Сусьветнай вайны беларускае Адраджэньне ў БССР было цалкам разгромлена, дзеячы расстраляныя.

Перад вайной дабівалі беларускую інтэлігенцыю і актыўнае насельніцтва таксама ў Заходняй Беларусі. Гэтую справу аднак (вымардаваньне Заходняй Беларусі) расейцы не пасьпелі закончыць, бо пачалася вайна.

* * *

У часе вайны, дзякуючы сваістаму зьбегу абставінаў (прыхільнасьць цывільнай адміністрацыі Вільгельма Кубэ) адбылося станаўленьне беларускіх незалежніцкіх сілаў, кароткае, але моцнае беларускае Адраджэньне, якога, бадай (па аднадушнаму сьведчаньню эміграцыі), Беларусь ня мела ні пры адной акупацыі. Пасьля вяртаньня бальшавіцкіх акупантаў тысячы беларускіх дзеячоў гэтай генэрацыі эмігравалі на Захад, а на Беларусі з новай сілай аднавіліся рэпрэсіі, арышты і расстрэлы людзей. Найперш — зьвязаных зь беларускім рухам.

Пачалася цёмная ноч беларускай нацыі. Зьнішчана, вытаптана, сфальшавана, забаронена было ўсё, што зьвязана з беларускай незалежнасьцю і змаганьнем за вольную Беларусь. Практычна, была амаль цалкам зьнішчана гістарычная памяць нацыі і ўяўленьні людзей аб палітычным змаганьні за Беларусь.

Некалькі пакаленьняў беларусаў, што выжылі, прапушчаныя праз сталінска-хрушчоўска-брэжнеўскую сістэму адукацыі і прапаганды, ня мелі ўжо ніякага паняцьця пра беларускую свабоду і незалежнасьць, пра Беларускі Сьцяг і Гэрб *Пагоня*, пра БНР ды беларускае войска.

* * *

Цяпер зьвернем увагу на палітыку і мэтодыку зьнішчэньня Беларусі і беларускага нацыянальнага Адраджэньня, якую ўжывала раней і практыкуе цяпер Расея. Акрамя зьнішчэньня беларускай мовы, здабыткаў культуры, рэлігіі (ліквідацыя Вуніі), адабраньня маёмасьці і стварэньня ўмоваў для беднасьці насельніцтва, галоўную ўвагу Расея зьвяртала найперш на вынішчэньне ў Беларусі людзей, якія здольныя былі падняць край на змаганьне з акупантамі і забясьпечвалі краіне культурна-эканамічную магутнасьць.

Гэтак на працягу ўсяго XIX стагоддзя царат пасьлядоўна вынішчаў беларускую шляхту. Збройна змагацца і падымаць краіну на ваенную барацьбу магла толькі шляхта. Шляхта была на Беларусі свабоднай і шматлікай. Яе галоўная задача ў мірны час: ажыцьцяўленьне ўлады, памнажэньне багацьця і культуры. У ваенны час — абарона Бацькаўшчыны, стварэньне войска. Пакуль існавала вольная шматлікая шляхта, акупанты не маглі лёгка зьнішчыць Беларусь і ня мелі гарантыяў, што ўтрымаюць за сабой захопленую беларускую тэрыторыю.

Паўторым: шляхта ў Беларусі не перарасла натуральным шляхам у новую супольнасьць, не інтэгравалася ў сучаснае грамадзтва, разьвіваючыся разам зь ім. Яна была адмыслова

зьнішчаная фізічна і рэпрэсіўна (і часткова — адміністрацыйна) царскай Расеяй, як масавая сацыяльная група.

Расейцы зьмянілі структуру беларускага грамадзтва, прадумана пазбавіўшы яго актыўнай баёвай інтэлігентнай і незалежнай сілы. (Мы не разглядаем тут пытаньне палянізацыі шляхты. Яно ў гісторыі перабольшанае. Калі пачынаецца нацыянальнае Адраджэньне, культурна-асіміляцыйныя меры, як правіла, рассыпаюцца. Пра гэта сьведчыць гісторыя нацыянальнага Адраджэньня іншых краінаў, напрыклад, Чэхіі, Вэнгрыі, Балгарыі, Малдовы і г.д., ды й Беларусі таксама.)

* * *

Беларускае Адраджэньне, абапертае на беларускай Нацыянальнай ідэі, разьвівалася ў пачатку ХХ-га стагоддзя і фармавалася яшчэ амаль выключна выхадцамі са шляхты і шляхецкай інтэлігенцыі. Але яно мела выразны сацыяльна-народніцкі (сацыялістычны) характар і арыентавалася на рэальны народны патэнцыял — на беларускае сялянства, якое складала ў 90-х гадах XIX стагоддзя каля дзевяноста адсоткаў насельніцтва. У ім беларускія адраджэнцы справядліва бачылі нацыянальную будычыню Беларусі. Таму яны ставілі задачу вызваліць сялянства сацыяльна (даць зямлю і эканамічную свабоду), прасьвяціць культурна-нацыянальна, адкрыць шляхі да адукацыі, палітыкі і вытворчасьці.

У беларускай мастацкай літаратуры таго часу нават словы „беларус” і „мужык” (селянін) часам атаясамліваліся. Гэтак моцная была нацыянальная арыентацыя на сялянства, і гэтак выразна выяўляліся сацыялістычна-народніцкія ўплывы ў адраджэнскай ідэялёгіі.

* * *

Але што робяць рускія бальшавікі адразу пасьля акупацыі Беларускай Народнай Рэспублікі? Яны пачынаюць мэтанакіравана зьнішчаць усю беларускую інтэлігенцыю, што была не з бальшавікамі і ўсіх беларусаў — выхадцаў са шляхты і маёмных пластоў насельніцтва. Па „клясавай” прыкмеце. (Расстрэлы і тэрор расейскіх „чрэзвычаек” у 1919-м, 1920-м гадах.)

Зьнішчэньне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі было давершана ў 30-х гадах. У гэты ж час мэтадам усеагульнай калектывізацыі і рэпрэсіяў было задушана беларускае сялянства. У першай палове ХХ-га стагоддзя, шляхам генацыду, рэпрэсіяў, этнацыду і тэрору, расейцы ў чарговы раз (гэтак жа, як і ў XIX стагоддзі) разбурылі і зьнішчылі сацыяльную структуру беларускай нацыі, абапертую на ўласнасьць, на зямлю і традыцыі культуры. Гэта значыць, зноў былі ліквідаваныя нацыянальна-пэрспэктыўныя пласты грамадзтва.

Цяперашнія абаронцы расейскай тэрарыстычнай палітыкі ўсё ськідваюць на бальшавікоў. Маўляў, яны і ў Расеі рабілі тое самае. Аднак тое — ды ня тое. *Плянавасьць і пасьлядоўнасьць выніштэньня па культурна-этнічнаму прынцыпу мы назіраем толькі на нярускіх тэрыторыях (у Беларусі, на Ўкраіне, на Каўказе, у Казахстане і г.д.).*

Але ня менш істотна іншае. Бальшавікі ўзначалілі рускую ўладу і рускую дзяржаву, яны ўмацавалі рускую імпэрыю і рускі таталітарызм. Зьнішчаючы маёмныя станы ў Расеі, праводзячы калектывізацыю і рэпрэсуючы дзеячоў навукі і культуры, яны таксама дэфармавалі сацыяльную структуру расейскага грамадзтва. Але ад гэтага яно не пераставала быць рускім. Ніхто не перасьледваў і не забараняў рускую мову, нікога не каралі за рускі нацыяналізм, за вялікадзяржаўнасьць. Наадварот, бальшавікі скарысталі камуністычную дактрыну і ўмацавалі гэтую рускую вялікадзяржаўнасьць, як ніколі. Давялі яе да абсалюту і аб’явілі пра пабудову камунізму ў адной асобна ўзятай краіне, дзе ў канцовым выніку ўсе павінны былі размаўляць на адной рускай мове і складаць адзіны „савецкі” (разумей „рускі”) народ.

Бальшавіцкія рэпрэсіі ўнутры Расеі ня мелі антырускага, антынацыянальнага (антынацыяналістычнага) характару. Бальшавікі не забівалі за рускую нацыянальную ідэю, не змагаліся з рускай нацыянальнай культурай. Усе іхныя рэпрэсіўныя дзеяньні былі накіраваныя выключна на ўмацаваньне абсалютызму сваёй рускай (камуністычнай, групавой) улады і рускага таталітарызму. (Нездарма некаторыя рускія эмігранты-шавіністы, ненавідзячы бальшавікоў, часам хвалілі іх за тое, што яны ўратавалі Расею ад распаду.)

Менск. 1996 год.

Тым часам зусім другая карціна рэпрэсіяў і тэрору назіралася ў Беларусі. Першае, тут былі выразна акрэсьленыя „ворагі” — беларускія нацыянальсты. Пад гэтай маркай рускія вынішчалі ўсё беларускае (размова па-беларуску таксама трактавалася як праява беларускага „буржуазнага нацыянальзму”). Другое, усялякае нібыта „клясавае” вынішчэньне беларускай інтэлігенцыі, адміністрацыі, нашчадкаў шляхты, заможных сялян, якое падавалася як зьнішчэньне „клясавых ворагаў”, было на Беларусі не ўнутраным „тэрорам улады”, як у Расеі, а клясычным генацыдам на чужой акупаванай тэрыторыі, забіваньнем людзей па нацыянальнай прыкмеце, вымардаваньнем беларускай нацыі.

Беларусь была акупаванай краінай, уладу на Беларусі трымалі рускія бальшавікі, якія выконвалі тут палітыку Масквы.

Паўторым: тут быў ня ўнутраны тэрор нацыянальных уладаў незалежнай краіны, як у Расеі (дзе ён не ўплываў карэнным чынам на пэрспэктывы існаваньня дзяржавы і нацыі і нават рускай нацыянальнай культуры). Тут было вынішчэньне беларусаў на беларускай акупаванай зямлі, людабойства, зьнішчэньне асобнага народа, ліквідацыя ягонай будучыні, магчымасьці існаваць і разьвівацца ў гісторыі. Справу забітых беларускіх паэтаў, палітыкаў, адраджэнцаў не заступіў ніхто. А на месца зьнішчанай беларускай адміністрацыі прыслалі рускіх з Расеі (альбо паставілі мясцовых, што адмовіліся ад роднай мовы і культуры і дапамагалі акупантам у вылюдненьні і русіфікацыі краіны).

Нельга ставіць знак роўнасьці паміж унутраным бальшавіцкім тэророрам у Расеі і расейска-бальшавіцкім генацыдам у Беларусі. Гэта розныя зьявы. Тут былі розныя мэты, задачы і розныя вынікі. (Не адно і тое, калі гіены грызуцца паміж сабой і паядаюць сабе падобных — і калі яны ўсе разам грызуць антылопу.)

Бальшавізм (камунізм) — гэта была найбольш агрэсіўная форма рускага імпэрыялізму, які Расея скарыстала дзеля вынішчэньня паняволеных нярускіх народаў і акупаваных краінаў. Галоўная звышзадача ў гэтай імпэрскай палітыцы рускіх вялікадзяржаўнікаў — ня даць падняцца ў будучыні, ня даць магчымасьці адрадзіцца Беларусі.

* * *

У 50-70 гады праводзілася ідэалягічнае замацаваньне разгрому беларускага Адраджэньня. Некалькі пакаленьняў беларусаў было выхавана савецкай сістэмай адукацыі ў поўным няведаньні сапраўднага мінулага Беларусі, у хлусьлівых уяўленьнях пра нібыта непаўнавартаснасьць беларускай культуры, беларускай мовы і беларускага народа, які (як сцьвярджалі савецкія прапагандысты) быццам бы ніколі ня меў дзяржавы і ня здольны быў яе стварыць, ды вечна цягнуўся да Расеі, каб быць разам.

Галоўнае дзеяньне і генэральны плян рускай палітыкі на Беларусі (пасьля ліквідацыі і калгаснай дэфармацыі сялянства) заключаўся ў вынішчэньні этнічных карэньняў беларускай культуры (гэта значыць, ізноў той жа асновы, якая магла б паспрыяць аднаўленьню ідэяў нацыянальнага Адраджэньня). Фальклярысты, этнографы, знаўцы народнай культуры, хто памятае тыя часы, ведаюць, якія перашкоды рабіліся ў тым, каб існаваў беларускі аўтэнтычны фальклёр, каб распаўсюджвалася інфармацыя пра яго, накопліваліся веды, перадаваліся традыцыі.

Але гэта была палітыка, якая вынікала толькі з пазыцыйнага, тактычнага зьместу ў ліквідацыі беларускага этнасу. Стратэгічны ж плян быў апрацаваны ў шырокім маштабе ў 1964 годзе. Ён заключаўся ў тым, што 73 адсоткі беларускіх вёсак (25 тысячаў з 34-х тысячаў) аб'яўляліся „непэрспэктыўнымі". Іх плянавалася зьнесьці (пабудову перанесьці ў іншае месца альбо зьнішчыць), а людзей перасяліць у вызначаныя зьверху „цэнтральныя" паселішчы.

Як бачым, гэта плян каласальнага структурнага разбурэньня беларускай нацыі (сотні чарнобыляў), у выніку якога была б канчаткова дабіта этнічна-гістарычная і звычаёвая культура беларускага народа. Бо ўсё астатняе ў грунце рэчы — ужо, паркотычна, да таго часу разбурылі. (Заўважым агульнавядомае, што традыцыйная народная культура існуе і разьвіваецца толькі пры ўмове, што носьбітам яе ёсьць пастаяннае насельніцтва на пастаяннай тэрыторыі.)

Плян вымагаў неверагодна вялікіх сродкаў. З эканамічнага боку ён выглядаў абсурдным, з сацыяльна-культурнага — антычалавечым. Тым ня менш Масква, ня гледзячы на патрэбу вялікіх фінансавых затратаў, узялася яго ажыцьцяўляць. І толькі крызіс камуністычнай сістэмы прытармазіў тэмпы зьнішчэньня беларускай вёскі. Далейшы распад СССР пакуль што ўратаваў беларусаў ад сацыяльна-культурнай катастрофы.

* * *

Ужо ў 70-х гадах, практычна, уся кампартыя на Беларусі (складвалася ўражаньне, што ўсе, да аднаго чалавека) і, як можна меркаваць, бальшыня КГБ былі перакананыя, што пасьля вынішчэньня, якое яны зрабілі, Беларусь памерла, ніколі ўжо не падымецца і не ўваскрэсьне. Яны былі ашарашаныя, зьдзіўленыя і зьбянтэжаныя, калі ў 1988-1991 гадах Беларусь уваскрэсла разам з *Пагоняй* і *Беларускім Бел-Чырвона-Белым Сьцягам,* разам з узьнікненьнем Беларускага Народнага Фронту. Калі ж зьбянтэжанасьць мінула, то Масква добра прааналізавала сітуацыю і адразу ўбачыла нешматлікасьць адраджэнскага авангарду ў Беларусі.

Неўзабаве крамлёўскі кантроль над Беларусяй быў вернуты. Масква правяла на прэзыдэнта краіны свайго стаўленьніка, абапершыся на савецкі КГБ, на савецкую каляніяльную адміністрацыю (былую камуністычную намэнклятуру) і на той дэфармаваны канглямэрат савецкага насельніцтва, якое засталося пасьля рэпрэсіяў, генацыду, калектывізацыі і савецкай школы. Стаўленьнік забясьпечыў умовы для ўнутранага захопу ўлады ў Беларусі прамаскоўскімі функцыянерамі і спэцслужбамі Расеі.

Вайна Расеі ў Беларусі — гэта адмысловая дзейнасьць спэцслужбаў КГБ-ФСБ, пры дапамозе якіх была захоплена ўлада знутры і ажыцьцёўлена ўнутраная акупацыя краіны. Задача унутранай акупацыі — развал нацыянальнай экономікі і зьнішчэньне беларускай культуры знутры, падрыхтоўка такім чынам захопленай краіны да здачы пад Расею. (Зараз, у 2002 годзе, расейцы рыхтуюць захоп беларускай нацыянальнай маёмасьці, адкрыта аб'явілі пра пэрспэктыву анэксіі Беларусі.)

Але вернемся да палітыкі і мэтодыкі зьнішчэньня расейцамі беларускага Адраджэньня. Што новага зьявілася ў дзейнасьці непрыяцеляў Беларусі пасьля таго, калі, ня гледзячы на тое, што яны зьнішчылі і разбурылі на Беларусі амаль усё, беларуская нацыя (і дзяржава) раптам пачалі адраджацца і ў 1991 годзе Беларусь вярнула незалежнасьць?

Схема выглядае так. Захоп улады, зьнішчэньне нацыянальных дзяржаўных сымвалаў (гэрб, сьцяг) і духоўных цэнтраў, мэмарыяльна-сакральных месцаў (Курапаты), нацыянальнай мовы, нацыянальнай школы і адукацыі, літаратуры і мастацтва, разбурэньне эканомікі, захоп нацыянальнай маёмасьці і нацыянальных рэсурсаў, ліквідацыя нацыянальнай фінансавай сістэмы, зьнішчэньне нацыянальна актыўных людзей, дэградацыя і замена насельніцтва.

На першы погляд, мы бачым як бы стандартны імпэрска-крымінальны набор, але ёсьць і новае. Па-першае, фатальнае выкарыстаньне Чарнобыльскай катастрофы ў палітыцы дэградацыі і замены беларускага насельніцтва. Гэта вельмі страшная і, бадай, найбольш небясьпечная і найбольш антычалавечая зьява. Прытым Расея тут можа мець саюзьнікаў на Захадзе — міжнародную атамную карпарацыю МАГАТЭ.

Другое, гэта ліквідацыя адукацыі, зьнішчэньне і стварэньне штучнага адплыву інтэлекту зь Беларусі, марнатраўства і рабаваньне інтэлектуальнай уласнасьці нацыі.

Бальшавікі стварылі сваю сістэму адукацыі і навукі. Аб'яднаўшы адукацыйны працэс з ідэалёгіяй і прапагандай, яны спадзяваліся выхаваць у Беларусі інтэлектуальных мамелюкаў, імпэрскіх людзей (саветаў) бяз памяці, бяз Бога і

без нацыянальных паняцьцяў культуры, ненавісьнікаў беларушчыны.

Аднак аказалася, што ня так проста кіраваць інтэлектам. Імпэрыі вынішчэньня хацелася, каб гэтага інтэлекту ў беларусаў увогуле не было. Цяперашняя палітыка прамаскоўскага рэжыму (і дарэчы, акупацыйны кантроль над адукацыяй) накіраваныя на інтэлектуальнае вынішчэньне нацыі, на ператварэньне Беларусі ў краіну трэцяга сьвету, цалкам залежную ад чужых тэхналёгіяў і ад чужой вытворчасьці, краіну бедных, пасіўных людзей.

Цалкам новымі зьявамі ў барацьбе зь беларускім Адраджэньнем і беларускай нацыянальнай дэмакратыяй зьяўляецца стварэньне на Беларусі адмысловай, кантралюемай Расеяй (найперш, спэцслужбамі) так званай „дэмакратычнай апазыцыі" (у грунце сваім — прамаскоўскай). А таксама кантралюемага рускімі спэцслужбамі так званага „незалежнага" апазыцыйнага друку.

Рускія спэцслужбы настваралі тут нават сваіх апазыцыйных арганізацыяў (у рэчышчы каляніяльнай апазыцыі), над якімі ажыцьцяўляюць кантроль праз агентуру і розных „каардынатараў". (Гэта ўтварэньні тыпу „Хартыя-97", „Зубр", „Край", „Белы легіён", шэраг партыяў і інш.)

Бальшавікі такімі мэтадамі, практычна, не карысталіся і ня бавіліся ні ў якую „дэмакратыю".

Але найбольш заблытала, дэзінфармавала беларускае грамадзтва іншая новая зьява ў маскоўскай антыбеларускай палітыцы. Гэта супрацоўніцтва з заходнімі палітычнымі русафіламі і міжнароднымі лібэральнымі арганізацыямі. Адмоўную ролю ў змаганьні супраць беларускай нацыянальнай дэмакратыі адыграла Місія АБСЭ ў Менску, і асабліва яе кіраўнік у 1998-2001 гадах — прафэсійны нямецкі разьведчык Ганс-Георг Вік.

Ганс Вік апасродкавана прычыніўся да расколу Беларускага Народнага Фронту, які адбыўся ў 1999 годзе, быў фактычным ініцыятарам і арганізатарам антыадраджэнскай каляніяльнай „апазыцыі", арыентаванай на супрацоўніцтва з Масквой (рускай „дэмакратыяй"). *Стварыўшы такую „апазыцыю" (якая фінансавалася з Захаду і з Усходу праз гранты і т.п.), Захад і Масква мелі кантроль над яе дзеяньнямі.*

У сфэру кантролю расейскіх спэцслужбаў і розных лібэральных актывістаў з Захаду патрапіў, фактычна, увесь (за рэдкім выключэньнем) так званы „незалежны" друк у Беларусі, радыё „Свабода" (беларуская рэдакцыя) і іншыя інфармацыйныя цэнтры.

Нельга сказаць, каб уся гэтая псэўдадэмакратычная „мабілізацыя" адразу абрынулася на Народны Фронт і беларускае Адраджэньне, як некалі, за КПСС, рабілі камуністы. Тут мэтады больш выраблены: выбарачныя нападкі і выбарачная дэзінфармацыя. Але самы відавочны агульны прыём (дзе найбольш і відаць зададзенасьць), — гэта замоўчваньне дзейнасьці, справаў і падзеяў Беларускай нацыянальнай дэмакратыі (Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ і інш.). Узамен — штучнае разьдзьмухваньне пабочнага нібыта „канфлікту" паміж Лукашэнкам і каляніяльнай „апазыцыяй" (пра якую сам Лукашэнка, дарэчы, выказаўся, што калі б такой „апазыцыі" не было, то трэба б было яе спэцыяльна прыдумаць.)

Стварыўшы і фінансуючы прамаскоўскую „дэмакратычную апазыцыю" (куды ўваходзяць нават камуністы), Ганс Вік і ягоныя калегі на Ўсходзе і на Захадзе атрымалі магчымасьць адметным чынам кантраляваць праз яе рэжым Лукашэнкі, дэзынфармаваць беларускае грамадзтва і міжнародную супольнасьць пра рэальнае змаганьне і рэальны канфлікт на Беларусі, адцягваючы на сябе (праз „незалежныя" СМІ) і на псэўдадзейнасьць гэтай „апазыцыі" ўсю інфармацыйную ўвагу. Барацьба беларускіх нацыянальна-дэмакратычных сілаў з акупацыйнай палітыкай за свабоду і незалежнасьць Беларусі ў выніку як бы выпадае з інфармацыйнага поля. Бо беларускі адраджэнскі друк (з закрыцьцём газэты „Пагоня") ужо, практычна, зьнішчаны.

Сімптаматычна, што Ганс Вік здолеў супрацоўнічаць і з кіраўніцтвам рэжыму Лукашэнкі, непасрэдна прычыніўся да выгнаньня апазыцыйнага старшыні Вярхоўнага Савета 13-га скліканьня Сымона Шарэцкага зь Беларусі і зь вялікай палітыкі (паколькі той ня стаў упісвацца ў схемы Бэрліна і Масквы).

У верасьні 2000 года, на канфэрэнцыі ў Беластоку, спаўняючы пэўную зададзенасьць, Ганс Вік публічна засьведчыў, што сваёй дзейнасьцю ў АБСЭ на Беларусі ён спрыяў палітыцы ўключэньня Беларусі ў склад Расеі.

18 лістапада 2000 года Беларускі Народны Фронт і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ аб'явілі Ганса Віка пэрсонай нон-грата на Беларусі. Яму прапанавалі пакінуць краіну. Пра гэтае рашэньне былі афіцыйна паінфармаваныя АБСЭ, Парляманцкая Асамблея АБСЭ, амбасада Нямеччыны ў Беларусі, Міністэрства замежных справаў Нямеччыны, Эўразьвяз і іншыя міжнародныя арганізацыі.

Ня гледзячы на тое, што падвойная дзейнасьць Ганса Віка ў Беларусі была ўжо выкрыта, ён паводзіў сябе як ні ў чым ні бывала, а рэжым Лукашэнкі, ягоная „апазыцыя", міжнародныя структуры і так званыя „незалежныя" СМІ рабілі выгляд, што нічога не адбылося.

Гэта дазволіла спадару Віку амаль свабодна плянаваць сваю апошнюю афёру ў Беларусі — прызнаньне „дэмакратычнасьці" выбараў прэзыдэнта ў 2001 годзе і легалізацыю рэжыма Лукашэнкі. Пры ўхваленьні з боку Віка і АБСЭ (і адпаведна, Масквы) была створана „пяцёрка" прамаскоўскіх кандыдатаў на прэзыдэнта Беларусі з былой камуністычнай намэнклятуры, а потым пакінута кандыдатура самага шэрага зь іх, камуна-савецкага функцыянера У. Ганчарыка (які ня мог быць рэальным супернікам Лукашэнкі). Для фальсіфікацыі і выграньня выбараў Лукашэнку стварылі выдатныя ўмовы і слабога псэўда-суперніка.

Аднак Лукашэнка перастараўся. Фальсіфікацыя была праведзена ім настолькі маштабна, груба, нахабна, татальна і бессаромна, што прызнаць выбары не было як. Акрамя таго Ганс Вік, вядучы падвойную гульню, ня мог эфектыўна ўплываць на назіральнікаў за выбарамі, якія паўсюдна зафіксавалі грубыя парушэньні.

Камісія АБСЭ, якая (відаць па ўсім) прыехала ў Беларусь з гатовымі фармулёўкамі аб прызнаньні выбараў, вымушана была скарэктаваць свае намеры і сказаць пра недэмакратычнасьць выбараў 2001 года ў Беларусі.

Ганс Вік пацярпеў частковае фіяска. Лукашэнка застаўся ў крэсьле, але выбары сьвет не прызнаў.

Закончылася ўсё даволі камічна. Ня гледзячы на супрацоўніцтва і „заслугі" Г. Віка, Лукашэнка ня даў яму ўязной візы і не пусьціў больш у Беларусь. Гэтакае цыганска-гэбоўскае вераломства. Маўляў, вы сваю справу зрабілі, спадары, дзякуй, вы вольныя. Місія АБСЭ таксама больш непатрэбная начальніку з усходняй мэнтальнасьцю.

Можа ўзьнікнуць пытаньне аб прычынах падвойнай „працы" Ганса-Георга Віка і пра сутнасьць агульных інтарэсаў Бэрліна і Масквы ў Беларусі. Гэта тэма асобнай размовы. Але можна сказаць, што тут справа ідзе пра незалежнасьць Беларусі, і пра транзіт, і пра канцэрн Рургаз-Газпром, і пра „калідор" праз

Польшчу, і пра інтарэсы Масквы за Бугам, а Бэрліна — у Калінінградзкай вобласьці, і пра ськідваньне „лішняга насельніцтва” з былой Усходняй Прусіі ў Беларусь (аналягічна, як гэта было ў 1990-1991 гадах — з Усходняй Нямеччыны), і пра ськідваньне ў Беларусь атамных адыходаў ды расейска-эўрапейскага сьмецьця і шмат пра што іншае, да чаго не дадумаецца звычайны беларус, але плянуюць злыдні.

Шкода, якую спадар Ганс-Георг Вік, сумесна зь Місіяй АБСЭ ў Менску, зрабіў для беларускай нацыянальнай дэмакратыі, беларускага Адраджэньня і для Беларусі — велізарная і ўтрымлівае ў сабе элемэнты злачынства, вымагае рассьледваньня, сьледзтва і разьбіральніцтва ў судзе.

* * *

Падсумоўваючы страты Беларускага Адраджэньня, мусім сказаць, што сытуацыя пасьля ўсяго, што натварылі на Беларусі расейцы за дзьвесьце гадоў акупацыі, няпростая. Найгорш, што непрыяцелі моцна і неаднаразова пабурылі сацыяльна-культурную структуру беларускага грамадзтва, зламалі сацыяльна-культурныя мэханізмы, ператварылі насельніцтва ў не прывязаных да месца людзей, моцна вынішчылі нацыянальную інтэлігенцыю, ідэёвых асобаў і змагароў. Беларускую нацыю пазбавілі сацыяльных апірышчаў, у грамадзтве не засталося моцных, стабільных, сацыяльна ўгрунтаваных групаў людзей, няма рэальных і нармальных дачыненьняў уласнасьці, вольных прафэсіяў і г.д. Ня кажам ужо пра нацыянальную сьведамасьць, культуру, рэлігійнасьць насельніцтва.

Тым ня менш Масква (нават пры дапамозе Нямеччыны) не дасягне, чаго хоча. У Беларусі ёсьць магчымасьці зьберагчы незалежнасьць, зьмяніць унутраныя абставіны (у тым ліку, і ўладу) да лепшага і выйсьці на вышэйшы ўзровень нацыянальнага разьвіцьця.

Аднак беларусы мусяць добра ведаць сваю гісторыю і разьбірацца ў гісторыі змаганьня за сваю незалежнасьць, дзяржаву, свабоду і нацыянальнае разьвіцьцё.

Беларусы павінны ведаць, хто іхны прыяцель у сьвеце, а хто — непрыяцель, мусяць разумець, найперш, палітыку Расеі ў дачыненьні да Беларусі, каб правільна арыентавацца, змагацца, адстойваць, абараняць сябе і сваю краіну.

* * *

Адзін з унівэрсальных сучасных шляхоў дзеля ўзмацненьня абароны і сілы нацыі ёсьць нацыянальная асьвета і адукацыя. ***Беларускае Адраджэньне ня будзе моцным без нацыянальнага асьветніцтва***. У цяжкі час трэба зьвярнуць вялікую ўвагу на ўзровень і становішча розумаў, калі хочам сур’ёзна супроцьстаяць несвабодзе і чужынскай навале. Каб эфэктыўна змагацца, трэба падрыхтаваць добрыя сілы, не марнаваць час і вызначыць прыярытэты. Гістрыя паказвае, што ***ў палітычнай барацьбе перамагае ня толькі сіла зброі ды грошай, але, найперш, — узровень розуму і сіла духу, калі яны абапіраюцца на сьведамае, асьвечанае грамадзтва***.

Беларускае Адраджэньне жыве і змагаецца. Падступныя ўдары па сілах нацыянальнай дэмакратыі ў Беларусі не дасягаюць мэты. Сутнасьць, аднак, ня толькі ў тым, каб змагацца ды выстаяць, але — перамагчы найгоршага непрыяцеля. На гэта павінны быць накіраваныя дзеяньні і праца беларускіх адраджэнцаў.

17 чэрвеня 2002 года, Варшава.

БЕЛАРУСКІЯ ГІМНЫ

Гімны нацыі, дзяржавы, краіны пішуцца, як вядома, не па заказу, а самой гісторыяй. Прытым сам факт зьяўленьня гімну можа быць выпадковай падзеяй, неадпаведным вершам і мэлёдыяй, але, трапіўшы ў гістарычны кантэкст народа, яны становяцца яго гімнам.

Вядомая, напрыклад, гісторыя французкай салдацкай песьні *Марсельеза*, што стала дзяржаўным гімнам Францыі, ці мазуркі „*Ешчэ Польска не згінэла”*, якая стала ў 1918 г. дзяржаўным гімнам Польшчы.

Дзяржаўны заказ на стварэньне гімну ёсьць блюзьнерства. Што з гэтага атрымліваецца, добра відаць на прыкладзе гімнаў СССР і так званых „рэспублік свабодных”. Гімны найчасьцей ствараюцца ў барацьбе за нацыянальна-культурнае, дзяржаўнае і духоўнае адраджэньне нацыі і выбіраюцца народам, які змагаецца за сваю волю і лепшую долю.

У пачатку XX стагоддзя гімнам беларускага Адраджэньня найчасьцей гучаў верш *Янкі Купалы* ***„А хто там ідзе...”*** на музыку *Людаміра Рагоўскага*. Ён так і называўся: „*Беларускі гімн”*.

Пазьней, пасьля ўтварэньня *Беларускай Народнай Рэспублікі*, ужо ў 20-х гадах, шырока распаўсюдзіўся гімн ***„Мы выйдзем шчыльнымі радамі”***, паводле верша *Макара Краўцова,* напісанага ў 1919 годзе (музыка *Уладзімера Тэраўскага*). Ён стаў гімнам *Беларускай Народнай Рэспублікі.* Яго сьпявалі паўсюдна змагары ў Заходняй Беларусі, потым ён гучэў у часы Другой Сусьветнай вайны і цяпер гучыць ва ўсім сьвеце, дзе жывуць беларусы, якія памятаюць пра Бацькаўшчыну.

З часоў Другой Сусьветнай вайны, падзеі якой стымулявалі беларускае нацыянальнае Адраджэньне, паўсюдна гучыць побач з гімнам *БНР беларускі духоўны гімн* ***„Магутны Божа”***. Гэта знакаміты верш *Натальлі Арсеньневай* (музыка *Міколы Равенскага*). Надзвычай велічная, узьнёслая і ўрачыстая мэлёдыя і зьмест гімна гучаць паўсюдна, дзе ладзяцца беларускія нацыянальна-культурныя мерапрыемствы. Прытым часта ўсё пачынаецца *дзяржаўным гімнам БНР*, а заканчваецца *духоўным гімнам нацыі — „Магутны Божа”.*Рэлігійныя службы ва ўсіх беларускіх цэрквах *Амэрыкі, Канады, Аўстраліі, Вялікабрытаніі* завяршаюцца сьпевам *„Магутны Божа”.*

Склалася добрая і прыгожая традыцыя. Беларуская нацыя мае два гімны — дзяржаўны і духоўны. Кожны заняў сваё месца. Кожны сьпяваецца ў сваім часе. Кожны адлюстроўвае нашу беларускую гісторыю, наш розум, нашую волю, наш дух, нашае беларускае сэрца.

Мяркую, што кожны Беларус павінен ведаць свае гімны.

МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны, родны свой прастор;

Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор!
Дамо адпор!

Няхай жыве магутны, сьмелы
Наш беларускі вольны дух;
Вольны дух!
Штандар наш бел-чырвона-белы
Пакрыў сабой народны рух.

На бой! За шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты, цярпелі мы даволі...
На бой! — усе да аднаго!
Да аднаго!

Імя і сілу Беларуса
Няхай пачуе й бачыць той,
Бачыць той!
Хто сьмее нам нясьці прымусы
І першы выкліча на бой.

Браты, да шчасьця мы падходзім;
Хай гром грыміць яшчэ мацней!
У крывавых муках мы народзім
Жыцьцё Рэспублікі сваёй!
Жыцьцё Рэспублікі сваёй!

МАГУТНЫ БОЖА

Магутны Божа! Ўладар сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменьні свае хвалы.

Дай спор у працы штодзённай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць — дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот!
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!

(„Беларускія Ведамасьці”, — 1998, №2(12); „Народная Воля”, — 2001, 19 красавіка).

(Фота В. Фядосенкі)

Шэсьце за Беларусь.

КАНФЛІКТ ДАВІДА З ГАЛІЯФАМ

Няшчасьце, якое здарылася ў Амэрыцы 11-га верасьня ў выніку нападу таямнічых авіяэкстрэмістаў на Нью-Ёрк і Вашынгтон, уразіла сьвет сваёй жорсткасьцю, разбуральнай выніковасьцю і бездапаможнасьцю Амэрыкі.

Я шаную Амэрыку, зычу ёй дабра і квітненьня. Аднак узрушэньне, якое завалодала палітыкамі, імкненьне тут жа зьнішчыць нябачнага і нібыта „слабога ворага”, вымушае мяне сказаць сваё слова. Абсалютна відавочна, што палітычныя рашэньні, якія прымаюцца на пачуцьцях, заўсёды накіраваныя толькі на бліжэйшыя мэты. Як правіла, ім нестае прадуманасьці, усьведамленьня магчымых адмоўных вынікаў. Мэта ацэньваецца як рэальнасьць. Але ў працэсе яе дасягненьня сітуацыя можа рэзка перамяніцца, і кантраляваць новыя дачыненьні стане немагчыма.

Пасьпешныя дзеяньні супраць адной усходняй краіны могуць перамяніць сітуацыю і скансалідаваць людзей на Ўсходзе супраць Амэрыкі. Тады, ня гледзячы на палітычныя пазыцыі ўсходніх урадаў, ворагам Амэрыкі стане ўвесь Усход.

Я мяркую, што, ва ўмовах цяперашняга сьвету, збройны канфлікт з Усходам можа быць фатальным для Эўропы і Амэрыкі. На жаль, на Захадзе шмат хто не разумее, што калі будзе дапушчаная памылка, то ваяваць прыдзецца не зь дзяржавамі на Ўсходзе, а зь людзьмі.

Ніякая эканамічная магутнасьць, ніякая супэртэхніка і ніякія спосабы яе ўжываньня ня могуць перамагчы перакананага чалавека. Нават ядзерныя ўзрывы не прынясуць Захаду перамогі, калі будуць парушаныя справядлівасьць, суверэнітэт і гонар людзей на Ўсходзе. Злачынства тэрарызму, перш чым будзе пакаранае, мусіць быць дакладна ідэнтыфікаванае і даказанае.

Захад ня выйграў ніводнай вайны зь „беднымі народамі” на Ўсходзе (Карэя, Індакітай, В’етнам, Індыя, Алжыр, Конга і г.д.), але, на жаль, не зрабіў з гэтага высноваў. Пасьпешнае, недакладна акрэсьленае і прыблізна вызначанае ўжываньне высокатэхнічнай зброі можа маральна салідарызаваць Усход. Вайна „беднага Ўхсоду” супраць ЗША (якая, дарэчы, вядзецца ўжо даўно малымі, нябачнымі сіламі) можа ператварыцца ў сусьветную партызанскую вайну Давіда з Галіяфам, якая будзе тлець дзесяцігоддзямі, ператворыць у кашмар жыцьцё ў Эўропе і ў Амэрыцы і можа скончыцца вядомым па антычнай легендзе канцом.

* * *

Амэрыцы варта задумацца глыбей, у чым прычына нянавісьці да яе з боку краінаў, бедных эканомікай і жыцьцёвым узроўнем, але багатых гісторыяй і духоўнай культурай. Амэрыканскае грамадзтва шмат выйграла б, калі б глянула ў глыбіню сябе, калі б зірнула на сябе збоку і знутры, заўважыла б свае маральныя эрозіі і недахопы.

На добры лад, перад аблічам вялікага і зьнешне таемнага, малазразумелага канфлікту Ўсходу з Амэрыкай, ня варта супакойваць сябе тлумачэньнямі пра неабходнасьць помсты антылюдзкаму арабскаму тэрарызму. Разумней было б амэрыканцам задаць сабе пытаньне: чаму, маўляў, яны, на Ўсходзе, нас, амэрыканцаў, ненавідзяць? Чым мы ім не падабаемся? Што яны хочуць сцьвердзіць, чаго дасягнуць? Мудра было б увогуле зразумець усходнюю мэнтальнасьць людзей Азіі і паўночнай Афрыкі. Тых, каго называюць „тэрарыстамі” — гэта не піраты. Яны гінуць не дзеля матэрыяльных каштоўнасьцяў. Гэта таксама ня ёсьць вар’яты, а цалкам нармальныя і сацыяльна адаптаваныя людзі. Але яны іншыя. Дык якія ж яны?

На жаль, рэчаіснасьць сьведчыць, што зрабіць паварот у сваёй сьвядомасьці простаму амэрыканцу вельмі цяжка. Ён перакананы, што яго краіна найлепшая, што сам ён таксама найлепшы, і не цікавіцца іншымі. І, што самае горшае, — ня хоча цікавіцца, ня хоча нічога ведаць. Абмежаванасьць ведаў пра сьвет у шэраговых людзей багатай і высокатэхнічнай Амэрыкі проста шакуе.

Зрэшты, на высокім узроўні амэрыканцы разумеюць свае праблемы. Толькі ці паўплывае гэта на выбар паводзінаў цяпер?

Ёсьць язвы ў амэрыканскім грамадзтве, экспарту якіх ня ўспрыме і не дапусьціць ні адзін народ на Ўсходзе (і ня толькі на Ўсходзе). Можа, ня ў сіле і не ў багацьці справа?

Канфліктныя дачыненьні цывілізацыяў ня выправіш бомбамі ды самалётамі, не палепшыш вайной.

Раптоўнае, нечаканае, на вачах ўсяго сьвету, хуткае і шокавае разбурэньне прымітыўнымі экстрэмістамі найвышэйшых будынкаў у ЗША (сьведчаньняў багацьця фінансава моцнай Амэрыкі), — ўспрымаецца як жудасны сымвал. Можа, гэта знак для Амэрыкі? Можа, гэта заклік павярнуцца да каштоўнасьцяў духу? Можа, гэтая страшная ахвяра ў шмат тысячаў загубленых жыцьцяў мае нейкі таемны зьмест?

Ілюзія сілы, увасобленая ў ваеннай, фінансавай і таварнай матэрыі, можа рассыпацца ў пыл і груду руінаў.

* * *

Заклікі татальна зьнішчаць тэрарызм паўсюдна, ва ўсіх яго праяўленьнях, правільныя, на жаль, толькі тэарэтычна. На практыцы, у цяперашняй палітычнай рэальнасьці, гэта можа абярнуцца масавай несправядлівасьцю, парушэньнем правоў нацыянальных меншыняў і генацыдам іхняга насельніцтва.

Схема такая. Нейкі дзяржаўны рэжым пачынае парушаць правы, а потым і рэпрэсаваць нейкую нацыянальную меншасьць ці групу людзей. Тыя, абараняючы жыцьцё і сваё існаваньне, пачынаюць змагацца ў адказ. Тады рэжым аб’яўляе іх тэрарыстамі і пачынае зьнішчаць, ужо зыходзячы і з сілы, і з права.

Выразны прыклад — тэрарыстычная Расея, якая ўжо некалькі гадоў вядзе шырокамаштабную вайну супраць мікраскапічнай Чачэніі і праводзіць генацыд чачэнскага насельніцтва (пры стрыманых, на жаль, і пасіўных паводзінах заходніх краінаў).

Чатыры гады таму, калі закончылася 1-я Расейска-Чачэнская вайна, быў падпісаны ***„Дагавор аб міры і прынцыпах мірных узаемаадносінаў”***. Яго падпісалі законныя, усенародна абраныя прэзыдэнты — Аслан Масхадаў і Барыс Ельцын, — дзе было заяўлена на ўвесь сьвет ***„аб спыненьні ваеннага супрацьстаяньня Расеі і Чачэніі, якое доўжылася цягам чатырох стагоддзяў”***.

Цяпер расейцы вядуць новую вайну супраць Чачэніі з ужываньнем усіх відаў зброі з расейскага боку (акрамя атамнай). Рускія накіравалі 150-тысячную армію супраць 5-тысячнай чачэнскай, разбамбавалі і ператварылі ў руіны паўмільённую чачэнскую сталіцу і іншыя гарады, забілі больш за 130 тысячаў мірных людзей у краіне, насельніцтва якой не дасягае і аднаго мільёна жыхароў; сотні тысячаў выгналі з Чачэніі ва ўцякацтва, тысячы замкнулі ў фільтрацыйныя лягеры, дзе катуюць і забіваюць мірных цывільных людзей. І ўсё гэта называюць „антытэрарыстычнай апэрацыяй”. Бо расейцы разумеюць, што назваўшы ўсё сваім імем (вайну вайной, а генацыд — генацыдам), — трэба будзе выконваць (альбо парушаць) Жэнэўскую Канвэнцыю пра ваеннапалонных, Усеагульную Дэкларацыю аб правах чалавека і іншыя міжнародныя прынцыпы і пагадненьні. А так рускія дазволілі сабе збамбаваць і зьнішчыць цэлую суверэнную краіну, забіваюць малалікі свабадалюбны народ, і не жадаюць несьці за гэтае злачынства супраць чалавецтва ніякай адказнасьці.

Цяпер расейскія прыхільнікі вайны хочуць скарыстаць бандыцкі напад на Амэрыку ў сваіх інтарэсах, каб апраўдаць генацыд чачэнцаў. Рускія палітыкі заяўляюць аб сваёй гатовасьці, разам з Амэрыкай, зьнішчаць тэрарызм „ісламскі, чачэнскі, ня важна, які". Некаторыя дагаварыліся нават, што напад на ЗША зроблены пры дапамозе і з удзелам чачэнцаў. (Якія, акрамя як на сябе, спадзяюцца, у сапраўднасьці, толькі на Амэрыку.)

Але барацьба суверэннай Чачэніі за свабоду і незалежнасьць супраць рускай агрэсіі ня мае дачыненьня да тэрарызму. Тэрор праводзіць якраз руская армія і рускія спэцслужбы.

* * *

Кожны народ валодае натуральным правам на незалежнасьць і свабоду, мае права абараняць незалежнасьць і, калі яе няма, — змагацца за яе. Кожны народ, калі яго вынішчаюць, мае права абараняцца ўсімі даступнымі і магчымымі сродкамі.

Заклік „паўсюдна зьнішчаць" і „ва ўсім сьвеце", без усебаковага аналізу і ўліку палітычнай рэальнасьці, можа прывесьці да падмены паняцьцяў у рэальнай палітыцы, можа ня вырашыць праблему, а толькі ўскладніць яе, узаконіць забойствы і гвалт, легалізаваць рэпрэсіі, пашырыць маштабы тэрору.

На мой погляд, патрэбна дакладнае вызначэньне тэрарызму і выразнае называньне канкрэтных дзеяньняў, доказнасьць аргумантаў, завершанасьць сьледзтва, устанаўленьне віны. Мусіць быць зразумеласьць. Усход не павінен успрымаць ваяўнічыя заявы як новы крыжовы паход.

Існуе небясьпека, калі Захад можа аказацца перад праблемай, што, каб перамагчы „тэрарызм", неабходна зьнішчыць цэлыя народы. Але трэба памятаць, што партызаны Ўсходу (як гэта ні жахліва) могуцьператварыць у руіны Жэнэву ці Брусэль, а заходнім арміям немагчыма зьнішчыць народ. (Гэта выглядала б злачынствам супраць чалавецтва.)

Вялікай небясьпекай для Амэрыкі і для Эўропы была б партызанская вайна з Усходам. Яе неабходна пазьбегнуць. Бо гэта заўсёды — вайна бяз правілаў, дзе сіла вымяраецца, з аднаго боку, авіяносцамі, ракетамі ды самалётамі сістэмы „Стэлс", з другога — сілай чалавечай апантанасьці. І, паўтаруся, яшчэ не было выпадку ў найноўшай гісторыі, каб самалёты перамаглі апантанага чалавека, які не баіцца сьмерці.

На маю думку, трэба заўсёды і найперш — старацца пра супрацоўніцтва і гуманную кансалідацыю сьвету, цаніць міжлюдзкія дачыненьні.

Тым часам складваецца ўражаньне, што ў паветры запахла вайной. Зьявілася шмат галасоў, якія толькі і гучаць: „Зьнішчыць!", „Забіць!" Але калі прааналізаваць усё спакойна, то прыходзіш да высновы, што ў трагічных выпадках 11 верасьня трэба найперш дакладна ўстанавіць арганізатараў, кіраўнікоў і спонсараў нападу (бо выканаўцы загінулі). І толькі тады прымаць захады і ажыцьцяўляць рашэньні. Лепш за ўсё, каб гэта быў паказальны судовы працэс з удзелам усіх зацікаўленых краінаў, а не ваеннае забойства, якое (можна не сумнявацца) пацягне за сабой новыя забойствы.

* * *

Я падтрымліваю Амэрыку, бо разумею, што на гэтую краіну абапіраецца цяперашні сьвет і цяперашняя Эўропа. Я падтрымліваю амэрыканскі народ, бо ведаю яго дабразычлівасьць. Бо крыўда і страты зроблены яму — несправядліва, і людзі загінулі, ні ў чым і ні перад кім не вінаватыя.

Але Амэрыка прымае цяпер вельмі адказныя рашэньні, якія могуць уплываць на далейшы ход гісторыі XXI-га стагоддзя. На мой погляд, у такім становішчы ніхто і нідзе на сьвеце не павінен заставацца абыякавым ці ацэньваць падзеі толькі на пачуцьцях. Патрэбна дыскусія і разумнае асэнсаваньне.

14 верасьня 2001 г., Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці", — 2001, №8(38); „Народная Воля", — 2001, 20 верасьня).

КУРАПАТЫ — НАШ БОЛЬ, НАША ПАМЯЦЬ, НАША ТРЫВОГА

Сёлета пачалося будаўніцтва шырокае сучаснае аўтастрады праз Курапаты. Ужо высякаюць Курапацкі лес, вядуць земляныя працы, каб пашырыць існуючую кальцавую дарогу. Савецкая практыка такой працы паказвае, што чакаюцца вялікія разбурэньні. Над Курапатамі зноў навісла небясьпека псаваньня і зьнішчэньня.

У абарону Курапатаў сталі энтузіясты Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне", Маладога Фронту, Мартыралёгу Беларусі, прадстаўнікі грамадзкасьці.

* * *

Цяжка ўсьведамляць, што на пачатку XXI-га стагоддзя прыходзіцца зьвяртацца да людзей у абароне *Курапатаў*. *Курапаты* — ня толькі найбольшы і найстрашнейшы на Зямлі масавы магільнік генацыду беларусаў, але і найвялікшы і найтрагічнейшы сымвал мартыралёгіі народу.

Гэта той сымвал, які трынаццаць гадоў таму ў адначасьсі абудзіў наш народ ад сну, ад ілюзіяў камуністычнае прапаганды і праз скруху нагадаў пра чалавечую годнасьць, прымусіў задумацца над паправай нашай агульнай будучыні.

Мы, беларусы, павінны цяпер разумець, што будучыня нашай нацыі мераецца існаваньнем *Курапатаў*. ***Гэта наш духоўны знак, мера нашай якасьці як народа, і вымярэньне духоўнай сілы.*** У якім стане знаходзяцца *Курапаты* — у такім і народ. Тут усё адпавядае да дробязяў. Сходзім туды і паглядзім, як яны выглядаюць праз трынаццаць гадоў пасьля адкрыцьця, дасьледваньня і ўсьведамленьня сэнсу. Убачыўшы, зразумеем: якія мы ёсьць, у якім стане жывём.

Калі б мы, беларусы, дапусьціліся, што *Курапаты* зьнішчылі б, разбурылі ці зьняважылі, лічыце, што тое самае адбудзецца і з намі. У 1988 годзе, калі йшло дасьледваньне і ярасная змаганьне за *Курапаты*, я зьвярнуў на гэта ўвагу і пісаў пра гэта („Калі мы згубім, страцім гэтую сілу, нас — няма").

Зьвернем увагу таксама, што непрыяцелі нашага нацыянальнага быцьця і нашай свабоды, і ўся цемра, што ўзрошчана ў нашым грамадзтве, імкнуцца *Курапаты* зьнішчыць. Па-свойму, па-

(Фота Ул. Кармілкіна)

Міліцыя ахоўвае разбурэньне Курапатаў. 2001 г.

Дарога праз Курапаты.

цёмнаму, яны дакладна разумеюць сэнс *Курапатаў* для Беларусі. І ў сваім непрыхільным стаўленьні ведаюць, што робяць.

Для закаранелых злачынцаў-забойцаў няма праблемы сумленьня і ніякіх праблемаў у злачынстве, акрамя праблемы трупа. У іх адзіны клопат: куды яго падзець, як схаваць. Энкавэдзісты хавалі ў зямлю, але сьляды замяталі потым. І найлепшай шырмай было якое-небудзь будаўніцтва.

Так схавалі шмат забойстваў. У пачатку 60-х гадоў, напрыклад, каля Менску, за Абсэрваторыяй (у бок Уручча) пры пабудове дарогі і дарожнай разьвязкі было зьнішчана месца масавых пахаваньняў растраляных энкавэдзістамі людзей.

У гэты ж час (пачатак 60-х) вялі кальцавую дарогу праз *Курапаты*, выграблі горы касьцей расстраляных. Хто ведае, хто памятае цяпер пра гэта? (Магчыма, акрамя мяне, што запісаў гэтыя зьвесткі ад людзей, якія ў большасьці ўжо не жывуць.) Будаўніцтва на касьцях — гэта цёмны зьдзек над людзкасьцю, сьвятакрадзтва, працяг злачынства, працяг, які хавае забойствы.

Так было з масавымі пахаваньнямі расстраляных у *Лошыцы (Лошыцкім Яры)*, зьвесткі пра якія я, на хвалі перамогі ў *Курапатах*, як аказалася, неабачліва, рассакрэціў раней часу (не зрабіўшы археалягічных дасьледваньняў). Сістэма зрэагавала імгненна. Тут жа хутка скапалі экскаватарамі прылеглыя ўзгоркі і засыпалі *Лошыцкі Яр*, заасфальтавалі, а на паверхні пабудаванлі гаражы.

(Фота Ю. Дзядзінкіна)

Курапаты. Беларусы перад памяцьцю пра генацыд.

Курапаты. 29 кастрычніка 2000 г. Удзельнікі Крыжовага шэсьця. (Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ).

З *Курапатамі* такі нумар не прайшоў. Пятнаццаць гадоў рыхтавалася іхняе адкрыцьцё. Мне і маім сябрам, якія ведалі таямніцу, хапіла вытрымкі, і *Курапаты* дачакаліся свайго часу. У 1988 годзе пра злачынствы камунізму ў *Курапатах* ведаў увесь сьвет.

Ні адзін помнік мартыралёгіі не дасьледаваны на такім узроўні, як *Курапаты*. Сфальшаваць зьвесткі і сказаць іншае нашчадкі НКВД ўжо былі ня ў стане. Кожная спроба давесьці адваротнае толькі сьведчыла супраць іх. Тады вярнуліся да старога мэтаду — да будаўніцтва. Так узьнікла ініцыятыва пашырэньня кальцавой дарогі і правядзеньня шырокай сучаснай аўтастрады праз *Курапаты*. І гэта нягледзячы на тое, што даўно існуюць нармальныя праекты аўтастрады ў абход *Курапатаў*. Але будаваць хочуць напрасткі. Тут відавочны палітычны заказ тых, хто зацікаўлены зьменшыць значэньне *Курапатаў* і ў пэрспэктыве — разбурыць іх.

Патрабаваньні людзей і ўсёй грамадзкасьці цяпер павінны быць рашучымі і адназначнымі: ***ніякай аўтастрады праз Курапаты не павінна будавацца і не павінна быць!***

Справа ня ў тым, што дарога, як абяцаюць, быццам бы не разбурыць зноў Курапацкія магілы (што сумніўна). Будаўніцтва аўтастрады праз *Курапаты* стане прыступкай для далейшай непавагі і стварэньня магчымасьцяў для зьнішчэньня рэшты магілаў у пэрспэктыве. Аўтастрада іх зьняважыць, прынізіць значэньне гэтага трагічнага і сьвятога месца, бо такія адносіны да яго — хамскія, паказваюць на тое, што ў людзей, якія б зрабілі такую дарогу, няма прыярытэту духа, памяці, пашаны перад пакутніцкай сьмерцю часткі нацыі; сьведчаць пра дробязнасьць інтарэсаў дробных людзей, што не берагуць спакой мёртвых. Брыдка пляваць у мінулае, але недапушчальна і дзіка пляваць у будучыню.

Не павінна такога быць, каб па краю пакутных магілаў, з шумам і грукатам, імчалася рака машын! Аўтастрада мусіць ісьці ў абход, далей ад Курапатаў і ад жылых дамоў. (Трэба шанаваць і жывых, і мёртвых!) Гэта было б правільна, разумна і па-людзку.

А на адрэзку старой кальцавой дарогі праз *Курапаты* (калі яна застанецца) неабходна паставіць з двух бакоў індывідуальны *Знак Курапатаў* і дарожныя знакі абмежаваньня хуткасьці, каб кожны ведаў, дзе праязджае.

Беларуская грамадзкасьць, дасьледчыкі і пацярпелыя (дзеці і сваякі расстраляных) не павінны паддавацца ні на якія нібы-та „канструктыўныя" кампрамісы, распачынаць нейкія „дасьледваньні" ў зоне заплянаванай дарогі (і тым самым згаджацца з будаўніцтвам), бо ня можа быць кампрамісу са злачынствам. А заплянаваная аўтастрада праз *Курапаты* якраз і ёсьць — злачынства.

* * *

У абставінах, калі імкненьням прынізіць і зьнішчыць *Курапаты* спрыяе ўлада і інсьпіруе такія дзеяньні, выратаваць мэмарыяльнае месца можа толькі грамадзкасьць, сам народ, і найперш — эліта грамадзтва.

У *Курапатах* (улічваючы нэгатыўную пазыцыю і дачыненьні ўладаў) можа быць толькі народны помнік расстраляным, народны мэмарыял, які спантанна здольны стварыць народ.

Пачатак народнаму мэмарыялу паклалі ў 1989 годзе, калі ўсім народам (тысячы людзей) паставілі ў *Курапатах сямімэтровы Крыж пакуты*. *Курапаты* мне бачацца помнікам з мноства крыжоў, дзе кожны крыж сымвалізуе ахвяру. Гэта помнік на вечнасьць. Ён не зьнікае і не марнее, пакуль жывы народ. Бо людзі кожнага пакаленьня нясуць сюды свае крыжы памяці.

29-га кастрычніка мінулага году Народны Мэмарыял пачаў мэтанакіравана стварацца энтузіястамі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"*, калі было арганізаванае шматкілямэтровае крыжовае шэсьце ў *Курапаты* і ўсталяваныя на магілах дзясяткі крыжоў.

З таго часу колькасьць крыжоў большае. Кожны чалавек можа прынесьці сюды і паставіць свой крыж у памяць пра генацыд, па загіблых людзях, па замардаваных матках, бацьках, дзядах, прадзядах, па нявінна забітых продках. Беларусаў зьнішчалі, і гэтая памяць у нас — велізарная, павінна стукаць у нашыя сэрцы.

Мала рушэньня энтузіястаў. Добра, каб быў шырокі, сапраўды ўсенародны рух. Тысячы, дзясяткі тысячаў, лес крыжоў можа вырасьці ў *Курапатах*, калі толькі людзі зрушацца і захочуць ушанаваць жыцьцё і сьмерць, і пакуты продкаў.

Пакаленьне 80-х гадоў выканала сваю задачу, выявіла, дасьледвала і выратавала *Курапаты*, паказала беларускую трагедыю ўсяму сьвету. Перад людзьмі пачатку трэцяга тысячагоддзя стаіць новы выклік, каб уратаваць *Курапаты*. Мусіць быць ня толькі пратэст супраць варварства, але й стваральная праца ўсіх. Ідэя ёсьць, пачатак зроблены. Няхай жа дапаможа Беларусі Бог!

6 кастрычніка 2001 г., Варшава.

(„Народная Воля", — 2001, 10 кастрычніка; „Берасьце", — 2001, верасень-кастрычнік, №12).

Нясеньне крыжоў у Курапатах. 29 кастрычніка 2000 года Беларускі Народны Фронт “Адраджэньне” і ягоная Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ арганізавалі Крыжовае шэсьце і мітынг--рэквіем, прысьвечаныя Дню памяці продкаў “Дзяды”. Больш за тысячу асобаў сабраліся на праспэкце Скарыны і прайшлі 8 кілёмэтраў, нясучы крыжы ў Курапаты і белыя кветкі. Крыжы паставілі на месцы расстрэлаў над магіламі, а сьвятары асьвяцілі іх.

ЧЫМ ВЫКЛІКАНЫ ВАРВАРСКІ НАСТУП НА КУРАПАТЫ

Ідэалёгія і палітыка разбурэньня *Курапатаў* зразумелая. Уладу ў Беларусі захапілі выхадцы з НКВД-КГБ, якія хацелі б зьнішчыць сьведчаньні генацыду, што ажыцьцяўляла Масква праз ворганы НКВД. Усе спробы сфальшаваць вынікі навуковых дасьледваньняў, зробленых у 1988 годзе, і абвергнуць вынікі сьледзтва па *Курапатах* праваліліся. Пасьля гэтага запанавала ўяўная цішыня, у час якой паволі руйнавалася і занечышчалася ўсё, што зьвязана было з памяцьцю пра *Курапаты,* засьмечвалася тэрыторыя магілаў, месца рабілася прахадным, кінутым на таптаньне наезных жыхароў з бліжэйшых кварталаў горада.

Тактыка рэжыму была зразумелай. Яе неабходна было спыніць. У 2000 годзе *на Дзяды Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* і ягоная *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* распачалі актыўнае стварэньне *ў Курапатах* ***Народнага Мэмарыялу Беларускай мартыралёгіі***. Было наладжана масавае Крыжовае шэсьце *ў Курапаты* і ўстаноўлена над магіламі мноства крыжоў (больш 30-ці).

Стаўленьне крыжоў працягвалася ўвесь час. На 2001 г. іх ужо паставілі больш за сотню. Была растлумачана (часткова ў друку) канцэпцыя *Народнага Мэмарыялу ў Курапатах*, які па задуме ствараў бы сам народ. Дзеля гэтага кожны мог зрабіць і прынесьці ў Курапаты свой крыж, паставіць яго за душы расстраляных беларусаў, сваіх родных і блізкіх. Над магіламі расстраляных на Курапацкіх горах, побач з соснамі, на палянах і ўздоўж дарог вырастаў бы лес рукатворных крыжоў. Усё гэта рэальна абазначыла б памяць па расстраляных і сымвалізавала б уваскрасеньне душ. (Такі беларускі крыжовы помнік ёсьць на сьвятой гары *Грабарка* на Беласточчыне і ў іншых месцах. Кожны год беларусы нясуць у Грабарку крыжы.)

Справа зрушылася. Гэтакія дзеяньні выклікалі ціхую паніку ў кіраўнічым асяроддзі рэжыму. Безумоўна, што маскоўскія аналітыкі з ГБ прааналізавалі задуму *Народнага Мэмарыялу* і зразумелі, што прыходзіць канец іхным спробам схаваць памяць пра *Курапаты* і паступова зьнішчыць іх.

Рэакцыя была пасьпешнай і грубай. Ужо летам 2001 года пачалася падрыхтоўка да будаўніцтва шырокай аўтастрады праз *Курапаты.* Прытым так сьпяшаліся, што пачалі без пляну і без узгадненьня праекту. Мэтадам такога будаўніцтва (гледзячы па абставінах) можна было разбурыць і зьнішчыць літаральна ўсё: і лес, і крыжы, і магілы. Напрацаваны вялікі савецкі вопыт зьнішчэньня культуры. Гісторыя расейскай акупацыі на Беларусі паказала, што не існуе ніякіх маральных перашкодаў у варвараў: ні ў тых, хто загадвае, ні ў тых, хто выконвае. Тыя, хто разбураюць крыжы і магілы, ня маюць ніякіх духоўных каштоўнасьцяў, акрамя паняцьцяў нявольніка і раба.

Разбурэньне *Курапатаў* заплянавана з асаблівым цынізмам. Варта зьвярнуць увагу на даты. Ігнаруючы ўсіх і ўсё, шырокім фронтам прыступілі да будаўніча-разбуральных працаў у зоне *Курапатаў* 20 верасьня, якраз ў дзень так званай „самаінаўгурацыі” Лукашэнкі пасьля сфальшаваных выбараў. 8-га лістапада, на другі дзень галоўнага бальшавіцкага сьвята, па загаду зьверху пачалі ламаць Крыжы, зьбіваць і катаваць людзей — абаронцаў магіл, кінулі на іх тэхніку, бульдозеры, КГБ і спэцыяльныя атрады міліцыі.

Такое супадзеньне датаў добра адлюстроўвае ідэалёгію вандалізму, паказвае, у якой сфэры паняцьцяў існуюць разбуральнікі *Курапатаў.*

Курапаты — унікальны помнік і сымвал генацыду. Ад асэнсаваньня яго беларусамі шмат у чым залежыць лепшая будучыня Беларусі. Бяда якраз у тым, што непрыяцелі беларушчыны гэта разумеюць лепш, чым некаторыя беларусы. Лёс *Курапатаў* будзе залежыць ад двух зьяваў: ад сілы супраціўленьня варварству і галоўнае — ад уздыму і моцы стваральнай працы, ад рабленьня ***Народнага Мэмарыялу крыжоў***. Рэч зразумелая: напачатку гэтую працу павінна ўзяць на свае плечы арганізаваная эліта грамадзтва, актыўныя і сьведамыя людзі, пакуль ня зрушыцца ўвесь народ.

2001 г., лістапад, Варшава.

(„Беларускія Ведамасьці”, — 2001, №10(40); „Беларус”, — 2002, красавік, №471).

Крыжовы шлях-2000. Пачатак працэсіі на праспэкце Скарыны ў Менску.

БЕРАЖЭМ КУРАПАТЫ!

(Зварот да моладзі)

Вельмі добра, што ў нашым беларускім грамадзтве знайшліся людзі, якія дабраахвотна ўсклалі на сябе абавязак старажаваньня Курапатаў.

Павінен сказаць пра сэнс зьявы. Курапаты гэта ёсьць ***мэмарыяльны помнік расейска-бальшавіцкага генацыду***, учыненага над нашым народам. Гэтае месца ёсьць адначасна ***нацыянальным сымвалам*** пакутаў і сымвалам беларускай народнай памяці. Гэта духоўнае месца. Па адносінах да Курапатаў мераецца наша народная беларуская моц, нашая маральная якасьць як народа.

Цяпер нашая народная моц і нашая беларуская мараль падвяргаюцца выпрабаваньням з боку ідэйных нашчадкаў тых злачынцаў, якія некалі расстрэльвалі людзей у Курапатах.

Яны нахабна дэманструюць непавагу да беларускай сьвятасьці, будуюць дарогу праз нашае сьвятое месца і глядзяць, як мы будзем сябе паводзіць.

Можна сказаць пэўна, што калі б на абарону Курапатаў ніхто не паўстаў, — гэта абазначала б, што мы — ніхто і нішто, што нас — няма. І цемра зрабіла б з гэтага высновы.

Але нашыя людзі сталі на абарону Курапатаў з поўнай сьведамасьцю. Прынесьлі сюды і паставілі сотні крыжоў. Прыйшлі з сьвятарамі. А маладыя дабраахвотнікі ўсталявалі тут кругласутачнае пільнаваньне.

Мушу сказаць, што гэта ёсьць *ужо* наша маральная перамога.

Цемра бярэ верх толькі тады, калі ёй не супраціўляюцца. Калі ж яна вымушанаяісьці па касьцях, па ахвярах, ламаючы супраціўленьне справядлівасьці грубай сілай, — гэта ніколі ня ёсьць перамога цемры, а толькі сьведчаньне яе амаральнасьці і зла. Такое зло ніколі доўга ня будзе трымацца. Вось чаму ***заўсёды трэба супраціўляцца злу***.

Хлапцам і дзяўчатам, якія дабраахвотна сьцерагуць Курапаты, я б сказаў: „Сярод вас, пэўна, ёсьць розныя людзі. Але памятайце: вы спрычыніліся да абароны найвялікшай таямніцы — таямніцы сьмерці, над якой ніхто ня ўладны. Усе народы берагуць і сьцерагуць месцы і памяць пра сьмерць, таму што гэтыя месцы і гэтая памяць ёсьць ***сымваламі вечнага існаваньня***. Ці гэта на Зямлі — для народа, ці гэта для вечнай душы — у іншым сьвеце.

Я хацеў бы, каб маладыя беларусы думалі і задумваліся над гэтым. І тады Курапаты могуць дапамагчы кожнаму ў паляпшэньні ягонай душы. Гэтак жа, як паспрыялі яны ў Адраджэньні Беларусі, як дапамагаюць у Адраджэньні ўсёй беларускай нацыі.”

26 сьнежня 2001 г., Варшава.

НАШ БЕЛАРУСКІ ШАСЬЦІКАНЦОВЫ КРЫЖ

У 30-я гады мінулага стагоддзя і за часы нямецкай акупацыі найбольш знакамітай асобай, як знаўца мастацтва і культуры, быў у Менску скульптар і прафэсар ***Міхаіл Керзін***. Аўтарытэт ягоны быў надзвычай высокі. Напачатку 40-х, калі нямецкія акупанты ўжо абсталяваліся ў горадзе і кіраўнікам цывільнай адміністрацыі Генэральнай Губэрніі быў прызначаны *Вільгэльм Кубэ*, тады дазволена было беларусам аднавіць беларускі гістарычны музэй, які знаходзіўся ў так званым „Юбілейным Доме". (Пабудаваны ў 1913 годзе ў манеры „а ля рюс" у гонар юбілею расейскай царскай дынастыі. Цяпер там Дом актора. 25 сакавіка 1918 года тут была абʼяўлена незалежнасьць БНР.)

Дырэктарам беларускага музэю заступіў ***Антон Шукелойць***, які акурат уцёк з бальшавіцкай турмы ў Крупках (фактычна, з-пад расстрэлу) і апынуўся ў Менску. (Як толькі пачалася вайна, энкавэдзісты схапілі яго і, разам з тысячамі такіх жа як ён арыштаваных беларускіх інтэлігентаў, павезьлі этапамі на Ўсход.)

Пачалі фармаваць музэйную экспазыцыю. І вось сабралі аднаго разу ўсе ўнікальныя археалягічныя экспанаты, якія засталіся ад ранейшага менскага музэю, расклалі на вялікім шырокім стале каменныя сякеры, наканечнікі, фігуркі, амулеты і задумаліся, што з гэтым рабіць.

Пагоня.

Паклікалі прафэсара Керзіна, каб той парадзіў. Прафэсар прышоў, кінуў вокам, паўзіраўся і кажа:

— Нясіце вядро.

Прынесьлі вядро. А прафэсар гэтак адным махам шырокай рукі згроб усе археалягічныя экспанаты і — шух у вядоро.

— Выносьце, — кажа, — на сьметнік. — Гэта ж падумаць толькі, — прадаўжаў далей прафэсар Керзін пасьля ўсеагульнай замінкі, — Масква ўсюды рабавала, дзе толькі магла! Па ейнай палітыцы, ніякай культуры на Беларусі не павінна было быць. Усе арыгінальныя знаходкі і ўнікумы — сабе ў Маскву забралі, а нам тут, у Беларусі, муляжы пакінулі, падробкі, хлам: радуйцеся! О, гэта адмыслова. У іх розум не на дабро, ведалі, што рабілі, — рэзюмаваў прафэсар.

* * *

Гэтую гісторыю расказаў мне аднойчы Антон Шукелойць, разважаючы пра ***Крыж*** і муляж Крыжа ***Эўфрасіньні Полацкай***. Муляж Крыжа (калі не прымаць пад увагу ягоную ілюстрацыйную ўжытковасьць) мае, на мой погляд, такі самы сэнс для культуры і такую ж цану, як і той хлам, які прафэсар Керзін выкінуў у вядро для сьмецьця.

Муляж наталяе розум, але засоньвае дух, стварае ілюзію, што нешта ўжо ёсьць. Фальшыўка, падробка дае ўяўленьне — і спрыяе забыцьцю рэальнасьці.

Калі б хто думаў спэцыяльна, што зрабіць, каб прымусіць беларусаў забыцца пра сваю зрабаваную маскоўцамі культуру і пра яе духоўны сэнс, то замест кляйнота стварыў бы дублікат, пустышку, каб улагодзіць і заспакоіць сярэдніх людзей, і тых, хто ня ведае і не разьбіраецца (якіх, на жаль, вельмі шмат).

Што датычыць рэальнага Крыжа Эўфрасіньні, то тут, на мой погляд, сэнс найглыбейшы. Я б сказаў, эзатэрычны сэнс, цудатворны і лёсавызначальны для ўсяго беларускага народа. Зьдзіўляе, зь якой пасьлядоўнасьцю расейцы-бальшавікі імкнуліся неўпрыкметна зьнішчыць Крыж, завалодаць ім, ня даць, каб ён заставаўся на Беларусі.

Зь літаратуры вядома, што ў 1929 годзе ГПУ-НКВД вывез Крыж Эўфрасіньні Полацкай зь Менску ў Магілёўскі музэй. (Захаваліся нават прозьвішчы тых гэбістаў, што вывозілі.) Тлумачылі акцыю тым, што, маўляў, рэліквія павінна быць далей ад мяжы, каб гарантаваць бясьпеку.

У канцы 70-х мне прыходзілася некалькі разоў размаўляць пра Крыж з былым дырэктарам Магілёўскага гісторыка-краязнаўчага музэю спадаром Філіповічам, які ў 1941 годзе працаваў у музэі і прысутнічаў пры эвакуацыі ягоных экспанатаў. Ён цьвердзіў, што энкавэдзісты вывезьлі тады Крыж ў Маскву.

Праўда, пасьля вайны была пушчана плётка (хутчэй за ўсё, праз КГБ), што быццам бы Крыжа на той час у Магілёве не было, і што невядома, дзе ён. Пазьней пускаліся іншыя чуткі, што быццам бы Крыж трапіў то ў Амэрыку (называлі нават калекцыю Моргана), то ў Аўстралію, то ў беларускую эміграцыю, Бразілію і г.д.

Пусканьне плётак тымі, хто скраў Беларускую Рэлiквію, мяне не зьдзіўляе. Я схільны верыць Філіповічу. Бальшавікі пры эвакуацыі музэя, першым чынам (вядома ж) забралі б Крыж, а не муляжы каменных сякераў, кшталту тых, якія выкінуў на сьмецьце прафэсар Керзін.

Але нават калі б сапраўды ў 1941 годзе Крыжа ўжо не было ў Магілёве (хадзілі яшчэ чуткі, што Крыж хавалі ў абкамаўскім

партыйным сэйфе), то ці могуць быць сумненьні ў тым, дзе ён апынуўся пасьля таго, як гэбісты забралі яго зь Менску?!

Крыж схаваны ў Маскве, і прычыны ягонага знаходжаньня там, відаць, ня толькі культурна-матэрыяльнага і музэйнага кшталту. Нездарма гэтым займаўся НКВД. Там думалі наперад, зьнішчалі дзеля „сьветлай камуністычнай будучыні”. (І, як паказала гісторыя, — дзеля рускай і гэбоўскай будучыні.)

Для беларускай нацыі ***Полацкі Крыж*** ёсьць сакральны агульнанародны сымвал, гэтак жа, як ***Пагоня***, ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг***, ***Вільня***, ***Курапаты***, ***Абраз Маці Божай Вострабрамскай***, ***Наваградак***, ***Мірскі замак***, ***Нясьвіж***, ***Полацак***, *рака* ***Нёман*** і *гістарычная рака* ***Няміга*** (дзе цаной вялікіх ахвяраў, у крывавай бітве былі спынены чужынцы), ***Белавежская Пушча***, ***Крэва*** і г.д. (Дарэчы, нават маючы на ўвазе толькі тое, што я назваў, заўважце, куды цаляюць непрыяцелі.)

Добра вядомы таксама ***Запавет*** Шасьціканцовага Крыжа Эўфрасіньні, сэнс якога ў тым, што Полацкі Крыж „жыватворыць” душы народа, сьцеражэ, аберагае краіну. Страта Крыжа — пазбаўляе народ апекі і прынясе няшчасьце тым, хто яго ўкрадзе.

І вось ён зьнік. З пачатку 40-х гадоў яго няма на Беларусі. Запавет прыдае Крыжу значэньне пэрспэктыўнага і мабілізуючага нацыю сымвала. (У мяне падазрэньне, што найперш таму ён і быў выкрадзены бальшавікамі-равсейцамі. У ягоным зьнікненьні прачытваецца злая воля.)

Крыж Эўфрасіньні — гэта беларускі Грааль, толькі захоўваецца ён ужо не на Монтсальвачы (Полацку), а, відаць, у д’ябальскім замку Шахтэльмарвайль.

Нагадаю, што Полацкі Шасьціканцовы Крыж, які сымвалізуе Боскае стварэньне сьвету (шэсьць канцоў — шэсьць дзён стварэньня) ёсьць Крыж-Куфэрак, у якім захоўваюцца кавалак Крыжа Хрыстовага з кроплямі Ягонай Боскай крыві і асколак каменю з крыпты (труны) Багародзіцы.

Калі паўзірацца на нашыя пасьляваенныя гады, то відаць, што то тут, то там зьяўляюцца людзі, якім не дае спакою лёс Полацкага Крыжа. Яны пачынаюць разважаць, дзе б ён мог быць. Некаторыя нават парываліся яго безвынікова шукаць. Але, зразумела (хоць, магчыма, яшчэ нямногім), што шукаць Полацкі Крыж трэба ня толькі ў натуральным ягоным выглядзе, як канкрэтную нацыянальную рэліквію, але здабываць у духу, як найсьвятлейшую, вечную праўду, знайшоўшы якую, народ становіцца — бесьсьмяротным.

І вось, калі ў чарговы раз зноў ажыла цікавасьць да Полацкага Крыжа, аднекуль, зь вельмі сумніўных сфэраў сьвядомасьці, зьяўляецца прымітыўная ініцыятыва стварыць ілюзію Крыжа, падробку, каб заспакоіць інтэрас ды суцішыць неабуджаны дух. Ствараецца муляж рэліквіі (1997г.), фальшыўка, і хораша абгрунтоўваецца; дзіўныя спонсары, зьвязаныя з Расеяй, дапамагаюць яе зрабіць. Утварылася зьява, як наш цяперашні суверэнітэт, які, заўважце, карэлюецца з муляжным падабенствам Вялікага Сымвала.

У іншых умовах і абставінах, пры адсутнасьці маскоўскага сьледу і пры поўнай невядомасьці пра месца знаходжаньня Крыжа, можа і не было б у гэтым чыне вялікай бяды. Хутчэй за ўсё, нават рэалізаваліся б добрыя памкненьні. Але калі ведаем і здагадваемся, што злодзей засеў там, у цёмным замку Кліншора, за крамлёўскімі сьценамі, то ўся гэтая самадзейнасьць выглядае інакш.

Тут выяўляецца тыпалягічная рыса пэўнай зьявы. У дачыненьні да беларускай культуры я назваў бы яе „адмоўным эфэктам Керзіна”. Яна (гэтая зьява) вынікае з тыпалёгіі ашуканства і каляніяльных дачыненьняў. Гэтак бэльгійцы некалі рабавалі Афрыку, забіралі брыльянты ды алмазы, а ўзамен давалі туземцам шкляныя пацеркі (каб цешыліся). З цывілізаваным народам можна абыходзіцца гэтак жа, калі давесьці ягоную сьведамасьць да ўзроўню Афрыкі.

(Фота Ул. Кармілкіна)

Курапаты.

У апошні час месцазнаходжаньнем Полацкага Крыжа спрабаваў цікавіцца Пётр Краўчанка, былы Міністар замежных справаў Беларусі. Але ён ніколі не задумваўся пра Грааль, таму ягоная мімалётная цікаўнасьць ні да чаго не прывяла, а сам ён неўзабаве ператварыўся ў „японскага пасла” ў краіне Ўзыходзячага Сонца.

Што дзень наступны нам рыхтуе? Калі вернецца на Беларусь Полацкі Шасьціканцовы Крыж? Дзе ягоныя рыцары і абаронцы? Хто дасьць адказ?

Але ня трэба адказу. Ужо даўно, так даўно, што сталі, як мроя, „усё лятуць і лятуць тыя коні, срэбнай збруяй далёка грымяць...”

12 жніўня 2002 г., Варшава.

ШЛЯХ АДРАДЖЭНЬНЯ

Адраджэньне — гэта ідэалёгія *Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху*, які ставіў задачу вярнуць незалежнасьць Беларусі і стварыць Беларускую нацыянальную дзяржаву. Пачатак гэтай ідэалёгіі сягае ў сярэдзіну XIX стагоддзя. Ён зьвязаны з творчай і грамадзкай дзейнасьцю ***Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*** і потым — з паўстаньнем пад кіраўніцтвам ***Кастуся Каліноўскага***.

Погляды і рух беларускага Адраджэньня сфармаваліся як сістэмная палітычная зьява ў самым пачатку XX-га стагоддзя, пасьля стварэньня беларускай палітычнай партыі Адраджэньня, якой стала *Беларуская Сацыялістычная Грамада*. Беларускае Адраджэньне, асабліва пасьля расейскай рэвалюцыі 1905 года, разьвівалася ў рэчышчы палітычнага незалежніцкага руху і ў форме нацыянальна-культурнага асьветніцтва.

* * *

Самым галоўным гістарычным вынікам беларускага Адраджэньня было аб'яўленьне незалежнасьці Беларусі, арганізацыя Беларускай незалежнай дзяржавы і стварэньне дзяржаўнай улады (ворганаў кіраваньня). Першасны цыкл рэалізацыі нацыянальнай ідэі і сцьвярджэньня беларускай нацыі пасьпяхова адбыўся ў 1918 годзе. Наступным этапам павінна была стацца нацыянальная стабілізацыя Беларускай дзяржавы і беларускага грамадзтва. Гэтага якраз не дазволілі ажыцьцявіць абставіны. Дзяржаўнасьць пад акупацыяй існавала ў вельмі дэфармаванай форме і, практычна, не разьвівалася, бо не было незалежнасьці.

У першыя дзесяцігоддзі руска-бальшавіцкай акупацыі беларускае Адраджэньне было, практычна, разгромленае, а ягоныя дзеячы, ў большасьці, — фізічна ліквідаваныя. Адбывалася расправа зь беларускім народам, генацыд і зьнішчэньне, практыкаваліся пачварныя зьявы. Нават мову беларускую (фактычна, забароненую) імкнуліся разбурыць і перарабіць пад расейскую акупацыйнымі дэкрэтамі.

У становішчы генацыду любая перамена, што адхіляла б прычыну генацыду, выглядала б лепшай. Такім парадоксам стала Другая Сусьветная вайна, зьмена акупацыі. Беларускі рух адрадзіўся, перажываў пэрыяд уздыму, моладзь гатовая была змагацца за свабоду і незалежнасьць Бацькаўшчыны. Але пэрспэктывы барацьбы былі мрочнымі, бо ўсё вырашалі акупанты, і змагацца прыходзілася на два бакі. Беларусы не пасьпелі сабраць вялікай вайсковай сілы і заняць самастойнае месца ў тэатры ваенных дзеяньняў. Але галоўным палітычным чыньнікам для беларусаў, які вызначаў палітычныя паводзіны (асабліва ў канцы вайны) быў чыньнік існаваньня Рады БНР, факт арганізацыі Беларускай дзяржаўнасьці ў 1918 годзе і падтрымка ідэалёгіі нацыянальнай дзяржаўнасьці.

У другой палове 40-х гадоў была адноўлена дзейнасьць Рады БНР (якая часова прыпынілася пасьля сьмерці Прэзыдэнта ***Васіля Захаркі***). Пытаньне беларускай свабоды, незалежнасьці і вызваленьня з-пад камуна-савецкай акупацыі зноў паўстала на ўсю моц у сфэры антысавецкай эміграцыйнай палітыкі. Прысутнасьць *Рады БНР* у пасьляваеннай палітыцы стала істотным чыньнікам удзелу беларускіх эміграцыйных колаў у халоднай вайне з Савецкім саюзам.

Ідэі Беларускай дзяржаўнасьці, свабоды і незалежнасьці, дзяржаўныя сымвалы — ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг****, гэрб* ***Пагоня*** *і гімн („****Мы выйдзем шчыльнымі радамі****")* — рэальна жылі толькі ў эміграцыі. У падсавецкай Беларусі яны былі, практычна, поўнасьцю задушаны і не выходзілі на паверхню з глыбокага падпольля. Складвалася ўражаньне, што беларуская нацыя ўжо не існуе, і ўсё грамадзтва ператворана ў савецкі канглямэрат.

Аднак з крызісам камунізму, які пачаў інтэнсіўна праяўляцца ў 80-х гадах, зноў узьніклі ідэі беларускага Адраджэньня, прычым у форме, у распрацоўках, у ідэалах і сымвалах *Беларускай Народнай Рэспублікі*.

Гэта ёсьць ілюстрацыя таго, што ідэі свабоды і незалежнасьці — незьнішчальныя, бо выходзяць з аб'ектыўнай неабходнасьці разьвіцьця нацыянальнага грамадзтва. Але істотна тое, што гэтыя ідэі былі ўжо сфармуляваныя, абгрунтаваныя і гістарычна рэалізаваныя, сталі чыньнікам змаганьня супраць нацыянальнага ўціску і савецкай акупацыі. Новым беларускім адраджэнцам, новаму пакаленьню ўжо ня трэба было сцьвярджаць тое, што сцьверджана раней, абгрунтоўваць тое, што было абгрунтавана. За вяртаньне дасягнутага трэба было змагацца, Беларускі Сьцяг трэба было ўзьняць, Беларускі гімн — сьпяваць. Але гэта ўсё ўжо існавала, гэта ўсё ўжо было.

Больш таго, дзякуючы стварэньню *Ўрада БНР* і аб'яўленьню незалежнасьці Беларусі, расейскія бальшавікі вымушаныя былі пагадзіцца на стварэньне марыянэткавай дзяржавы БССР з фіктыўным сувэрэнітэтам і самастойнасьцю, але з рэальнымі ўрадавымі і ўпраўленчымі структурамі, якія былі, па сутнасьці, каляніяльнай адміністрацыяй, але, тым ня менш, грамадзтва мела сістэму арганізацыі па ўзору дзяржаўнага кіраваньня. Гэта аблегчыла вяртаньне незалежнасьці (хоць і ўскладніла далейшыя дачыненьні).

Такім чынам, за ўсімі паваротнымі момантамі нашай цяперашчыны на шляху да дзяржаўнай незалежнасьці стаіць чыньнік — ***25 Сакавіка****,* існаваньне ***Рады БНР*** і ідэалаў ***Беларускай Народнай Рэспублікі***.

Ідэалы *БНР* застануцца істотнымі і актуальнымі заўсёды, пакуль будуць існаваць беларусы і дзяржава Беларусь. Бо Беларуская нацыянальная дзяржава ёсьць першасны і найвялікшы ідэал, які фармальна быў рэалізаваны ў 1918 годзе. Толькі валодаючы дзяржаўнай незалежнасьцю і нацыянальнай свабодай можна было казаць пра ўсё астатняе: становішча чалавека, дэмакратыю, законы, культуру, асьвету ды эканоміку. Ня будучы гаспадаром над сабой і ў сваім краі, народ ня можа рэалізаваць сваіх магчымасьцяў; і ўсе размовы пра *наступнае* без дасягненьня *першаснага* — нерэальныя.

Дзяржаўная незалежнасьць і нацыянальная свабода ёсьць першым пытаньнем і галоўнай задачай ідэалёгіі Беларускага Адраджэньня, сутнасьцю Беларускай Нацыянальнай Ідэі.

Аднак галоўная задача Адраджэньня не была да канца рэалізаваная ў беларускай палітыцы і, адпаведна, — слаба замацаваная ў грамадзкай сьведамасьці народа ў той час, калі завяршаўся працэс утварэньня нацыяў і нацыянальных дзяржаваў. Савецкая акупацыя і цяперашні ўнутраны прарасейскі акупацыйны рэжым затармазілі разьвіцьцё і рэалізацыю тых працэсаў, якія закончыліся ў Эўропе ў першай чвэрці XX-га стагоддзя.

Але нацыя ня можа абмінуць заканамернасьці і пераскочыць праз нейкі абавязковы этап разьвіцьця. Таму доўга змагаючыся за свабоду і незалежнасьць, кожнае новае пакаленьне беларусаў зноў і зноў зьвяртаецца да нацыянальных праблемаў Адраджэньня, каб вырашыць задачы стогадовай даўніны.

Ня могучы абмінуць затарможанага і не завершанага раней, нацыя імкнецца дарабіць усё ў іншым часе, *разьвіваючыся паскорана*, узнаўляючы пасьпешна этапы і структуру праўдзівага

разьвіцьця. Цяжкасьць абавязковага паскарэньня, якое разьвіваецца ў пазьнейшым часе, заключаецца, перш за ўсё, у тым, што сусьветная супольнасьць, суседзі існуюць ужо ў іншым вымярэньні і вырашаюць іншыя грамадзкія задачы. У такіх умовах зьніжаецца міжнародная салідарнасьць з запозьненым нацыянальна-дэмакратычным рухам і, што найгоршае, — частка грамадзтва перастае разумець актуальнасьць духоўных праблемаў нацыі, імкнецца ўключыцца ў вырашэньне сучасных цывілізацыйных задачаў у чужой форме, не разумеючы, што вырашыць іх немагчыма, не зрабіўшы папярэдняга, не стварыўшы неабходных умоваў для разьвіцьця нацыі.

прыярытэтнай у беларускай палітыцы. Толькі яна можа прывесьці да рэалізацыі ідэі незалежнасьці, свабоды і дэмакратыі. Па-сапраўднаму толькі нацыянальнае Адраджэньне і ёсьць беларускай палітыкай. Усё астатняе — пабочнае, хоць можа і супадаць у нейкіх сфэрах і на нейкіх этапах зь беларускім Адраджэньнем.

* * *

На працягу больш чым стогадовай гісторыі беларускага Адраджэньня праціўнікі Беларускай дзяржавы і незалежнасьці ўсімі спосабамі змагаліся з нацыянальнай ідэяй. Канцэпцыяў

1989 год, 29 кастрычніка. Мітынг жалобы ў Курапатах.

Калі мы вернемся ў думках на 10 гадоў раней, то ўбачым, што з усіх нашых суседзяў, якія вызваліліся ад савецкай акупацыі (Польшча, Летува, Латвія, Расея, Украіна), Беларусь мела найлепшыя эканамічныя і патэнцыяльныя стартавыя магчымасьці. Прамаскоўская дыктатура, мафійнае і рэліктавае гаспадараньне запаволілі разьвіцьцё Беларусі, выклікалі страшэнныя страты. Цяпер у сістэме палітыкі, эканомікі, па ўзроўню сацыяльных прыярытэтаў і па жыцьцёвым узроўні Беларусь не стасуецца са сваімі суседзямі і нібы апусьцілася на дно глыбокай ямы. Але каб вылезьці з гэтай ямы, беларускае грамадзтва абавязкова павінна будзе вырашыць тыя нацыянальныя праблемы разьвіцьця і арганізацыі нацыі, якія не ўдалося вырашыць у 1905-м, 1918-м, 1920-м, 1991-м гадах. Прыдзецца паскорана адрабіць тое, што не далося нам зрабіць сто гадоў таму. Такая ёсьць дыялектыка разьвіцьця нацыянальнага грамадзтва і нацыянальнай ідэі.

Ідэалёгія беларускага Адраджэньня зьяўляецца

супрацьпастаўленьня было некалькі і рознага ўзроўню. Найбольш сур'ёзнымі і разбуральнымі былі канцэпцыі *„заходнерусізму", „саветызму"* 20-40-х гадоў і, пачынаючы з сярэдзіны 50-х і да канца СССР, — *„савецкага інтэрнацыяналізму".* На заходніх землях Беларусі, захопленых Польшчай у 1921-1939-х гадах, узьнікла адзіная акупацыйная канцэпцыя палянізацыі беларускага насельніцтва.

Цяперашні прамаскоўскі рэжым ня мае выпрацаванай ідэалёгіі і праводзіць грубую палітыку задушэньня ўсяго беларускага, накіраваную ў канцовым выглядзе на ліквідацыю Беларускай дзяржавы і ўключэньне нашай нацыянальнай тэрыторыі ў склад Расеі.

Больш падступную і казуістычную сістэму змаганьня зь беларускім нацыянальным Адраджэньнем выставіў у Беларусі заходні лібэралізм. Гэта разрэкламаваная ў 90-х гадах лібэральная дактрына прыярытэту правоў чалавека над нацыянальнай свабодай

і суверэнітэтам народа. У цэлым, гэтая канцэпцыя мае шмат станоўчага і прыцягальнага ў сваім зьмесьце, але, даведзеная лібэраламі да абсурду, яна не вытрымлівае крытыкі. І сапраўды, пра якія „правы чалавека” можна гаварыць пад акупацыяй? Страціўшы незалежнасьць і свабоду, народ траціць і свае правы. Так што прыярытэт не ў „правах”, а ў незалежнасьці і свабодзе. Нічога няма ў беларускай палітыцы вышэйшага, важнейшага і разумнейшага за народную ідэалёгію нацыянальнага Адраджэньня.

Пасьля бамбаваньня Сэрбіі, Афганістану і здачы Чачэніі на зьнішчэньне расейскім дзяржаўным тэрарыстам, усе ўбачылі, што дактрына прыярытэту „правоў чалавека” грэшыць дэмагогіяй і без супраціву ўлягае палітычным інтарэсам вялікіх дзяржаваў.

Міжнародны скрайні лібэралізм у эканоміцы ставіцца варожа да нацыянальнага Адраджэньня, дзейнасьці хрысьціянскіх, народных, кансэрватыўных партыяў, якія стараюцца ўмацаваць нацыянальную дзяржаву, культуру, маральныя традыцыі і грамадзтва. Для міжнароднага фінансвага бізнэсу патрэбныя краіны бязь межаў і нацыянальных інтарэсаў, так званае „адкрытае грамадзтва”, каб лёгка было ў яго пранікнуць і падпарадкаваць эканоміку сваёй фінансавай сістэме. Нацыянальная дзяржава, краіна-айчына, якая грунтуецца на нацыянальнай ідэі, будзе супраціўляцца залежнасьці і захопу нацыянальнай эканомікі сусьветным фінансавым капіталам. Таму заходні лібэралізм змагаецца з нацыянальнымі рухамі і хрысьціянскай палітыкай, абапіраецца пры гэтым на касмапалітычную дактрыну „правоў чалавека” ў сваіх інтарэсах.

Трэба сказаць, што ў лібэральных партыях на Захадзе ніколі не зьбіраліся лепшыя людзі, хутчэй наадварот. Тым часам Эўропа цяпер моцна паружавела, практычна, усюды кіруюць сацыял-дэмакраты, сацыялісты, камуністы і ўвогуле — левыя. Гэта ёсьць спажыўчае асяроддзе для лібэралізму ў культуры, этыцы і маралі, што прыводзіць да маральнай дэградацыі грамадзтва. Бо лібэралізм у культуры і ў маральных дачыненьнях разумее свабоду ў анархічным кшталце: як свабоду граху і скрайняга індывідуалізму, а правы чалавека трактуе як абгрунтаваньне права на грэх. За ўсім гэтым стаіць даволі стракатая публіка (ад дзяржаўных дзеячоў і палітыкаў да асацыяльных элемэнтаў), але ўсіх іх аб’ядноўвае непрыхільнасьць да хрысьціянства і нацыянальных каштоўнасьцяў і, у большасьці, — да ўсялякай традыцыйнай нармальнасьці.

У Беларусі гэтакі лібэралізм мае пакуль што яшчэ непрыкметны, наносны і штучны характар, трымаецца, у асноўным, на фінансавай падтрымцы з Захаду. Але разбуральнае ўзьдзеяньне ягонага амаральнага ўплыву на асобных людзей і шкода для беларускага Адраджэньня — ужо відавочныя.

* * *

Спробы размыць беларускае Адраджэньне, перарадзіць яго ці прыстасаваць да абслугоўваньня небеларускіх палітычных інтарэсаў назіраюцца пастаянна як у Беларусі, гэтак і на эміграцыі. Можна адзначыць некалькі стэрэатыпаў у гэтай справе. Напрыклад: „трэба выступаць за незалежнасьць, але ня трэба змагацца за беларускую мову, бо шмат беларусаў гавораць па-расейску”. (Тэзіс, дарэчы, тыпова агентурны, калі ён гучэў у партыі Адраджэньня. Тэст на агента.) Ці яшчэ: „за незалежнасьць, але ня трэба выступаць супраць Расеі”; ці напрыклад: „трэба казаць тое, што людзі хочуць чуць і, калі патрэбна, то схлусіць, каб узяць уладу, а потым (узяўшы ўладу) праводзіць сваю палітыку”. (Гэта, дарэчы, таксама тэст: на інфантыльнасьць і палітычную няразьвітасьць.) Альбо: „трэба аб’яднацца з намэнклятурай, зь Кебічам”, ці: „супрацоўнічаць з Лукашэнкам” (як прапанаваў адзін мой былы намесьнік па БНФ у 1994 годзе, адразу пасьля выбараў) і г.д.

Увесь гэты „інфантылізм”, „ідыятызм” ды „прагматызм” мы ўжо перажылі. Але гэта ня значыць, што такое не паўтараецца.

Апошнім разам прыходзіцца чуць, што традыцыйнае Адраджэньне, маўляў, базуецца на гісторыі, на мінулым, а трэба глядзець у будучыню, праграмаваць Адраджэньне наперад і г.д. (Амаль, як у будаўнікоў камунізму: каб пабудаваць новае, трэба адмовіцца ад старога.) Ствараецца выгляд супярэчнасьці там, дзе яе не існуе. Дарэчы, нацыянальная гісторыя (гэтак жа, як нацыянальная мова) ёсьць грунтам і базай нацыянальнага Адраджэньня, прыярытэтам адраджэнскай палітыкі. Іншых прыкладаў у гісторыі адраджэнскіх рухаў не назіралася. Не было нават выключэньняў.

Аднак як бы ні ўскладнялася ці як бы ня горшала палітычнае становішча на Беларусі, у беларускага Адраджэньня ёсьць грунт, на які яно заўсёды можа стаць абедзьвюма нагамі. Гэты грунт — ідэалы *Беларускай Народнай Рэспублікі*. У 1988 годзе, калі ўтварыўся Беларускі Народны Фронт, акурат гэтак і адбылося. Фронт узьняў нацыянальныя сымвалы *БНР* і, крок за крокам, ішоў у сваёй ідэалёгіі да незалежнасьці і суверэнітэту, да дзяржаўнасьці беларускай мовы, да дэмакратыі і рынкавай эканомікі, да свабоды сумленьня і аўтакефальнасьці беларускіх канфэсіяў (разарваных раней чужымі і часовымі ўладамі па сваіх закаморках), да беларускага войска і беларускіх грошай, да праэўрапейскага шляху разьвіцьця.

Гэтыя палітычныя каштоўнасьці былі засвоеныя ў Народным Фронце і актыўнай часткай беларускага грамадзтва ўжо ў першыя два гады існаваньня БНФ. Як ні дзіўна, найдаўжэй засвойвалася пытаньне, якое павінна б было ўсьвядоміцца першым. Менавіта: што зьяўляецца прычынай нашай несвабоды і нацыянальных няшчасьцяў? Адказ, зразумелы раней для кожнага беларускага адраджэнца, для кожнага актывіста *БНР*. Але ў постсавецкім грамадзтве ён высьпяваў на Беларусі амаль да сярэдзіны 90-х гадоў. І, дарэчы, у гэтым найбольш выяўлялася саветызаванасьць, глыбокая дэфармаванасьць беларускага грамадзтва. Зьяўленьне на вяршыні беларускай улады чалавека з антыбеларускімі поглядамі (што абсалютна неверагодна было б, скажам, у Польшчы ці Летуве), тут было дастаткова абумоўлена якраз разбуранасьцю нацыянальнай канцэпцыі народнага існаваньня, зьніжэньнем нацыянальнай годнасьці беларусаў, збочаным зьместам думак пасьлясавецкай супольнасьці.

Бадай што толькі цяпер, калі палітыка рэжыму набыла выразныя прарасейскія і антыбеларускія рысы, для шмат якіх беларусаў (у форме адкрыцьця) стала зразумелай сутнасьць і роля расейскай шавіністычнай палітыкі, накіраванай супраць Беларусі. Да той пары, дакуль будзе існаваць вялікадзяржаўная Расея і яе імпэрская палітыка, датуль будзе ўзьнікаць пагроза для беларускай незалежнасьці і для беларускага нацыянальнага існаваньня.

Эліты беларускага грамадзтва толькі цяпер пачынаюць набліжацца да ўсьведамленьня гэтай простай і галоўнай відавочнасьці, зразумелай больш чым сто гадоў таму яшчэ шляхоцкім змагарам за свабоду. *„Толькі тады, народзе, зажывеш шчасьліва, калі маскаля над табой ня будзе!”* — пісаў ***Кастусь Каліноўскі.***

Прамаўляючы лапідарна, можна сказаць, што толькі тады ёсьць сэнс гаварыць пра свабоду, калі чалавек разумее, што ён несвабодны. Калі ж *„у думах выхаваны зморных, ня знае, дзе пячэ, дзе студзіць” (Янка Купала),* то змаганьне за незалежнасьць набыве кшталт бегу на месцы. Перш, чым змагацца, трэба навучыцца правільна думаць, каб барацьба мела сэнс і дасягала выніку. Таму нацыянальнае асьветніцтва мае цяпер найвялікшае значэньне. (І, дарэчы, цяперашняя фронтаўская праграма *Беларуская Салідарнасьць.*)

Праз асьвету — да свабоды — вось лёзунг усяго эўрапейскага нацыянальнага Адраджэньня ў XIX-м стагоддзі. Нам, беларусам, ня трэба думаць, што цяпер — XXI-е, і ўсе мы ўжо разумныя. Лепш хоць позна, але навучыцца таму, чаму некалі навучылася Эўропа, і чаго не навучыліся ў нас цэлыя пакаленьні, жывучы пад савецкай акупацыяй.

Няма сэнсу беларусам ганарыцца пабочнымі ведамі, скажам, у электроніцы, у эканоміцы ці ў мастацтве, калі няма разуменьня галоўнага: што такое Бацькаўшчына, што такое нацыянальная мова і што ёсьць прычынай няшчасьця Бацькаўшчыны, дзе яе ворагі і дзе яе сябры. Без усьведамленьня гэтых галоўных паняцьцяў, пабочныя веды беларуса, разам зь яго талентамі, адукаванасьцю ды „прафэсарствам”, ня пойдуць яму ў карысьць. Ён будзе змушаны прадаць іх за бясцэнак пад чужым рэжымам і памрэ ў галечы ды рабстве, так і не зразумеўшы прычынаў.

Ня можна быць свабодным ад народа і незалежным ад нацыі, калі яна ў бядзе. Ня можна быць вольным ад краіны, калі яна церпіць.

* * *

Школай нацыянальнага асьветніцтва, крыніцай вялікіх і простых ведаў зьяўляецца гісторыя Беларускага Адраджэньня, дзе найбольш яркай старонкай ёсьць, ізноў жа, утварэньне *Беларускай Народнай Рэспублікі* і потым — змаганьне за яе ідэалы.

Беларускі рух быў моцны сваёй ідэёвасьцю, якая вынікала з духовай элітарнасьці беларускага Адраджэньня. У гэтым — першасная характарыстыка беларускага адраджэнскага руху. Ён ня быў рухам масаў, хоць і абапіраўся на ўвесь народ; прытым, на найбольш простыя дэмакратычныя пласты людзей, ідэалізаваў сялянства. Такі рух вымагаў ад ягоных актыўных асобаў, і асабліва ад кіраўнікоў, пасьвячэньня і ахвярнасьці. У гэтым — сакрэт сілы беларускага руху. Аднак чыньнік выбранасьці Беларускага Адраджэньня яшчэ не гарантаваў посьпеху. Мы назіралі неверагодныя палітычныя перамогі малымі сіламі у складаных абставінах і потым — немагчымасьць рэалізаваць дасягнутае з-за слабасьці малых сілаў. Так было ў 1918-м, гэтак сталася ў 1991-м і 1994-м. Рыцарская вайна. Пэрманэнтная *Бітва пад Воршай.*

Але гэта правільны, пэрспэктыўны, надзейны, наш Беларускі шлях. Тое, што гэта так, пацьвярджае, найперш, Слуцкі Збройны Чын у 1920 годзе, калі на абарону *Беларускай Народнай Рэспублікі* супраць бальшавікоў паўстаў, практычна, бяз зброі ўвесь Слуцкі павет. Яшчэ б пару гадоў незалежнага існаваньня *БНР* — і такой, як змагарная Случчына, была б уся Беларусь.

Другі прыклад адваротнага кшталту — 1999 год, калі ў асяроддзі *Беларускага Народнага Фронту* група актывістаў публічна адмовілася ад нацыянальнай ідэі і стала на пазыцыі прагматызму, дэкляруючы іншы, прагматычны, не ідэёвы шлях („новую хвалю”). Скончылася ўсё супрацоўніцтвам з камуна-савецкай намэнклятурай і поўным фіяска, палітычным паражэньнем і тупіком.

Іншага шляху ў нацыянальнага Адраджэньня, чым ідэёвасьць нацыянальнага Адраджэньня, у беларускага руху не існуе.

Беларускае Адраджэньне церпіць на выдаткі запозьненасьці зьявы і паскоранасьці працэсу. Заўсёды не хапала крыху часу і сілы, каб рэалізаваць дасягнутае. Заўсёды замалы быў пэрыяд нацыянальнага асьветніцтва. Калі, напыклад, гераічнымі высілкамі адраджэнцаў у чарговы раз дасягалася незалежнасьць і трэба было б будаваць дзяржаўнасьць, абывацель гэтай дзяржаўнасьці раптам пытаўся: „А зачэм этат суверэніцет?” Тады прыходзіў гэтакі самы, як ён, альбо чарговы акупант — і заграбаў уладу. Усё пачыналася спачатку.

Гэтае заганнае кола (калі за геройскай перамогай ідзе абавязковая страта пазыцыі) трэба разарваць. Цяперака, калі беларускае Адраджэньне і ўсе антырэжымныя групы пацярпелі паражэньне пасьля сілавой фальсіфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў саўгасным рэжымам, мы ўсе павінны зьвярнуць надзвычайную ўвагу на нацыянальнае асьветніцтва нашых людзей, і найперш — моладзі. Трэба рыхтаваць грунт для перамогі.

У асьветніцкай праграме дзейнасьці важна ўсё, што спрыяе ўмацаваньню нацыянальнай сьведамасьці беларуса і ўспрыняцьцю ім духоўных каштоўнасьцяў нацыі. Але тут істотна, каб не рабіць непатрэбшчыны, не прымаць пабочнага і негалоўнага — за галоўнае. Калі не прадугледзець прыярытэтаў, галоўных тэмаў і дзеяньняў, тады ўся асьветніцкая справа можа быць змарнаваная, стацца неэфэктыўнай і невыніковай.

Асьветніцтва мусіць быць адраджэнцкім. Тры пазыцыі найперш трэба ўсьвядоміць кожнаму беларусу, каб яны сталі ягонай існасьцю: галоўны ідэал нацыі — незалежнасьць і свабода, галоўная прычына нацыянальнай бяды і несвабоды — рускі імпэрыялізм, галоўная нацыянальная каштоўнасьць — беларуская мова. Бяз мовы нацыя не існуе.

Цяпер мусіць паўстаць пытаньне аб новых выбарах прэзыдэнта і адначасна — весьціся нацыянальна-асьветніцкая ды палітычная праца.

Асьветніцкая дзейнасьць у гэтым моманце і ў лепшым варыянце павінна стацца паклікаdebit пакліканьнем для ўсіх адукаваных і сьведамых беларускіх інтэлектуалаў. Трэба дапамагчы сабе.

Такія акцыі, як *Беларуская Салідарнасьць* і *Грамадзянства БНР* (прыняцьце сымвалічнага грамадзянства БНР) маглі б найбольш паспрыяць асьветніцкай задачы і вымогам часу, які не павінен быць змарнаваны.

Стагнацыя рэжыму, што сфальшаваў выбары, ня будзе трываць доўга. Праз нейкі час пачнуцца чарговыя зрухі і дрыжэньне асноў. Рэжым, які ня мае ніякіх ідэяў (хоць бы тыпу чучхэ) і трымаецца толькі на Маскве, на старых савецкіх людзях ды страху, — такі рэжым ня мае ні будучыні, ні пэрспэктывы. Ужо цяпер Беларусь павінна рыхтавацца да распаду рэжымнай улады, каб свабодна парадзіць сабой, як найлепш.

Калёна беларускіх адраджэнцаў у Слуцку. 2000 год.

(Канфэрэнцыя: ІДЭАЛЫ БНР І АДРАДЖЭНЬНЕ БЕЛАРУСІ. 84-я гадавіна незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. 17 сакавіка 2002 г., г. Менск. Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ)

(Фота Ул. Карміліна)

1995 год. Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне". Фронтаўцы на радзіме Тадэвуша-Андрэя Касьцюшкі ў Мерачоўшчыне.

ЗЬМЕСТ

Стар.

Новае стагоддзе (прадмова) 5
Мінула XX-е стагоддзе 6
Беларускі сьцяг 8
Старыя дарожкі 10
Эліта 11
Свабода 13
Тэлевізар 15
Урбанізацыя 18
Эгалітарызм 20
Вялікія людзі 22
Камунізм як форма рускага імпэрыялізму 25
Вера і палітыка 30
Традыцыя 33
Унутраная акупацыя 37
Змаганьне за незалежнасьць 38
Антыбеларуская прапаганда 40
Чужая сучаснасьць і беларуская палітыка 42
Слава Слуцкім героям! 44
Фізічнае зьнішчэньне беларускай нацыі 45
Вялікі Купала 51
Амэрыка — для амэрыканцаў 51
Ідэалы БНР нам сьвецяць *(З выступу ў Нью-Ёрку)* 53

З цыклу: „Выбары ў Беларусі”:
Першае, што трэба зрабіць, каб забясьпечыць справядлівыя выбары — выдаліць зь Беларусі Віка 54
Сфальшаваныя выбары 55

Варвары 57
Незалежнасьць гэта ёсьць існаваньне нацыі 59

Нацыянальныя каштоўнасьці:
Чалавек 60
Беларуская мова 62
Беларускі народ 67
Беларуская тэрыторыя і прырода 74
Беларуская ідэя 79
Культура, гісторыя, маёмасьць 81

Лёгіка стратаў і адраджэньня 85
Беларускія гімны 90
Канфлікт Давіда з Галіяфам 92
Курапаты — наш боль, наша памяць, наша трывога 93
Чым выкліканы варварскі наступ на Курапаты 96
Беражэм Курапаты! 97
Наш Беларускі шасьціканцовы крыж 98
Шлях Адраджэньня 100

УДК 323 (476)
(091) П 12

Пазьняк Зянон Станіслававіч, кандыдат мастацтвазнаўства

Культурна-асьветніцкае выданьне

Надрукавана пры матэрыяльнай дапамозе беларускіх патрыётаў у Польшчы і пры спрыяньні сяброў

Пазьняк Зянон.
Новае стагоддзе. — Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, Вільня; „Беларускія Ведамасьці”, Варшава, 2002. — 108 с.: іл.
ISBN 9955-9337-4-7
УДК 323 (476) (091) П 12

Кніга артыкулаў аб гісторыі і культуры Беларусі ў XX стагоддзі.
Напісаная адмыслова для шырокага чытача.

© Зянон Пазьняк

Мастацкі макет, вокладка і падбор
ілюстрацыяў: *Зянон Пазьняк*
Кампутарны набор і карэктура: *Галіна Палачаніна*
Кампутарны склад: *Робэрт Стаховіч*
Друк: Друкарня „АРО”, Варшава
Наклад: 1200 асоб.
Аддрукавана ў верасьні 2002 г. у Варшаве
Папера крэйдавая, фармат: 68x86 см
Ум. друк. арк: 15,2
Таварыства Беларускай культуры ў Летуве, Вільня, 2004, вул. Жыгімонта, 12-3;
„Беларускія Ведамасьці”, Варшава, 02-017, вул. Ерусалімскія алеі, 125/127

ISBN 9955-9337-4-7